ПКАУ “Магілёўскі маладзёжны цэнтр”

Ініцыятыва “Грамадскі магістрат”

**Ігар Пушкін**
**Аляксандр Агееў**

# ГРАМАДЗЯНСКАЯ СУПОЛЬНАСЦЬ І ДЗЯРЖАВА. СТАНАЎЛЕННЕ БЕЛАРУСКАГА САМАКІРАВАННЯ

Магілёў
2017

УДК 94(476)
ББК 63.3 (4Беи)6
П 91

Рэцэнзенты:
доктар гістарычных навук, прафесар *Я. Р. Рыер*;
доктар сацыялагічных навук, прафесар *Ю. М. Бубнаў*;
кандыдат філасофскіх навук, дацэнт *А. В. Дзячэнка*

**Пушкін, І. А.**
П91 Грамадзянская супольнасць і дзяржава. Станаўленне беларускага самакіравання / І. А. Пушкін, А. Р. Агееў. – Магілёў : МДУХ, 2017. – 182 с.
ISBN 978-985-6985-90-7.

У выданні, якое ўяўляе сабой тэксты аўтараў, аб'яднаных тэмай узаемадзеяння грамадзянскай супольнасці і дзяржавы, коратка асвятляюцца і аналізуюцца гістарычныя перадумовы і сучасныя тэндэнцыі фарміравання мясцовага самакіравання і грамадзянскай супольнасці ў кантэксце працэсаў нацыянальнага самавызначэння беларусаў і фарміравання беларускай дзяржаўнасці і грамадзянскай супольнасці ад сярэднявечча да пачатку XXI ст. з апорай на матэрыялы ўсходняй Беларусі.

Адрасуецца грамадскім актывістам, палітыкам, навукоўцам, выкладчыкам, краязнаўцам, студэнтам і вучням, а таксама ўсім, хто цікавіцца айчыннай гісторыяй і палітыкай.

**УДК 94(476)**
**ББК 63.3 (4Беи)6**

**ISBN 978-985-6985-90-7**
© Пушкін І. А., Агееў А. Р., тэкст, 2017
© Афармленне МДУХ, 2017

## ЗМЕСТ


УВОДЗІНЫ 5

1 ШЛЯХІ ФАРМІРАВАННЯ МЯСЦОВАГА САМАКІРАВАННЯ І ЭЛЕМЕНТАЎ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ НА ЗЕМЛЯХ СЁНЯШНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў СТАРАЖЫТНАСЦІ, СЯРЭДНЯВЕЧЧЫ І НОВЫ ЧАС 9

1.1 Вытокі і гістарычныя передумовы фарміравання мясцовага самакіравання і грамадзянскай супольнасці 9

1.2 Грамадска-дзяржаўнае кіраванне і самакіраванне эпохі ВКЛ і Рэчы Паспалітай на беларускіх землях 12

1.3 Магдэбургскае права: сутнасць самакіравання і яго рэгіянальныя асаблівасці 16

1.4 Парасткі грамадзянскай супольнасці пад час расійскага панавання 42

2 АКТЫВІЗАЦЫЯ ГРАМАДСКАГА І НАЦЫЯНАЛЬНАГА РУХАЎ У АПОШНІЯ ГАДЫ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ (1917–1918) 51

2.1 Стварэнне беларускіх арганізацый і дзейнасць Магілёўскага Беларускага Камітэта 54

2.2 Фарміраванне дзяржаўнай ідэнтычнасці і рост падтрымкі ідэі стварэння нацыянальнай дзяржавы 85

3 АСАБЛІВАСЦІ ФУНКЦЫЯНАВАННЯ ЭЛЕМЕНТАЎ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ Ў САВЕЦКАЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ 115

3.1 Грамадскі рух ва ўмовах нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва і станаўлення сацыялістычнага ўкладу жыцця (1919–1940-я) 115

3.2 Асаблівасці грамадска-палітычнага жыцця БССР у час “перамогі сацыялізму” (1945–1990) 128

3.3 Імітацыя самакіравання на прадпрыемствах і ва ўстановах БССР у другой палове 1950–1960-х гг. 133

3.4 Формы пратэсту савецкіх работнікаў і кадравая палітыка КПБ (1950–1960-я) 139

3.5 Аўтарытарызм і самакіраванне ў пошуках шляхоў павышэння якасці і эфектыўнасці кадравага патэнцыялу прамысловасці ў БССР (1970–1980-я) 145

4 ФАРМІРАВАННЕ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ (1991–2017) 155
4.1 Пачатак фарміравання мясцовага самакіравання і грамадзянскай супольнасці ў наш час 155
4.2 Барацьба грамадскасці за рэгенерацыю гістарычнага ландшафту Магілёва і Магілёўскай ратушы, як сімвала Магдэбургскага права і градзянскай супольнасці 158
4.3 Пашырэнне імкнення да адраджэння самакіравання праз ушанаванне магдэбургскіх традыцый на Магілёўшчыне 175
ЗАКЛЮЧЭННЕ 180

# УВОДЗІНЫ

У апошнія дзесяцігоддзі сфарміравалася агульнапрынятае ўяўленне аб тым, што грамадзянская супольнасць з'яўляецца найважнейшым элементам у сістэме стрымак і проціваг сучаснага грамадства. Менавіта свабодныя грамадзяне і іх добраахвотна сфарміраваныя некамерцыйныя асацыяцыі і арганізацыі дазваляюць кантраляваць і абмяжоўваць дзейнасць дзяржаўных інстытутаў, іх празмернае ўмяшанне ў прыватнае жыццё грамадзян, прадухіляць парушэнні закона, стрымліваць камерцыйныя інтарэсы бізнэсу. Гістарычна фарміраванне грамадзянскай супольнасці ішло ў барацьбе з дзяржаўнымі інстытутамі, але сёння яе існаванне з'яўляецца адной з неабходных ўмоваў для эфектыўнага функцыянавання сучаснай дзяржавы. З іншага боку наяўнасць прававой дэмакратычнай дзяржавы спрыяе фарміраванню грамадскіх інстытутаў, якія вызваляюць дзяржаву ад часкі функцый, дзейнічаюць на аснове супрацоўніцтва розных сацыяльных груп, згладжваюць супярэчнасці і гарманізуюць грамадскія адносіны, у чым кроўна зацікаўлены органы дзяржаўнай улады.

У прапанаваным ніжэй выданні разглядаецца ў кантэксце гісторыі Беларусі тысячагадовы працэс фарміравання індывіда з развітым пачуццём грамадзянскай і асабістай годнасці, адказнасці перад грамадствам. Таксама закранаюцца пытанні станаўленне духоўна-маральных якасцей, якія дэтэрмінуюць эфектыўную працу грамадскіх структур сучаснай грамадзянскай супольнасці. Аналізуючы прадмет даследавання аўтары не імкнуліся да падрабязнага апісання ўсіх гістарычных формаў існавання грамадзянскай супольнасці на тэрыторыі нашай краіны і ўсіх акалічнасцяў іх узаемадзеяння з дзяржавай. Тэкст кнігі пабудаваны паводле праблемнахраналагічнага прынцыпу, які ў цэлым адпавядае агульнапрынятай перыядызацыі гісторыі Беларусі. Пры выкладанні канкрэтна-гістарычнага матэрыяла намі закраналіся агульнабеларускія тэндэнцыі, але перш наперш мы абапіраліся на матэрыялы ўсходняй Беларусі.

Вядома, што стварэнне перадумоў для функцыянавання грамадзянскай супольнасці ў палітычнай і эканамічнай сферы магчыма за кароткі гістарычны перыяд, а вось фарміраванне грамадзянскай культуры – працэс працяглы і складаны. Гістарычны шлях беларускага народа дазваляе прасачыць і зразумець якім чынам, у якіх умовах, адбываўся працэс паступовага станаўлення наступных выз-

начальных элементаў і каштоўнасцей грамадзянскай культуры (як у асноўнай часткі народа, так і ў эліты): законнасць (законапаслухмянасць), супрацоўніцтва супольнасці з дзяржаваю (эфектыўны дыялог), імкненне да свабоды, адказнасць, талерантнасць, ініцыятыўнасць, самаарганізаванасць, актыўная дзейнасць у грамадска-палітычным жыцці, у тым ліку па кіраванню грамадствам, жаданне браць на сябе паўнамоцтвы па самакіраванню, салідарнасць (давер адзін да аднаго і да органаў дзяржаўнага кіравання), уплыў на ўладу і дзяржаву, стварэнне грамадскіх арганізацый, матывацыя ўдзелу ў грамадска-палітычным жыцці (эга ці сацыяцэнтрысцкія), інтарэсы сацыяльнай асновы (сярэдняга класу) і некаторыя іншыя[1].

Перадумовы грамадзянскай супольнасці сучаснай Беларусі выяўляюцца ў сацыяльна-эканамічным, грамадска-палітычным і культурным жыцці мінулых пакаленняў. Зыходзячы з гэтага прадметам нашага аналізу сталі наступныя элементы грамадзянскай супольнасці з мінулага Беларусі: формы сялянскага самакіравання (абшчына, калгас, які быў не толькі эканамічнай, але і сацыяльнай адзінкай, сельскі савет), гарадскога (веча, цэх, магістрат, брацтвы, гарадская дума, гарадскі савет), шляхецкага (зборы, сеймікі, канфедэрацыі, дваранскія сходы), фарміраванне парламентарызму (дзейнасць палітычных партый і грамадскіх арганізацый). Яны разглядаюцца ў кантэсце агульнагістарычных працэсаў, асаблівасцей фарміравання ў розных гістарычных формах беларускіх дзяржаўных утварэнняў, унутранай і знешняй палітыкі дзяржаў у склад якіх уваходзілі беларускія землі, імкнення да адраджэння суверэнітэта, стварэння ўласнай незалежнай дзяржавы. Прычым трэба абавязкова ўлічваць, што станаўленне элементаў грамадзянскай супольнасці адбывалася як мірным шляхам (выбарнасць пасадавых асоб, удзел у працы органаў самакіравання, партый і інш.), так і са зброяй у руках (рокашы, паўстанні, дзейнасць тайных таварыстваў і інш.).

Намі выкарыстаны дакументальны матэрыял шэрагу дзяржаўных архіваў Беларусі, Літвы і Расіі, абагульняючыя працы па гісторыі Беларусі[2] і навуковыя артыкулы іншых даследчыкаў, якія

---

[1] Гражданское общество и государство (очерки теории и практики взаимодействия) / Е.М. Бабосов и др.; под общ. ред. Ю.М. Бубнова. Могилев: МГУП, 2014.

[2] Гісторыя Беларусі: У 6 т. Мінск, 2000–2011; Гісторыя Беларусі. У 2-х ч. / Пад рэд. Я.К. Новіка і Г.С. Марцуля. Мінск, 2007; Нарысы гісторыі Беларусі: У 2-х ч. Мінск, 1994–1995; Шымуковіч С.Ф. Гісторыя Беларусі: курс лекцый у 2-х ч. Мінск, 2005; Саракавік І.А. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі. Мінск, 2006; Міраноўіч Я. Найноўшая гісторыя Беларусі. СПб, 2003 і інш.

асвятлялі ў сваіх публікацыях асобныя передумовы фарміравання грамадзянскай супольнасці.

Асабліва варта адзначыць навуковыя выданні Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору і Інстытута гісторыі НАНБ[3]. У праватнасці, з тома "Беларусы. Вытокі і этнічнае развіццё" выкарыстаны звесткі пра грамадскае жыццё, развіццё этнічнай самасвядомасці і змены ў грамадскім побыце насельніцтва Беларусі ад старажытнасці да сучаснасці, а з кнігі "Беларусы. Грамадскія традыцыі" матэрыял пра стварэнне і дзейнасць грамадскіх аб'яднанняў і форм самакіравання: сялянскай абшчыны, дваранскага і гарадского самакіравання, цэхаў, земстваў, сельскагаспадарчых аб'яднанняў, праваслаўных брацтваў. Гістарыяграфічны аналіз даследаванняў па праблемах самакіравання ў беларуска-літоўскіх губерніях Расійскай імперыі прадстаўлены ў першай кнізе "Гісторыі беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст.", а дзейнасць палітычных партый на сучасным этапе развіцця Рэспублікі Беларусь прааналізавана ў другой частцы выдання [4].

Некаторыя вынікі даследаванняў гістарычных фактараў і передумоў фарміравання элементаў грамадзянскай супольнасці ва ўсходняй Беларусі былі прааналізаваны і апублікаваны[5] у зборніках міжнароднай навуковай канферэнцыі "Праблемы і перспектывы станаўлення грамадзянскай супольнасці" (20–21.05.2010, установа адукацыі "Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт харчавання")[6], міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Ад Магдэбургскага права да сучаснага самакіравання" (Магілёў, 27–29.01.2017)[7], рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі "Магдэбургскія

[3] Беларусы. Т. 6: Грамадскія традыцыі. Мінск, 2002; Беларусы. Т. 4 : Вытокі і этнічнае развіццё. Мінск, 2001; Нарыс гісторыі беларускай дзяржаўнасці: XX стагоддзе. Мінск, 2008; Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 1. Мінск, 2011.

[4] Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 1 Мінск, 2011. С. 17–21; Кн. 2. Мінск, 2012. С. 501–554.

[5] Пушкін І.А. Гістарычны нарыс аб фактарах і передумовах фарміравання элементаў грамадзянскай супольнасці ў Беларусі // Гражданское общество и государство (очерки теории и практики взаимодействия) / Е.М. Бабосов и др.; под общ. ред. Ю.М. Бубнова. Могилев: МГУП, 2014. С. 61–97.

[6] Матэрыялы секцыі "Гістарычныя передумовы грамадзянскай супольнасці"// Проблемы и перспективы становления гражданского общества : материалы Междунар. науч.-практич. конф. В 2 ч. Ч. 2. Могилев, 2010. С. 7–108.

[7] Ад Магдэбургскага права да сучаснага самакіравання: зборнік навуковых матэрыялаў / уклад., аўт. прадмовы І. А. Пушкін, А. Р. Агееў. Магілёў: МДУХ, 2017.

традыцыі на Магілёўшчыне” (Магілёў, 20.12.2015)[8], рэгіянальных навукова-практычных канферэнцыях: “Магдэбургскае права ў Крычаве: гісторыя і сучаснасць” (Крычаў, 2012) і “Магдэбургскае права на Магілёўшчыне: учора, сёння, заўтра” (Магілёў, 2012)[9].

Нягледзячы на значную колькасць існуючых выданняў пра станаўленне самакіравання на тэрыторыі сучаснай Беларусі ў асобныя перыялы яе гісторыі, абагульняючая праца адсутнічае. Апублікаваны і архіўны матэрыялы дазволіў нам асвятліць гістарычныя перадумовы і сучасныя тэндэнцыі фарміравання мясцовага самакіравання і грамадзянскай супольнасці ў кантэксце працэсаў нацыянальнага самавызначэння беларусаў і фарміравання беларускай дзяржаўнасці і грамадзянскай супольнасці ад сярэднявечча да пачатку XXI ст.

---

[8] Магдэбургскае права на Магілёўшчыне: зборнік навуковых матэрыялаў / уклад. І. А. Пушкін, А. Р. Агееў. Магілёў: МДУХ, 2015.

[9] Магдэбургскае права на Магілёўшчыне: учора, сёння, заўтра: зборнік матэрыялаў / Сацыяльна-культурная ўстанова “Рэгіянальнае бюро стратэгія развіцця і міра”; уклад., аўт. прадмовы І.А. Пушкін, А.Р. Агееў. Магілёў, 2012.

# 1. ШЛЯХІ ФАРМІРАВАННЯ МЯСЦОВАГА САМАКІРАВАННЯ І ЭЛЕМЕНТАЎ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ НА ЗЕМЛЯХ СЁНЯШНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў СТАРАЖЫТНАСЦІ, СЯРЭДНЯВЕЧЧЫ І НОВЫ ЧАС

## 1.1 Вытокі і гістарычныя перадумовы фарміравання мясцовага самакіравання і грамадзянскай супольнасці

Нягледзячы на тое, што на тэрыторыі сучаснай Беларусі традыцыі грамадзянскай супольнасці, мясцовага самакіравання дзейнічалі, пачынаючы з ранняга Сярэднявечча, варта пачаць агляд узгаданых элементаў грамадзянскай супольнасці і перадумоў іх фарміравання ў Беларусі са старажытнага часу.

Да моманту стварэння ВКЛ размова можа весціся аб існаванні толькі сацыяльных і грамадскіх аб’яднанняў. Першабытныя людзі на тэрыторыі Беларусі з’явіліся ў перыяд палеаліту, прыкладна 100–40 тыс. г. да н.э. Праз некаторы час пачалося чарговае наступленне ледавіка і першабытныя людзі адышлі ў больш спрыяльныя паўднёвыя раёны. Паўторнае засяленне Беларусі адбылося каля 30–25 тыс. г. да н.э., калі ледавік адступіў на поўнач (пачаўся перыяд позняга ці верхняга палеаліту). Асноўным заняткам людзей было паляванне на буйных жывёл – мамантаў, шарсцістых насарогаў, паўночных аленяў і пясцоў. Умовы выжывання вызначылі першую форму вытворчай кааперацыі людзей – лоўчую абшчыну. У познім палеаліце складваецца новы тып сацыяльнай арганізацыі людзей – родавая абшчына ці род, які аб’ядноўваў людзей аднаго паходжання, характарызаваўся агульнай (калектыўнай) маёмасцю, сумесным пражываннем, працай і спажываннем, падзелам працы паводле ўзросту і полу (першая форма падзелу працы), дзе існавала простая кааперацыя ў вытворчай сферы[10].

У эпоху мезаліта (9–5 тыс. г. да н.э.) на тэрыторыі Беларусі з’яўляецца сталае насельніцтва. Сучасныя беларускія землі ўвайшлі ў айкумену – тэрыторыю, пастаянна заселеную людзьмі. Змены прыродных умоў адбіліся на гаспадарчых занятках насельніцтва і вызвалі з’яўленне новых прылад працы. У неаліце (5–3 тыс. г. да

[10] Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 1. Старажытная Беларусь: Ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. Мінск, 2000. С. 21–135; Шымуковіч С.Ф. Гісторыя Беларусі: курс лекцый. Частка I. Мінск, 2005. С. 20–37; Гісторыя Беларусі. У 2-х ч. Ч. 1. Мінск, 2007. С. 17–33; Беларусы. Т. 4 : Вытокі і этнічнае развіццё. Мінск, 2001. С. 12–36; Нарысы гісторыі Беларусі: У 2-х ч. Ч. 1. Мінск, 1994. С. 9–91.

н.э.) насельніцтва стала весці аселы вобраз жыцця, замацаваўся родавы лад грамадства.

Са з'яўленнем індаеўрапейцаў (2 – пачатак 1 тыс. да н. э.) запанавала патрыярхальная ці бацькоўская родавая абшчына. Асноўныя пытанні жыцця роду ці племені вырашаліся на агульных сходах узброеных мужчын, такі лад кіраўніцтва зваўся "ваенная дэмакратыя". Паступова пачала складвацца і асабістая няроўнасць у родавым грамадстве.

Дзесьці ў IV–VII стст. нашага часу адбылася падзея, якая носіць назву "вялікае перасяленне народаў". Не пазбеглі гэтага і славяне, якія жылі ў Прыкарпацці і на тэрыторыі паміж Віслай і Одэрам. Адзін з напрамкаў іх рассялення закрануў тэрыторыю сучаснай Беларусі. Славяне з'явіліся тут у V–VI стст., а ў VIII–IX стст. масава рассяліліся і хутка занялі ўсе яе абшары. Мясцовае (аўтахтоннае) балцкае насельніцтва было асімілявана таму, што славяне былі на больш высокай ступені гаспадарчага развіцця у параўнанні з ім. Славяне прынеслі новую форму земляробства, якая садзейнічала ўзнікненню адасобленай гаспадаркі малой сям'і. Гэта прывяло да распаду абшчыны, звязанай кроўным сваяцтвам. Родавая абшчына паступова саступіла месца суседскай сельскай абшчыне, у аснове якой ляжалі тэрытарыяльныя і эканамічныя сувязі.

Першыя грамадскія арганізацыі на тэрыторыі нашай краіны з'яўляюцца ў этнічных славянскіх супольнасцях і ў першых старажытных беларускіх дзяржавах – Полацкім і Тураўскім княствах[11].

У выніку славяна-балцкага сінтэзу ў VIII–X ст. на тэрыторыі Беларусі утварыліся тры даволі ўстойлівыя этнічныя славянскія супольнасці (саюзы плямён) дрыгавічоў, крывічоў-палачан і радзімічаў. Паступова зацвярджалася новая форма грамадскай арганізацыі – сельская суседская абшчына, у аснове існавання якой ляжалі не кроўна-родасныя, а тэрытарыяльныя і эканамічныя сувязі паміж яе членамі. Некалькі побач жывучых сем'яў складалі сяло ці весь. Недалёка размешчаныя сёлы складалі абшчыну (мір, верв). Цэнтр такой абшчыны – самае вялікае з сёл, яно звалася пагост.

Адначасова са станаўленнем суседскай абшчыны развівалася паняцце аб прыватнай маёмасці, спачатку на прылады працы, а

[11] Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 1. С. 136–146, 215–224; Беларусы. Т. 4. С. 12–36; Шымуковіч С.Ф. Гісторыя Беларусі. Ч. I. С. 39–56; Гісторыя Беларусі. Ч. 1. С. 46–54; Нарысы гісторыі Беларусі. Ч. 1. С. 92–113.

потым на іншыя сродкі вытворчасці і на атрыманую прадукцыю. Самае галоўнае права ўласнасці – гэта ўласнасць на зямлю.

На працягу X–XIII стст. ўтварылася асноўная колькасць беларускіх старажытных гарадоў. Горад выконваў функцыі: адміністратыўную (ён быў цэнтрам княства ці воласці, там месцілася адміністрацыя); рамесную (у горадзе канцэнтраваліся вытворцы, больш таго, з'явіліся першыя аб'яднанні рамеснікаў – брацтвы); гандлёвую (менавіта ў гарадах знаходзіліся гандлёвыя рынкі – таргі); рэлігійна-культурную (саборы і цэрквы будаваліся ў гарадах, тут засноўвалі манастыры, а пры іх – скрыпторыі па перапісцы кніг і школы); абарончую (дзякуючы моцным абарончым збудаванням, у гарадах хавалася насельніцтва навакольных сёл у час небяспекі). Самым старажытным горадам Беларусі з'яўляецца Полацак – старажытная сталіца крывічоў. Ён упамінаецца ў Іпацьеўскім летапісе пад 862 год. Іншыя нашы гарады ўпершыню ўзгадваюцца: Віцебск – 974 г., Тураў – 980 г., Заслаўль – 988 г., Брэст – 1019 г., Браслаў – 1065 г., Мінск – 1067 г., Друцк – 1078 г., Барысаў – 1102 г., Гародня і Слуцк – 1116 г., Навагрудак – 1117 г.

Старажытныя беларускія гарады мелі ўсталяваўшуюся структуру. Галоўнай часткай горада з'яўляўся дзяцінец – умацаваны цэнтр горада, дзе знаходзілася рэзідэнцыя князя ці яго намесніка. Акрамя адміністратыўнага цэнтра – дзяцінца – існаваў і грамадскі цэнтр горада – торг ці рынак. Менавіта тут збіралася веча – агульны сход дарослых мужчын горада і акругі, што вырашаў важныя пытанні.

Першыя дзяржавы, што ўтварылася на тэрыторыі сучаснай Беларусі – гэта Полацкае і Тураўскае княствы. У іх значную ролю адыгрывала гарадское веча, якое кантралявала дзейнасць князя, запрашала ці выганяла кіраўніка дзяржавы, вырашала пытанні вайны і міру, ад яго імя заключаліся мірныя і гандлёвыя пагадненні, ажыццяўляўся вышэйшы суд (веча – апошняя апеляцыйная інстанцыя). Акрамя Полацка і Турава веча існавала і ва ўдзельных княствах Полацкай зямлі – Друцкім, Віцебскім, Менскім, Заслаўскім, Лагойскім.

Пасля знаходжання ў складзе Кіеўскай Русі і яе распада, беларускія землі апынуліся ў цэнтры стварэння новай дзяржавы.

## 1.2 Грамадска-дзяржаўнае кіраванне і самакіраванне эпохі ВКЛ і Рэчы Паспалітай на беларускіх землях

Да пачатку XIII ст. тэрыторыя сучаснай Беларусі была падзелена на шматлікія ўдзельныя княствы – часткі былога магутнага Полацкага і Тураўскага княстваў. У тыя ж часы пачаўся працэс стварэння дзяржавы, якая вядома нам з гісторыі пад назвай Вялікае Княства Літоўскае або беларуска-літоўская (славяна-балцкая) дзяржава[12]. Яна праіснавала як самастойная краіна да 1569 г., а затым разам з Каронай Польскай утварыла федэратыўную дзяржаву – Рэч Паспалітую Абодвух Народаў. У ВКЛ дзяржаўнай мовай з'яўлялася старабеларуская, асновай прававых нормаў – нормы старабеларускага права.

Перадумовы грамадзянскай супольнасці былі закладзены ў дзяржаўна-палітычным ладзе ВКЛ, які характарызаваўся існаваннем сістэмаў феадальнага і гарадскога самакіравання. Так, прывілей 1447 г. гарантаваў асабістую свабоду і недатыкальнасць усіх феадалаў. Прывілей 1492 г. замацаваў вялікую ролю Рады ВКЛ: вялікі князь мог разглядаць важнейшыя справы (абарона краіны, міжнародныя справы, выданне законаў, найважнейшыя судовыя справы) толькі разам з Радай, адмяняць гэтыя рашэнні князь не меў моцы; у выпадку адсутнасці князя на тэрыторыі княства Рада самастойна вырашала пытанні кіравання дзяржавай; былі акрэслены прынцыпы, па якім асобы прызначаліся на дзяржаўныя пасады і пазбаўляліся іх. З 1505 г. выключнае значэнне атрымала права liberum veto, якім валодалі феадалы пад час правядзення вышэйшага прадстаўнічага органа ўлады дзяржавы – сойма (сейма). Сойм – з'езд шляхты ВКЛ, на яго паседжаннях прымалі ўдзел выбранцы з шляхты кожнага павета і ваяводства. Ён мог збірацца па распараджэнню вялікага князя ці Рады. На сеймавых паседжаннях маглі прымаць удзел вялікі князь, Рада ўсім складам, усе службовыя асобы дзяржаўнага і мясцовага кіравання, каталіцкія і праваслаўныя (з 1596 г. – уніяцкія) епіскапы і настаяцелі манастыроў, а так сама

---

[12] Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 2: Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага. Мінск, 2008; Шымуковіч С.Ф. Гісторыя Беларусі. Ч. I. С. 58–125; Гісторыя Беларусі. Ч. 1. С. 75–166; Беларусы. Т. 6: Грамадскія традыцыі. Мінск, 2002. С. 10–149; Беларусы. Т. 4. С. 48–170; Нарысы гісторыі Беларусі. Ч. 1. С. 114–200; Дубовік А.А. Гістарычныя перадумовы станаўлення сацыяльнага партнерства як інстытута грамадзянскай супольнасці ў Беларусі // Проблемы и перспективы становления гражданского общества : материалы Междунар. науч.-практич. конф. Ч. 2. С. 46–50.

кожны шляхціц. Збіраліся сеймы па меры патрэбы, а з сярэдзіны XVI ст. – раз у два гады.

Вялікае Княства Літоўскае было федэратыўнай дзяржавай, розныя часткі яе мелі розную ступень падпарадкаванасці цэнтру. Так, Полацкае, Віцебскае і Мсціслаўскае ваяводствы мелі спецыяльныя граматы, дзе агаворваліся значныя правы на самакіраванне. У ваяводствах і паветах праводзіліся мясцовыя (ваяводскія ці павятовыя) сеймікі, што маглі вырашаць розныя пытанні з жыцця ваяводства ці павета. На сейміках прысутнічалі ўсе кіруючыя асобы і ўсе жадаючыя шляхціцы тэрытарыяльнай адзінкі. Галоўная роля сеймікаў – гэта выбар двух паслоў на агульнадзяржаўны (вальны) сейм і выпрацоўка для іх інструкцый і хадайніцтваў перад урадам. На сейміках слухалі справаздачы послоў аб сеймах, выбіралі судзей і прызначалі на пасады мясцовага кіравання.

У 1520-я гг. была праведзена сістэматызацыя і кадыфікацыя права ВКЛ, што мела вынікам выданне Статута ВКЛ. У якім уводзіўся прынцып публічнасці адпраўлення правасуддзя, роўнасці бакоў у працэсе, права абвінавачанага на адваката; ніхто не можа адказваць за злачынства, зробленае іншай асобай; пакаранне можа быць установлена толькі па суду.

Вяршыня развіцця права ў ВКЛ – гэта Статут 1588 г. Ён утрымліваў прынцыпы права, якія былі ўласцівы грамадству новага часу. Сярод гэтых прынцыпаў – абмежаванне ўлады гаспадара; раздзяленне ўлад; прыярытэт дзяржаўнага суверэнітэту; панаванне, вяршынства закону [13]. Статут 1588 г. быў надрукаваны, што зрабіла немагчымым унясенне змяненняў у яго тэкст. Нормы права былі так дакладна распрацаваны, што гэты збор законаў меў юрыдычную сілу на тэрыторыі Беларусі да пачатку XIX ст.

У сувязі з сацыяльна-эканамічным і культурна-асветным развіццём у XIV – XVIII стст. у Беларусі пашыралася Магдэбурскае права – права на самакіраванне гарадоў. Гэта было вынікам развіцця гарадской гаспадаркі і жаданнем вялікіх князей мець гарады ў саюзніках у супрацьстаянні з феадаламі княства. Кожны горад атрымліваў сваю грамату. Ступень свабод, што прадастаўляліся гарадам, была розная. Агульным было: мяшчане вызваляліся з-пад адміністратыўнай і судовай улады ваявод і стараст, замест феадальных павіннасцяў уводзіўся адзіны дзяржаўны грашовы падатак на горад. У горадзе ствараліся органы самакіравання і суды.

---

[13] Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэксты. Мінск, 1989. С. 376, 374, 417, 419.

На беларускія землі Магдэбургскае права прыйшло з Польшчы. Яго мелі больш 90 сучасных гарадоў і мястэчак Беларусі. Першым з сённяшніх беларускіх гарадоў Магдэбургскае права атрымала ў 1390 годзе Бярэсце (Брэст)[14]. За некалькі гадоў да гэтай падзеі, у 1387 годзе, Ягайла адпаведным прывілеем надаў Магдэбургскае права сталіцы ВКЛ – гораду Вільні. У XVI – першай палове XVII ст. яго мелі ўсе вялікія, сярэднія і бальшыня дробных беларускіх гарадоў: Гародня – 1391 і 1496 гг., Слуцк – 1441 г., Полацк – 1498 г., Менск – 1499 г., Браслаў – 1500 г., Наваградак – 1511 г., Слонім – 1531 г., Барысаў – 1563 г., Магілёў – 1577 г., Мазыр – 1577 г., Пінск – 1581 г., Нясвіж – 1586 г., Віцебск – 1597 г., Крычаў – 1633 г., Мсціслаў – 1634 г., Чавусы – 1634 г. і інш. Устанаўленне самакіравання, нягледзячы на яго абмежаванні, паляпшала ўмовы рамеснай і гандлёвай дзейнасці, аслабляла феадальную залежнасць гараджан, якія былі асабіста свабоднымі[15].

Дзейнічалі элементы самакіравання згодна прафесійных заняткаў. З другой паловы XVI ст. рамеснікі аб’ядноўваліся ў цэхі (брацтвы), купцы стваралі свае аб’яднанні (брацтвы ці гільдыі). Цэхі аб’ядноўвалі рамеснікаў аднаго веравызнання. Яны прымалі рамеснікаў адной ці некалькіх сумежных спецыяльнасцяў і абараняли іх ад канкурэнцыі з боку прышлых сельскіх і іншагародніх рамеснікаў. Падобнае тычыцца і аб’яднанняў (гільдыяў) купцоў. У буйных гарадах Беларусі колькасць цахоў хутка павялічвалася да некалькіх дзесяткаў. У Мінску на сярэдзіну 17 ст. было 9, у Слуцку – 17, у Магілеве – 21, у Брэсце – 14 цахоў.

З’явіліся праваслаўныя брацтвы – грамадскія аб’яднанні прыхажан (існавалі ў Вільні, Магілёве, Слуцке, Бярэсце, Полацку і інш.), якія ў асноўным займаліся адукацыяй. Дзейнічалі брацкія школы з шырокай праграмай, што ўключала вывучэнне замежных і

---

[14] Грыцкевіч А. Магдэбургскае права // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: ў 6 тамах Т. 5. Мінск, 1999. С. 5–6.

[15] Больш падрабязна традыцыі Магдэбургскага права асвятляюцца ў наступным раздзеле манаграфіі: **Магдэбургскае права: сутнасць самакіравання і яго рэгіянальныя асаблівасці,** а таксама ў публікацыях А. Агеева, І. Пушкіна, А. Доўнара, І. Соркінай, М. Шымукенуса, А. Коласава, А. Грудзіны, М. Карпечанкі, В. Юдзіна і іншых, якія размешчаны ў зборніках: Магдэбургскае права на Магілёўшчыне: учора, сёння, заўтра: зборнік матэрыялаў. Магілёў, 2012; Магдэбургскае права на Магілёўшчыне: зборнік навуковых матэрыялаў / уклад. І. А. Пушкін, А. Р. Агееў. Магілёў: МДУХ, 2015; Ад Магдэбургскага права да сучаснага самакіравання: зборнік навуковых матэрыялаў / уклад., аўт. прадмовы І. А. Пушкін, А. Р. Агееў. Магілёў: МДУХ, 2017.

класічных (лацінскай і грэчаскай) моў, гісторыю, рыторыку. Навучанне ў іх было галоўным чынам бясплатным.

Гістарычна склалася, што Беларусь знаходзіцца на памежжы дзвух хрысціянскіх канфесій – праваслаўя і каталіцтва, гэта адбілася на рэлігійнай гісторыі краіны, культуры і менталітэце народа. Абедзве рэлігіі ўраўнаважвалі адна адну. Важную ролю ў садзейнічанні фарміраванню грамадзянскай самасвядомасці таго часу адыгралі Рэфармацыя і ўніяцтва. Грэка-каталіцкая (уніяцкая) царква, якая была ўтворана ў 1596 г. праз падтрымку дзяржавы і культурна-асветніцкую дзейнасць паступова пашыралася сярод сельскага насельніцтва і гараджан, дробнай шляхты. Да пачатку XVIII ст. уніяцтва стала самай масавай рэлігіяй у княстве, дапамагло захаваць нацыянальныя адметнасці беларускага народа.

У 1569 г. была заключана Люблінская ўнія, яе вынікам было стварэнне Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў[16]. Назву можна патлумачыць як – рэспубліка, агульная справа. Маецца на ўвазе тое, што ў краіне шляхта выбірала караля. Выбары праходзілі ў межах Рады (паны-рада), пазней, з XVI ст. на агульнадзяржаўным сейме.

Прынятыя ў новай дзяржаве, “Генрыкавы артыкулы” і “Pacta conventa” ўтрымлівалі палажэнні, якія значна абмяжоўвалі ўладу караля і павялічвалі паўнамоцтвы шляхты: кароль не меў права прэтэндаваць на перадачу ўлады па спадчыне; гарантавалася свабода хрысціянскага веравызнання; кароль не меў права прымаць рашэнні без абмеркавання з 16 сенатарамі; кожныя два гады павінен збірацца сейм, без згоды якога нельга ўводзіць новыя налогі і сазываць паспалітае рушэнне; без згоды сената нельга весці міжнародныя справы, прызначаць на вышэйшыя дзяржаўныя пасады і здымаць розных асоб. Калі кароль і вялікі князь не выконваў умоў “артыкулаў”, шляхта мела права на стварэнне канфедэрацыі (Слуцкая канфедэрацыя праваслаўнай шляхты, Торуньская канфедэрацыя пратэстанцкай шляхты, Барская канфедэрацыя – супраць праваслаўя і Расіі) і ўзброенае выступленне супраць каралеўскай улады.

Сведчаннем фарміравання элементаў грамадзянскай супольнасці з’яўляюцца імкненні да захавання вольнасцей шляхам гарадскіх паўстанняў (1606–1610 гг. у Магілёве, 1615 г. у Мазыры і інш.).

[16] Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 3. Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII–XVIII стст. ). Мінск, 2004; Шымуковіч С.Ф. Гісторыя Беларусі. Ч. І. С. 125–187; Гісторыя Беларусі. Ч. 1. С. 169–260; Беларусы. Т. 6. С. 10–149; Беларусы. Т. 4. С. 197–213; Нарысы гісторыі Беларусі. Ч. 1. С. 140–266.

Яны былі накіраваны супраць дзеянняў мясцовых улад, якія парушалі правы гараджан і не адпавядалі іх інтарэсам. Пад час вайны 1654–1667 гг. паміж Рэччу Паспалітай і Маскоўскай дзяржаваю магілёўскі шляхціц К. Паклонскі стварае беларускі (менавіта пад такой назвай) полк. Пачалося паказачванне беларускага сялянства. Адметную ролю ў гісторыі Беларусі адыграла вызваленчае паўстанне 1661 г. супраць маскоўскага гарнізона ў Магілёве, па яго прыкладу адбыліся паўстанні ў Дзісне, Себежы, Гомелі.

У выніку Маскоўскай агрэсіі, падзеяў вайны (1654–1667) і акупацыйнай палітыкі рускіх гаспадарка Беларусі ляжала ў руінах, поўнасцю было вынішчана адукаванае беларускае мяшчанства, менавіта з гэтага часу беларуская культура і мова канчаткова перайшлі ў разрад другараднай, “сялянскай”, яны не здолелі канкураваць з “панскай” польскай культурай. Разам з культурай і мовай была страчана нацыянальная ідэя беларусаў і ВКЛ – як пераважна беларускай дзяржавы.

Вялікі ўплыў атрымалі магнацкія групоўкі і каталіцкая царква. Пасля вайны з Расіяй апошнія праваслаўныя шляхціцы перайшлі ў каталіцтва. У 1668, 1674 і 1677 гг. прынятымі пастановамі значна абмяжоўваліся правы праваслаўных, ім забаранялася займаць дзяржаўныя пасады, пакідаць межы дзяржавы, праводзіць набажэнствы. У 1676 г. праваслаўныя брацтвы былі пазбаўлены права зносін з канстантынопальскім патрыярхам, у 1699 г. забаранялі праваслаўным займаць пасады ў магістратах.

Пасля Паўночнай вайны (1700–1721) у Рэчы Паспалітай нарастаў палітычны крызіс, які ў канцы стагоддзя XVIII ст. прывёў да ліквідацыі дзяржавы. Беларускі народ страціў рэшту сваёй дзяржаўнай самастойнасці.

### 1.3 Магдэбургскае права: сутнасць самакіравання і яго рэгіянальныя асаблівасці

На землях Магілёўшчыны вельмі часта Магдэбургскае права надавалася за гераізм і адданасць краіне. На вялікі жаль сучасныя жыхары Беларусі, асабліва гарадоў, не ўсведамляюць цалкам вялікае значэнне гэтай падзеі. А менавіта з гэтага трэба пачынаць гісторыю любога горада.

Можна рознымі прычынамі патлумачыць імкненне людзей перасяліцца на сталае жыццё ў горад. Але нават сярод гараджан,

асабліва тых хто жыве на ўскрайку, пануе выраз “Паедзем у горад”. Менавіта ў горад, а не ў цэнтр. Чаму? На нашу думку асноўнай прычынай, якая вабіць асобу, – адчуванне сябе вольным чалавекам. Пад горадам разумеецца месца, дзе гістарычна склаліся гарадскія традыцыі, якія заснаваны на пэўных адносінах паміж уладаю і насельніцтвам, паміж жыхарамі і г.д. Гэта ёсць узаемаадносіны вольных асоб, якія з’явіліся яшчэ ў сярэднявеччы на землях Еўропы (тэрыторыя сённяшняй Беларусі ў тыя часы была неад’емнай яе часткай). Яны былі настолькі ўдалымі і жыватворнымі, што наступствы іх адчуваюцца да нашых дзён у падсвядомасці насельніцтва. Трэба адзначыць, што іх падмацавалі традыцыі існавання ў гарадах веча і “савецкай калгаснай сістэмы”, калі людзі ратаваліся ў гарадах ад катаржнай працы ў “калектыўнай савецкай гаспадарцы”.

У сярэднявеччы, якое характарызуецца існаваннем двух асноўных груп насельніцтва – феадалаў (свабодныя людзі, уладальнікі) і прыгонных (не свабодныя, прыроўненыя да рэчаў), з’яўляецца яшчэ адна катэгорыя вольных – гараджане, жыхары гарадоў, якія атрымалі Магдэбургскае права.

У 805 годзе Карл Вялікі заснаваў горад Магдэбург. Феадальнае гарадское права гэтага нямецкага горада атрымала назву Магдэбургскае права. Яно было юрыдычным замацаваннем поспехаў гараджан у барацьбе з феадаламі за самастойнасць (волю). Магдэбургскае права надавала гораду права на самакіраванне і ўласны суд, права зямельнай уласнасці і вызваленне ад значнай часткі феадальных павіннасцяў. Шмат гарадоў усходняй Германіі, Усходняй Прусіі, Сілезіі, Чэхіі, Венгрыі, Польшчы, Беларусі, Літвы, Галіччыны перанялі Магдэбургскае права, дзе яго часам называлі нямецкім правам.

Магдэбургскае права склалася з розных крыніц, у тым ліку з прывілеяў, выдадзеных архіепіскапам Віхманам гарадскому патрыцыяту (1188), Саксонскага зярцала, пастаноў суда шэфенаў Магдэбурга і інш. Гарадское права мела ўніверсальны характар, г. зн. трактавала розныя віды праваадносін: дзейнасць гарадской улады, суда, яго кампетэнцыю і парадак судаводства, пытанні зямельнай уласнасці “ў межах горада”, парушэнні ўладання, захопу нерухомасці, устанаўлівала пакаранні за розныя віды злачынстваў і г.д. Асобае месца займалі нормы, што рэгулявалі гандаль і рамесніцтва, дзейнасць цэхаў і купецкіх гільдый, парадак падаткаабкладання.

Магдэбургскае права з'явілася юрыдычным замацаваннем поспехаў гараджан у барацьбе з феадаламі за самастойнасць.

На тэрыторыі сучаснай Беларусі ў XIV–XVI стагоддзях адбываецца значны рост гарадоў і гарадскога насельніцтва. Найбольш буйнымі гарадамі ў гэты час з'яўляліся Полацк, Магілёў, Віцебск, Мінск, Брэст, Гародня, Слуцк, Наваградак. Каля 40 % усіх гарадоў былі прыватнаўласніцкімі. Гарады, што належалі феадалам, былі адміністрацыйнымі, гаспадарчымі і культурнымі цэнтрамі іх зямель. Жыхары гэтых гарадоў неслі феадальныя павіннасці на карысць свайго гаспадара. З ростам гарадоў гараджане імкнуліся пазбавіцца ад феадальнай залежнасці і атрымаць свабоду, а з ёй і права на самакіраванне.

Феадальная залежнасць перашкаджала развіваць гарадскія промыслы і гандаль. Таму з канца XIV ст. кіраўнікі дзяржавы (Вялікі князь, кароль) сталі дараваць гарадам права на самакіраванне, названае магдэбургскім на прыкладзе таго права, якім валодаў г. Магдэбург. Паводле Магдэбургскага права, насельніцтва вызвалялася ад выканання адработачных (паншчынных) павіннасцей на карысць феадала. Яны замяняліся адзіным грашовым падаткам.

Згодна падлікаў даследчыка А. Цітова[17] на этнічных землях Беларусі было звыш 120 вольных магдэбургскіх местаў, а ў сучасных звужаных межах нашай краіны іх было звыш 90. Па дадзеных Беларускай савецкай энцыклапедыі на 1.01.1985 г. у БССР налічвалася 98 гарадоў. З іх ніводны не ўзнік як населены пункт за часы панавання Расійскай імперыі з 70-х гадоў XVIII ст. і СССР (да 1991 г.). За гэты ж час страцілі статус і правы гарадоў: Лагішын, Ружаны, Шарашова, Бешанковічы, Друя, Капысь, Сураж, Ула, Ушачы, Астрына, Любча, Поразава, Радунь, Бялынічы, Бобр, Мядзел і іншыя. Яны сёння называюцца тэрмінам і маюць статус, народжаны ў нетрах камуністычнага бюракратызму, "гарадскі пасёлак". У нас ёсць былыя вольныя магдэбургскія месты, якія ў лепшым выпадку, аграгарадкі і (ці) цэнтры калгасаў (СПК): Воўпа, Гарадная, Пераброддзе, старажытны гістарычны цэнтр Крэва, а такія былыя гарады, як Геранёны, Гарадок (Кобрынскага р-на), Жыровіцы, Ліпнішкі, Малеч, Міхалова, Прывалка, Радунь і іншыя пераўтварыліся ў звычайныя вёскі.

---

[17] Цітоў А. Геральдыка Беларусі. Мінск, 2007; Цітоў А. Сімвалы незалежнасці // Геральдыка беларускіх местаў. Мінск, 1998; Цітоў А. Вольныя беларускія месты (самакіраванне ў нашых гарадох XIV–XVIII стст.). Мінск, 1996.

Наданне магдэбургскіх правоў абумоўлівала якасна новае становішча паселішча ў сацыяльнай іерархіі, адрознівала і вылучала яго з навакольных населеных пунктаў. Адпаведна са Статутамі Вялікага княства Літоўскага, і ў прыватнасці з апошнім (1588), кожны мешчанін магдэбургскага места мог на роўных прыцягнуць да адказнасці прадстаўнікоў шляхецкага саслоўя. Гэта пераканаўчае сведчанне асобага статусу жыхароў магдэбургскіх паселішчаў. Ён не распаўсюджваўся на іншых мяшчан – жыхароў немайдэборскіх гарадоў і мястэчак. З гэтага артыкулу Статута вынікае, што юрыдычны статус мяшчан у нас вырашаўся альбо наяўнасцю, альбо адсутнасцю майдэборыі, а не памерам горада ці колькасцю жыхароў у ім. Правільным будзе падзел населеных пунктаў Беларусі на Магдэбургскія і не магдэбургскія гарады і мястэчкі.

Пераважна прывілеі або граматы на Магдэбургскае права давалі кіраўнікі дзяржавы, у прыватнаўласніцкіх гарадах – непасрэдна ўладальнікі або па іх просьбе Вялікія князі. У прыватнаўласніцкіх гарадах Беларусі, у якіх не дзейнічала Магдэбургскае права, феадалы часта выкарыстоўвалі яго асобныя нормы у мэтах больш дасканалага кіраўніцтва.

Нормы Магдэбургскага права былі замацаваны ў Статутах ВКЛ. Трэба адзначыць, што з увядзеннем Магдэбургскага права ў судах адмянялася дзейнасць мясцовага права, але не адмаўлялася правамернасць карыстання мясцовымі звычаямі, калі вырашэнне справы не прадугледжвалася Магдэбургскім правам. У судовай практыцы магістратаў гарадоў Беларусі разам з Магдэбургскім выкарыстоўваліся нормы агульнадзяржаўнага права – Статутаў ВКЛ, судовых статутаў сталіцы – Вільні і ўласнай юрыдычнай практыкі.

З атрыманнем прывілея на самакіраванне само места станавілася аўтаномнай юрыдычнай адзінкай у дзяржаве. Мяшчане кіраваліся ў сваім жыцці асобнымі законамі і валодалі ўласным комплексам правоў, які адрозніваўся ад правоў іншых жыхароў краіны. Акрамя гэтага горад, як цэнтр гандлёвай і прамысловай дзейнасці, вылучаў сваіх насельнікаў ад іншых саслоўяў не толькі правамі, але і якасцю і сферай працы.

Паводле грамат на Магдэбургскае права, мяшчане вызваляліся ад шэрагу феадальных павіннасцяў, якія раней неслі разам з сялянамі дадзенай зямлі ці воласці, ад суда і ўлады ваявод, старостаў і іншых дзяржаўных службовых асоб. У прыватнаўладальніцкіх

гарадах Магдэбургскае права не вызваляла гараджан ад залежнасці і ўлады феадалаў, аднак залежнасць не мела рысаў прыгонніцтва. Грамата давала гораду права на уласны герб. Перасяленне у горад давала права на асабістую свабоду[18].

Праваадачыненні мяшчан паміж сабой, з іншымі пластамі насельніцтва і дзяржавай рэгуляваліся мясцовым звычаёвым правам, граматамі на Магдэбургскае права і праўнымі нормамі, змешчанымі ў іншых граматах, сеймавых уставах і статутах, а таксама ў статутах цэхаў і брацтваў.

Па сваіму зместу прывілей складаўся з асноўных частак і гарантаваў дзейнасць органаў самакіравання ў наступных сферах:

1. Стварэнне, функцыянаванне, размеркаванне паўнамоцтваў органаў улады, наданне ім юрыдычных правоў і атрыбутаў самакіравання.

2. Гандлёвыя ільготы жыхарам прывілеяваных месцаў.

3. Развіццё рамеснай вытворчасці.

Згодна з прывілеем на магдэбургскае права ў горадзе ствараўся выбарны орган самакіравання – магістрат (рада), незалежны ад ваявод і старастаў.

Гарадское кіраванне ўзначальваў войт, прызначаны Вялікім князем. Разам з ім дзейнічала гарадская рада, што складалася з месцічаў – радцаў (райцаў). Дзейнасць рады ў фінансавай сферы кантралявалася выбарным органам з 12 месцічаў – мужоў паспалітых, або прысяглых. Існаваў уласны судовы орган па крымінальных справах – лава, куды ўваходзілі лаўнікі пад старшынствам войта. Штодзённымі справамі займаліся бурмістры, якія па сканчэнні паўнамоцтваў рабілі справаздачу перад радай, а пазней – на агульным сходзе месцічаў. Бурмістарскі суд, куды ўваходзілі бурмістры з радцамі, развязваў цывільныя справы. Гарадская рада і лава разам складалі магістрат. Месцам яго знаходжання ў гарадах былі спецыяльна пабудаваныя для гэтай мэты будынкі – Ратушы. Што ў перакладзе з нямецкай азначае “дом сходаў”. Упершыню яны з’явіліся ў Заходняй Еўропе ў XII ст. і з часам набывалі больш манументальныя формы.

Знешне прывілей на Магдэбургскае права ўяўляў сабой аркуш пергаменту памерам ад 20–70 см у вышыню і ад 30 да 100 см у шырыню, па якім пазёмна пісаўся тэкст, дзе агаворваліся дараваныя

---

[18] Грыцкевіч А. Магдэбургскае права // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: ў 6 тамах Т. 5. Мінск, 1999. С. 5–6.

месту ільготы, правы і абавязкі. Часта аркуш па краях аздабляўся раслінным арнаментам, у цэнтры яго падаваўся малюнак герба. З пачатку XVIII ст. знадворны выгляд прывілея мяняецца, і ён набывае форму сшытка з дзвюх, чатырох ці шасці старонак.

Пачынаўся прывілей з імя і тытула таго правіцеля, які надаваў яго, і канчаўся датай надання, подпісам караля-вялікага князя і пісара канцылярыі і замацоўваўся, часцей, сярэдняй пячаткай Вялікага Княства Літоўскага з выявай герба Пагоня.

Чырвонавасковая пячатка была, як правіла, прывестай і памяшчалася ў металёвай бляшанцы (з жалеза, медзі, бронзы, срэбра). Вечка і дол бляшанкі ўпрыгожваліся арнаментам адпаведна з густамі і мастацкімі стылямі эпохі.

Пячатка прымацоўвалася да прывілею на шаўковых матузках альбо стужках, чырвонага, белага, блакітнага, радзей іншага колеру.

Тэкст распачынаўся з ініцыяла – маляўнічай, па мастацкі напісанай літары, аздобленай альбо гербам места, альбо асабістым гербам даўцы прывілея альбо канцлера ці пісара ВКЛ.

Прывілеі былі двух відаў: першапачатковы (фундацыйны) і канфірмацыйны (пацвярджальны). Апошні гарады атрымлівалі пры прыходзе на прастол новага Караля і Вялікага князя.

Прывілей выдаваўся гарадскім уладам і захоўваўся ў адпаведных службовых асобаў. Такі ж самы тэкст заносіўся ў кнігі дзяржаўнага архіва, які называўся Метрыка Вялікага Княства Літоўскага. Акрамя таго, адпаведна з тагачасным заканадаўствам, кожны дакумент набываў юрыдычную моц і “права вечнасці”, калі ён на працягу паўгоддзя або году быў унесены ў актавыя кнігі земскага суда адпаведнага павету. Такая трайная фіксацыя дакумента забяспечвала найбольш аптымальныя магчымасці для яго захавання ад вогнішчаў войны, зламыснікаў і іншых надзвычайных здарэнняў. У пэўнай ступені тую ж мэту мелі і што″разавыя канфірмацыі пасля змены першай асобы ў дзяржаве.

За некалькі стагоддзяў карыстання правамі самакіравання ў некаторых беларускіх месцах (Гародня, Віцебск і іншыя) назапасілася столькі прывілеяў, што яны складалі цэлыя кнігі. У сярэднім кожны горад у Беларусі меў ад пяці да трынаццаці асноўных і канфірмацыйных прывілеяў. Беларускі даследчык А.А. Мяцельскі ў сваёй кнізе “Старадаўні Крычаў” (Мінск, 2003) дае дакладны змест двух прывілеяў Крычаву ў перакладзе з польскай на беларускую мову.

Увогуле, прывілеяў, звязаных з правамі на самакіраванне для нашых гарадоў, мусіць было звыш тысячы. Калі меркаваць, што частка іх загінула ў войнах і вогнішчах XVI–XVIII стст., дык можна было б спадзявацца на тое, што хаця б палова іх ацалела.

Яны ашчадна захоўваліся ў скрынях архіваў пры магістратах (ці як найбольшая каштоўнасць, што забяспечвала правы і свабоды мяшчан – у царкве ці касцёле, не толькі пад аховай замкоў, але і, на тагачасны менталітэт, пад аховай Найвышэйшых Сілаў). Нягледзячы на гэтыя перасцярогі, сёння на тэрыторыі нашай краіны ёсць толькі два арыгіналы прывілеяў – гэта Мазыра (1680) і Прывалак (1792). Першы захоўваецца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў Мінску, другі – у Гісторыка-археалагічным музеі ў Гродне.

Прывілей на герб Навагародку (1595), канфірмацыйныя прывілеі Менска і некаторых іншых беларускіх месцаў захоўваюцца ў Гісторыка-этнаграфічным музеі ў Вільні. Прывілеі Бярэсця (1495), Ружанаў (1637), Кобрына (1662), Гародні (1718, 1744), Поразава, Камянца, Радашковічаў і Браслава, а таксама шэрагу месцаў, што зараз знаходзяцца ў Польшчы – Бельска, Новага Двара, Васількова, Клешчалёў і іншых захоўваюцца ў Аддзеле рукапісаў Бібліятэкі Акадэміі Навук Літвы.

У аналагічным сховішчы Пецярбургскага Аддзялення інстытута гісторыі АН Расіі захоўваюцца прывілеі Гародні (1496, 1531, 1540,1541, 1561, 1576), Ліды (1590), Магілёва (1577, 1588, 1589, 1633, 1649, 1661, 1676, 1679), Мсціслава (1676), Полацка (1697), Дзісны (1736), Оршы (1623), Вяліжа (1698 – апошні зараз на тэрыторыі Расіі), прывілей на беларускай мове, які быў дадзены ў 1463 годзе месту Коўне (суч. Каўнас) і г.д. Гэты спіс далёка няпоўны, увогуле ў архівах Пецярбурга і Масквы знаходзіцца найзначнейшая частка прывілеяў беларускім вольным местам.

Добра паказвае прычыны месцазнаходжання арыгіналаў прывілеяў (грамат) А. Цітоў[19]. Ён сцвярджае, і з гэтым немагчыма не пагадзіцца, што паходжанне гэтых збораў у Расіі даволі банальнае – вынік грабяжу мясцовых архіваў. Падчас далучэння да Расійскай імперыі, каб прыцягнуць на свой бок жыхароў вольных магдэбургскіх месцаў, царскі ўрад даваў у сваіх маніфестах дэмагагічныя абяцанкі аб захаванні мяшчанам “их свобод и привилегий данных

[19] Цітоў А. Вольныя беларускія месты (самакіраванне ў нашых гарадох XIV–XVIII стст.). Мінск, 1996.

прежними королями”. Або, як было падкрэслена ў “Плакаце” ад 10.08.1772 г. на далучэнне Усходняй Беларусі: “Всемилостивейшая государыня изволит подтверждать при совершенной и ничем не ограниченной свободе... через торжественное обнадежение... Жительствуюшие в присоединенных к империи Российской городах и землях, будут оставлены и сохранены при всех тех свободах, коими они ныне пользуются...”. Спачатку так і было, але не праходзіла пяці – сямі гадоў, як пачыналася падгонка ўсіх пад агульнарасійскі ранжыр і заканадаўства.

Расія, як тыранія “ўсходняга тыпу”, не цярпела на сваёй тэрыторыі нейкія аўтаномныя стварэнні у выглядзе вольных гарадоў. Таму іхнія правы былі скасаваны, і мяшчане некаторых з іх былі нават аб’яўлены прыгоннымі сялянамі, напрыклад, Угор’е, Бешанковічы, Талачын, Бялынічы. Жыхары апошняга распачалі судовы працэс, сталі хадайнічаць перад Сенатам. Справа цягнулася з 1803 да 1832 гг. Два прывілеі (першасны – 1634 г. і канфірмацыйны – 1703 г.) былі прадстаўлены ў Магілёўскі павятовы суд, а затым у Сенат. У ім гэтыя дакументы былі прызнаны “недействительными”. Дзеючым асобам – істцам, як “возмечтавшим о мнимой вольности” было паказана іх “мейсца” – усе яны былі залічаны ў прыгонныя. Двух найбольш актыўных шукальнікаў праўды секлі кнутамі і саслалі ў Сібір. Калі такі ж лёс напаткаў іншае вольнае магдэбургскае места – Угор’е (зараз блізка адтуль знаходзіцца Браслаўскае лясніцтва), – мяшчане, адпаліўшы свае дамы і ўсю мескую маёмасць, разбегліся хто куды. Горад знік, засталіся толькі сведчанні яго існавання на старажытных геаграфічных картах, у дакументах і яго герб. Крычаўцы 18 год спрабавалі праз суд адстойваць свае правы на самакіраванне, але таксама безпаспяхова. На гэтых прыкладах добра відаць стаўленне Расіі да еўрапейскіх дэмакратычных традыцыяў і прынцыпаў самакіравання.

У іншых выпадках калі гараджане згадвалі аб старажытных прывілеях і правах на вольнасць, з Пецярбургскага Сенату прыходзіла патрабаванне “выслать оныя привилегии для ознакомления” (трэба разумець дзеля пэўнай экспертызы аўтэнтычнасці). Наіўныя і законапаслухмяныя выконвалі загад “цэнтра”. Таксама некаторыя беларускія гарады страцілі свае дакументы, а значыць і частку гістарычнай памяці і самасвядомасці, праз “предписание” міністра ўнутраных спраў Расіі ад 14.11.1836 г. за № 5419. У ім, у прыватнасці, было падкрэслена, каб у архівах на местах была зроблена

рэвізія для пошуку старых дакументаў “и если в оных будут найдены какия древния свитки, грамоты или рукописи...” перадаваць іх на захаванне і вывучэнне ў Пецярбург. Расійскія архівы дагэтуль надзейна хаваюць чужую гісторыю. Беларусам навязвалі ўяўленні пра іх вясковасць, сярмяжнасць і лапцюжнасць, замоўчваючы іх традыцыі еўрапейскага гарадскога самакіравання.

Пачатак самакіравання ў гарадах і мястэчках Магілёўшчыны быў характэрны для Еўропы. Як у іншых гарадах Беларусі самі жыхары ініцыявалі працэс надання свайму месту Магдэбургскага права. Яны разам са старастамі звярталіся праз Паноў–Раду да каралёў Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў. Апошнія ў сваіх прывілеях на Магдэбургскае права спачатку падкрэслівалі клопат дзяржавы аб неабходнасці павялічэння дабрабыту жыхароў, а затым адзначалі вернасць жыхароў сваёй Айчыне пад час абароны свайго места ад маскоўскіх агрэсараў. Менавіта гэтыя прычыны найперш прымушалі ўладара краіны рабіць месцічаў вольнымі і ўводзіць гарадское самакіраванне.

Атрымаўшы Магдэбургскае права, гарады ператвараліся ў самастойныя адміністратыўныя адзінкі. Уся ўлада пераходзіла да органаў гарадскога самакіравання.

Згодна прывілея, у горадзе ліквідаваліся ўсе юрыдыкі (як свецкіх, так і духоўных феадалаў). Аднак усё ж Магдэбургскае права не распаўсюджвалася на ўсю тэрыторыю горада. Існавала асобная юрыдыка – замкавая. Дзяржава пакідала пад сваёй уладай пэўную частку насельніцтва, якое займалася ў першую чаргу абслугоўваннем некаторых функцый горада як ваеннага цэнтра. Напрыклад, пушкароў і некаторых іншых рамеснікаў. Захоўваліся і шляхецкія юрыдыкі.

Каралеўскія прывілеі напачатку ўводзілі інстытут магдэбургскага войтаўства. Кароль прызначаў на пасаду войта, прычым пажыццёва. Войт старшыняваў на пасяджэннях магістрата, асабліва ў час судовых сесій, і кантраляваў дзейнасць гарадскіх улад. Ён прымаў прысягу перад жыхарамі горада аб належным выкананні сваіх абавязкаў.

Калі войт не меў магчымасці прысутнічаць на пасяджэнні магістрата, ён прызначаў замест сябе лентвойта – “асобу шляхецкага ці мяшчанскага стану”. Лентвойт таксама павінен быў прынесці прысягу. Звычайна лентвойта ў гарадах Беларусі выбіралі гараджане, узгадняючы яго кандыдатуру з войтам. Войт мог сумяшчаць

пасаду старосты і знаходзіцца на іншай “дзяржаўнай” службе. Тады ён быў постаццю намінальнай, а яго функцыі выконваў намеснік – лентвойт, які пастаянна пражываў у магдэбургскіх гарадах. Належнасць як першага, так і другога да шляхетнага стану не была абавязковай умовай, але ў прывілеях падкрэслена, каб войт быў “чоловек побожный и уместный”.

Існавала наступная арганізацыя працы гарадскіх улад, найперш суда, па дзвюх схемах: супольныя пасяджэнні войта, бурмістраў, радцаў, лаўнікаў і асобныя пасяджэнні войта з лаўнікамі і бурмістраў з радцамі. Незалежна ад рашэння гараджан найбольш важныя пытанні павінны былі вырашацца на агульных пасяджэннях войта “разам з бурмістрамі, гарадской радай па апісанні магдэбургскага права”.

Пасля абрання на пасаду ўсе асобы: бурмістр, войт, райцы і лаўнікі, пісар у прысутнасці войта і ўсяго зграмаджэння мяшчан прыносілі ў Ратушы прысягу. Пасля гэтай урачыстай працэдуры яны лічыліся дапушчанымі да выканання сваіх абавязкаў. Пасля таго, як адбываліся ўсе гэтыя цырымоніі, “урад мескі” пачынаў паўнавартасна функцыянаваць.

У сферу кампетэнцыі войта і магістрата, уваходзілі акрамя бягучых спраў і “справы галоўныя”, бунты, забойствы, чарадзействы, непаслушэнствы і інш., якія яны мусілі судзіць па законах Магдэбургскага права. Адным з галоўнейшых абавязкаў органаў гарадскога самакіравання быў нагляд за тым, каб землі горада не пераходзілі ў іншыя рукі.

Функцыі бурмістраўскага суда – “о речи и справы поточные” (што разумелася як бягучыя і цывільныя). З прывілеяў на вольнасці нашым гарадам можна даведацца аб тых крытэрыях, якія прад’яўляліся да кандыдатаў на заняцце той альбо іншай пасады. Першае патрабаванне было на “вряд обирати людей годных, набожных, смысльных”. Другое “на вряд бурмистровский” абіраць чалавека “побожного в праве майдеборском умелого в том же месте оселого”.

Суды павінны былі адбывацца ў дакладна вызначаныя дні. Выключэнне рабілася для крымінальных спраў, злачынстваў, раскрытых па “гарачым учынку”, і спраў, якія датычыліся прыезджых людзей. Пасяджэнні суда праходзілі толькі ў прысутнасці ўсяго гарадскога ўраду і пад кантролем некалькіх іншых выбарных прадстаўнікоў гараджан.

Апеляцыі на рашэнні гарадскіх судоў – ці агульнага (супольнага) суда, ці войтаўскага і радзецкага – павінны пастурапаць у суд караля і вялікага князя. З даходу ад судовых выплат (віны) войту ішла адна трэць, а "гарадской радзе" – дзве трэці.

Пісар мусіў быць чалавекам высокаадукаваным, які ведаў беларускую мову і пісьмо, польскую, лацінскую. Ён прысутнічаў на пасяджэннях магістрата, запісваў і ўносіў у гарадскія магістрацкія кнігі (актавыя, паточныя, дэкрэтовыя і інш.) справы. Пісар выдаваў выпісы з выракаў рашэнняў, копіі іншых дакументаў, якія падпісваў разам з войтам ці бурмістрам. У некаторых выпадках меў на сваім захаванні адзін з трох "ключоў ад скрыні, дзе захоўвалася меская пячатка".

"Полецаі" назіралі за парадкам у горадзе і былі адказныя за выкананне правілаў гандлю; спаўнялі функцыі санэпідстанцыі – аглядалі ўсе харчовыя прадукты, якія прывозіліся ў горад; збіралі падатак на карысць горада і замка; сачылі за выкананнем правілаў пажарнай бяспекі; разбіралі бытавыя сваркі паміж жыхарамі; каралі за дробязныя ўчынкі. У іх функцыі ўваходзіла сачыць, каб пляцы ў горадзе не пуставалі, а былі заселены мяшчанамі.

Шафары – асобы, асноўнай функцыяй якіх была праверка правільнасці выдаткаў і прыбыткаў горада. Гэтая "кантрольна-рэвізійная група" фарміравалася наступным чынам: палова іх абіралася непасрэдна магістратам, другая тым жа магістратам з васьмі – дванаццаці кандыдатаў, якія былі вылучаны гараджанамі.

Фармальна членам гарадскога магістрата мог стаць любы месціч, на самой справе выбіралі найбольш заможных. Чаму? Таму, што тагачасныя гараджане разважалі наступным чынам: "Як можа добра кіраваць грамадскімі справамі чалавек, які нават сам сябе забяспечыць не можа".

Разам з Магдэбургскім правам месцам надаваліся ўласная пячатка і герб. Яны былі сведчаннем юрыдычнай правадзейнасці і сімвалам гарадскога самакіравання. Абодва паняцця "герб" і "пячатка" выступалі як узаемазамяняльныя, што сведчыць пра тое, што яны разумеліся сучаснікамі як тоесныя. Атрыманне герба, які сведчыў аб непадлегласці горада княжацкім і каралеўскім ураднікам, была вельмі важнай падзеяй у жыцці гарадоў і мястэчак Магілёўшчыны.

Як праходзіў працэс выбару эмблемы для герба невядома. Магчыма, тут адыгрывала ролю як ініцыятыва жыхароў горада, так

і асабістыя густы і меркаванні ўладароў. Паводле А. Цітова, гербы, якія рэпрэзентавалі беларускія гарады падзяляюцца на дзве вялікія групы: функцыянальныя і штучныя.

Функцыянальныя гербы адлюстроўваюць якую-небудзь адметную рысу геаграфічнага становішча, яго ролю ў абароне краіны, гандлі, гаспадарцы. Напрыклад, большасць гарадоў, якія маюць на сваіх гербах як галоўны або дадатковы элемент выяву зброі, стаяць уздоўж граніц і вельмі добра акрэсліваюць гістарычную тэрыторыю Беларусі. Гэта: Бярэсце, Пінск, Крычаў, Мсціслаў, Віцебск, Веліж, Невель. Да гэтай жа групы гербаў абарончай сімволікі трэба аднесці і гербы, на якіх знайшлі адлюстраванне архітэктурныя матывы выявы веж, муроў, брам. Гэта гербы Суража, Магілёва, Камянца, герб на вайтаўскай пячатцы Бярэсця і інш.

Другая група – штучныя гербы, больш умоўная, чым першая. Эмблемы гэтых гербаў не звязаны непасрэдна з той ці іншай асаблівасцю горада. Яны маюць выяву якога-небудзь святога, як правіла, заступніка горада, рэлігійную сімволіку, герб ці частку герба гаспадара горада або якую-небудзь іншую выяву. Пры вывучэнні гербаў, асабліва трэба памятаць той факт, што яны часта маюць пад сабой нейкую, не расшыфраваную намі, рэальную глебу і змест, якія з цягам часу былі забыты нашчадкамі, і ўжо цяпер праз прызму іх светаўспрымання да нас дайшлі толькі вонкавыя формы.

Перыяд росквіту інстытута гарадскога герба на тэрыторыі Беларусі абмяжоўваецца апошнімі дзесяцігоддзямі XVI і першай паловай XVII стст., прычым характэрнай рысай з’яўляецца імкненне да адлюстравання адметных рысаў і асаблівасцяў кожнага горада. Гэта час існавання паўнавартаснага, з пункту гледжання юрыдычнага і геральдычнага гарадскога герба.

Гарадскія пячаткі праз форму шчыта і стыль выканання выяваў паказваюць паступовую змену мастацкіх стыляў – рэнесансу, барока, ракако, класіцызму. Прычым пячаткі шэрагу гарадоў Беларусі не саступаюць лепшым узорам тагачаснага еўрапейскага мастацтва. Варта адзначыць, што не ўсе гарадскія пячаткі маюць аднолькавую мастацкую каштоўнасць. Побач з пячаткамі, якія выразаны вельмі дакладна, на высокім мастацкім узроўні, знаходзім пячаткі, зробленыя схематычна і нават прымітыўна. Якасць выканання залежала не толькі ад прафесійнага ўзроўню і таленту рамесніка, але і ад фінансавых мажлівасцяў заказчыка.

Пячатка, зробленая з металу (сталі, бронзы, срэбра), знаходзілася ва ўжытку вельмі працяглы час. Надпісы на пячатках рабіліся на беларускай, беларуска-польскай, лацінскай і польскай мовах. Пячаткі яскрава ілюструюць мастацкі ўзровень старажытных злотнікаў. У гэтых формах дробнай пластыкі да нас дайшлі эстэтычныя густы і крытэрыі прыгажосці мінулых часоў, а самым галоўным з’яўляецца тое, што на іх прадстаўлены аўтэнтычныя гарадскія гербы – сімвалы самакіравання і незалежнасці.

Вярхоўная ўлада краіны імкнулася стварыць пазітыўныя эканамічныя ўмовы для горада і яго жыхароў. Асноўным цэнтрам грамадскага і эканамічнага жыцця магдэбургскіх гарадоў і мястэчак была рынкавая плошча з яткамі і крамамі, якія размяшчаліся вакол ратушы. Менавіта тут знаходзіліся сэрца і мозг вольнага горада. Тут вырашалася каго варта прымаць у мяшчанскае саслоўе.

Акрамя памяшканняў дзе праходзілі пасяджэнні магістрата, вельмі часта ў Ратушы на дольных паверхах размяшчалася “крамніца”, дзе гандлявалі рамеснымі вырабамі, хлебныя “яткі”, дзе захоўваліся хлебныя запасы, “камора пастрыгальня” для стрыжкі сукна, “бочка мерная” для сыпучых прадуктаў, “медніца медная” для вадкіх і васкабойня, або “капніца” для таплення воску. Воск быў адным з найбольш распаўсюджаных прадуктаў, які ішоў на экспарт у замежжа. Гарантам яго якасці выступаў увесь горад. Таму для гарадской пячаткі была знойдзена крыху нязвыклая для нас форма выкарыстання – меская пячатка выступала, акрамя выканання чыста юрыдычных функцый, як своеасаблівы “знак якасці”. Так, на стоплены ў “камень” воск, калі ён быў найвышэйшага гатунку, ставілася дзве пячаткі, першага – адна, а ніжэйшыя гатункі ўвогуле не маркіраваліся. Аналагічную ролю адыгрываў і гарадскі герб, які ўпрыгожваў не толькі пячатку. Наяўнасць яго на вырабе мела тыя ж функцыі.

Кожны тыдзень на рынак прыязджалі купцы з розных гарадоў і мястэчак. Пры праездзе праз горад іншагароднія плацілі пошліну. Для гандлю будаваліся і выкарыстоўваліся яткі і “клеткі” (для мяса). Яны былі ва ўласнасці места, з іх яно атрымлівала арэндную плату ад гандляроў. Дзеля зручнасці знаходжання ў горадзе прыезджых купцоў (гасцей) будаваліся “гасцінныя дамы”. Асобай мерай, якая мусіла спрыяць гандлю, было назначэнне кірмашоў і таргоў. Пры гэтым тавары, што прывозіліся на кірмашы часта вызваляліся ад усялякага мыта.

Вельмі істотным аспектам надання Магдэбургскага права была пратэкцыя развіццю не толькі гандлю, але і рамёстваў у вольных гарадах. У выніку ўзнікалі рамесныя цэхі для стварэння спрыяльных умоў для развіцця і ўздыму той альбо іншае галіны вытворчасці.

Словам "цэх" пачалі карыстацца ў XVI ст. для абазначэння рамесніцкіх аб'яднанняў. Першапачаткова больш распаўсюджанай назвай было "брацтва" На працягу XVI–XVII стст. адбываецца паступовая змена апошняй на першую.

У час гарадскіх урачыстасцяў або варожага нападу на горад рамеснікам належала выступаць асобнай групай, якой адводзіліся строга акрэсленыя функцыі ў цырыманіяле і ў абароне горада. Кожны цэх выступаў пад сваей асабістай харугвай. Пры наданні яму статута агаворвалася, у якой царкве, касцёле ці нават каля якога алтара рамеснікам адбываць набажэнства. Таму з аднаго боку харугвы змяшчаліся выявы патронаў – святых заступнікаў цэха, з другога – давалася выява герба, калі такі быў абумоўлены статутам ці прывілеяй, або эмблема, якая адлюстроўвала асноўныя віды прадукцыі ці спецыфічныя, характэрныя толькі для гэтага цэха інструменты і прылады. У іншых выпадках на месцы царкоўных патронаў апыналіся патроны рамяства. Пад час гарадскіх святаў члены цэха ўдзельнічалі ў працэсіі са сваім музыкай, у найлепшым адзенні і са зброяй.

Вярхоўная ўлада, улічваючы аб'ектыўную эканамічную і палітычную сітуацыю, імкнулася (разумеючы, што ад дабрабыту народа залежыць і ўласны дабрабыт) даваць эканамічныя ільготы на пэўны акрэслены перыяд. Так, калі горад пацярпеў у выніку пажару, варожага нападу ці з іншых прычынаў, яго вызвалялі ад платы падаткаў у агульнадзяржаўную скарбніцу на тэрмін ад трох да дзесяці гадоў. Так, у 1649 г. Крычаў і яго валасць вельмі моцна пацярпелі ад казацкай навалы, таму яго вызвалілі ад выплаты падаткаў. У 1652 г. за мужнасць Крычаў зноў вызвалены ад падаткаў і пастою жаўнераў на 6 год і г.д. Прыкладна тое ж рабіў і сам горад, каб прыцягнуць больш жыхароў у якасці новых граммадзянаў. Новапасяленцы вызваляліся таксама ад платы падаткаў у магістрацкую скарбонку на пэўны тэрмін.

Гараджанам гарантавалася эканамічная дзейнасць і ўласнасць. Безумоўна, былі ў іх і пэўныя абавязкі. Мусілі плацілі падаткі.

Частка падаткаў ішла ў гарадскі бюджэт. Прычым усе падаткі збіралі самі мяшчане.

Дзяржаве прыходзілася несці вялікія выдаткі на будаўніцтва і ўтрыманне замкаў нават у мірныя часы. У ваенны час фартыфікацыі маглі знішчацца ўшчэнт. Таму ўладам прыходзілася шукаць дадатковыя сродкі. Так, на патрэбы замку часцяком ішла частка прыбыткаў мясцовых васкабойні і гасціннага двара. Акрамя таго, жыхары давалі пэўныя сродкі. Цяжка сказаць, ці выконвалі простыя жыхары свае абавязкі з вялікай ахвотай. Магілёў і Крычаў, як і іншыя месты, мелі ваенную арганізацыю насельніцтва, якое аб’ядналася ў дзесяткі і сотні. У сотню залічвалі ўсіх дарослых мужчын. Гэта павышала ваеннае значэнне горада і мабілізавала мясцовых жыхароў.

Арганізацыю работ па аднаўленню замка можна рэканструяваць на прыкладзе Магілёва. Там праца па рамонту гарадскога валу здзяйснялася наступным чынам. Магістрат мабілізоўваў “слуг месскіх”, сотнікаў, дзесятнікаў і “паспалітых”. Яны распараджаліся грашыма, якія горад ахвяраваў на рэстаўрацыю. У іх кампетэнцыі знаходзіліся пытанні закупу будаўнічых матэрыялаў, падрыхтоўкі інструментаў, арганізацыі рабочай сілы і спецыялістаў у ваенна-інжынернай справе. Асноўны цяжар працы палягаў на сотні. Ім выдавалася “картка”, у якой загадзя апісваліся тэрміны, характар і аб’ём работ. Гэта дапамагала пазбегнуць простояў, рэгламентавала і дысцыплінавала ўвесь працэс будаўніцтва. Магістрат таксама наймаў за плату дадатковых рабочых, якія выконвалі самую розную працу – наразалі і клалі дзёрн, заточвалі калы і г. д. Кіравалі імі дзесятнікі. Рытм працы стымулявалі музыкі. На кожным надзеле меўся свой “добыш” (барабаншчык), які “бубніў”, ствараючы лёгкую для працы атмасферу.

Пераход гарадскіх умацаванняў пад апеку магістратаў у значнай ступені адбіўся і на архітэктуры гарадскіх замкаў. Павялічыліся памеры фартыфікацый, бо мяшчане клапаціліся пра сваё месца. Так, напрыклад, 1664 г. кароль Ян Казімір, аглядаючы ўмацаванні Крычаўскага замку, застаўся задаволены іх станам.

Разгледзім асаблівасці Магдэбургскага права ў Крычаве, які ўпершыню згадваецца ў пісьмовых крыніцах 1136 г. Усю сваю гісторыю Крычаў адыгрываў дастаткова значную ролю ў палітычным, эканамічным, а найперш, ваенным жыцці рэгіёна. З’яўляючыся цэнтрам абароны ўсёй акругі, Крычаў доўгія стагоддзі

надзейна абараняў межы радзімы. З XVII ст. Крычаў – цэнтр Крычаўскага староства ў складзе Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў. Жыццё тут было адносна спакойным да 1614 г., калі горад быў спалены маскоўскім войскам, а староства разрабавана. У 1632 г. рускія ажно некалькі разоў спрабавалі захапіць Крычаў, але ўдалося ім гэта толькі ў 1633 г. Ваявода Іван Тарбееў, казацкія атаманы Іван Балаш, Сямён Пірог, Яраславец Малы ды іншыя захапілі пасад, а на кароткі тэрмін нават і замак. У выніку амаль усё крычаўскае насельніцтва (2000 чал.) было вывезена ў Маскоўскую дзяржаву, а горад спалены. За гераізм і адданасць радзіме Крычаву было нададзена Магдэбургскае права.

Гісторыю Крычава – магдэбургскага падрабязна даследаваў вучоны, археолаг А. Мяцельскі. Сярод іншага мы скарыстаемся вынікамі яго даследаванняў[20].

Пачатак Крычаўскага самакіравання быў характэрны для Еўропы. Як у іншых гарадах Беларусі самі жыхары места Крычаўскага ініцыявалі працэс надання свайму гораду Магдэбургскага права. Яны разам са старастам звярнуліся праз Паноў–Раду да караля Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў – Уладзіслава Вазы з просьбай аб наданні Крычаву Магдэбургскага права. 23.08.1633 г. кароль Уладзіслаў Ваза спецыяльным прывілеем “права Магдэбургскае… месту нашаму Крычаўскаму надаў”.

Кароль у прывілеі спачатку падкрэсліў клопат дзяржавы аб неабходнасці павялічэння дабрабыту жыхароў, а затым адзначыў вернасць крычаўцаў сваёй Айчыне пад час абароны Крычава ад маскоўскіх агрэсараў. Менавіта гэтыя прычыны прымусілі ўладара краіны зрабіць насельніцтва Крычава вольнымі і ўвесці гарадское самакіраванне.

Атрымаўшы Магдэбургскае права, Крычаў ператварыўся ў самастойную адміністратыўную адзінку. Уся ўлада перайшла да органаў гарадскога самакіравання.

Згодна прывілея, у горадзе ліквідаваліся ўсе юрыдыкі (як свецкіх, так і духоўных феадалаў). Аднак усё ж Магдэбургскае права не распаўсюджвалася на ўсю тэрыторыю Крычава. Існавалі асобныя юрыдыкі – замкавая і шляхецкія. У Крычаве ў 1679 г. з 375

[20] Мяцельскі А.А.Старадаўні Крычаў: Гіст.-археалагічны нарыс горада ад старажытных часоў да канца XVIII ст. Мінск, 2003; Мяцельскі А.А. Крычаў – горад з правам магдэбургскім // Памяць: Гіст.-дакум. Хроніка Крычаўскага раёна. Маладзечна, 2004. С. 59–64.

гарадскіх гаспадарак магдэбургскім правам карысталіся – 131, шляхецкімі былі 58 гаспадарак, замкавую юрыдыку складалі 186 гаспадарак. Нерухомая маёмасць шляхты, касцёла і царквы (землі, дамы, крамы і інш.) не падпадала пад юрысдыкцыю горада.

Прывілей 1633 г. уводзіў у Крычаве інстытут магдэбургскага войтаўства. Кароль прызначаў на пасаду войта, прычым пажыццёва. Войт старшыняваў на пасяджэннях магістрата, асабліва ў час судовых сесій, і кантраляваў дзейнасць гарадскіх улад. Ён прымаў прысягу перад жыхарамі горада аб належным выкананні сваіх абавязкаў.

Улічыўшы, што крычаўскі стараста Крыштаф Весялоўскі добраахвотна склаў з сябе паўнамоцтвы "і абывацеляў места Крычава пад вольнасць і права магдэбургскае выпусціў", кароль Уладзіслаў Ваза гэтым жа прывілеем 1633 г. надаў яму першае крычаўскае магдэбургскае войтаўства. Напачатку кароль нават абяцаў пасля смерці Весялоўскага разгледзіць справу аб выбарах войта гараджанамі, але гэтага не адбылося. Абавязкі войта Крычава выконвалі прызначаныя ўрадам дзяржаўцы крычаўскага староства, а пры Радзівілу арандатары.

У адсутнасць войта яго функцыі выконваў намеснік – лентвойт, які пастаянна пражываў у Крычаве. У Крычава была свая асаблівасць – лентвойт прызначаўся войтам.

Прывілей прадугледжваў наяўнасць у Крычаве двух бурмістраў, двух радцаў і шэсць лаўнікаў "як з рэлігіі рымскай (каталіцкай), так і грэчаскай (праваслаўнай)". Яны выбіраліся крычаўцамі з 24 вылучаных кандыдатаў. Дата выбараў у Крычаве прыходзілася на Новы год па грыгарыянскаму календары, якім мы карыстаемся і сёння. Кожны склад магістрата кіраваў горадам 3 гады. Штогод магістрат даваў справаздачу. І калі мяшчане былі не задаволены працай якога-небудзь яго прадстаўніка, дык мелі права адазваць яго, пазбавіць даверу. Так, напрыклад, у 1753 г. быў зняты з пасады райца Міхаіл Губа.

Пасля абрання на пасаду ўсе асобы бурмістр, войт, райцы і лаўнікі у прысутнасці войта і ўсяго зграмаджэння мяшчан прыносілі ў Ратушы прысягу. Пасля гэтай урачыстай працэдуры яны лічыліся дапушчанымі да выканання сваіх абавязкаў. У прывілеі Крычаву падкрэслена, што "пісар" таксама мае "быць абраны выбаршчыкамі і прыняць прысягу". Пасля таго, як адбываліся ўсе гэтыя цырымоніі,

магістрат пачынаў паўнавартасна функцыянаваць. У Крычаве суды павінны былі адбывацца ў панядзелак і суботу.

Уладзіслаў Ваза надаў Крычаву “герб, альбо пячаць: крыж і меч каля яго” (у чырвоным полі выява залатога крыжа і сярэбранага мяча), які быў намаляваны ў арыгінале прывілея. Выява мяча безумоўна адлюстроўвае ролю Крычава ў абароне краіны.

Цікавымі з’яўляюцца два варыянты адбіткаў пячатак Крычаўскага магістрата – ад 1669 і 1752 гг., дзе замест надпісу лацінскім шрыфтам прадстаўлена яго імітацыя. Гэта вельмі добра сведчыць аб мясцовым паходжанні майстроў разьбяроў пячатак.

Асноўным цэнтрам грамадскага і эканамічнага жыцця вольнага Крычава была рынкавая плошча з яткамі і крамамі вакол ратушы. Згодна даследчыцы І. Слюньковай[21], плошча размяшчалася насупраць замка. У цэнтры яе ўзвышалася Ратуша. Крычаўская ратуша ўяўляла з сябе спачатку драўляны, а затым мураваны будынак з вежавай кампазіцыяй. Менавіта тут знаходзіліся сэрца і мозг вольнага горада. Тут вырашалася каго варта прымаць у мяшчанскае саслоўе. “Кожны новы мешчанін Крычава, прымаючы аселасць і гарадскія правы, перш за ўсё павінен на Ратушы прынесці прысягу і адпаведна сваёй магчымасці ўнесці ўклад у гарадскі скарб”. Так, напрыклад, Марцін Круглік у якасці ўступнага ўзносу ўнёс у гарадскую скарбонку 20 талераў. Толькі пасля гэтага ён мог атрымаць вольнасці права магдэбургскага.

На Крычаўскі рынак прыязджалі купцы з Вільні, Віцебска, Магілёва і іншых местаў. Пры праездзе праз горад іншагароднія плацілі пошліну. Яткі і “клеткі” (для мяса) былі ва ўласнасці Крычава, з іх ён атрымліваў арэндную плату ад гандляроў. З горада вывозіліся воск, футры, некаторыя рамесныя вырабы. Атрымліваў ён сукно, соль і інш.

Дзеля зручнасці знаходжання ў месцы прыезджых купцоў (гасцей) крычаўцы мусілі, паводле прывілея ад 1634 г., “збудаваці два гасціныя дамы, адзін за астрогам, а другі над ракою Сожам”. Паводле прывілея Крычаву дазвалялася мець: “Дзве ярмаркі, адну на Св.Троіцу, а другую на Св. Міколу свята рымскага (6 снежня)”.

Крычаўцы маглі ездзіць па краіне і гандляваць ва ўсіх валасцях. У той жа час прывілей катэгарычна прадпісваў прыезджым купцам спыняцца толькі ў гарадскім гасцінным двары і

[21] Слюнькова И.Н. Архитектура городов Верхнего Приднепровья XVII – середины XIX в. Минск, 1992. С. 54.

гандляваць толькі оптам і толькі з купцамі і мяшчанамі Крычава. У прывілеі ад 24.02.1634 г. Крычаву падкрэслівалася, што прыезджыя купцы мусяць не па валасцях тавар купляць, а толькі на таргу ў горадзе. Гэтае палажэнне не тычылася кірмашоў. Падчас таргоў за яго выкананнем сачылі вельмі пільна, бо тут быў вялікі эканамічны інтарэс. Дазвалялася яўрэям гандляваць у Крычаве. Тыя, якія мелі "свае аселасці ў месцы Крычаўскім", павінны былі выконваць усе гарадскія павіннасці.

Прывілей на самакіраванне вызваляў крычаўцаў ад большасці павіннасцей, паслуг і падаткаў на карысць крычаўскага старасты і замка. Але старасту ішла плата за карыстанне гарадской зямлёй. Аднак жа землі, на якіх крычаўцы здаўна пасвілі сваю жывёлу, былі ў бясплатным карыстанні. Акрамя таго, мяшчане мусілі плаціць старасце за арэнду "напояў: гарэлкі, мёду, піва, віна". Пры гэтым падкрэслівалася, што шляхта і духавенства, якія жылі ў горадзе і ў прадмесцях, не мелі права гандляваць у сваіх дамах алкагольнымі напоямі.

Падаткі ў Крычаве прымаліся ў перыяд ад свята Св. Міхала (29 верасня) да свята Св. Марціна (13 красавіка). Дзяржава і гарадскі скарб клапаціліся аб тым, каб мяшчане маглі спакойна выплаціць усе падаткі, і таму адводзілі для гэтага даволі доўгі тэрмін.

Улічваючы важнае стратэгічнае і абарончае значэнне Крычава, за гараджанамі заставаўся абавязак рамантаваць замак. Але за гэта яны атрымлівалі права пад час ваеннай небяспекі ратавацца ў "клецях замкавых". Прывілеем асабліва падкрэслівалася, што крычаўцы вызваляюцца ад выдзялення падвод на дзяржаўныя патрэбы і патрэбы старасты. У выпадку дзяржаўнай неабходнасці мяшчане абавязаны былі ўсё ж такі даваць падводы, але толькі па спецыяльным лісце-распараджэнні манарха і за плату.

Як толькі прыпыняліся войны наступаў мірны час і, дзякуючы Магдэбургскаму праву, Крычаў квітнеў, павялічвалася яго тэрыторыя. Горад інтэнсіўна займаў тэрыторыю паміж Забялышчынскім ярам і далінай Крычаўкі. Колькасць мяшчан паступова расла. Пра гэта сведчаць інвентары, якіх захавалася дастаткова многа. У 1694 г. у Крычаве налічвалася 8 цэркваў, сінагога і, хутчэй за ўсё, касцёл. З 1682 г. дакладна вядома пра існаванне тут прыходскіх школ. Шматлікія пісьмовыя крыніцы, а таксама археалагічныя знаходкі, даюць падставы меркаваць пра значнае развіццё рамёстваў: металаапрацоўкі, ганчарства, гарбарства, кушнерства і г.д. Знойдзена вялікая

колькасць цацак, вырабаў са шкла і керамікі, упрыгожванняў, зброі, люлькаў.

Крычаўцы добра ведалі значэнне вольнасці і ўсяляк абаранялі яе. Так было пад час войнаў XVII–XVIII стст., аб гэтым сведчыць паўстанне пад кіраўніцтвам В. Вашчылы. Адзначыліся крычаўцы удалай абаронай горада ад сялянска-казацкіх войскаў у 1648 і 1651 гг. 30.07.1654 г. пачалася гераічная абарона горада ад маскоўскіх войскаў, якая назаўсёды пакрыла славай яго мужных жыхароў. Ваяводы Шарамецеў і Шчарбатаў узялі Крычаў у аблогу, але вынікаў гэта ніякіх не давала. Не дапамагла нават дапамога прысланая з-пад Дуброўны. Маскоўскія войскі, значную частку якіх складалі татары, не маглі захапіць горад, які "…стоит на осыпи высокай, и ров глубок и въезд и выезд один, а пищалей затинных и винтовочных в городе много". Мала таго, абаронцы пастаянна здзяйснялі ўдалыя начныя вылазкі. І Смаленск, і Орша, і Мсціслаў, і Горы, і Магілёў, і Дуброўна ўжо даўно былі захоплены, а Крычаў упарта не скараўся ворагам. І толькі пасля таго, як у канцы верасня сярод абаронцаў пачаўся голад, яны склалі зброю. Тым больш, што дапамогі чакаць было неадкуль. Аддаючы належнае героям, маскоўскі цар Аляксей Міхайлавіч выдаў спецыяльныя даравальныя граматы, у якіх гарантаваў захаванне маёмасці, правоў і прывілеяў крычаўскім шляхцічам і мяшчанам. Аднак гэта не вельмі дапамагло, бо казацкі палкоўнік Залатарэнка ў траўні 1655 г. ўсё ж спаліў замак з усёй маёмасцю. У 1658 г. мяшчане паднялі паўстанне і знішчылі маскоўскі акупацыйны гарнізон. Пасля гэтага ў 1659 г. горад зноў захоплены, а ў замку размясціўся чарговы атрад акупантаў. У 1660 г. мяшчане яшчэ раз вызвалілі Крычаў, але ўсяго на некалькі месяцаў, – у лістападзе яго занялі аддзелы запарожскага казацкага палкоўніка Раслаўчанкі. Аднак ужо ў сакавіку 1661 горад зноў здабыў свабоду.

Пасля гвалтоўнага падзелу Рэчы Паспалітай і захопу беларускіх земляў Расійская імператрыца Кацярына II на пачатку 1776 г. падаравала Крычаўшчыну свайму фаварыту – вядомаму графу Рыгору Пацёмкіну. Ён адмяніў Магдэбургскае права і пазбавіў горад самакіравання, а мяшчан зрабіў прыгоннымі. Аднак крычаўцы не скарыліся і 18 гадоў вялі судовыя цяжбы супраць Пацёмкіна. На жаль перамогі дасягнуць не ўдалося.

Разгледзім як развіваўся Магілёў у часы Магдэбургскага права. На працягу XVI–XVIII стст. у Магілёве пражывала каля 10–

17 тыс. чалавек. Горад быў буйным гандлёвым і рамесным цэнтрам. У канцы XVI–пач. XVII стст. налічвалася рамеснікаў больш за 80 розных спецыяльнасцей, каля 400 крам. Большасць рамеснікаў аб’ядноўвалася ў цэхі, а купцы ў гільдыі. Магілёўскія купцы падтрымлівалі сувязь больш чым з 60 гарадамі розных краін. У Магілёве сфарміраваліся свае архітэктурныя і мастацкія традыцыі, горад стаў адным з цэнтраў кнігадрукавання ў Беларусі. У Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў на тэрыторыі Беларусі існавала адзіная праваслаўная епархія з цэнтрам у Магілёве. Усё гэта дзякуючы сістэме Магдэбургскага самакіравання[22].

20.01.1561 г. Магілёву, паводле ўстаўнай граматы караля Польшчы і Вялікага князя літоўскага Сігізмунда II Аўгуста, было дадзена права на абмежаванае самакіраванне – войтаўства, згодна з якім гараджане вызваляліся ад нясення аднолькавых з сялянамі воласці павіннасцей, але заставаліся залежнымі ад замкавай адміністрацыі. Неаднаразова гараджане звярталіся да вялікага князя са скаргамі на старостаў і іншых службовых асоб і з просьбамі аб дазволе гораду неабмежаванага самакіравання. 28.01.1577 г. кароль Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў Стэфан Баторый выдаў Магілёву прывілей на Магдэбургскае права[23]. Магілёў атрымаў герб і дазвол на пабудову ратушы, якая была зруйнавана ў 1957 г. і адноўлена ў 2008 г.[24]

Быў створаны выбарчы орган самакіравання – магістрат (рада), які ведаў адміністрацыйнымі, гаспадарчымі, фінансавымі, паліцэйскімі і судовымі справамі горада, быў распарадчым, выканаўчым і судовым органам. Магістрату падпарадкоўваліся ўсе жыхары гора-

---

[22]Записки игумена Ореста // Археографический сборник документов, относящийся к истории Северо-Западной Руси. Вильна, 1867. Т. 2; Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской. Витебск, 1877. Вып. 8; Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской. Витебск, 1878. Вып. 9; Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской. Витебск, 1879. Вып. 10; Магілёўская хроніка Трафіма Сурты і Юрыя Трубніцкага // Беларускія летапісы і хронікі. Мінск, 1997. С. 281–390; Марзалюк І.А. Магілёў у XII–XVIII стст. Людзі і рэчы. Магілёў–Мінск, 1998; Мелешко В.И. Могилев в XVI – середине XVII вв. Минск, 1988; Опыт описания Могилевской Губернии. Могилев, 1882. Т. 1; Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Магілёва. Мінск, 1998; Пушкін І.А. Гістарычная і культурная спадчына горада Магілёва: Курс лекцый. Магілёў, 2006.

[23] Прывилей г. Магилеву на Майдеборскае права (1577 г.) // Магдебургское право в Могилёве: 427 лет. Могилев, 2004. С. 63–66.

[24] Агееў А.Р., Трусаў А.А. Магілёўская ратуша. Гістарычны лёс і адраджэнне. 2-е выд. папр. і дап. Магілёў, 2010.

да, за выключэннем тых, хто жыў у юрыдыках (адміністрацыйна адасобленыя часткі горада, што былі пад уладай феадала, царквы або манастыра і на якія не пашыралася адміністрацыйная ўлада магістрата). Першапачаткова Магілёўскім магістратам кіравалі прызначаныя каралём з мясцовых магнатаў войт і 2 выбарныя з гараджан бурмістры. З ліку гараджан выбіраліся 2 радцы (дарадчыкі) і 4 лаўнікі (прысяжныя засядацелі). Магістрат складаўся з рады, што ажыццяўляла функцыі гарадской улады і суда па маёмасных і грамадзянскіх справах, займалася зборам падаткаў, кантралявала гандаль, дзейнасць рамесных цэхаў, і лавы, якая была судовым органам па крымінальных справах. Да 1654 г. пасада Магілёўскага войта была пажыццёвай. Ён атрымліваў 1/3 гарадскіх даходаў ад штрафаў, у гарадскіх уладаннях яму адводзіліся вызваленыя ад падаткаў 2 валокі (каля 43 га) зямлі, дом, сядзібны ўчастак з агародам, сенакос. Да 1636 г. Магілёўскі магістрат выбіраўся на 2 гады. Выбары праходзілі на агульным сходзе гараджан, дзе адначасова выбіраліся два поўныя склады рады, кожны з якіх пасля прынясення прысягі войту кіраваў горадам на працягу года.

Перадача паўнамоцтваў аднаго складу рады іншаму адбывалася ва ўрачыстых абставінах на агульным сходзе ўсіх членаў магістрата. Службовыя асобы, што здавалі паўнамоцтвы, рабілі справаздачу аб фінансавай дзейнасці. Рада, якая прымала справы, называлася “рочнай”. Для вырашэння найбольш важных пытанняў “рочная” і старая рады аб’ядноўваліся. Члены былога складу магістрата прыцягваліся да выканання абавязкаў службовых асоб “рочнай” рады, што адсутнічалі. У магістрат, як правіла, выбіраліся найбольш уплывовыя гараджане (прадстаўнікі гарадскога купецтва, цэхмістры, заможныя майстры). Некаторыя з іх займалі гэтыя пасады на працягу некалькіх гадоў. Замацаванне вышэйшых пасад за вузкім колам асоб калі-нікалі прыводзіла да злоўжыванняў з боку вярхоў магістрата. У 1580 г. пры магістраце быў створаны кантрольна-дарадчы орган з 12 “паспалітых”, якія выбіраліся з ліку гараджан ратушнай юрысдыкцыі і сачылі за правільнасцю выкарыстання бюджэту горада.

У 1588 г. пад уплывам гарадской абшчыны паўнамоцтвы “паспалітых” былі пашыраны, яны атрымалі права дарадчага голасу на выбарах службовых асоб абодвух складаў магістрата, на іх ускладаліся абавязкі “справовать и заведовать” усімі гарадскімі даходамі, весці строгі ўлік фінансавых спраў у сваіх спецыяльных

ведамасцях і інш. Былі ўведзены пасады 4 "шафаров" (скарбнікаў) – 2 ад рады і 2 ад "паспалітых". Без удзелу апошніх магістрат не меў права прымаць рашэнні па фінансавых пытаннях. У 1589 г. гараджане дабіліся права выбіраць лентвойта (намеснік войта, спачатку прызначаўся войтам і ў яго адсутнасць меў законную ўладу ў горадзе) і заключылі пагадненне аб адмове войта ад свайго суда (у якасці кампенсацыі магістрат абавязаўся пажыццёва выплачваць яму 130 коп літоўскіх грошай, за войтам захавалася права адмены рашэння магістрацкага суда, а каб змяніць рашэнне войта, можна было апеляваць толькі да вярхоўнай улады).

Унутрыпалітычнае жыццё Магілёва ў канцы XVI – 1-й палове XVII ст. напоўнена вострай барацьбой гараджан супраць магістрату, уладаў. За што горад праславіўся як "краіна бунтаў". Увайшлі ў гісторыю Беларусі гарадскія паўстанні ў Магілёве ў 1606–10, 1636, 1638 гг.

У другой палове XVII–XVIII стст. адбыліся змены ў структуры гарадской рады, выбарчай сістэме і ў прынцыпах кіравання горадам. Войт, як і ўся рада, выбіраўся штогод з ліку службовых асоб, што ўваходзілі ў склад пяці змен магістрата (бурмістраў, радцаў і лаўнікаў). Пасада лентвойта была ліквідавана. Палавіна членаў магістрата ў абавязковым парадку павінна была быць каталіцкага веравызнання. У гарадскім самакіраванні павялічылася роля сесіі "радных і пасполітых", якая была распарадчым органам і займалася пытаннямі гаспадарчага, фінансавага і грамадска-палітычнага жыцця горада, прымала рашэнні, выкананне якіх было абавязкам дзеючага ("рочнага") магістрата.

З 18.08.1636 г. выбары рады (магістрата) праходзілі 20 снежня кожнага года. За тры дні, 17-га, магістрат шырока абвяшчаў гараджан спецыяльнай пастановай (універсалам) аб выбарах. На наступны дзень у ратушы збіраліся мяшчане і выбіралі па 12 лепшых "мужей" ад купцоў і цэхавых рамеснікаў. 20 снежня ўсе абраныя "мужы" з'яўляліся на сесію магістрата, дзе выбіраліся 12 "паспалітых" (па 6 ад купцоў і рамеснікаў). 12 паспалітых разам са старою радай выбіралі новую раду, якая будзе кіраваць горадам. На сесіі магістрата выбіраліся адразу 5 змен "паспалітых" і 5 змен рады. Кожная змена паспалітых і рады кіравала горадам на працягу года, перадаючы у яго канцы свае паўнамоцтвы наступнай. Кожная рада прыносіла прысягу.

Перадача ўлады праходзіла ва ўрачыстых абставінах і ў прысутнасці усіх змен магістрата. Стары склад рады рабіў фінансавую справаздачу за год, перадаваў справы, ключы ад касы магістрата, пячатку новаму складу рады. Гэты дзень з'яўляўся святочным днём для жыхароў горада. Як бачна, выбары праводзіліся раз у 5 гадоў, але склад магістрата мяняўся штогод.

Гарадская рада (магістрат) кіравала горадам. На пасяджэннях рады разглядаліся пытанні і выносіліся пастановы аб парадку падаткаабкладання насельніцтва і грашовых збораў, аб перадачы ў арэнду гарадскіх уладанняў. Рабіліся запісы ў актавую кнігу аб продажы, завяшчаннях, зацвярджаліся цэхмістры, цэхавыя пастановы, гандлёвыя і крэдытныя ўгоды. На чарговыя (кожны чацвер штотыднёва а 18 гадзіне) і пазачарговыя пасяджэнні павінны былі з'яўляцца ўсе члены новай і старой рады, паспалітыя, сотнікі, калі-нікалі дзесятнікі, а таксама ўсе пасадавыя асобы, якія загадзя апавяшчаліся праз слугу "мескага".

Паспалітыя сачылі, каб не было злоўжыванняў з боку пасадавых асоб. Яны кантралявалі правільнае выкарыстоўванне гарадскіх сродкаў, выбіралі раду, клапаціліся аб росце дабрабыту горада. Без іх згоды магістрат не мог прыняць ніводнага рашэння ці пастановы. Рада (магістрат) перыядычна рабіла справаздачу перад імі за расход гарадскіх сродкаў.

Шафары (ці казначэі) выбіраліся па 2 ад рады і паспалітых. Яны выдаткоўвалі гарадскія сродкі толькі па распараджэннях рады і паспалітых. У канцы года яны рабілі фінансавую справаздачу.

Сотнікі выбіраліся гарадской абшчынай і былі замацаваны за вызначанай часткай горада, дзе мелі пэўныя паўнамоцтвы. На пасяджэннях рады разам з дзесятнікамі выступалі супраць злоўжыванняў, парушэнняў радай устаноўленага парадку. Выказвалі думкі гараджан аб падатках, прызначэнні пасадавых асоб. У сувязі з тым, што яны выступалі ад імя гарадской абшчыны, да іх уважліва прыслухоўваліся.

На штотыднёвых пасяджэннях мелі права прысутнічаць цэхмістры (кіраўнікі рамесных цэхаў), якія прымалі ўдзел у абмяркаванні розных пытанняў. Без іх не маглі выносіць пастановы па грашовых зборах.

У XVIII ст. грамадска-палітычнае жыццё Магілёва таксама было запоўнена барацьбой гараджан супраць падатковага і павіннаснага ўціску, беззаконняў і самавольстваў магістрата пры размер-

каванні і зборы падаткаў, злоўжыванняў уладаў. У 1742 г. і 1744 г. гараджане Магілёва не заплацілі належнай сумы грашовага збору, адмовіліся яго ўносіць, а таксама падпарадкоўвацца гарадской радзе. Магістрат прыняў жорсткія меры ў адносінах да найбольш актыўных арганізатараў супраціўлення. Многія рамеснікі былі прыцягнуты да суда, а шэсць чалавек зняволены ў турму.

У 1577 г. Магілёў атрымаў свой першы герб: вежа сярэбраная (белая), на блакітным полі, упрыгожанымраслінным арнаментам. У 1661 г. горад атрымаў новы герб[25]. Згодна з прывілеем, які, між іншым, ураўнаваў у правах наш горад са сталічным горадам Вільняй, на гэтым гербе – у блакітным полі тры срэбныя гарадскія вежы, у адчыненай сярэдняй браме – рыцар з узнятым мячом (на думку Андрэя Завадскага сімвалізуе рыцара Раланда з мячом правасуддзя), а над ім герб – “Пагоня”, які з’яўляўся і з’яўляецца гістарычным гербам для ўсёй Беларусі. З 2005 г. гэты герб зацверджаны ў якасці афіцыйнага герба горада Магілёва.

Пасля падзелу Рэчы Паспалітай і далучэння ўсходнебеларускіх земляў да Расійскай імперыі Магілёў у 1781 г. атрымаў новы герб. Але ў дакументах тых часоў пазначана, што гораду дадзены “стары герб” – узброены коннік у чырвоным полі. Калі ў гербе горада, атрыманым у 1661 г. выява “Пагоні” была толькі адным з элементаў, дык у той час яна стала дамінуючай. Герб уяўляў сабою тарчу (шчыт), у верхняй палове якога была палова расійскага герба – двухгаловы арол з каронаю, а ў ніжняй на чырвоным полі – белы вершнік з узнятым мячом у руцэ. Гербы Магілёва з’яўляюцца помнікамі мінуўшчыны і адлюстроўваюць цікавыя старонкі гісторыі горада.

У часы Магдэбургскага права ў Магілёве назіралася інтэнсіўнае асваенне прылеглых да замка тэрыторый, узнікненне новых пасадаў, колькасны і якасны рост гарадской забудовы[26].

У Беларусі Магдэбургскае права было скасавана паводле ўказаў Кацярыны ІІ у Магілёўскай губерні ў лістападзе 1775 г., у Мінскай – у маі 1795 г., у заходняй Беларусі – у снежні 1795 г.

---

[25] Даніленка С. Семантыка магдэбургскіх гербаў Магілёва // Старонкі гісторыі Магілёва. Магілёў, 1998. С. 17–26.

[26] Слюнькова И.Н. Архитектура городов Верхнего Приднепровья XVII – середины XIX в. Минск, 1992; Ткачоў М.А. Замкі і людзі. Мінск, 1991; Чантурия В.А. История архитектуры Белоруссии. Минск, 1985. Т. 1; Чарняўская Т.І. Архітэктура Магілёва. Мінск,1973; Марзалюк І.А. Магілёў ў XII–XVIII стст. Людзі і рэчы. Магілёў–Мінск, 1998.

Такім чынам, залатым векам вольных беларускіх местаў з'яўляецца другая палова XVI і першая палова XVII стагоддзяў. У гэты перыяд канчаткова фармуецца структура кіравання магдэбургскім горадам, афармляюцца яго атрыбуты – пячатка і герб. Першая – як сведчанне юрыдычных паўнамоцтваў гараджан, а другі як сімвал незалежнасці, што аб'ядноўвае ўсіх мяшчан у адну супольнасць, падкрэслівае іх правы і акрэслівае іх абавязкі ў дачыненні да вярхоўнай улады. Крыху змяншаецца інтэнсіўнасць надання правоў на самакіраванне ў другой палове XVII першай палове XVIII ст. Апошняя значная хваля ўзнікнення новых і аднаўлення ў правах раней меўшых магдэбургскія правы прыпадае на пачатак 90-х гадоў XVIII ст. У гэты перыяд вярхоўная ўлада аганізуючай дзяржавы імкнулася прыцягнуць на свой бок шырокія колы гарадскога насельніцтва. Але ўжо было позна – агрэсары (Аўстрыя, Расія, Прусія) былі гатовы да нападу, насельніцтва размежавана і дэмаралізавана, што ў рэшце рэшт прывяло да краху Рэчы Паспалітай. Але менавіта ў гэты перыяд шмат гарадоў атрымала як першасныя, так і пацвярджальныя прывілеі на самакіраванне.

Магдэбургскае права забяспечыла гарадам развіццё рамяства і гандлю, вызначыла месца і стан гараджан у феадальным грамадстве, бараніла іх ад уціску шляхты і вялікакняскай адміністрацыі, спрыяла саслоўнаму адзінству гараджан на аснове паняцця – вольныя людзі.

Палітыка надання гарадам Магдэбургскага права – права на вольнасць і самакіраванне прыводзіла да таго, што гарады Беларусі ў большасці заставаліся вернымі Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў. Нягледзячы на частыя і моцныя пагромы з боку Маскоўскай, а затым Расійскай дзяржавы, даволі хутка адбудоўваліся і нават працягвалі расці.

У "дамагдэбургскі" перыяд у кожным месцы існавалі "канцы" (раёны), якія аб'ядноўваліся толькі сваім сітуацыйным станам, а падзяляліся паміж сабой юрыдычным становішчам. Так, у адным месцы маглі быць свецкія юрыдыкі – пляцы, якія належалі шляхце і магнатам; духоўныя – дзе знаходзіліся манастыры, цэрквы, касцёлы і г.д.; гродскія юрыдыкі – замак, чэлядзь і рамеснікі, якія асблугоўвалі яго і г.д. Наданне гораду Магдэбургскага права сцірала гэтую "шматковасць", і, у ідэале, спрыяла зліццю ўсіх гэтых фрагментаў у адзін жыццяздольны гарадскі арганізм з адзінай прававой базай, аб'яднаны адзінымі задачамі і мэтамі. Праўда, у жыцці гэты тэарэ-

тычны пастулат не заўсёды і не ў поўнай меры выконваўся. Тым не менш, ствралася спрыяльная агульнаправавая база для гэтай інтэграцыі асобных частак места ў эканамічна мабільны арганізм. Гэта вельмі актуальна сёння. Бо разуменне гараджанамі сябе вольнымі людзьмі з шырокімі паўнамоцтвамі мясцовага самакіравання (а не кіравання) дазволіць ім адчуваць сябе адзінай супольнасцю. І тады паціху знікне выраз “паедзем у горад”, тым больш ў вядучых краінах заможныя людзі жывуць у прыгарадах, пакідаючы за цэнтрам грамадскія функцыі.

У сучасных населенных пунктах Магілёўскай вобласці, дзе існуюць традыцыі магдэбургскага самакіравання неабходна штогод ладзіць агульнагарадское свята з нагоды надання ім Магдэбургскага права. Павінна каб у іх былі Ратушная плошча, у перспектыве адбудаваны будынкі Ратуш. Варта каб з’явіліся вуліцы Магдэбургская і помнікі асобам, якія давалі права на самакіраванне.

Гісторыя гарадоў нашай краіны сведчыць аб існаванні ў XIV–XVIII стст. высокаарганізаванай сістэмы самакіравання і глыбокіх дэмакратычных традыцыяў у Беларусі. Вынікам гэтага былі вялікія дасягненні як у галіне эканомікі, так і культуры.

## 1.4 Парасткі грамадзянскай супольнасці пад час расійскага панавання

У 1772, 1793, 1795 гг. адбыліся тры падзелы тэрыторыі Рэчы Паспалітай паміж Расіяй, Аўстрыяй і Прусіяй. Абшары Беларусі былі захоплены і ўвайшлі ў склад Расійскай імперыі. Падзелы Рэчы Паспалітай выклікалі ўздым грамадзянскага патрыятызму, што прадвызначыла прыняцце першай у Еўропе і другой у свеце (пасля ЗША) Канстытуцыі Рэчы Паспалітай 3. 05. 1791 г., а таксама нацыянальна-вызваленчыя паўстанні: 1794 г. пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі, 1830–1831 гг., 1863–1864 гг. пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага. Пад час іх фарміраваліся этнічная самасвядомасць і дэмакратычны светапогляд эліты тагачаснага жыхарства Беларусі[27].

[27] Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. Кн. 1. С. 79–296; Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 4. Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.). Мінск, 2007; Гісторыя Беларусі. Ч. 1. С. 263–363; Беларусы. Т. 6. С. 58–149; Беларусы. Т. 4. С. 227–289; Нарысы гісторыі Беларусі. Ч. 1. С. 267–439; Шымуковіч С.Ф. Гісторыя Беларусі. Ч. II. С. 10–82; Канфесіі на Беларусі (к. XVIII–XX стст.) / В.В.Грыгор’ева, У.М.Завальнюк, У.І.Навіцкі, А.М.Філатава. Мінск, 1998. С. 5–154;

Грамадска-палітычная сітуацыя на тэрыторыі Беларусі шмат у чым вызначалася падзеямі агульнаеўрапейскага маштабу: французскай буржуазнай рэвалюцыяй (1789–1794), вайной 1812 г. і г.д. Яны садзейнічалі распаўсюджванню рэвалюцыйных і дэмакратычных ідэй, спрыялі актывізацыі радыкальна-дэмакратычных рухаў. У значнай часткі беларускай шляхты – адзінага правадзейнага суб'екта тагачаснага грамадства, панавала імкненне да аднаўлення Рэчы Паспалітай. Побач з гэтым, у дэмакратычна-радыкальных колах выспяваюць ідэі аб неабходнасці вызвалення сялян ад прыгоннага стану, дэмакратычных пераўтварэнняў у грамадстве. Ва ўмовах абсалютысцкай Расійскай імперыі легальным асяродкам, дзе маглі праяўляцца грамадскія, у тым ліку і апазіцыйныя, настроі былі губернскія і павятовыя шляхецкія дэпутатскія сходы, якія мясцовае дваранства разглядалі як былыя сеймікі Рэчы Паспалітай. Гэта выклікала супрацьдзеянне мясцовай расійскай адміністрацыі.

Жорсткае адзінаўладдзе і самаўладзе, нацыянальны і эканамічны прыгнёт прывялі да ўзнікнення тайных таварыстваў: "Віленская асацыяцыя" (1796–1797), якая мела аддзяленні ў Мінску, Брэсце, Кобрыне, Ашмянах; мясцовыя нешматлікія масонскія ложы ў Мінску, Нясвіжу, Навагрудку, Гродне; філаматаў (1817–1818); філарэтаў (1820); "Ваенныя сябры" (1823), якое мела свае філіялы: "Згода" і "Заране"; "Дэмакратычнае таварыства"; арганізацыя "Саюз свабодных братоў" (1846–1849) з суполкамі ў Ашмянах, Вільна, Гродне, Лідзе і Мінску. Беларусь была таксама арэнай дзейнасці дзекабрыстаў.

Садзейнічала абуджэнню беларускай нацыянальнай самасвядомасці паўстанне 1863–1864 гг. пад кіраўніцтвам нацыянальнага героя Беларусі Кастуся Каліноўскага. Ён разам з сваімі прыхільнікамі (чырвонымі – левымі) імкнуўся да стварэння дэмакратычнай народнай дзяржавы, агучваў права на нацыянальнае самавызначэнне беларусаў, украінцаў, літоўцаў. Яны патрабавалі ліквідаваць памешчыцкае землеўладанне і перадаць усю зямлю сялянам, а сялян актыўна прыцягваць да ўзброенага паўстання, нават пераўтварыць паўстанне ў сялянскую (народную) рэвалюцыю.

На тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX ст. дзейнічалі народніцкія арганізацыі. У прыватнасці "Зямля і воля", якая акрамя

---

Фірыновіч А.Э. «Справа 29-ці» Магілеўскай ваенна-следчай камісіі над удзельнікамі паўстання 1863–1864 гг. // Проблемы и перспективы становления гражданского общества : материалы Междунар. науч.-практич. конф. Ч. 2. С. 105–108.

арганізацый у галоўных гарадах імперыі мела так сама гурткі і ў Беларусі. Шмат беларусаў было ў мясцовых і цэнтральных арганізацыях "ЗВ" – гэта М. Судзілоўскі, К. Брэшка-Брэшкоўская, Г. Ісаеў, С. Гаховіч, М. Янчэўскі, А. Зундзіловіч.

У 1884 г. студэнты пецярбургскіх ВНУ структурна аформілі Беларускую сацыял-рэвалюцыйную групу "Гоман", якая выдала два нумары аднайменнага часопіса. На яго старонках гоманаўцы выступалі за аб'яднанне ўсіх рэвалюцыйных сіл імперыі і распрацавалі пытанне аб існаванні асобнай беларускай нацыі, выставілі патрабаванне сацыяльнага і нацыянальнага разняволення беларусаў у супрацлегласць да афіцыйнай тэорыі "заходнерусізму". Яны спрабавалі абвясціць сябе цэнтрам усіх народніцкіх арганізацый Беларусі, але стварыць адзіную народніцкую беларускую арганізацыю не здолелі – вельмі добра працавала царская сыскная паліцыя і існавалі разнагалоссі паміж мясцовымі гурткамі [28].

Расійскі ўрад жорстка караў удзельнікаў тайных таварыстваў, народніцкіх арганізацый, удзельнікаў паўстанняў 1830–1831 гг., 1863–1864 гг. Рэпрэсіі, безумоўна, абмяжоўвалі магчымасці нацыянальна-вызваленчага руху, але цалкам пагасіць імкненне да волі, нацыянальнай і сацыяльнай свабоды не змаглі.

У 1860-х гг. расійскі царызм устанавіў у беларуска-літоўскіх губернiях рэжым выключных законаў і сістэму ваенна-паліцэйскага кіравання, мясцовая дзяржаўная адміністрацыя атрымала пашыраныя паўнамоцтвы. Тым не менш, рэформы 1860–1870-х гг., асабліва гарадская (праведзена ў Беларусі ў 1876) і земская (з 1911 на ўсходніх і цэнтральных беларускіх тэрыторыях), забяспечылі, хаця і больш павольны, чым у расійскай метраполіі, развіццё элементаў самакіравання[29]. Стан дваранскага, гарадскога, сялянскага і земскага самакіраванне ў парэформенны час добра раскрыты ў

[28] Гоман. № 2 ад 15.11.1884 г. // Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛМ). Фонд 3. Воп. 2. Спр. 7. Арк. 1–28; Ляхоўскі У. Ад гоманаўцаў да гайсакоў. Чыннасць беларускіх маладзёвых арганізацый у 2-й палове XIX ст. – 1939 г. Беласток-Вільня, 2012. С. 16–23.

[29] Сидоренко Б.И. Могилевская губерния на пути становления гражданского общества в общероссийском информационном процессе 60–70-х гг. 19 века: опыт города и деревни // Проблемы и перспективы становления гражданского общества : материалы Междунар. науч.-практич. конф. Ч. 2. С. 78–83; Петров Д.Н. Элементы гражданского общества в деятельности негосударственных структур города Могилева в конце 19 – начале 20 вв. // Тамсама. С. 65–68; Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. Кн. 1. С. 79–144; Токць С. Валасное кіраванне ў Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX стст.: штодзённасць вясковай дэмакратыі // ARCHE Пачатак. 2012. № 3. С. 178–232.

калектыўным выданні Інстытута гісторыі НАНБ [30]. Мы звернем увагу толькі на некаторыя аспекты.

Распарадчая ўлада ў гарадах па пытаннях народнай адукацыі, аховы здароўя, развіцця гандлю, прамысловасці і добраўпарадкавання належала гарадскім думам, якія выбіраліся на чатыры гады. Выканаўчы орган – гарадская ўправа на чале з гарадскім галавой, яна вырашала пытанні па адкрыццю навучальных устаноў і арганізацый па медыцынскаму абслугоўванню, начлежных дамоў, утрымання пажарнай аховы, паліцыі і казармаў, па добраўпарадкаванню тратуараў, вуліц, будаўніцтву калодзежаў, выконвала самыя разнастайныя ўрадавыя прадпісанні. Думы і ўправы падпарадкоўваліся губернатарам і міністру ўнутраных спраў.

Аднак трэба мець на ўвазе, што ў грамадскую адміністрацыйна-кіруючую дзейнасць у гарадах была ўцягнута невялікая частка нават прывілеяваных і заможных жыхароў; існаваў пэўны маёмасны і ўзроставы цэнзы пры выбарах у гарадскую думу. Сярод членаў гарадскіх дум пераважалі дваране, прадстаўнікі духавенства, паліцэйскага ўпраўлення, урачэбнай інспекцыі і вышэйшага рангу чыноўнікі. У беларускіх гарадах, дзе большасць насельніцтва складалі – яўрэі, былі ўведзены абмежаванні для гэтай катэгорыі гараджан. Спачатку яны мелі права займаць 1/3 частку месцаў у органах гарадскога самакіравання, а ў выніку конррэформы – па новаму Гарадавому палажэнню 1892 г. – толькі 1/10 частку месц.

У грамадскім жыцці павятовых гарадоў рашаючая роля належала дваранскаму сходу на чале з прадвадзіцелем. Паралельна гарадскому кіраванню дзейнічала і саслоўнае кіраванне, якое ажыццяўлялася мяшчанскай, купецкай і рамеснай управамі, а ў невялікіх гарадах – выбарнымі ад гэтых саслоўяў старастамі і дзесятнікамі. У іх функцыі ўваходзілі: раскладка і збор грамадскіх і казённых падаткаў, кантраляванне выканання гараджанамі гарадскіх павіннасцей і ўказаў урада.

З 1911 г. пачалася дзейнасць земстваў у Беларусі. Яны аказалі пэўную стваральную ролю ў развіцці асветы, прамысловасці, земляробства, гандлю, займаліся будаўніцтвам дарог, грамадскіх будынкаў (школ, бальніц, чытальняў, пошт), вялі шырокую культурна-асветніцкую работу сярод насельніцтва.

---

[30] Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 1. Мінск, 2011. С. 79–138.

Значнае месца ў грамадскім жыцці гарадоў займалі дабрачынныя і міласэрныя таварыствы, якія арганізоўвалі бясплатныя абеды, сняданні, прыюты, будавалі за свой кошт бальніцы, школы, аказвалі дапамогу бедным гімназістам, сіротам. Для гарадской эліты чыноўнікаў, афіцэраў, дваранства існавалі саслоўна–прафесійныя клубы, якія мелі замкнёны характар. У клубах праводзілі балі, маскарады, святы, праходзілі сустрэчы па палітычных, працоўных інтарэсах.

Для працоўных гараджан было адкрыта некалькі народных дамоў. Так, 1.01.1902 г. быў адчынены Гродзенскі народны дом, які падпарадкоўваўся губернскаму Камітэту апякунства аб народнай цвярозасці. Пры ім існавала бібліятэка-чытальня, праходзілі чытанні па пытаннях літаратуры, рэлігіі, побыту народа. У губернях, паветах меліся камітэты апякунства аб народнай цвярозасці, якія займаліся наглядам за гандлем гарэлачных напояў і імкнуліся абмежаваць п'янства шляхам заахвочвання будаўніцтва народных дамоў, бібліятэк, чытальняў. Пэўную работу па медыцынскай асвеце насельніцтва, збору грошай для пацярпелых ад розных наступстваў вяло таварыства Чырвонага Крыжа.

У грамадскім жыцці беларусаў прыкметнай з'явай былі народныя чытанні. Так, 19.10.1913 г. у г. Магілёве ў памяшканні Магілёўскага народнага вучылішча адбыліся народныя чытанні "Вясковая туга" і "Тарас Бульба", прысутнічалі сяляне ў колькасці 7 дарослых і 67 дзяцей і падлеткаў; 18.01.1914 г. там жа прыйшлі чытанні "Багамольцы ля святыняў Кіева" і "Яўген Анегін", на лекцыі было 98 чалавек, з іх 75 дзяцей; 8.03.1914 г. у в. Магілёўцы чыталіся лекцыі "Дзе на Русі які народ жыве і чым займаецца", "Дзе любоў, там і бог", прысутнічала 114 чалавек, з іх 65 падлеткаў [31].

Напрыканцы XIX – пачатку XX стст., у сувязі з пашырэннем рабочага і сялянскага руху, ствараюцца і дзейнічаюць на тэрыторыі Беларусі розныя грамадскія аб'яднанні і палітычныя партыі [32]. Да

[31] Беларусы. Т. 4. С. 344–345.

[32] Дакументы БСГ // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 139. Арк. 1–25; Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. Кн. 1. С. 227–258; Бондаренко К.М., Лавринович Д.С. Русские и белорусские монархисты в начале XX века : монография. Могилев, 2003; Бондаренко К.М. Создание и территориальное размещение правых союзов и обществ в Беларуси : (1903–1907 гг. ) // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А, Гуманитарные науки. 2008. № 1. С. 17–22; Лавринович Д. С. Деятельность конституционно-демократической партии и "Союза 17 октября" в Беларуси (1905–1918 гг.) : монография. Могилев, 2009; Барыс А. Палітычныя партыі і арганізацыі на Беларусі ў першай палове XX ст. // Беларускі гістарычны часопіс. 1998. № 1. С. 26–30;

сацыялістычнага кірунку адносіліся: Сацыял-дэмакратыя Каралеўства Польскага (з 1900 – Сацыял-дэмакратыя Каралеўства Польскага і Літвы); Усеагульны яўрэйскі саюз у Расіі і Польшчы; Польская партыя сацыялістычная; Рабочая партыя палітычнага вызвалення Расіі; Расійская сацыял-дэмакратычная рабочая партыя; партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў. У 1902 г. у Пецярбургу ўзнікла беларуская партыя – Беларуская рэвалюцыйная грамада (з 1903 – Беларуская сацыялістычная грамада). У 1902 г. у Мінску легальна прайшоў Усерасійскі з’езд сіяністаў.

Рэвалюцыйныя падзеі 1905 г. прывялі да ўзнікнення легальных партый: Партыі канстытуцыйных дэмакратаў (кадэтаў), Канстытуцыйна-каталіцкай партыі Літвы і Беларусі, “Саюз 17 кастрычніка” ці акцябрыстаў. У Беларусі мелі свае аддзелы: Партыя мірнага абнаўлення, “Саюз русского народа”, Усерасійскі нацыянальны саюз. Утвараліся і мясцовыя арганізацыі: “Белорусское общество” (1908), таварыствы “Крестьянин” і “Русский окраинный союз”.

У канцы XIX – пачатку XX стст. у грамадска–палітычным жыцці ўсё большую ролю сталі адыгрываць буржуазія і пралетарыят (рабочыя). Іх нацыянальны склад у Беларусі шмат у чым прадвызначыў агульныя тэндэнцыі развіцця супольніцтва. Згодна з перапісам 1897 г. ў пяці заходніх губернях Расіі (Беларусь) да дробнай буржуазіі адносіліся 103 тыс. чал., сярэдняй 47 тыс., буйной 33 тыс. чал. Па нацыянальным складзе гэта яўрэі – 60 %, беларусы – 17 %, рускія – 10 %, палякі – 10 %, іншыя нацыянальнасці да 3 %. Асаблівасць беларускага пралетарыяту – яго шматнацыянальны склад (беларусы, рускія, палякі, яўрэі, украінцы, літоўцы, латышы, татары). Аднак, улічваючы, што яўрэі ў асноўным жылі ў гарадах, менавіта яны сталі асноўнай часткай рэвалюцыйнай масы ў Беларусі. Сярод рабочых чыгуначных майстэрань і дэпо, паравозных машыністаў, тэлеграфістаў пераважалі рускія і палякі. На лесапавале, будаўніцтве і рамонце чыгуначных і шашэйных дарог, прамысловых прадпрыемствах у сельскай мясцовасці працавалі перважна беларусы. У запалкавай, тытунёвай, гарбарна-

---

Бобков В., Кузнецов Н., Осмоловский В. Политические партии Беларуси. Минск, 1997; Болсун Г.А. Политические партии России в судьбах их лидеров (конец XIX – первая треть XX века). Минск, 2001; Восович С.М. Деятельность Могилевского Богоявленского братства в сфере народного образования в 1883–1914 гг. // Проблемы и перспективы становления гражданского общества : материалы Междунар. науч.-практич. конф. Ч. 2. Могилев, 2010. С. 28–32 і інш.

абутковай галінах вытворчасці, у друкарнях пераважалі яўрэйскія рабочыя.

Вядома, што грамадзянская супольнасць з’яўляецца сацыяльна-палітычнай асновай партнёрскіх адносін, калі дзяржава не ўзвышаецца над грамадствам, а служыць яму. Сацыяльнае партнёрства – гэта супрацоўніцтва розных сацыяльных груп і пластоў для дасягнення агульных мэтаў. Адносіны сацыяльнага партнёрства найперш звязаны з узнікненнем і развіццём прафсаюзнага руху. У Беларусі раней чым у цэнтральных губернях Расійскай імперыі ў сярэдзіне 1890-х гг. пачалі стварацца прафсаюзы. Зараджэнню сацыяльнага партнёрства садзейнічалі таксама развіццё кааператыўнага руху, арганізацыя акцыянерных таварыстваў.

У дарэвалюцыйнай Беларусі пераважаў канфліктны тып сацыяльна-працоўных адносін. У паслякастрычніцкі перыяд зацвердзілася практыка калектыўна-дагаворных адносін у сацыяльна-працоўнай сферы, якой перашкаджалі камандна-адміністрацыйныя метады кіравання ў савецкай краіне. Новы этап у сацыяльна-працоўных адносінах наступіў у пачатку 1990-х гг. з абвяшчэннем незалежнасці Рэспублікі Беларусь і пераходам да сацыяльна арыентаванай рыначнай эканомікі. У гэтых умовах пачала складвацца сістэма ўзаемаадносін прафсаюзаў з органамі дзяржаўнага кіравання і з утворанымі аб’яднаннямі прадпрымальнікаў, заснаваная на прынцыпах сацыяльнага партнёрства [33].

З апошняй чвэрці XIX ст. стаў пашырацца беларускі нацыянальны рух, які вялікую ўвагу надаваў фарміраванню этнічнай свядомасці і пашырэнню грамадскай актыўнасці.

У другой палове 1880-х гг. у Мінску ўзнікла група ліберальнай інтэлігенцыі (М. Доўнар-Запольскі, У. Завітневіч, А. Слупскі, Я. Лучына) якія імкнуліся абудзіць нацыянальную самасвядомасць легальнымі сродкамі. Для гэтага выкарыстоўвалася першая прыватная (недзяржаўная) газета на Беларусі “Мінскі лісток” і календары. На іх старонках друкаваліся матэрыялы А. Багдановіча, І. Янчука, М. Доўнар-Запольскага пра гісторыю, мову, беларускі этнас, а так

[33] Дубовік А.А. Гістарычныя перадумовы станаўлення сацыяльнага партнерства як інстытута грамадзянскай супольнасці ў Беларусі // Проблемы и перспективы становления гражданского общества : материалы Междунар. науч.-практич. конф. Ч. 2. С. 46–50 ; Агеев А.Г., Пушкин И.А. История профсоюзного движения Могилёвщины. Могилёв, 2005. С. 3–17; Смолина А.П. Социальное партнёрство и формирование гражданского общества // Белорусская политология: многообразие в единстве – III : материалы междунар. науч.-практ. конф. Ч. 2. Гродно, 2008. С.177–179.

сама літаратурныя творы Янкі Лучыны і Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. Гэтыя выданні па сведчанні сучаснікаў, абудзілі беларускі нацыянальны рух. Разам з гэтым гуртком, на фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці вялікі ўплыў зрабіла творчасць Ф. Багушэвіча. Яго прадмова да "Дудкі беларускай" з'яўляецца маніфестам нацыянальнага адраджэння.

У XIX – пачатку XX стст. фарміраванню элементаў грамадзянскай супольнасці ў Беларусі садзейнічала вялікая цікавасць да гісторыі, этнаграфіі, археалогіі Беларусі, якая выразна праявілася ў першай палове XIX ст. і звязана з імёнамі І. Грыгаровіча, М. Баброўскага, З. Даленгі-Хадакоўскага, Т. Нарбута, А. Кіркора, І. Даніловіча, братоў Я. і К. Тышкевічаў і шмат іншых. Гэта былі людзі розных палітычных поглядаў і культурных накірункаў, але іх дзейнасць сведчыла аб развіцці працэсу духоўнага адраджэння Беларусі і паспрыяла росту этнічнай самасвядомасці беларусаў у другой палове XIX стагоддзя і фарміраванню беларускай нацыі. Так, згодна з дадзенымі ўсерасійскага перапісу 1897 г. (нацыянальная прыналежнасць вызначалася па роднай мове) 74 % насельніцтва беларускіх губерняў лічылі роднай мовай беларускую, у тым ліку амаль палова патомнай шляхты палічыла сябе беларусамі.

У маі 1907 г. прайшоў настаўніцкі з'езд у Вільне, які выказаўся за навучанне на беларускай мове. З 10.11.1906 г. выдавалася газета на беларускай мове – "Наша ніва". З 1912 г. нашаніваўцы наладзілі выпуск грамадска-палітычнага і літаратурнага альманаха "Маладая Беларусь". У выдавецтве "Загляне сонца і ў наша ваконца" (1908–1914) выходзілі дзесяткі беларускіх кніжак [34].

Перашкаджалі станаўленню элементаў грамадзянскай супольнасці ў Беларусі – палітыка ўладаў Расійскай імперыі, адсутнасць ВНУ (у 1864 быў зачынены земляробчы інстытут – апошняя вышэйшая навучальная ўстанова ў Беларусі часоў Расійскай імперыі, з таго часу вышэйшую адукацыю беларусы атрымлівалі за межамі Радзімы), нешматлікасць і неўплывовасць беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі і тое, што эканамічная эліта краю складалася з небеларусаў. Па сутнасці, не існавалі ні беларускай

---

[34] Справа Віленскай судовай палаты па абвінавачванні К.Міцкевіча (Я.Коласа) // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 2. Спр. 2. Арк. 1–39; Статут Пецярбургскага таварыства студэнтаў беларусаў // Тамсама. Спр.152. Арк. 1–5; Матэрыялы Беларускага выдавецкага таварыства. 1906–1914 гг. // Тамсама. Воп. 1. Спр. 37. Арк. 1–18; Спр. 38. Арк. 1–27; Матэрыялы газеты "Наша Ніва" // Тамсама. Спр. 69. Арк. 1–15; Спр. 70. Арк. 1–72; Спр. 71. Арк. 1–50; Спр. 72. Арк. 1–15.

прамысловай буржуазіі (яна яўрэйская і польская), ні беларускага прамысловага пралетарыята (ён пераважна яўрэйскі, рускі і польскі). Толькі сельская буржуазія была амаль выключна беларускай (але яшчэ не ўсведамляла нацыянальнага адзінства, бо была падзелена па рэлігійных прыкметах) і сельскі пралетарыят (батракі) – так сама быў беларускім па складзе. Вядома, гэта вельмі адмоўна сказалася на тэмпах і характары культурнага адраджэння беларускай нацыі.

З пачаткам выбараў і дзейнасці ў Расійскай імперыі Дзяржаўнай Думы (1906) на тэрыторыі Беларусі распачаўся працэс аднаўлення традыцый парламентарызму (закладзеных яшчэ ў час існавання Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў), які быў перапынены ваеннымі падзеямі (1914–1920) і ўсталяваннем бальшавіцкай сістэмы кіравання ў краіне.

## 2. АКТЫВІЗАЦЫЯ ГРАМАДСКАГА І НАЦЫЯНАЛЬНАГА РУХАЎ У АПОШНІЯ ГАДЫ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ (1917–1918)

Летам 1914 г. пачаліся ваенныя дзеянні, у якія хутка ўцягнулася 33 краіны з насельніцтвам 1,5 млрд. чалавек. З 5.08.1914 г. ў беларускіх губернях увялі ваеннае становішча. У Баранавічах, а са жніўня 1915 г. у Магілёве, размяшчалася Стаўка вярхоўнага галоўнакамандуючага Расійскай імперыі. Вельмі хутка цэнтр губерні ператварыўся ў царскую рэзідэнцыю. Беларусь апынулася ў цэнтры ваенных і грамадска-палітычных падзей Першай сусветнай вайны. Апошняя актывізавала рэвалюцыйныя працэсы ў Расіі і Еўропе, прывяла к стварэнню новых дзяржаў і станаўленню новага ўкладу жыцця на тэрыторыі Беларусі[35].

Ва ўмовах вайны грамадскія інстытуты развіваліся марудна. Іх дзейнасць насіла аднабаковы характар, у першую чаргу накіраваны на мінімізацыю наступстваў вайны і выпрацоўку перспектыў развіцця грамадства пасля вайны. У 1915 г. было створана Беларускае таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны. Гэта была першая легальная беларуская нацыянальная грамадская арганізацыя. Галоўнай мэтай лічылася дабрачынная дзейнасць, аднак таварыства здолела займацца і культурна-асветніцкай дзейнасцю[36]. Па ініцыятыве мінскага аддзела Таварыства была створана “Беларуская хатка” – клуб беларускіх дзеячаў культуры.

Пачалася дзейнасць Беларускага народнага камітэта, лідэры якога браты Іван і Антон Луцкевічы, Вацлаў Ластоўскі выказваліся спачатку за адраджэнне ВКЛ, а потым за незалежнасць Беларусі ў этнічных межах беларускага народа. Пытанне аб стварэнні незалежнай Беларусі дзеячы БНК уздымалі на Стакгольмскай і Лазанскай канферэнцыях народаў Расіі. На незалежніцкіх пазіцыях

---

[35] Нарыс гісторыі беларускай дзяржаўнасці: XX стагоддзе. С. 39–336; Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 5. Беларусь у 1917–1945 гг. Мінск, 20006; Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. Кн. 1. С. 297–584; Гісторыя Беларусі. Ч. 1. С. 364–411; Беларусы. Т. 4. С. 280–429; Шымуковіч С.Ф. Гісторыя Беларусі. Ч. ІІ. С. 84–117; Нарысы гісторыі Беларусі. Ч. 2. С. 8–264; Барыс А. Палітычныя партыі і арганізацыі на Беларусі ў першай палове XX ст. С. 26–30; Рудовіч С. Час выбару: Праблема самавызначэння Беларусі ў 1917 годзе. Мінск, 2001.

[36] Статуты Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны за 1915, 1921, 1923 гг. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 125. Арк. 1–25; Ляхоўскі У. Ад гоманаўцаў да гайсакоў. С. 73–221.

стаяла газета "Гоман", якая выхадзіла ў акупаванай Вільні пад рэдакцыяй В. Ластоўскага.

Першая сусветная вайна рэзка паскорыла геапалітычныя і нацыябудаўнічыя працэсы ў Еўропе, а рэвалюцыйны 1917 год яшчэ больш актуалізаваў гэтыя пытанні на абшарах Расійскай імперыі, унёс карэнныя змены ў жыццё краіны. Лютаўская рэвалюцыя 1917 года ў Расіі абудзіла каласальную рэвалюцыйную энергію, якая раней не знаходзіла выйсце з-за фактычнай адсутнасці дэклараваных свабод, любая грамадская актыўнасць знаходзілася ў жорсткіх цісках царскай бюракратычна-паліцэйскай машыны. Вызваленне патэнцыяльнай унутранай энергіі спрыяла нечуванай актывізацыі грамадства. Цяпер да грамадска-палітычнага жыцця абудзілася велізарная колькасць людзей, якія раней амаль не мелі магчымасці для рэальнага ўдзелу ў дзейнасці легальных палітычных і грамадскіх арганізацый.

Сфарміраваны 100 гадоў таму рэвалюцыйны Часовы ўрад прыступіў да ліквідацыі палітычных, рэлігійных і сацыяльных абмежаванняў на абшарах Расійскай імперыі. Пасля абвяшчэння палітычных свабод і адмены многіх бюракратычных перашкод грамадскае жыццё краіны завіравала. Лёсавызначальны год стаў часам стварэння палітычных партый і аб'яднанняў, шматлікіх грамадскіх арганізацый, суполак, ініцыятыў і камітэтаў, правядзення мітынгаў, сходаў і з'ездаў. Рэзка актывізавалася палітычная дзейнасць насельніцтва. Пачалося вырашацца і нацыянальнае пытанне – адно з самых вострых у Расіі.

У губернскіх цэнтрах і галоўных беларускіх гарадах былі створаны Саветы рабочых і салдацкіх дэпутатаў. З прадстаўнікоў Гарадской думы, Саюза гарадоў, Земскага саюза, мясцовых Ваенна-прамысловых комплексаў, духавенства, палітычных партый быў створаны ў Мінску Часовы грамацкі камітэт парадка, які цалкам падтрымліваў Часовы ўрад. У Магілёве дзейнічаў уплывовы "Сход салдацкіх і афіцэрскіх прадстаўнікоў". Актыўную працу развярнула партыя кадэтаў. Вельмі моцныя пазіцыяі ў Беларусі ў той час мела партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў. Акрамя іх найбольшы аўтарытэт мелі Бунд і меньшавікі. Бальшавікі былі малавядомы, але вельмі актыўна набіралі папулярнасць. Яны актыўна ўдзельнічалі ў стварэнні прафсаюзаў і фабрычна-завадскіх камітэтаў.

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі актыўна ствараліся нацыянальныя беларускія партыі і арганізацыі. У лістападзе іх налічвалася

каля 14. Найбольш масавай партыяй была БСГ. 25.03.1917 г. па ініцыятыве БСГ адбыўся І з'езд беларускіх нацыянальных арганізацый. На ім быў створаны выканаўчы орган з'езда – Беларускі нацыянальны камітэт (БНК). 8–10.07.1917 г. у Мінску адбыўся ІІ з'езд беларускіх нацыянальных арганізацый. На ім быў створаны выканаўчы орган з'езда – Цэнтральная рада беларускіх арганізацый (з кастрычніка 1917 г. – Вялікая беларуская рада)[37]. Восенню 1917 г. была створана Беларуская сацыял-дэмакратычная рабочая партыя, якая цалкам падтрымала бальшавікоў і іх курс на паўстанне. Актывісты партыі – А.Чарвякоў, І.Лагун, А.Усціловіч.

У ноч з 25 на 26.10.1917 г. у Петраградзе адбылося ўзброеннае паўстанне і да ўлады прыйшла партыя бальшавікоў. У Мінску адбыліся з'езды Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў Заходняй вобласці, Саветаў сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў і Саветаў салдацкіх дэпутатаў арміі Заходняга фронту. Па выніках з'ездаў быў створаны Абласны выканаўчы камітэт Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Заходняй вобласці і фронту (Аблвыканкамзах) – вышэйшы орган улады ў краі.

У снежні 1917 г. у Мінску адбыўся Усебеларускі кангрэс – прадстаўнічы з'езд беларускіх арганізацый, які ўпершыню ўзняў пытанне аб стварэнні самастойнай Беларускай дзяржавы і быў разагнаны бальшавікамі. Аднак, абраная з'ездам Рада працягвала дзейнічаць пасля яго разгону і ва ўмовах германскай акупацыі. Дзякуючы дзейнасці гэтага грамадскага органа, 25.03.1918 г. было абвешчана стварэнне незалежнай Беларускай Народнай Рэспублікі[38] і распачаўся працэс нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва. У сувязі з ваеннымі падзеямі на тэрыторыі Беларусі БНР не здолела стаць

---

[37] Пратакол з'езда беларускіх нацыянальных арганізацый у Мінску 25–27.03.1917 г. // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Фонд 325. Воп. 1. Спр. 3. Арк. 1–2; Пратакол з'езда беларускіх арганізацый // Літоўскі цэнтральны дзяржаўны архіў (LCVA). Фонд 582. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 48–49 адв.; Статут Цэнтральнай Рады беларускіх арганізацый // Тамсама. Арк. 21–21адв.; Пратаколы БНК у Вільні за 1917 г. // Цэнтральная бібліятэка Акадэміі навук Літвы Аддзел рукапісаў (LMAVB RS). Фонд 21. Спр. 2069. Арк.1–17.

[38] Пратакол І Усебеларускага нацыянальнага з'езда 5–17.12.1917 г. // НАРБ. Фонд 325. Воп. 1. Спр. 3. Арк. 9–10; Пратаколы пасяджэнняў Усебеларускага нацыянальнага з'езда // LCVA. Фонд 582. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 5–8; Адозвы да беларускага насельніцтва аб стварэнні беларускай незалежнай рэспублікі // Тамсама. Спр. 16. Арк. 1–2; Пратаколы пасяджэнняў Рады БНР // Тамсама. Спр. 4. Арк. 1–12; Пасяджэнні Рады Міністраў і дэкларацыі Ўраду БНР. 1918 г. // Тамсама. Воп. 2. Спр. 1; Дакументы Рады БНР // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 142. Арк. 1–16.

самастойнай дзяржавай, але яе з'яўленне паўплывала на стварэнне савецкай Беларусі.

У студзені 1918 г. пры Народным камісарыяце па справах нацыянальнасцей РСФСР быў створаны Беларускі нацыянальны камісарыят (Белнацкам) пад кіраўніцтвам А. Чарвякова (уваходзілі З.Жылуновіч, І. Лагун, Б. Тарашкевіч, Я. Канчар і інш.). Ён заахвочваў бальшавіцкія ўлады да вырашэння пытання беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове, праводзіў актыўную дзейнасць сярод бежанцаў-беларусаў па развіццю беларускай адукацыі і культуры. Белнацкам працаваў у цеснай сувязі з Беларускімі секцыямі РКП(б), якія ствараліся ў асяроддзі беларускіх бежанцаў з восені 1918 года і так сама былі арыентаваныя на стварэнне сацыялістычнай беларускай дзяржавы.

## 2.1 Стварэнне беларускіх арганізацый і дзейнасць Магілёўскага Беларускага Камітэта

Падзеі Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. у Расійскай імперыі далі моцны імпульс развіццю беларускага нацыянальнага руху. Адрадзіліся і сталі ўзнікаць новыя нацыянальныя палітычныя партыі і арганізацыі, якія ў сваіх праграмах вылучалі задачы вырашэння культурных і сацыяльных праблем, а таксама ўсё з большай настойлівасцю фармулявалі патрабаванні стварэння беларускай дзяржаўнасці. Да ліку такіх нацыянальных арганізацый адносіўся і Магілёўскі Беларускі Камітэт.

Магілёў з'яўляўся трэцім горадам Расійскай імперыі (пасля Петраграда і Масквы), у якім вырашаўся лёс рэвалюцыі, паколькі ў гады Першай сусветнай вайны правінцыйны губернскі горад з 1915 г. фактычна стаў ваеннай сталіцай Расійскай імперыі. Пасля пачатку Лютаўскай рэвалюцыі Магілёў завіраваў. З аднаго боку, ажывілася грамадска-палітычнае жыццё, з'явілася мноства палітычных, нацыянальных, культурніцкіх арганізацый, а з іншага боку, менавіта тут назапашвалі сілы прыхільнікі контррэвалюцыі, якія гуртаваліся вакол Стаўкі. Горад адыгрываў важную ролю не толькі для ўздыму рэгіянальных, але і для разгортвання агульнарасійскіх працэсаў і падзей.

Перыяд паміж Лютаўскай рэвалюцыяй і кастрычніцкім пераваротам у гісторыі Магілёва – адзін з самых напружаных і разам з тым цікавых. Жыхары Магілёва актыўна ўдзельнічалі ў рэвалюцыйных

падзеях, у дзейнасці ўтвораных партый, таварыстваў і суполак. Як і па ўсёй краіне, у горадзе і губерні праводзіліся мітынгі і сходы, утвараліся грамадскія арганізацыі і мясцовыя філіі палітычных партый, выходзілі газеты “Могилевский вестник”, “Труд”, “Жизнь”, “Эхо” і інш. Адначасова ў насельніцтва паскорыўся працэс нацыянальнай ідэнтыфікацыі.

Вось у такіх умовах вясной 1917 г. у Магілёве была ўтворана грамадская арганізацыя беларусаў – Магілёўскі Беларускі Камітэт, які пад назвамі Магілёўскі Беларускі Арганізацыйны Камітэт, Магілёўскі Беларускі Нацыянальны Камітэт, Магілёўская Беларуская Рада і г. д. актыўна дзейнічаў да канца 1918 г. У гэтай працы для зручнасці намі будзе выкарыстоўвацца абагульняючая назва арганізацыі – “Магілёўскі Беларускі Камітэт” (МБК).

На працягу наступных двух дзесяткаў месяцаў членамі камітэта праводзіліся сходы і мерапрыемствы, ладзіліся гарадскія святы, прымаліся адозвы, ствараліся структуры МБК, рабіліся захады па заснаванню філій Камітэта ў павятовых гарадах губерні. Прадстаўнікі Камітэта ўвайшлі ў склад і актыўна дзейнічалі ў шэрагу грамадскіх і дзяржаўных устаноў горада Магілёва, павета і губерні, прымалі ўдзел у мясцовых і агульнарасійскіх выбарах. Магілёўскі Беларускі Камітэт стаў дастаткова ўплывовай арганізацыяй і прыкметнай з’явай у нацыянальным, культурным і палітычным жыцці не толькі Магілёва, але і ўсяго краю.

Камітэт, без перабольшання, можна назваць першай палітычнай нацыянальнай арганізацыяй беларусаў Магілёва. Патрыёты Магілёва, а гэта былі пераважна прадстаўнікі інтэлігенцыі, віталі спробы нацыянальнага адраджэння, палітычную мэту сваёй дзейнасці бачылі ў стварэнні Беларускай аўтаномнай адміністрацыйнай адзінкі ў складзе Расіі, а ў перспектыве – незалежнай дзяржавы. Палітычныя погляды яго членаў эвалюцыянавалі ад мар пра нацыянальную аўтаномію ў складзе Расіі да падтрымкі незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР). Члены камітэта не проста самі марылі аб самастойнасці Беларусі, але і здолелі арганізаваць падтрымку магілёўцамі ідэі стварэння ўласнай дзяржаўнасці.

Беларуская гістарыяграфія шмат увагі ўдзяляла пытанням адраджэння (ці, у іншых канцэпцыях, нараджэння) беларускай дзяржаўнасці ў пачатку ХХ ст. Вывучаючы гэтую праблему, даследчыкам немажліва было абысці тэму дзейнасці беларускіх нацыянальных камітэтаў у 1917–1918 гг., якія сыгралі найважнейшую

ролю ва ўтварэнні БНР. Эвалюцыя падыходаў да іх прайшла шлях ад адмоўнай негатыўнай ацэнкі іх дзейнасці як дробнабуржуазных арганізацый у савецкі час да ўвагі і навуковага вывучэння ў постсавецкі перыяд. Тым не менш праца па вывучэнні і пераасэнсаванні іх ролі ў гісторыі нашай краіны толькі пачынаецца. На ацэнку ролі і значнасці камітэтаў да гэтага часу моцна ўплываюць палітычныя ўстаноўкі аўтараў, асабліва прызнанне або непрыняцце ролі БНР у станаўленні беларускай дзяржаўнасці.

Амаль сем савецкіх дзесяцігоддзяў даследчыкі не мелі практычнай магчымасці вывучаць дзейнасць першых магілёўскіх беларускіх патрыётаў. Максімум дазволенага ў савецкі час тычыўся згадак дзейнасці "беларускіх буржуазных нацыяналістаў". Нядзіўна, што Магілёўскі Беларускі Камітэт, як і Беларуская Народная Рэспубліка, былі выкрэслены з масавай гістарычнай свядомасці.

Толькі ў незалежнай Рэспубліцы Беларусь стала магчымым усебакова і комплексна даследаваць раней забароненыя тэмы. З'яўляюцца публікацыі А. Агеева, Ю. Васілеўскага, А. Вараб'ёва, А. Горнага, Р. Жук-Грышкевіч, Д. Лаўрыновіча, Л. Луцкевіча, У. Ляхоўскага, І. Пушкіна, С. Рудовіча, А. Сідарэвіча і інш., якія закранаюць асобныя бакі стварэння і дзейнасці Магілёўскага Беларускага Камітэта[39]. У часопісе "Спадчына" былі апублікаваны ўспаміны М. Кахановіча[40].

---

[39] Агееў А.Р. Эвакуацыя архіва Магілёўскага Беларускага Камітэта ў Вільню восенню 1918 года // Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць: зб. навук. прац VIII Міжнар. навук. канф. / уклад.: А.М. Бацюкоў, І.А. Пушкін. Магілёў, 2013. С. 9–13; Агееў А.Р., Пушкін І.А. Магілёўскі беларускі камітэт і палітычнае самавызначэнне магілёўцаў напрыканцы Першай сусветнай вайны // Романовские чтения – 10 : сб. статей Международной науч. конференции / под общ. ред. И.В. Шардыко. Могилев, 2015. С. 64–65; Васілеўскі Ю. Кахановіч Міхаіл Сілуянавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. Мінск, 1997. Т. 4. С. 153; Васілеўскі Ю. Успаміны Міхаіла Кахановіча "Іван Луцкевіч у Магілёве" // Ратуша. – 1993. 14–20 кастр. С. 6; Воробьев А.А. Выборы во Всероссийское Учредительное собрание на территории Беларуси и соседних российских губерний. Могилев, 2010; Горны А. Міхаіл Кахановіч: лёс інтэлігента // Краязнаўчая газета. 2013. № 14, крас. С. 4; Жук-Грышкевіч Р. Жыццё Вінцэнта Жук-Грышкевіча. Торонто–Канада, 1993; Лавринович Д.С. Либеральные организации России и белорусский национальный вопрос в 1917 г. // Веснік Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова. Серыя А. Гуманітарныя навукі. 2012. № 1. С. 4–10; Луцкевіч Л.А. Віленская беларуская гімназія // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. Мінск, 1994. Т. 2. С. 279–281; Ляхоўскі, У. Магілёўскі Беларускі Камітэт // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. Мінск, 1999. Т. 5. С. 24; Пушкін І.А. Дзейнасць Магілёўскага Беларускага Камітэта ў сферы міжнародных адносін (1917–1918 гг.) // Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць : зб. навук. прац VIII Міжнар. навук. канф. / уклад.: А.М. Бацюкоў, І.А. Пушкін. Магілёў, 2013. С. 302–310; Пушкін І., Агееў А. Стварэнне і дзейнасць Магілёўскага Беларускага Камітэта // Гарадзенскі социум 2013. Гісторыя і памяць. XV–XX стст. / пад рэд. А.К. Краўцэвіча і А.Ф. Смаленчука. Гродна,

Пачатак беларускай нацыянальнай арганізацыі ў Магілёве быў пакладзены сходам “асоб, што прызнаюць сябе беларусамі”, які адбыўся на кватэры адваката І.І. Рэўты 23.03.1917 г. Падчас пасяджэння на ім быў створаны Магілёўскі Беларускі гурток. Напачатку ён налічваў усяго 12 асоб. Сімвалічна, што менавіта з гэтага нешматлюднага пасяджэння дванаццаці магілёўскіх апосталаў беларускага руху ў горадзе распачынаецца працэс стварэння першай палітычнай нацыянальнай арганізацыі беларусаў Магілёва.

Па праву заснавальнікаў усе першыя члены арганізацыі вартыя быць пералічанымі пайменна: пад № 1 – ксёндз Данат Лапошка, надалей: Вікенцій Раум [неразборліва. – аўт.], Іван Аляксееў, Афанасій Галаўнёў, Уладзіслаў Пучынскі, Міхаіл Кахановіч, Валерыян Какашынскі, Вікенцій Кміта, кс. Пётр Краўяліс, Антон Куніцкі, Антон Жабінскі, Іван Рэўт[41]. Адным з найбольш актыўных членаў гуртка адразу вызначыўся выкладчык рэальнага вучылішча і рэдактар-выдавец штодзённай грамадска-палітычнай і літаратурнай газеты “Могилевский вестник” – Міхаіл Сілуянавіч Кахановіч.

Вось што аб першым сходзе паведаміў “Вестникъ Могилевского земства”: “Сход гуртка Магілёўскіх беларусаў. Па ініцыятыве асоб, якія пялегавалі думку аб адраджэнні да самастойнага жыцця беларускага народа, склаўся гурток з асоб, якія прызнаюць сябе беларусамі і жадаюць гэтага. У кватэры прысяжнага паверанага Рэўта адбыўся сход нешматлікі, але цесна злучаны аднадумствам і агульным жаданнем адрадзіць Беларусь у самастойным вольным жыцці. Мэта – стварыць у Магілёве саюз беларусаў, які выпрацуе правілы будучага ладу Беларусі і яе адносіны да Расіі, Польшчы, Літвы. Але перад тым як утварыць саюз беларусаў, вырашылі даведацца, у чым будуць заключацца дзеянні і пастановы з’езда беларускіх дзеячаў, які мае адбыцца ў г. Мінску. Аднагалосна

2014. С. 212–229; Пушкін І.А. Сход магілёўцаў вітаў Незалежнасць Беларусі (Жыццёвы лёс Міхаіла Кахановіча) // Гістарычнае і сацыякультурнае развіццё Магілёва : зборнік навуковых прац / уклад. І.А. Пушкін, В.В. Юдзін. Магілёў, 2007. С. 163–171; Пушкін І. Самавызначэнне беларусаў у Магілёве падчас Першай сусветнай вайны // Białoruskie Zeszyty Historyczne. Białystok, 2015. № 43. S. 158–184; Рудовіч С. У пошуках нацыянальнай ідэнтычнасці: Беларуская патрыятычная арганізацыя ў Магілёве ў 1917–1918 гг. // Мінулая і сучасная гісторыя Магілёва : зборнік навуковых прац / уклад. І.А. Пушкін. Магілёў, 2001. С. 203–209; Сідарэвіч А.М. Беларускі пасольскі клуб // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. Мінск, 1993. Т. 1. С. 451.

[40] Кахановіч Міхаіл. Магілёўцы і незалежнасць Беларусі (мае ўспаміны) // Спадчына. 1997. № 6. С. 3–5.

[41] Спіс Магілёўскага Беларускага гуртка // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 136. Арк. 14.

вырашылі прыняць удзел у гэтым з’ездзе ў асобах выбраных прадстаўнікоў: настаўніка рэальнага вучылішча М.С. Кахановіча ад праваслаўных беларусаў і настаяцеля Магілёўскага касцёла Лапошкі ад беларусаў-католікаў. Іх забяспечылі неабходнымі паўнамоцтвамі гуртка”[42].

Варта адзначыць, што ў пратаколе сходу, які захоўваецца ў фондах БДАМЛМ, пазначана, што “для прысутнасці ў г. Мінску на з’ездзе беларускіх партый і арганізацый у якасці дэлегатаў выбраны гр. Міхаіл Сілуянавіч Кахановіч і кс. Данат Лапошка”[43]. Няма ніводнага слова аб тым, што накіраваны яны ад праваслаўных ці католікаў. Магчыма, у газетнай публікацыі, друкуючы веравызнанне дэлегатаў, падкрэслівалася імкненне беларусаў Магілёва ад самага пачатку дзейнасці гуртка да нацыянальнага адзінства і пераадолення канфесійнай раз’яднанасці народа.

З’езд беларускіх нацыянальных арганізацый адбыўся ў Мінску 25–27.03.1917 г. Паказальна, што адна з прывітальных тэлеграм з’езду была ад спадара М. Булгака з Магілёва. Акрамя магілёўцаў, на з’ездзе прысутнічаў і дэлегат ад Бабруйскага беларускага гуртка – Кілчэўскі[44].

На з’ездзе асаблівай актыўнасцю вызначыўся М. Кахановіч. Ён выступіў з прывітаннем “ад гуртка магілёўскіх беларусаў і педагогаў”, затым быў абраны ў склад агітацыйна-палітычнай, арганізацыйнай камісій[45]. Таксама ён стаў сакратарам адной з найважнейшых камісій з’езда – этнаграфічнай, якая займалася пытаннямі вызначэння межаў Беларусі.

На другі дзень з’езда былі выступленні і абмеркаванні дакладаў прадстаўнікоў камісій. Б. Тарашкевіч рабіў даклад ад школьнай камісіі і, у прыватнасці, адзначыў (на мове арыгіналу): “Апроч падручнікаў, ні менш важнай перашкодай для ўвядзення беларускай мовы ў школі – гэта тое, што у ёй мала вучыцелеў беларусаў, бо, як паказаў гр. Кахановіч, быўшы інспектар народных вучылішчаў, у такой напрыклад Магілёўскай губерніі, чыста беларускай, блізка

[42] Собрание кружка Могилевских белоруссов // Вестникъ Могилевского земства. 1917. № 4. – С. 35.
[43] Спіс Магілёўскага Беларускага гуртка // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 136. Арк. 14.
[44] Пратакол з’езду беларускіх нацыянальных арганізацый у Мінску 25–27.03.1917 г. // НАРБ. Фонд 325. Воп. 1. Спр. 3. Арк. 1.
[45] Тамсама. Арк. 1 адв.

што скрозь вучыцелі і вучыцелькі велікарусы, каторыя не ведаюць мовы беларускай”[46].

Ад этнаграфічнай камісіі дакладаў яе сакратар М. Каха-новіч, як пазначана ў пратаколе, – рэдактар “Магілёўскага Весніка”. У сваім выступленні ён ад імя камісіі адзначыў, што апошняя прыйшла да высновы: межы Беларусі вызначаюцца рассяленнем беларускага народа ў складзе губерняў – Мінскай, Гродзенскай, Магілёўскай, часткі Смаленскай і Чарнігаўскай. Камісія прапанавала з’езду выказаць Часоваму ўраду пратэст супраць уключэння літоўцамі ў склад Літвы ўсёй Віленскай губерніі, заселенай на s беларусамі. З’езд пагадзіўся з дадзенымі высновамі і прапановамі[47].

Быў створаны каардынацыйны орган нацыянальнага руху – Беларускі Нацыянальны Камітэт (БНК). М. Кахановіча выбралі членам БНК і ўключылі ў склад дэлегацыі ў Петраград да Часовага ўрада[48]. Беларускі Нацыянальны Камітэт па ініцыятыве Беларускай сацыялістычнай грамады (БСГ) зрабіў спробу дабіцца ад Часовага ўрада перадачы ўлады Беларускай краёвай радзе. Аднак расійскія ўлады не падтрымалі гэту просьбу[49].

БНК утвараўся для выпрацоўкі ў кантакце з Часовым Урадам асноў аўтаноміі Беларусі ў складзе Расійскай Федэратыўнай рэспублікі і падрыхтоўкі выбараў у Беларускую краёвую раду. БНК патрабаваў ад Часовага ўрада забеспячэння дэмакратызацыі мясцовага кіравання, увядзення выкладання ў школах краю беларускай мовы, гісторыі Беларусі, краязнаўчых дысцыплін, кампенсацыі насельніцтву страт па прычыне ваенных дзеянняў. Часовы ўрад меў з БНК трывалыя сувязі, але канкрэтныя прапановы членаў Камітэта не знайшлі падтрымкі ва ўрадавых колах.

Па вяртанні са з’езда ў Магілёў М. Кахановіч зрабіў на сходзе (прысутнічала каля 40 чалавек) грунтоўную справаздачу пра з’езд і адначасова надрукаваў яе ў рэдагаванай ім газеце “Могилевский вестник”. Неабходна падкрэсліць, што беларускае пытанне на старонках магілёўскага друку было амаль такім папулярным, як

[46] Пратакол з’езда беларускіх нацыянальных арганізацый у Мінску 25–27.03.1917 г. // НАРБ. Фонд 325. Воп. 1. Спр. 3. Арк. 2.

[47] Тамсама.

[48] Пратакол з’езда // LCVA. Фонд 582. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 48–49 адв.; Пратакол з’езда беларускіх нацыянальных арганізацый у Мінску 25–27.03.1917 г. // НАРБ. Фонд 325. Воп. 1. Спр. 3. Арк. 1–2 адв.

[49] Рудовіч С. Час выбару: Праблема самавызначэння Беларусі ў 1917 годзе. Мінск, 2001. С. 123.

пытанне аб пастаўках і закупках хлеба для гараджан. Яно на працягу 1917–1918 гг. літаральна не сыходзіла са старонак мясцовых газет, у тым ліку дзякуючы публіцыстычнай актыўнасці сяброў Магілёўскага Беларускага Камітэта.

У апошні дзень сакавіка 1917 г. у памяшканні Магілёўскага павятовага з'езда пад старшынствам Мікалая Пахомава адбыўся сход магілёўцаў, якія ўваходзілі ў склад беларускага гуртка або падзялялі яго мэты, на якім быў выбраны арганізацыйны камітэт па стварэнні ў Магілёве "Нацыянальнага Губернскага Беларускага Камітэта". У лісце да Магілёўскага губернскага камісара па справе рэгістрацыі Камітэта прыведзена іншая назва – "Магілёўскі Беларускі Арганізацыйны Камітэт" (МБАК)[50].

Чацвёртага красавіка на сходзе было выбрана кіраўніцтва Камітэта. Прысяжны паверaны І. Рэўт быў абраны старшынёю[51]. У МБАК увайшлі 24 асобы, ва ўправу – 12: в.а. дырэктара народных вучылішчаў І. Рэўт (старшыня), беларускі гісторык і археограф Д. Даўгяла (намеснік старшыні), студэнт М. Кажамяка (сакратар), члены акруговага суда І. Раманкевіч (скарбнік), В. Какашынскі, В. Кміта, інспектар вышэйшых пачатковых вучылішчаў, этнограф і фалькларыст І. Сербаў, ксёндз Д. Лапошка, выкладчыкі сярэдніх навучальных устаноў М. Кахановіч, А. Прэферансаў, Я. Аляхновіч і М. Пахомаў (пасля яго ад'езду з Магілёва ў склад МБАК увайшла А. Плебанская). Членамі-супрацоўнікамі МБАК сталі: М. Судзілоўскі, А. Семяненка, А. Раждзественскі, А. Гарбачык, У. Бачкоўскі, Ф. Ляхтановіч, Анатоль і Алёна Малевіч[52]. Былі створаны наступныя секцыі: палітычная – 11 чалавек; этнаграфічная – 4; школьная – 8; культурна-асветніцкая – 11; арганізацыйная – 9; фінансавая – 4[53].

З успамінаў М. Кахановіча ў 1921 г.:

"...Пад гул раскатаў рэвалюцыі і акупацыі магілёўскія беларусы сталі патроху гуртавацца і арганізоўвацца. Залажылі Беларускі Камітэт,

---

[50] Заява Магілёўскага Беларускага Арганізацыйнага Камітэта ад 15.04.1917 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 137. Арк. 20–20 адв.

[51] Пратакол сходу Магілёўскага Беларускага Арганізацыйнага Камітэта 7.04.1917 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 136. Арк. 19.

[52] Склад секцый // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 136. Арк. 10–11; Ляхоўскі У. Магілёўскі Беларускі Камітэт // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. Т. 5. Мінск, 1999. С. 24; Рудовіч С. У пошуках нацыянальнай ідэнтычнасці: Беларуская патрыятычная арганізацыя ў Магілёве ў 1917–1918 гг. С. 203–204.

[53] Склад секцый. Пратакол сходу МБАК 19.05.1917 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 136. Арк. 10–11, 25–26 адв.; Месцы беларускай працы // LCVA. Фонд 582. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 29.

у які адразу-ж пайшлі лепшыя сілы беларускай інтэлігенцыі, ня ўтраціўшай нацыянальнага пачуцьця. Новай арганізацыі адразу-ж прышлося вытрымаць барацьбу з старажытнымі грамадзянскімі групіроўкамі, як, напрыклад, кадэцкая партыя, а з другога боку – з усерасійскімі рэвалюцыйнымі партыямі інтэрнацыянальнага толку, якіх расплядзілася тады шмат...”[54].

Пратаколы першых пасяджэнняў дазваляюць нам вызначыць кола інтарэсаў і асноўныя кірункі дзейнасці МБК і іншых беларускіх камітэтаў краіны. Напрыклад, 30.04.1917 г. на агульным сходзе беларускай грамадскасці Магілёва пасля прывітальнага слова старшыні МБАК І. Рэўта прагучалі даклады: М. Кажамякі “Развитие Белорусского края”, Д. Даўгялы “Историческое развитие Белорусского народа”, І. Сербава “Границы Белорусского края и народы, населяющие Белоруссию”, Я. Аляхновіча “Ближайшие задачи Могилевского Белорусского комитета и организация Белоруссии”, А. Пігулеўскага “О текущем моменте в связи с организацией Белоруссии”, М. Кахановіча “Белорусский съезд в Минске”. Напрыканцы членамі МБК былі выбраны яшчэ 12 асоб[55]. Па назвах дакладаў можна зрабіць выснову, што найбольш тагачаснае грамадства хвалявала пытанне дзяржаўна-палітычнага самавызначэння Беларусі (“организации Белоруссии”).

Магілёўскі Беларускі Арганізацыйны Камітэт 7 красавіка 1917 года на чарговым сходзе зацвердзіў праект статута[56]. Паўторна разгледзелі статут і канчаткова яго зацвердзілі 18.04.1917 г.[57] Аднак за тры дні да гэтага, 15.04.1917 г., на імя Магілёўскага губернскага камісара была пададзена заява з просьбай зарэгістраваць арганізацыю[58]. 24.04.1917 г. з “Магілёўскай губернскай установы па справах аб арганізацыях” быў атрыманы адказ (пасведчанне) аб рэгістрацыі Магілёўскага Беларускага Арганізацыйнага Камітэта пад № 247[59].

[54] Кахановіч Міхаіл. Магілёўцы і незалежнасць Беларусі (мае успаміны). С. 3–5.
[55] Пратакол сходу 30.04.1917 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 136. Арк. 24.
[56] Пратакол сходу Магілёўскага Беларускага Арганізацыйнага Камітэта 7.04.1917 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 136. Арк. 20.
[57] Пратакол сходу Магілёўскага Беларускага Арганізацыйнага Камітэта 18.04.1917 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 136. Арк. 21.
[58] Заява Магілёўскага Беларускага Арганізацыйнага Камітэта ад 15.04.1917 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 137. Арк. 20–20 адв.
[59] Ліст у Магілёўскі Беларускі Арганізацыйны Камітэт ад 24.04.1917 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 137. Арк. 57.

Першапачатковы статут Беларускага арганізацыйнага камітэта ў Магілёве быў дастаткова сцíслым але выразным. Сваёй задачай сябры арганізацыі ставілі аб’яднанне ўсяго беларускага насельніцтва Магілёўскай губерні ў мэтах: “а) аказання падтрымкі Часоваму ўраду ў барацьбе са знешнім ворагам і ў справе ўладкавання Расіі на пачатках дэмакратычнай рэспублікі; б) арганізацыі выбараў ва Усерасійскі ўстаноўчы сход; в) распрацоўкі пытанняў, якія належаць вырашэнню Устаноўчым сходам у згодзе з нацыянальнымі імкненнямі беларускага народа, а таксама г) эканамічнага і культурнага ўладкавання Беларусі”. Для дасягнення азначаных мэт Камітэт згодна з палажэннямі статута меў права ўваходзіць у зносіны з іншымі арганізацыямі беларускіх губерняў, адкрываць свае аддзяленні ва ўсіх пунктах губерні, дзе ў тым будзе патрэба, засноўваць чытальні, наладжваць лекцыі, сходы, веча, вечарыны, тэатральныя паказы, выдаваць газеты, часопісы, кнігі, заклікі. Камітэт меў права набываць нерухомую і рухомую маёмасць, заключаць дамовы, прымаць ахвяраванні і выдаткоўваць свае сродкі адпаведна задачам. Арганізацыйны камітэт прымаў у свае члены грамадзян-беларусаў, якія спачувалі “беларускаму нацыянальнаму развіццю” і заплацілі членскія ўзносы не меншыя за 50 капеек. Кіраваць справамі арганізацыйнага камітэта павінны былі разам старшыня, памочнік старшыні, скарбнік і сакратар [60].

Гэты кароткі дакумент быў дастакова ёмістым і канкрэтным. Ён дазваляў арганізацыі ў далейшым паспяхова функцыянаваць. Дэкларацыя падтрымкі Часовага ўрада не павінна засмучаць сучаснага чытача. У 1917 г. Часовы ўрад успрымаўся сучаснікамі і быў насамрэч рэвалюцыйным органам, які павінен быў вызваліць Расію ад самадзяржаўных перажыткаў і забяспечыць дэмакратычныя перамены. Да таго ж кіраўніцтва Камітэта адразу агаварылася, у якіх мэтах і межах яно будзе падтрымліваць гэты ўрад.

Беларускі Нацыянальны Камітэт ў ліпені замяніла Цэнтральная рада беларускіх арганізацый (ЦРБА), якая ў кастрычніку 1917 г. была пераўтворана ў Вялікую Беларускую Раду (ВБР). Удагон за зменай назваў цэнтральных беларускіх органаў мяняліся назвы і Магілёўскага камітэта. Архіўныя дакументы раскрываюць эвалюцыю назваў арганізацыі беларусаў горада Магілёва. Ад 23.03.1917 года – Магілёўскі Беларускі гурток, з 31.03.1917 – Магілёўскі

---

[60] Лавринович Д.С. История либерального движения в Беларуси начала XX века: учебно-методический комплекс. Могилев, 2011. С. 136–137.

Беларускі Арганізацыйны Камітэт, з чэрвеня 1917 па снежань 1917 – Магілёўскі Беларускі Камітэт, са снежня 1917 – Магілёўская Беларуская Рада. Апошняя назва ў дакументах сустракаецца з кастрычніка 1917 г., у тым ліку і на бланках МБК. Наогул напачатку планавалася назва "Нацыянальны губернскі Беларускі камітэт". Таксама сустракаецца варыянт назвы "Магілёўскае беларускае культурна-асветніцкае таварыства". Агульны Сход арганізацыі ў некаторых пратаколах абазначаны як "Магілёўскі Беларускі Нацыянальны сход".

Кіравалі Магілёўскім Беларускім Камітэтам: ад 4.04.1917 да 19.05.1917 г. – І. Рэўт, з 24 мая да 20 кастрычніка 1917 – В. Какашынскі, ад 20 кастрычніка 1917 і да восені 1918 – М. Кахановіч[61]. МБК спыніў сваю дзейнасць напрыканцы 1918 г.

Такім чынам, архіўныя дакументы сведчаць, што правядзенне з'езда беларускіх нацыянальных арганізацый падштурхнула і паскорыла аб'яднанне беларусаў Магілёва ў беларускі гурток, які надалей пераўтварыўся ў паўнавартасную грамадскую арганізацыю. Можна адназначна сцвярджаць, што Магілёўскі Беларускі Камітэт як грамадская арганізацыя афіцыйна з'явіўся і легалізаваўся ўжо ў красавіку 1917 года – на працягу першага месяца пасля абвяшчэння аб сваім нараджэнні. А вось працэс фарміравання, удасканальвання і шліфавання яго статутных і праграмных дакументаў, арганізацыйнай структуры, вызначэння лідара арганізацыі і нават найменця расцягнуўся больш чым на год. Заснавальнікамі беларускага камітэта былі выкладчыкі навучальных устаноў горада, у тым ліку рэальнага вучылішча і настаўніцкага інстытута, работнікі суда, архіва, бібліятэк, чыгункі, земскіх устаноў, органаў гарадскога самакіравання.

Энергія і энтузіязм, імклівы ўваход у культурнае і грамадска-палітычнае жыццё горада і выхад за яго рамкі на нацыянальны ўзровень – характэрныя рысы дзейнасці членаў Магілёўскага Беларускага Камітэта на працягу 1917 г.

Адразу пасля ўзнікнення па ініцыятыве або пры актыўным удзеле членаў толькі што створанай арганізацыі адбылося даволі шмат значных падзей. Найбольшага поспеху камітэт дасягнуў у культурна-

---

[61] Пратакол сходу Магілёўскага Беларускага Арганізацыйнага Камітэта 19.05.1917 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 136. Арк. 25–26 адв.; Пратакол сходу МБАК 24.05.1917 г. // Тамсама. Арк. 28–29; Пратакол пасяджэння МБК 20.10.1917 г. // Тамсама. Арк. 51; Ляхоўскі У. Магілёўскі Беларускі Камітэт // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. Мінск: БелЭн, 1999. Т. 5. С. 24.

асветніцкай дзейнасці. Яго сябры выступалі за аднаўленне народных гулянняў і свят, спрыялі арганізацыі беларускага школьніцтва, бібліятэк, выдавецтваў, чыталі лекцыі па гісторыі і культуры Беларусі, садзейнічалі пашырэнню кааператыўнага руху і г. д.

Дні вольнай Беларусі, прымеркаваныя да свята Купалля, былі праведзены ў Магілёве 24–25 чэрвеня. Падчас свята дэманстраваліся дасягненні нацыянальнага мастацтва, чыталіся рэфераты па гісторыі Беларусі, распаўсюджваліся лістоўкі БНК. Вуліцы горада былі ўпрыгожаны плакатамі і нацыянальнымі беларускімі сцягамі, актывісты ў народных строях правялі скарбонкавы збор сродкаў на патрэбы беларускага руху, а ў ноч на Івана Купала на гарадскім вале адбылося гулянне[62], для якога быў запрошаны духавы аркестр Георгіеўскага батальёна[63]. У выніку агульная сума сабраных сродкаў склала 2083 руб. (з іх: у 43 скарбонках – 1041 руб. 98 кап., ад продажу квіткоў і ахвяраванні – 1044 руб. 96 кап., за кветкі – 50 руб. і інш.)[64]. Святкаванні прынеслі значны прыбытак: выдаткі склалі ўсяго 444 руб. 75 кап.[65]

Прадстаўнікі МБК увайшлі ў склад і актыўна дзейнічалі ў шэрагу грамадскіх устаноў горада Магілёва, павета і губерніі: М. Кахановіч разам з прадстаўнікамі іншых арганізацый горада увайшоў у створаны пры губернскім камісары Камітэт грамадскай бяспекі, В. Кміта быў дэлегаваны для ўдзелу ў пасяджэннях Магілёўскай губернскай земляной камісіі, М. Судзілоўскі і У. Лукін дэлегаваны ў Магілёўскі Павятовы Земскі сход, М. Кахановіч, В. Кміта, Д. Аляхновіч – у Магілёўскі выканаўчы камітэт. Восьмага ліпеня 1917 г. старшыня Магілёўскай губернскай земскай управы прасіў накіраваць прадстаўніка ад беларускай арганізацыі ў арганізацыйнае бюро, якое стваралася управай, па падрыхтоўцы агульнагубернскага з’езда па народнай адукацыі (на з’езд па адукацыі былі накіраваны чатыры прадстаўнікі ад МБК), прадстаўнікі МБК

[62] Пратакол пасяджэння камісіі па наладжванні скарбоначнага збору і гуляння на карысць Беларускага камітэта 12.06.1917 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 136. Арк. 34–35; Склад камісіі па наладжванні агульнагарадскога гуляння 24–25 чэрвеня 1917 г. // Тамсама. Спр. 137. Арк. 63 адв.; Склад камісіі па наладжванні скарбоначнага збору і гулянняў 23 і 24 чэрвеня 1917 г. // Тамсама. Спр. 136. Арк. 33 адв.

[63] Журнал выхадных папер МБК. 1917 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 137. Арк. 6.

[64] Пратакол пасяджэння МБАК 28.06.1917 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 136. Арк. 44 адв.

[65] Справаздача скарбніка ад 18.01.1918 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 136. Арк. 64 адв.

прысутнічалі на пасяджэннях Магілёўскага павятовага школьнага камітэта і інш.[66]

Колькасць прыхільнікаў Магілёўскага Беларускага Камітэта даволі хутка дасягнула некалькіх соцень чалавек[67]. Ствараліся яго структуры, у некаторых установах як самастойныя адзінкі. Напрыканцы 1917 – у пачатку 1918 г. быў арганізаваны беларускі гурток пры Магілёўскім рэальным вучылішчы[68], гісторыя стварэння і дзейнасці якога не даследавана[69]. Рабіліся захады па заснаванні філій МБК у павятовых гарадах губерні: Быхаве, Мсціслаўлі, Рагачове і інш[70]. Кіраўніцтва камітэта ўсталявала сувязі з Беларускім Нацыянальным Камітэтам у Мінску, Беларускім Народным Саюзам у Віцебску, Саюзам беларускай дэмакратыі ў Гомелі, Беларускім Камітэтам у Оршы, Беларускай Народнай Грамадой у Маскве і іншымі беларускімі арганізацыямі[71].

Члены Камітэта – пераважна прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі – шчыра віталі спробы нацыянальнага адраджэння, а палітычную мэту сваёй дзейнасці напачатку бачылі ў стварэнні Беларускай аўтаномнай адміністрацыйнай адзінкі ў складзе Расіі. Перспектывы жыцця Беларусі ў складзе дэмакратычнай Расіі або незалежнай Беларусі выклікалі дыскусіі і нават канфліктныя сітуацыі, што

[66] Ліст МБАК ад 20.05.1917 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 137. Арк. 22; Пастанова МБК ад 3.06.1917 г. // Тамсама. Арк. 26; Пастанова Магілёўскага Беларускага Нацыянальнага схода ад 6.06.1917 г. // Тамсама. Арк. 27; Ліст ад 8.07.1917 г. // Тамсама. Арк. 79–79 адв.; Ліст ад 24.07.1917 г. у МБАК ад Магілёўскай губернскай земскай управы // Тамсама. Арк. 84–84 адв.; Ліст у Магілёўскую Беларускую Раду ад 19.10.1917 г. // Тамсама. Арк. 99.

[67] 20 чэрвеня 1917 г. былі выдадзены пасведчанні членаў МБК пад нумарамі: 135, 136, 137. Журнал выходных папер МБК. 1917 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 137. Арк. 6.

[68] Пратакол пасяджэння ВК МБР 18.01.1918 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 136. Арк. 62 адв.; Статут Беларускага гуртка рэалістаў (рэальнага вучылішча) // LMAVB RS. Фонд 21. Спр. 2218. Арк. 46 а.

[69] У аддзеле рукапісаў Цэнтральнай бібліятэкі Акадэміі навук Літвы (г. Вільнюс) захоўваецца статут гуртка, які падпісаны кіраўніцтвам і замацаваны пячаткай “Белорусскій Кружокъ реалистовъ. Могилев губ.” Дзейнасць гуртка не асвятляецца і ў працы даследчыка беларускіх маладзёжных арганізацый У. Ляхоўскага (Ляхоўскі У. Чыннасць беларускіх маладзёвых арганізацый у 2-й палове XIX ст. – 1939 г. Беласток, 2012. С. 96, 213–215).

[70] Ліст МБАК ад 5.06.1917 г. у г. Быхаў да гр. Мезаўцова з просьбай арганізаваць у горадзе мясцовы аддзел Беларускага камітэта // LMAVB RS. Фонд. 21. Спр. 2071. Арк. 1; Ліст МБАК ад 9.06.1917 г. у Мсціслаў А. Кавалёву аб арганізацыі ў Мсціслаўскім павеце беларускага камітэта // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 137. Арк. 25; Адказ дырэктара Рагачоўскай настаўніцкай семінарыі аб арганізацыі беларускага аддзела ад 18.07.1917 г. // Тамсама. Арк. 81.

[71] Ляхоўскі У. Магілёўскі Беларускі Камітэт // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. Мінск, 1999. Т. 5. – С. 24.

абумовіла цікавасць Камітэта як да ўнутранага ўладкавання Беларусі, так і да знешняй палітыкі, а таксама да дзейнасці ў сферы міжнародных адносін.

Прадстаўнікі Магілёўскага Беларускага Камітэта прымалі ўдзел у працы Першай Сесіі Цэнтральнай Рады Беларускіх Арганізацый у Мінску 5–6.08.1917 г., якая праходзіла ў памяшканні "Беларуская хатка". На сесіі быў зацверджаны Статут Цэнтральнай Рады беларускіх арганізацый як "кіраўніка і прадстаўніка ўсёй беларускай справы". Рада пастанавіла паслаць дэлегатаў у Кіеў на нараду (з'езд) "недзяржаўных народаў". Сярод іншых дэлегаваўся адзін прадстаўнік ад Магілёва[72].

Ідэю надання беларусам нацыянальна-тэрытарыяльнай аўтаноміі ў межах іх этнічнага рассялення падтрымлівалі прадстаўнікі беларускіх партый і арганізацый, якія ўдзельнічалі ў рабоце Дзяржаўнай нарады ў жніўні 1917 г., якая адбылася ў Маскве, Усерасійскай дэмакратычнай нарады (Петраград) і З'езда народаў Расіі (Кіеў) у верасні гэтага ж года.

У Маскве дэлегаты падтрымалі праграму перабудовы Расіі на аснове права нацый (у тым ліку беларусам) на аўтаномію, а таксама патрабавалі адмяніць усе віды нацыянальных абмежаванняў, абвясціць раўнапраўе моў, стварыць пры Часовым урадзе нацыянальны савет з прадстаўнікоў усіх народаў Расіі і даць ім магчымасць правесці нацыянальныя ўстаноўчыя сходы.

З'езд народаў Расіі ў Кіеве быў скліканы 21–28 жніўня (8–15 верасня) 1917 г. па ініцыятыве Украінскай Цэнтральнай рады. У ім бралі ўдзел прадстаўнікі грузін, літоўцаў, татар, латышоў, эстонцаў, беларусаў, малдаван, данскіх казакаў, буратаў і яўрэяў, у іх ліку прадстаўнік МБК[73]. У прынятай рэзалюцыі з'езд выказаўся за "федэратыўнае ўпарадкаванне дзяржавы Расійскай" і ў якасці неадкладнай меры прапанаваў прыдаць статус аўтаноміі "вялікім краям, заселеным адной нацыянальнасцю" [пераклад. – аўт.]. Для экстэрытарыяльных народаў абвяшчалася права на нацыянальна-персанальную аўтаномію. З'езд пастанавіў вызначыць для Часовага ўрада неабходнасць рэарганізаваць "Асобную нараду па абласной рэформе ў адмысловы савет нацыянальнасцей як орган для абароны

[72] Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Вільня–Нью-Ёрк–Менск–Прага, 1998. Т. 1. Кн. 1. С. 13.
[73] Ліст выканаўчага камітэта Цэнтральнай Рады Беларускіх арганізацый у МБК ад 26.08.1917 г. за подпісам Я. Лёсіка // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 137. Арк. 85.

інтарэсаў народнасцей”. Гэты орган прапаноўвалася стварыць для правядзення ў жыццё тых мерапрыемстваў, якія “акажуцца неабходнымі пры здзяйсненні асноўных задач нацыянальнага і абласнога аўтаномна-федэратыўнага будаўніцтва і арганізацыі саюза народаў”. З’езд таксама прыняў рашэнне стварыць “асобы паўнамоцны орган – Савет народаў”.

Кіеўскі з’езд народаў і абласцей Расіі не толькі прыняў праграму федэратыўнай перабудовы расійскай дзяржавы, але і сярод іншых прыняў “Рэзалюцыю аб Беларусах”, у якой падкрэслівалася трагічнае становішча беларусаў, якіх падзяліла лінія фронту, і меўся заклік да Часовага ўрада неадкладна прыняць акт аб аўтаноміі Беларусі: “Аб аўтаноміі Беларусі ў межах Расійскай Дэмакратычнай Рэспублікі” з абавязковым далучэннем да аўтаноміі Беларусі захопленых ворагам тых мясцовасцей, у межах якіх былі расселены прадстаўнікі беларускага этнасу[74]. Урад Керанскага нічога рэальнага ў гэтым кірунку не зрабіў, але сама пастаноўка пытання сыграла станоўчую ідэалагічную і інфармацыйную ролю пры абмеркаванні беларускага пытання ў будучым[75].

Вірлівы пачатак практычнай дзейнасці МБК быў шматабяцаючы. Сябры камітэта актыўна ўдзельнічалі і нават шмат ў чым вызначалі парадак дня гарадскога жыцця. Яны не толькі зрабілі камітэт уплывовай і адметнай магілёўскай арганізацыяй, але і паспяхова спрабавалі выйсці на агульнадзяржаўны расійскі ўзровень дзейнасці.

Адной з важных палітычных кампаній, накіраваных на рэалізацыю палітычных правоў расійскіх грамадзян, былі мясцовыя выбары 1917 г. Рэвалюцыйны Часовы ўрад меў план пабудовы дэмакратычнай краіны, для чаго ў Расіі ў 1917 г. было праведзена тры выбарчыя кампаніі: у гарадскія думы, валасныя земствы і Устаноўчы сход. Выбары цяпер адбываліся шляхам усеагульнага, роўнага, прамога і тайнага галасавання. У іх удзельнічалі не толькі палітычныя партыі, але і грамадскія арганізацыі, якія мелі права вылучэння кандыдатаў.

Першымі ў жніўні па новых дэмакратычных правілах прайшлі выбары ў гарадскія думы. Для іх правядзення ў красавіку 1917 г. Часовы ўрад Г. Львова зацвердзіў палажэнне “Аб вытворчасці

[74] Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. : у 2 кн. Мінск, 2011. Кн. 1. С. 329.
[75] Лазько Рыгор. Супрацоўніцтва ленінскага Саўнаркама з беларускім нацыянальным рухам напярэдадні Усебеларускага з’езда 1917 г. // Беларускі гістарычны часопіс. 2015. № 11. С. 6–7.

выбараў галосных гарадскіх дум, аб участковых гарадскіх упраўленняў”. Усе гараджане незалежна ад полу, якія дасягнулі 20 гадоў, былі надзелены роўнымі выбарчымі правамі без адрознення нацыянальнасці і веравызнання. Мелі права выбараў і салдаты тылавых гарнізонаў. У першай дэмакратычнай выбарчай кампаніі 1917 г. актыўна ўдзельнічалі члены Магілёўскага Беларускага Камітэта і ён сам як палітычны суб’ект.

Упершыню ў гісторыі Магілёва ўсеагульныя, роўныя і прамыя пры тайным галасаванні выбары ў Магілёўскую гарадскую думу адбыліся 13.08.1917 г. Яны дазволілі МБК яшчэ мацней заявіць пра сябе і праверыць свой рэйтынг сярод гараджан. Па сутнасці, менавіта на гэтых выбарах нацыянальная беларуская палітычная плынь упершыню ў Магілёве была гучна прадстаўлена і мела поспех.

На пасяджэнні МБК першы раз пытанне пра выбары ў Гарадскую Думу было разгледжана 28.06.1917 г. З дакладам “Аб маючых адбыцца выбарах у Магілёўскую Гарадскую Думу і аб удзеле ў гэтых выбарах камітэта” выступіў Міхаіл Кахановіч. Пастанавілі вырашэнне гэтага пытання перадаць на разгляд агульнага сходу магілёўскіх беларусаў. Для распрацоўкі праграмы дзеянняў было прапанавана правесці 3 ліпеня агульны сход беларусаў г. Магілёва[76].

Пасяджэнне пад старшынствам Д.І. Даўгялы ад 16.07.1917 г. вызначыла колькасць кандыдатаў (пяць) ад членаў камітэта ў гласныя гарадской думы. Закрытай балаціроўкай былі абраны М. Кахановіч, В. Лукін, Я. Аляхновіч, А. Малевіч, Белаброўскі[77]. Было вырашана зрабіць стаўку на саюз з домаўласнікамі Магілёва і адстойваць інтарэсы карэнных жыхароў горада. Надалей быў сфармаваны спіс кандыдатаў у гласныя гарадской думы на будучых выбарах ад прагрэсіўнага насельніцтва ўскраін горада Магілёва і Беларускага Нацыянальнага Камітэта[78].

Да выбараў была надрукавана спецыяльная ўлётка – зварот да выбаршчыкаў. Улётка, безумоўна, мела адраджэнскі і прапаган-

---

[76] Пратакол пасяджэння МБНК 28.06.1917 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 136. Арк. 44–44 адв.

[77] Пратакол пасяджэння МБК 16.07.1917 г. // Тамсама. Арк. 46.

[78] Зварот з праграмай і агітацыйным матэрыялам Магілёўскага беларускага камітэта да насельніцтва Магілёва з нагоды выбараў 13.08.1917 г. // LMAVB RS. Фонд 21. Спр. 2251. Арк. 7; Спіс прагрэсіўнага насельніцтва ўскраін горада Магілёва і Беларускага Нацыянальнага Камітэта – кандыдатаў у гласныя гарадской думы на выбарах 13.08.1917 г. // Тамсама. Спр. 2218. Арк. 22–24 адв.

дысцкі характар. Відавочны акцэнт у ёй рабіўся на апеляцыю да прыніжанага стану беларусаў у Расійскай імперыі. Звярталася ўвага на тое, што "усё багацце краю вырвана з яго рук", што "ў багатых маёнтках сядзяць, за нешматлікімі выключэннямі, не беларусы", а "ў гарадах вядуць гандаль таксама не беларусы". Канстатавалася, што "абуджаны пасля доўгіх стагоддзяў палітычнай, культурнай і эканамічнай няволі народ наш бачыць родную Беларусь убогай, беднай, культурна-адсталай", што сёння "беларус павінен трываць моўчкі здзекі няпрошаных "культурных" гаспадароў краю". Рабіўся недвухсэнсоўны вывад аб прычынах бядотнага стану і неабходнасці нацыянальнага вызвалення: "Вось відавочны вынік шматвяковай працы няпрошаных гаспадароў!!! Так далей працягвацца не павінна. Беларус не можа заставацца рабом, які абслугоўвае чужыя інтарэсы. Ён мае права, ён павінен падумаць пра сябе і пра сваю будучыню"[79].

Разам з кароткатэрміновай арыентаванасцю заклiку на будучыя выбары ў ім адлюстраваны і праграмныя накірункі дзейнасці Камітэта, і палітычныя погляды яго сяброў. Так, з яго тэксту вынікае жыццёвая неабходнасць нацыянальнага адраджэння; пазначана асноўная сацыяльная база беларускага руху – сялянства і выхадцы з вёскі ў гарадах, жыхары гарадскіх ускраін; прадэманстравана бачанне членамі камітэта палітычна адзінага лёсу беларусаў і іншых народаў Расіі ў новай дэмакратычнай дзяржаве, яшчэ ўласцівае ім у жніўні 1917 г.; шматразова дэкларавана прыхільнасць дэмакратычным каштоўнасцям; вызначаны беларускі падыход да міжнацыянальных адносін і г. д.

Для надання аўтарытэту свайму перадвыбарчаму блоку і плённай будучай дзейнасці ў гарадской Думе члены камітэта сфармулявалі і раздрукавалі "Муніцыпальную праграму Беларускага Нацыянальнага Камітэта і прагрэсіўнага насельніцтва ўскраін горада Магілёва на выбарах 13 жніўня 1917 г." У ёй БНК "у саюзе з жыхарамі ускраін, заселеных амаль выключна беларусамі і наогул рускімі", заклікаў ўсіх грамадзян беларусаў і рускіх аб'яднацца вакол агульнай муніцыпальнай праграмы, якая мела на мэце "ўзняцце культурнага добраўпарадкавання горада і галоўным чынам нашых гарадскіх магілёўскіх ускраін"[80].

---

79 Зварот з праграмай і агітацыйным матэрыялам Магілёўскага беларускага камітэта да насельніцтва Магілёва з нагоды выбараў 13.08.1917 г. // LMAVB RS. Фонд 21. Спр. 2251. Арк. 7.

80 Муниципальная программа Белорусского Национального Комитета и прогрессивного окраинного населения г. Могилева // LMAVB RS. Фонд 21. Спр. 2251. Арк. 26–26 адв.

Муніцыпальная праграма складалася з наступных асноўных частак: уводны заклік, харчовае пытанне, народная асвета, гарадское земства і вылучэнне горада ў самастойную земскую адзінку, жыллёвае пытанне, праца і яе ахова, санітарна-ўрачэбная частка, асвятленне і ацяпленне, арэнда гарадскіх зямельных участкаў, добраўпарадкаванне, гандаль і прамысловасць, фінансавая сістэма, грамадскае апекаванне, юрыдычная дапамога, рэвізія гарадскіх прадпрыемстваў.

Кожнаму з накірункаў праграмы нададзены адзін-два абзацы тэксту. Але само існаванне такіх накірункаў паказвае, што кіраўніцтва Камітэта валодала асновамі паліталагічнай пісьменнасці. Праграма закранае ўсе асноўныя патрэбы жыхароў тагачаснага Магілёва. Невыпадкова змест праграмы ўражвае чытача і сёння. Ён паказвае, як хутка і глыбока змаглі падрыхтавацца да выбарчай кампаніі беларускія нацыянальныя сілы. Многія тэзісы тагачаснай праграмы будуць заставацца актуальнымі яшчэ доўгія гады, а некаторыя і сёння.

Добра падрыхтаванай і плённай была перадвыбарчая агітацыя членаў МБК, якая праводзілася па нядзелях у царкоўных прыходах: Барыса-Глебскім (Даўгяла), Мікалаеўскім (Кахановіч), Саборным (Гарбацкі), Успенскім (Дзмітрыеў і Лукін), на Мышакоўцы (А. Малевіч)[81].

У сваіх успамінах Міхаіл Кахановіч тагачасныя падзеі апісвае наступным чынам:

“...Скора Беларускі Камітэт павінен быў памерацць свае сілы ў барацьбе за дэпутатскія крэслы ў мясцовай думе. Трэба прыняць пад увагу, што большасьць магілёўскага насяленьня складаецца з жыдоў і, значыцца, на долю не–жыдоў магло пры выбарах выпасьць найбольш 30 крэслаў з 62. Апрача таго, па выбарнаму закону права голасу мелі войскі і цэлая армія штабных і наагул вайсковых арганізацый, што яшчэ больш памяншала шансы Беларускага Камітэту. Аднак камітэт усё–ж заваяваў шэсьць крэслаў, што трэба лічыць вельмі добрым рэзультатам.

Адначасова Беларускі Магілёўскі Камітэт пашырыў сваю дзеяльнасць і на правінцыю. Залажыліся камітэты ў Воршы, Гомлю,

[81] Пратакол сходу членаў МБНК 15. 07. 1917 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 136. Арк. 45 адв.

Горках. Справа стала вырастаць і захапліваць людзёў з правінцыі...”[82].

Прадуманая і актыўная перадвыбарчая кампанія прынесла пэўны плён: за беларускі спіс прагаласавалі каля 2,1 тыс. гараджан, што дазволіла Камітэту атрымаць амаль дзясятую частку месцаў у Думе – 6 з 64. Па выніках выбараў быў створаны Беларускі Камітэт гласных Гарадской Думы г. Магілёва.

Адразу да яго пацягнуліся жыхары горада і прадмесцяў. Так, ад імя насельніцтва Лупалава (задняпроўскае прадмесце Магілёва) да Беларускага Камітэта гласных Гарадской Думы звярнуліся бацькі навучэнак Петрапаўлаўскай школы з просьбай аб адкрыцці настаўніцкай семінарыі: “Граждане – Белоруссы! Целые столетия стояла тьма над окраиной города Луполова! Только трактиры и пивные лавочки покрывали унылою сетью наше темное Луполово. И вот теперь, когда самосознание народностей прояснилось и народы увидели, в чем заключается его счастье, народ вместе с политическим самоопределением и защитой своих национальных черт, своей национальной души стал стремиться к образованию. Эта жажда образования охватила и нас **Луполовцев – белоруссов** [выдзелена аўт.], мы собрали из своих последних средств 13 тысяч рублей и просим открыть учительскую семинарию… 300 родителей совместно со всем населением Луполова просит Вас поддержать при голосовании открытие на Луполово учительской семинарии и тем дать счастье всему белорусскому Луполовскому населению…”[83].

Жнівеньскія дэмакратычныя выбары ў Магілёўскую гарадскую думу сталі важнай вяхой у дзейнасці Камітэта. Сябры арганізацыі і сам МБК, як палітычны суб’ект, актыўна і паспяхова ўдзельнічалі ў выбарчай кампаніі. Падчас мясцовых выбараў была распрацавана муніцыпальная праграма, якая адлюстроўвала патрэбы гарадскога насельніцтва Магілёва. Гэта дазволіла і самой арганізацыі больш выразна зразумець і сфармуляваць свае задачы, вызначыць сваю электаральную базу ў горадзе, а ў выніку павялічыць колькасць сваіх прыхільнікаў. Па выніках выбараў быў створаны Беларускі Камітэт гласных Гарадской Думы г. Магілёва. Яго існаванне

[82] Кахановіч Міхаіл. Магілёўцы і незалежнасць Беларусі (мае ўспаміны). С. 3–5.

[83] Ліст у Беларускі Камітэт гласных Гарадской Думы ад імя насельніцтва Лупалава і бацькоў Петра-Паўлаўскай школы. 19.10.1917 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 137. Арк. 103–103 адв.

дазволіла беларусам адстойваць свае інтарэсы ў Магілёўскай гарадской думе на працягу 1917–1918 гг.

Даволі шмат увагі сябры МБК надавалі пытанням аб стане беларускай мовы і беларускай школы. Так ці інакш, гэтыя пытанні перыядычна ўваходзілі ў парадак дня камітэта. Прычым разгляд пазіцый сяброў арганізацыі ў ходзе іх абмеркаванняў паказвае неадназначнасць і нават пэўную нявызначанасць магілёўскіх патрыётаў па гэтых праблемах.

Упершыню моўная сітуацыя стала прадметам шырокага абмеркавання на пасяджэнні агульнага сходу 7.06.1917 г. Пры разглядзе даклада аб выданні газеты паўстала пытанне: на якой мове будуць публікавацца матэрыялы? Прагучала меркаванне супраць выдання газеты на рускай мове, таму што гэтым русіфікуецца Беларусь. Але і выдаваць газету на такой беларускай мове, на якой выдавалася Мінская газета «Грамада», таксама палічылі немагчымым, "паколькі такая мова яшчэ больш не зразумелая, чым руская". Нарэшце М. Кахановіч заявіў, што ён прапануе выдаваць газету на літаратурнай рускай мове, а на беларускай мове змяшчаць фельетоны і карцінкі з мясцовага жыцця. А. Пігулеўскі для прыцягнення сялян вёскі беларускай прапанаваў выдаваць яе "на простай зразумелай рускай мове..."[84].

Восенню 1917 г. членамі МБК прызнавалася неабходнасць выкладання ў народных класах на беларускай мове, увядзенне ў вышэйшых пачатковых і сярэдніх вучэбных установах у якасці неабавязковага прадмета вывучэнне беларускай мовы, гісторыі Беларусі, этнаграфіі і геаграфіі краю. Пры гэтым на рускай мове рыхтуецца і выдаецца падрабязная праграма па курсу беларускай гісторыі. Захавалася значная частка пратаколаў МБК на цікавай ненармаванай "беларускай мове", але ў цэлым справаводства вялося па-руску.

Нявызначанасць па моўным пытанні заставалася нязменнай на працягу ўсяго перыяду існавання МБК. Вітаючы ў чэрвені 1918 г. "адраджэнне беларускай народнай мовы і росквіт беларускай літаратуры, паэзіі і мастацтва", Камітэт палічыў заўчасным увядзенне беларускай мовы як абавязковай у дзяржаўнае справаводства[85].

---

[84] Пратакол пасяджэння 7.06.1917 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 136. Арк. 32–32 адв.
[85] Пратакол № 5 пасяджэння Выканаўчага камітэта МБР 5.06.1918 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 136. Арк. 74; Местная жизнь. В исполнительном комитете могилевской белорусской рады // Труд. 1918. № 85. 13(01) чэрв. С. 4.

Такая супярэчнасць у пасылцы і вывадах была характэрнай з’явай у дакументах. Моўнае пытанне, магчыма, уздымалася і ў пачатку ліпеня 1918 г. падчас сустрэчы прадстаўнікоў ВК МБР і германскіх акупацыйных войск, бо напрыканцы размовы прадстаўнік апошніх прасіў забяспечыць яго перакладчыкам для друку яго распараджэнняў на беларускую мову[86].

У жніўні 1917 г. (згодна з І. Філіповічам, 19 верасня) у Магілёве адбыўся з’езд настаўнікаў сярэдніх школ Віленскай навучальнай акругі[87]. Па ініцыятыве М. Кахановіча, які выступіў з адпаведным дакладам, з’езд прыняў рэзалюцыю “аб неабходнасці выкладання ў народных класах беларускіх губерняў на беларускай мове, у вышэйшых пачатковых і сярэдніх вучэбных установах увесці ў якасці неабавязковага прадмета вывучэнне беларускай мовы, гісторыі Беларусі, этнаграфіі і геаграфіі краю...”[88].

З мэтай хутчэйшага выканання пастановы з’езда настаўнікаў члены МБК распрацавалі і аператыўна выдалі падрабязную праграму па курсе беларускай гісторыі[89]. Вось тут спатрэбіліся веды і педагагічныя навыкі М. Кахановіча, які скончыў гісторыка-філалагічны факультэт Харкаўскага ўніверсітэта і выкладаў гісторыю. Ці былі ў Кахановіча сааўтары, нам пакуль невядома.

Праграма па гісторыі Беларускага народа была прызначана для сярэдніх навучальных устаноў, настаўніцкіх інстытутаў, семінарый і для самаадукацыі. Яна пачынаецца з “Папярэдніх заўваг”, у якіх сцвярджаецца, што беларусы, “як славянскае, рускае племя, больш родныя велікарусам”, пералічваюцца этнасы, якія паўплывалі на фарміраванне беларусаў, даецца характарыстыка беларускім гаворкам і вызначаецца этнічная тэрыторыя Беларусі памерамі ў 68 паветаў розных губерній, з якіх 38 суцэльна беларускіх, а 11 напалову. Надалей выкладанне гістарычнай часткі пададзена ў

---

[86] Пратакол пасяджэння ВК МБР 11.07.1918 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 136. Арк. 79–79 адв.

[87] Филиппович И.И. Могилев. Хроника событий 1917–1918 (по архивным и печатным материалам). Могилев, 1995. С. 23.

[88] Для параўнання. 9–12 мая 1918 года адбыўся з’езд настаўнікаў Магілёўскага павета. Там наконт ужывання беларускай мовы ў навучальным працэсе было прынята рашэнне: “Ведя преподавание на русском языке, пользоваться белорусским языком, когда это является облегчением в работе обучения”. Пратакол пасяджэння ВК МБР 13.05.1918 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 136. Арк. 71–71 адв.

[89] Программа по истории Белорусскаго народа. Для средних учебных заведений, учительских институтов, семинарий и для самообразования. Издание Могилевскаго Белорусскаго Национальнаго Комитета. Могилев на Днепре, 1917.

храналагічна-тэматычным ключы. Матэрыял прапаноўвалася выкладаць ад першабытнасці да "рускага ўдзельнага перыяду", у які аўтар(ы) уключыў утварэнне і ранні перыяд гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. Таксама падрабязна разглядаецца перяд гісторыі Беларусі пасля заключэння ВКЛ і Польшчай Крэўскай уніі, самы "змрочны перыяд у жыцці беларускага народу", – уваходжанне ў склад Рэчы Паспалітай і нарэшце "Рускі самадзяржаўны перыяд". Трэба адзначыць, што па многіх праблемах аўтар(ы) выкладалі матэрыял з пазіцый заходнерусізма. Да станоўчых і метадалагічна апраўданых момантаў праграмы трэба аднесці вялікую ўвагу да гістарычнай тэрміналогіі і вызначэнняў.

Праграма па гісторыі беларускага народа лічылася выданнем Магілёўскага Беларускага Нацыянальнага Камітэта, была надрукавана ў электрадрукарні Б. Рабіновіча ў Магілёве на Дняпры. На працягу лістапада 1917 года МБК разаслаў па два асобнікі праграмы ў 78 навучальных устаноў Беларусі: Магілёва (у тым ліку і ў Магілёўскі настаўніцкі інстытут[90]), Бабруйска, Віцебска, Рэчыцы, Мазыра, Нясвіжа, Слуцка, Оршы, Веліжа, Невеля, Нова-Вілейкі, Свянцян, Гарадка, Мсціслаўля, Полацка, Мінска, Барысава, Рагачова, Клімавіч і інш.[91] Інфармацыя аб рашэннях з'езда настаўнікаў і выдадзенай праграме была шырока распаўсюджана сярод навучальных устаноў. У некаторых навучальных установах іх прапанова знайшла падтрымку педагагічных калектываў: у Нова-Вілейскай настаўніцкай семінарыі, Слуцкай жаночай дзяржаўнай гімназіі, Барысаўскай жаночай настаўніцкай семінарыі, Быхаўскай жаночай гімназіі і інш.[92].

Дакументы сведчаць, што пазіцыя МБК па моўным пытанні, у адрозненне ад меркаванняў многіх больш радыкальных дзеячаў беларускага руху, была ў 1917 г. абачлівай і нават асцярожнай. Інакш яе можна назваць рэалістычнай. Хаця беларусізацыя дваццатых гадоў пацвердзіла лёгкасць пераводу тагачасных дзяцей на беларускамоўнае навучанне, паказала, што праблема была ў нейкай ступені надуманай. Тым не менш Камітэт сыходзіў з таго, што школа не падрыхтавана да маментальнага пераходу да выкладання ўсіх прадметаў на беларускай мове. У той жа час МБК лічыў неабходным

---

[90] Журнал выхадных папер МБК. 1917 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 137. Арк. 11.
[91] Тамсама. Арк. 10–17.
[92] Лісты і квіткі аб перасылцы 1 руб. за 2 асобнікі праграмы // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 137. Арк. 109, 112, 113, 114. Арк. 114.

усяляк спрыяць развіццю беларускай літаратурнай мовы і школьніцтва, распаўсюджванню мовы сярод насельніцтва, стварэнню для яе магчымасці стаць мовай школьнага выкладання. Менавіта камітэт стаў лідарам краіны ў распрацоўцы праграмы гісторыі беларускага народа, якая была надрукавана восенню 1917 г. і з'явілася адным з першых, калі не першым у нашай краіне дакументам, у якім сістэматычна і метадычна выверана прапаноўвалася выкладанне гісторыі народа з тысячагадовай даўнінай.

Напрыканцы лета – у пачатку восені 1917 г. М. Кахановіч з паплечнікамі займаліся вылучэннем кандыдатаў на выбарах дэлегатаў ва Устаноўчы сход па г. Магілёве. 14 кастрычніка ў акружную камісію паступіў кандыдацкі спіс беларускіх арганізацый (Магілёўскай арганізацыі БСГ), які быў апублікаваны ў газеце "Могилевская жизнь" за 16–23 кастрычніка[93]. М. Кахановіч, Д. Даўгяла, П.А. Счансноўскі [Счансновіч у А. Вараб'ёва. – аўт.], Я. Аляхновіч, А.К. Лехтановіч упяцёх ад Магілёўскага Беларускага Камітэта ўвайшлі ў выбарчы спіс (налічваў усяго 15 асоб: 5 – МБК, 4 – Гомельскі саюз беларускай дэмакратыі, 3 – Аршанскі Беларускі народны камітэт, 3 – маскоўская Беларуская народная грамада) беларускіх арганізацый Магілёўскай губерні на выбарах ва Устаноўчы сход Расіі[94].

Гэты спіс быў складзены ў выніку перамоў з арганізацыямі Оршы (Аршанскі беларускі народны камітэт) і Гомеля (Гомельскі саюз беларускай дэмакратыі) і зацверджаны на агульным сходзе Беларускага Нацыянальнага Саюза, які адбыўся 12.10.1917 г. у г. Магілёве[95]. Ідэя агульнага спісу беларускіх арганізацый Магілёўскай губерніі спачатку знайшла падтрымку на з'ездзе ў Оршы, які адбыўся 8.10.1917 г.[96] і на рашэнні якога моцна паўплывалі "маскоўскія беларусы" на чале з А. Цвікевічам. На Магілёўскім агульным сходзе Беларускага Нацыянальнага Саюза прысутнічалі дэлегаты ад Аршанскай і Гомельскай арганізацый. Магілёўцы [менавіта такая саманазва ўжываецца ў пратаколе сходу. – аўт.] пасля абмеркавання таксама выступілі за фарміраванне адзінага

[93] Филиппович И.И. Могилев. Хроника событий 1917–1918. С. 24; Пратакол агульнага сходу Беларускага Нацыянальнага Саюза ад 12.10.1917 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 136. Арк. 50.
[94] Белорусский список (№ 8) // Горецкий вестник. 1917. 3 ноября. С. 2.
[95] Пратакол агульнага сходу Беларускага Нацыянальнага Саюза 12.10.1917 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 136. Арк. 49–50 адв.
[96] Журнал выходных папер МБК. 1917 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 137. Арк. 9.

спісу. Пад нумарам першым быў зацверджаны прадстаўнік Масквы (А. Цвікевіч), другім – ад Оршы (М.Р. Ляўковіч), трэцім – ад Магілёва (М. Кахановіч), чацвёртым – ад Гомеля (Д.Г. Гулевіч) і г. д. У сваім выступленні на сходзе аршанец М.Р. Ляўковіч адзначыў, што "мясцовая інтэлігенцыя мала надае ўвагі нацыянальнаму руху, але хутка надыдзе час, калі мы ўсё возьмем у свае рукі. Нам неабходна аб'яднацца і прыцягнуць увагу сялянскага асяроддзя, абудзіўшы ў яго народную самасвядомасць". І далей, пры абмеркаванні пытання правядзення з'езда беларускіх арганізацый, прапанаваў "**цэнтрам Беларусі зрабіць Магілёў** і па гэтай прычыне правесці з'езд"[97] [выдзелена аўт.].

Беларускія арганізацыі Падняпроўя прапаноўвалі 5.01.1918 г. склікаць у Магілёве з усёй Беларусі прадстаўнікоў земстваў, гарадскіх дум, саветаў, беларускіх партый і арганізацый і ўтварыць тут часовы орган кіравання краем – Беларускі народны савет. Яго галоўная місія палягала б у правядзенні выбараў у пастаянны орган улады – Беларускую краёвую думу. Гэта быў адзін з праектаў стварэння ў Беларусі самастойнай сістэмы ўлады[98]. Магілёў мог стаць першай сталіцай Беларусі ў XX стагоддзі[99]. Аднак быў выбраны іншы варыянт – Усебеларускі з'езд быў праведзены ў снежні 1917 г. у Мінску, за якім паступова і замацаваўся статус сталіцы[100].

20.10.1917 г. на пасяджэнні МБК выступіў прадстаўнік сацыял-дэмакратаў і БУНДа Сяўрук, які прапанаваў аб'яднанне беларускага і іх спісаў у адзін[101]. Але гэтая прапанова не знайшла падтрымкі з боку беларусаў Гомеля, Магілёва і Оршы.

Паралельна з удзелам у выбарчай кампаніі МБК супольна з Цэнтральнай Радай Беларускіх арганізацый[102] беспаспяхова

[97] Пратакол агульнага сходу Беларускага Нацыянальнага Саюза 12.10.1917 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 136. Арк. 50–50 адв.

[98] Рудовіч С. У пошуках нацыянальнай ідэнтычнасці: Беларуская патрыятычная арганізацыя ў Магілёве ў 1917–1918 гг. С. 208–209.

[99] Пушкін І.А. Як Магілёў мог стаць сталіцай Беларусі ў 1917 годзе // Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць : зборнік навуковых прац удзельнікаў IX Міжнар. навук. канф. Магілёў, 2015. С. 135–141.

[100] Тым не менш у 1930-я гг. савецкія ўлады паспрабавалі пераўтварыць Магілёў у сталіцу БССР. 19 кастрычніка 1937 г. бюро ЦК КП(б)Б пастанавіла "*лічыць мэтазгодным перанесці сталіцу з Мінска ў Магілёў*". 19 красавіка 1938 г. адпаведную пастанову СНК СССР і ЦК УКП(б) падпісалі В. Молатаў і І. Сталін. І толькі падзеі пачатку Другой сусветнай вайны перашкодзілі гэтаму.

[101] Пратакол пасяджэння МБК 20.10.1917 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 136. Арк. 51.

[102] Ліст Цэнтральнай рады Беларускіх арганізацый Упаўнаважанаму выканаўчага камітэта ЦРБА М. Кахановічу ад 22.09.1917 г. // LMAVB RS. Фонд. 21. Спр. 2209. Арк. 3.

ініцыяваў перад Стаўкай Вярхоўнага галоўнакамандавання Расійскай імперыі правядзенне ў Магілёве з’езда беларускіх вайсковых арганізацый[103].

Пасля Кастрычніцкага перавароту ў Петраградзе камісар Часовага ўрада па Магілёўскай губерні Р.І. Пэўзнер 26.10.1917 г. склікаў нараду палітычнага актыву Магілёва. МБК рэпрэзентаваў фактычны “рухавік” арганізацыі і новы кіраўнік М. Кахановіч. Сугучна большасці выступоўцаў ён назваў бальшавіцкае паўстанне злачынствам і контррэвалюцыйным актам, “бо пасля яго можа вярнуцца ранейшы [самадзяржаўны. – аўт.] рэжым”.

Праз два дні пасля перавароту на тэрыторыі Магілёўскай губерні 28 кастрычніка для супрацьдзеяння бальшавікам былі створаны Магілёўскі гарадскі камітэт выратавання Радзімы і рэвалюцыі і Магілёўскі губернскі камітэт грамадскай бяспекі. У склад апошняга ўваходзілі: магілёўскі губернскі камісар Р. Пэўзнер (старшыня), ад гарадскога самакіравання – член управы Я.І. Локшын, ад губернскай польскай рады – шляхціц Р.В. Выгоўскі, ад партыі кадэтаў – ваенны інжынер Папоў, ад энесаў – земскі батанік Р.К. Крэйер, ад МБК – выкладчык рэальнага вучылішча М. Кахановіч, ад сацыял-дэмакратаў меншавікоў і БУНДа – Браўн, ад губернскага земства – член управы І.У. Кірыкос, ад кааператыўных арганізацый горада Магілёва і губерні – член губернскай харчовай управы Д.І. Каваленка, ад яўрэйскай народнай партыі – А.Я. Сыркін, ад яўрэйскай сацыялістычнай рабочай партыі – Г.А. Гурэвіч, ад саюза паштова-тэлеграфных служачых – Пражэнік і ад губернскага Савета сялянскіх дэпутатаў – Рыжанкоў і Патапаў[104].

Магілёўскі губернскі камітэт грамадскай бяспекі не змог арганізаваць рэальнае супраціўленне сілам бальшавікоў, і 20 лістапада ў Магілёве была ўсталявана савецкая ўлада. І хаця відавочных рэпрэсіўных дзеянняў збоку новай улады да чальцоў камітэта намі не выяўлена, але сітуацыя відавочна для апошніх была патэнцыйна небяспечнай.

[103] Тэлеграма Упаўнаважанаму Цэнтральнай Рады Беларускіх арганізацый М. Кахановічу ад начальніка асобага аддзела кіравання Генеральнага Штаба падпалкоўніка Новікава // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 137. Арк. 98.

[104] Железняк М.Н. Комитеты спасения революции на территории современной области после захвата власти в России большевиками // Романовские чтения – 3 : сб. трудов Междунар. науч. конф. Могилев, 2007. С. 11.

Трэба заўважыць і тое, што дзейнасць беларускіх нацыянальных арганізацый негатыўна ўспрымалася кіраўніцтвам многіх органаў Савецкай улады. У кіраўніцтва Паўночна-Заходняй абласной арганізацыі РСДРП(б) меўся відавочны антыбеларускі псіхалагічны комплекс. Кіраўнікі арганізацыі добра ўсведамлялі сябе людзьмі выпадковымі ў Беларусі, якіх у гэты край занеслі віхуры Першай сусветнай вайны. Адчуваючы сваю чужароднасць у краі, яны ставілі пад сумненне само існаванне беларусаў як асобнага этнасу. Беларусы практычна не былі прадстаўлены ў арганізацыі, якая абапіралася на франтавую салдацкую масу. Невыпадкова адзін з кіраўнікоў бальшавікоў В. Кнорын сцвярджаў, што беларусы не з'яўляюцца нацыяй, а тыя этнаграфічныя асаблівасці, якія адрозніваюць іх ад рускіх людзей, павінны быць зжытыя. Разам з тым мясцовыя бальшавіцкія органы вымушаны былі падпарадкоўвацца ленінскаму Саўнаркаму ў нацыянальным пытанні. А ён з мэтай захавання ўлады ў шматнацыянальнай краіне праводзіў напачатку асцярожную і гібкую палітыку, абяцаў народам Расіі забеспячэнне сапраўднага права на самавызначэнне, якое яшчэ летам дэкляраваў Часовы урад[105].

Прыход да ўлады бальшавікоў з іх прапановамі ўсталявання дыктатуры пралетарыяту падштурхнуў Магілёўскі Беларускі Камітэт далучыцца да Вялікай Беларускай Рады і разам з іншымі беларускімі арганізацыямі напрыканцы кастрычніка 1917 года падпісаць “Грамату да Беларускага Народа” з заклікам “сабраць усе жывыя сілы нашае Бацькаўшчыны дзеля абароны і ўтрымання нашых вольнасцяў… верыць у сілу і мудрасьць беларускаго народа, у руках каторага вялікая будучыня Вольнай Беларусі…”[106].

У снежні 1917 года МБК паведаміў, што Камітэт пераўтвараецца ў Раду, для якой выпрацоўваецца новы статут[107]. У выканаўчы камітэт Магілёўскай Беларускай Рады ўваходзілі: М. Кахановіч – старшыня, Д. Даўгяла, В. Какашынскі – таварышы старшыні, Д. Аляхновіч – сакратар, Ф. Ляхтановіч – скарбнік. Афіцыйнае

---

[105] Лазько Рыгор. Супрацоўніцтва ленінскага Саўнаркама з беларускім нацыянальным рухам напярэдадні Усебеларускага з'езда 1917 г. С. 6–12; Пушкін І.А. Нацыянальна-дзяржаўная палітыка ў БССР (1920–1930-я гг.) // Гістарычна-археалагічны зборнік. Мінск, 2015. Выпуск 30. С. 151; Терри Мартин. Империя “положительной деятельности”. Нации и национализм в СССР, 1923–1939. М., 2011.

[106] Грамата да Беларускага Народа ад 27.10.1917 г. // LMAVB RS. Фонд. 21. Спр. 2218. Арк. 28а–28в.

[107] Ліст МБК // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 137. Арк. 50.

месцазнаходжанне рады і яе выканаўчага камітэта – Акруговы суд, які размяшчаўся ў памяшканні Марыінскай жаночай гімназіі па Дняпроўскім праспекце[108].

Як сведчаць гістарычныя крыніцы, Магілёўскі Беларускі Камітэт, які пасля Кастрычніцкага перавароту пераўтварыўся ў Магілёўскую Беларускую Раду, ад самага пачатку бачыў небяспеку новай улады для беларускага народа, не падтрымаў гвалтоўныя дзеянні бальшавікоў па захопу ўлады і ўвайшоў у магілёўскія антыбальшавіцкія камітэты. Рэальнага супраціву гэтыя органы атрадам бальшавікоў не аказалі, і надалей МБК прыходзілася дзейнічаць ва ўмовах рэальнай улады ў руках бальшавіцкіх саветаў.

Выбары ва Устаноўчы сход праходзілі ўжо пасля Кастрычніцкага перавароту, і іх вынікі для беларускіх арганізацый былі няўдалыя, перамогу атрымалі агульнарасійскія партыі: эсэры, бальшавікі і інш.[109] Ад Магілёўскай выбарчай акругі было абрана 15 дэпутатаў Устаноўчага сходу. З аглушальнай перавагай перамаглі эсэры, якія атрымалі 12 месцаў. Бальшавікам дасталося два месцы, а адзін мандат атрымаў Яўрэйскі нацыянальны выбарчы камітэт[110].

Ход усіх выбарчых кампаній 1917 г. паказаў, што іх галоўнай тэмай было агульнае палітычнае становішча, а не рэгіянальныя або муніцыпальныя праблемы. Нацыянальнае пытанне павялічвала сваю вагу ў агульнапалітычным дыскурсе, але і на выбарах ва Устаноўчы сход дыскусія аб будучыні вялікай краіны і яе ўладкаванні падштурхоўвала выбаршчыкаў галасаваць за агульнарасійскія партыі. Аднак фарміраванне асобнага спісу ад беларусаў дазволіла беларускім арганізацыям Усходняй Беларусі выйсці на новы, агульнарасійскі ўзровень палітычнай дзейнасці і гучна заявіць аб сабе. Дзякуючы перадвыбарчай агітацыі праграмныя палажэнні МБК сталі больш шырока вядомы грамадскасці, што дазволіла ў будучым аказваць значны ўплыў на палітычныя працэсы ў Магілёве і губерні. У выніку ўзрасла роля Камітэта ў працэсе фарміравання нацыянальнай ідэнтычнасці беларусаў Магілёўшчыны.

У час карэнных пераўтварэнняў Магілёўскі Беларускі Камітэт актыўна далучыўся да падрыхтоўкі першага агульнанацыянальнага форуму беларусаў – Усебеларускага з’езду, які быў скліканы ў

---

[108] Спіс членаў МБР // LMAVB RS. Фонд. 21. Спр. 2071. Арк. 4–6.

[109] Лавринович Д.С. Либеральные организации России и белорусский национальный вопрос в 1917 г. С. 9.

[110] Воробьев А.А. Выборы во Всероссийское Учредительное собрание на территории Беларуси и соседних российских губерний. С. 173.

снежні 1917 г. У адозве, выдадзенай МБК з гэтай нагоды, звярталася ўвага на тое, што ў барацьбе за лепшую будучыню “беларускі народ быў цярплівы”, але “разлад, унесены ў апошні час у шэрагі рускай дэмакратыі”, пагражае поўным развалам і анархіяй усёй дзяржаве. Такая небяспека штурхае “сыноў шматпакутнай Беларусі ўзяць на сябе задачу захавання цэласнасці сваёй радзімы і здабытых свабод ад замахаў, з чыйго б боку яны ні зыходзілі” [у перакладзе аўт.]. У Магілёве 1 снежня а 18 гадзіне ў зале Гарадской Думы адбыўся Сход Беларусаў, на які МБК (МБР) запрасіў Выканаўчы камітэт Магілёўскага губернскага савета сялянскіх дэпутатаў[111].

На сходзе быў прыняты “Наказ от Могилевской Белорусской Рады делегату на Всебелорусский Съезд 5 декабря 1917 года в Минске. 1) По вопросу “Международное положение Белоруссии” /Война и мир/. Исполнительный Комитет Могилевской Белорусской Рады находит, что разоренная и опустошенная 3-летней войной Белоруссия должна быть восстановлена и весь Белорусский народ объединен в одну целую автономную единицу, входящую как равноправный член в единую демократическую федеративную Российскую Республику, для чего Исполнительный Комитет настаивает на необходимости представительства от Белорусского народа на международной мирной конференции или о решении вопроса о самоопределении народности, дабы этим путем вопрос о самоопределении Белорусского народа был поставлен в международном масштабе. Вместе с воинами белорусами Северного фронта, Исп. Ком. Мог. Белор. Рады поддерживает категорический протест по поводу появляющихся захватнических намерений со стороны империалистически настроенных соседей, выносит свой протест на Суд Российской Революционной Демократии и Западно-Европейской демократии и полагает, что Международная Демократия, при разрешении спора на предстоящей Мирной Конференции, будут руководствоваться Общедемократическим Критерием – пределами этнографического расселения этого или иного народа при установлении на будущей карте Европы новых границ самоопределяющихся народов Восточной, западной и Южной Европы…”.

---

[111] Ліст МБК у выканаўчы Камітэт Магілёўскага губернскага савета сялянскіх дэпутатаў ад 1.12.1917 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 137. Арк. 39; Зварот Выканаўчага камітэта МБР да беларусаў на сход па выбарах дэлегатаў на Усебеларускі з’езд // LMAVB RS. Фонд 21. Спр. 2229. Арк. 3.

Па "Зямельным пытанні" выканкам МБК меркаваў, што зямля павінна перайсці ў карыстанне працоўнага народа, а ўмовы пераходу і спосабы землекарыстання будуць распрацаваны Устаноўчым Кангрэсам. Па пытанні "Будучы палітычны лад Беларусі" і "Стварэнне органа Краёвай улады" камітэт у той момант выступаў за аўтаномію ў складзе Федэратыўнай Расійскай Рэспублікі і за ўтварэнне Краёвай Беларускай Рады. Вялікая ўвага ў наказе была таксама прысвечана фарміраванню нацыянальных Беларускіх войск. Камітэт знаходзіў, што "…згуртаваныя радством і зямляцтвам беларусы, сабраныя разам, найлепшым чынам захаваюць ацалелыя ад разбурэння вайной рэшткі краёвай маёмасці і разам з тым не дапусцяць прыніжэння правоў свайго народа на самавызначэнне і парушэння інтарэсаў яго кім бы то ні было"[112].

Падобныя наказы і звароты да агульнанацыянальнага форуму беларусаў складаліся ў той час у беларускіх арганізацыях, установах, воінскіх часцях па ўсёй Беларусі і за межамі нашай краіны. Так, у Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь захаваўся наказ воінаў беларусаў 404-й пешай (пяхотнай) Магілёўскай дружыны дэлегатам І-га Усебеларускага з'езда[113].

Усебеларускі з'езд, які быў скліканы Вялікай Беларускай Радай, распачаў сваю працу 5.12.1917 г. у Мінску. На нарадзе дэлегатаў з'езда ўвечары 5 снежня было прапанавана стварыць Часовую Раду з'езда, якая складалася з прадстаўнікоў ад буйнейшых арганізацый і партый Беларусі. Ад павятовых і губернскіх земстваў быў абраны Даніла Васілеўскі (у 1930-я гады выкладчык Магілёўскага педінстытута), ад валасных земстваў Магілёўскай губерні – З. Міхайлаў[114]. Трэба адзначыць, што вясной, 23 красавіка, падчас правядзення Сялянскага з'езда Міхайлаў, будучы старшынёй з'езда, заяўляў: "БНК панская інтрыга, БСГрамада на павадку ў памешчыкаў"[115]. Гэтая заява выклікала абурэнне з боку магілёўскіх беларусаў. 24.05.1917 г. на пасяджэнні МБК была прынята

[112] Наказ от Могилевской Белорусской Рады делегату на Всебелорусский съезд 5 декабря 1917 г. в г. Минске [Друкаваны і рукапісны варыянты. – аўт.] // LMAVB RS. Фонд 21. Спр. 2218. Арк. 38–39, 43–43 адв.
[113] Наказ воинов белорусов 404-й пешей Могилевской дружины делегатам I Всебелорусского съезда // НАРБ. Фонд 325. Воп. 1. Спр. 4. Арк. 14.
[114] Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Т. 1. Кн. 1. С. 15–16.
[115] Тэлеграма з Мінска ў МБК Рэўту // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 137. Арк. 58.

пастанова з пратэстам супраць дзеянняў і выказванняў Міхайлава[116], які быў членам партыі бальшавікоў[117].

Прысутнасць дэлегацыі ад Магілёўскай губерні на Усебеларускім з’ездзе ў снежні 1917 года ўзгадваецца ў даведцы аб Урадзе БНР, якая была верагодна складзена ў 1920 г. спецыяльна для азнаямлення паслоў Балтыйскіх дзяржаў (Фінляндыі, Эстоніі, Латвіі, Літвы і Польшчы)[118].

У архівах захавалася пасведчанне МБК № 221 ад 2.12.1917 г. аб дэлегаванні ад МБК на з’езд Д. Аляхновіча (спачатку яно было выпісана на імя М. Кахановіча, а затым яго імя закрэслена і ўпісана “Д. Аляхновіч”, тое ж зроблена ў Журнале выхадных папер МБК[119]). Па некаторых дадзеных, брат Зміцера – актыўны сябра МБК Яўген Сямёнавіч Аляхновіч быў таксама дэлегаваны на гістарычны з’езд ад імя педагагічнай рады Магілёўскага настаўніцкага інстытута[120]. На жаль, архіўных дакументаў недастаткова, каб удакладніць, ці сапраўды абодва браты Аляхновічы ўдзельнічалі ў працы гістарычнага Усебеларускага з’езду.

Трэба адзначыць, што выкладчыкі і студэнты Магілёўскага настаўніцкага інстытута актыўна ўдзельнічалі ў рэвалюцыйных падзеях, у тым ліку ў дзейнасці Магілёўскага Беларускага Камітэта. Напэўна адным з найбольш актыўных сяброў камітэта быў выкладчык матэматыкі інстытута, а потым і рэальнага вучылішча Яўген Аляхновіч. Пазней, у сакавіку 1918 года, нацыянальна арыентаваная частка супрацоўнікаў інстытута падтрымала ідэю незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі[121].

Пратакол пасяджэння Выканаўчага камітэта Магілёўскай Беларускай Рады ад 24.12.1917 г. сведчыць аб вылучэнні дэлегатамі

---

[116] Пратакол пасяджэння МБК 24.05.1917 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 136. Арк. 28 адв.

[117] Журнал выходных папер МБК. 1917 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 137. Арк. 3 адв.

[118] Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Вільня–Нью-Ёрк–Менск–Прага, 1998. Т. 1. Кн. 2. С. 940.

[119] Журнал выходных папер МБК. 1917 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 137. Арк. 18; Пасведчанне МБК // Тамсама. Арк. 40.

[120] Ляхоўскі У. Магілёўскі настаўніцкі інстытут // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. Т. 5. С. 26.

[121] Агееў А.Р. Гісторыя МДУ імя А.А. Куляшова як люстэрка грамадска-палітычных працэсаў XX ст. // Актуальные проблемы социально-гуманитарных наук : сб. науч. статей Междунар. науч.-практ. конф., посвященной 100-летию МГУ имени А.А. Кулешова. Могилев, 2013. С. 8.

на Усебеларускі з’езд так сама М. Кахановіча і В. Какашынскага[122]. А ліст № 518 ад 9 снежня М. Кахановічу ад Беларускай Цэнтральнай Вайсковай Рады за подпісам С. Рака-Міхайлоўскага з інфармацыяй аб адкрыцці з’езда і просьбай “зрабіць усё магчымае ад Вас для таго, каб дэлегаты ад Магілёўскай губерні прыбылі”[123], дазваляе зрабіць выснову аб тым, што не ўсе дэлегаты ад МБК і беларускіх арганізацый губерні ўдзельнічалі ў працы з’езда ад яго пачатку.

На пасяджэнні Усебеларускага з’езда 7 снежня прагучалі прывітальныя тэлеграмы, у тым ліку ад Булгака з Магілёва. Адбыліся выступы з вітаннямі ад мусульман Беларусі, ад БУНДа і г. д.[124] На наступны дзень на з’ездзе выступіў дэлегат ад імя сялян Магілёўскай губерні. З яго прамовы можна прасачыць пазіцыю сялянства, якая істотна адрознівалася ад поглядаў патрыятычна настроенай часткі інтэлігенцыі краю. Ён заклікаў, каб на з’ездзе не было расколу, што неабходна дзейнічаць супольна. Выказаўся і наконт мовы: “Не следует созерцаться к прошлому, что было 400 лет тому назад”[125]. Дзявятага снежня на з’ездзе быў абраны Прэзідыум, у склад якога ад сялян Магілёўскай губерні ўвайшоў Альховік (Альхоў (Ольков)?)[126].

11.12.1917 г. адбылося пасяджэнне ваеннай секцыі Усебеларускага з’езда, падчас якога прагучалі выступы з рэгіёнаў. Ад імя 404 пяхотнай Магілёўскай дружыны (Румынскі фронт) прывітанне Беларускай Радзе выказаў Макарэвіч[127].

Наяўныя крыніцы вельмі фрагментарна адлюстроўваюць удзел прадстаўнікоў МБК ва Усебеларускім з’ездзе. Вядома толькі, што Д. Даўгяла меўся зрабіць даклад аб стане народнай адукацыі ў краі, а М. Кахановіч на адным з пасяджэнняў выступіў з заклікам не

[122] Пратакол пасяджэння ВК МБР 24.12.1917 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 136. Арк. 56–56 адв.

[123] Ліст Беларускай Цэнтральнай Вайсковай Рады // LMAVB RS. Фонд 21. Спр. 2209. Арк. 2.

[124] Пратаколы пасяджэнняў Усебеларускага нацыянальнага з’езда // LCVA. Фонд 582. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 5–8.

[125] Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Т. 1. Кн. 1. С. 31.

[126] Пушкін І.А. Магілёў і Магілёўшчына ў святле апублікаваных архіваў Беларускай Народнай Рэспублікі // Шляхі Магілёўскай гісторыі : зборнік навуковых прац. Могилёв, 2005. С. 260–270.

[127] Пратакол пасяджэння Ваеннай секцыі Агульна-Беларускага з’езда. 14.12.1917 г. // НАРБ. Фонд 325. Воп. 1. Спр. 4. Арк. 17–17 адв.

адкладваць справу самавызначэння, “бо за нас можа вырашыць Вільгельм ці польскія легіёны”[128].

Захаваліся нешматлікія чарнавікі пратаколаў пасяджэнняў культурна-асветніцкай камісіі Усебеларускага з’езда з фрагментамі выступленняў члена МБК Зміцера Аляхновіча, які не стаў пасіўным сведкам гістарычнай падзеі, а актыўна ўдзельнічаў у дыскусіях. Так, напачатку працы камісіі ён спрыяў нармалізацыі яе дзейнасці: прапанаваў выступоўцам трымацца парадку дня, даручыць камісіі падрыхтаваць даклады па пытаннях парадку дня, а надалей прапаноўваў абмежаваць колькасць запісаў прамоўцаў і час іх выступленняў. Сярод іншага Аляхновіч падтрымаў важнасць развіцця вышэйшай адукацыі ў краі і звярнуў увагу прысутных на неабходнасць вяртання інвентару былых вышэйшых навучальных устаноў[129].

Усебеларускі з’езд быў гвалтоўна разагнаны бальшавікамі 17.12.1917 г. Варта адзначыць неадназначныя адносіны насельніцтва Магілёўшчыны да з’езда. У адрозненне ад інтэлігенцыі, якая ў большасці вітала правядзенне з’езда і прынятыя ім рэзалюцыі, IV Магілёўскі агульнагубернскі з’езд сялянскіх дэпутатаў (15–18 снежня) у сваёй рэзалюцыі “Аб Усебеларускім з’ездзе” пастанавіў: “Склікаць 2-гі Усебеларускі з’езд саветаў сялянскіх, рабочых і салдацкіх дэпутатаў… сцвердзець уладу працоўнага народа па ўсёй Беларусі і яе безумоўнай неадрыўнасці і неадчужальнасці ад маці – Расіі… Дэлегатамі на з’езд лічыць прадстаўнікоў саветаў, а не самазваных Беларускіх Рад і Грамад” [130] [у перакладзе аўт.]. Рэзалюцыя была прынята па ініцыятыве прабальшавіцкі настроенай часткі кіраўнікоў з’езда.

Бальшавіцкая ўлада прадстаўляла хлуслівую інфармацыю аб з’ездзе і прычынах прыпынення яго працы[131]. Патрыёты Беларусі імкнуліся давесці праўду аб з’ездзе. Гэта добра бачна з ліста пісара Вайсковай Рады Міколы Шылы на пачатку 1918 г. Міхасю Кахановічу ў Магілёў[132]. У ім прагучала просьба, каб ва ўсіх магілёўскіх газетах быў надрукаваны пратэст Выканаўчага Камітэта

---

[128] Рудовіч С. У пошуках нацыянальнай ідэнтычнасці: Беларуская патрыятычная арганізацыя ў Магілёве ў 1917–1918 гг. С. 203–209.

[129] Пратаколы пасяджэнняў культурна-асветніцкай камісіі 1-га Усебеларускага з’езда // НАРБ. Фонд 457. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 1.

[130] Рэзалюцыя з’езда // LCVA. Фонд 582. Воп. 2. Спр. 11. Арк. 34.

[131] Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва ў Беларусі (1917–1922 гг.) : метадычныя парады студэнтам / склад. І.А. Пушкін. Магілёў, 2002. С. 7.

[132] Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Т. 1. Кн. 1. С. 42.

Рады І-га Усебеларускага з’езду наконт хлусні Л. Троцкага аб прычынах і абставінах разгону з’езда, выказанай у адказе на запыт прадстаўніка аўстра-германскай дэлегацыі на пасяджэнні мірнай дэлегацыі ў Брэсце 14.01.1918 г.[133]

Вынікі з’езда былі заслуханы на пасяджэнні Выканаўчага камітэта Магілёўскай Беларускай Рады (ВК МБР), якое адбылося 3.01.1918 г. у кватэры М. Кахановіча. Сярод іншага былі заслуханы даклады аб з’ездзе Д. Аляхновіча і М. Кахановіча. Першы падрабязна распавёў пра адкрыццё з’езда і першыя пасяджэнні, падкрэсліў “вялікае значэнне З’езда ў справе папулярызацыі ідэі аўтаноміі Беларусі”, далей паведаміў аб пасяджэннях пасля разгону з’езда. Абмеркавалі праект рэзалюцыі з’езда аб арганізацыі Краёвай улады ў Беларусі. М. Кахановіч прапанаваў “прыняць рэзалюцыю пратэсту супраць разгону З’езда і ўвогуле супраць перашкоды самавызначэння Беларусі і распаўсюдзіць яе ў Магілёўскай губерні, а таксама паслаць ва ўсе месцы Расійскай Рэспублікі”[134].

Такім чынам, ва ўмовах рэвалюцыі 1917 г. на тэрыторыі Беларусі, у тым ліку і ў Магілёве, вельмі хутка фарміруюцца грамадскія і палітычныя дэмакратычныя арганізацыі, праходзяць першыя дэмакратычныя выбары. Беларуская супольнасць здолела аб’яднацца, гучна заявіць аб сабе і паспяхова дзейнічаць у самых складаных умовах.

## 2.2 Фарміраванне дзяржаўнай ідэнтычнасці і рост падтрымкі ідэі стварэння нацыянальнай дзяржавы

Напрыканцы Першай сусветнай вайны на тэрыторыі еўрапейскіх імперый актывізаваўся працэс стварэння новых нацыянальных еўрапейскіх дзяржаў. Узнікненне дзяржаў было не толькі вынікам дзейнасці нацыянальных эліт, але і тым, наколькі гэта адпавядала інтарэсам такіх вялікіх краін, як Францыя, Вялікабрытанія, ЗША, Германія.

Вядома, што кожная дзяржава, як суб’ект міжнародных адносін, мае ўласную знешнюю палітыку, якая вызначаецца шматлікімі фактарамі: узроўнем сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця, геаграфічным становішчам, нацыянальна-гістарычнымі традыцыямі, мэтамі і патрабаваннямі забеспячэння суверэнітэту, бяспекі

[133] Тамсама. С. 42–43.
[134] Пратакол пасяджэння ВК МБР 03.01.1918 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 136. Арк. 58–59 адв.

дзяржавы і інш. Асновай знешнепалітычнай дзейнасці кожнай дзяржавы і яе міжнародных палітычных адносін з'яўляюцца суверэнітэт, тэрытарыяльная цэласнасць, дастойны ўзровень жыцця насельніцтва, ідэалогія правячай эліты. Усё згаданае знаходзіць адлюстраванне ў дакументальных матэрыялах аб дзейнасці МБК. Улічваючы тагачасную палітычную сітуацыю ў Еўропе і Расіі, мы найперш прыпынімся на пазіцыях МБК у адносінах да дзеянняў кіраўніцтва ці нацыянальных рухаў Германіі, Літвы, Польшчы, Расіі і Украіны.

Статут і дакументы аб дзейнасці дазваляюць сцвярджаць, што МБК прытрымліваўся ў нацыянальным кірунку пакрокавай стратэгіі, паступова прайшоўшы шлях ад мар пра аўтаномію ў складзе Расійскай імперыі да падтрымкі ідэй незалежнасці БНР. Гэта было выклікана натуральнай эвалюцыяй поглядаў яе членаў, станам грамадства, унутранымі і знешнепалітычнымі прычынамі. Падобныя змены ў поглядах эліт з рознай хуткасцю адбываліся і ў іншых рэгіёнах былой Расійскай імперыі.

Першы крок быў арыентаваны на Расію. Аб'яднаць беларускі народ на ўсёй тэрыторыі этнічнага рассялення ў складзе асобнай (пакуль што аўтаномнай) адміністрацыйнай адзінкі са сваімі органамі ўлады (мясцовым самакіраваннем), што паспрыяе нацыянальна-культурнаму адраджэнню і асабовай ідэнтыфікацыі асноўнай масы насельніцтва. Вырашэнне гэтай задачы ставілася перад нацыянальнай элітай, якой было ўласціва пачуццё дзяржаўнасці, непазбежна пераўтвараемае ў імкненне да стварэння самастойнай, незалежнай дзяржавы.

Першапачатковыя праграмныя мэты Магілёўскага Беларускага Арганізацыйнага Камітэта былі апублікаваны ў красавіку 1917 г.: "У мэтах аб'яднання ўсяго беларускага народа камітэт вызначыў наступныя задачы: а) аказваць падтрымку Часоваму ўраду ў барацьбе са знешнім ворагам у справе добраўладкавання Расіі на пачатках дэмакратычнай рэспублікі; б) арганізаваць выбары ва Усерасійскі Ўстаноўчы сход; в) распрацаваць праграму дзеянняў, якая павінна быць зацверджана Устаноўчым сходам і адпавядаць нацыянальным імкненням беларускага народа; г) эканамічна і культурна добраўпарадкаваць Беларусь"[135].

Крыху пазней яны загучалі наступным чынам: "1) Дзяржаўны лад. Расійская дзяржава аб'яўляецца федэратыўнай дэмакратычнай

[135] Заявление МБАК // Могилевский вестник. 1917. 20 апр. С. 1; Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. : у 2 кн. Кн. 1. С. 323.

рэспублікай. 2) Зямля. Уся зямля пераходзіць у рукі працоўнага народа і ў нашым краі (Беларусі) перадаецца ў прыватную ўласнасць, беззямельныя і малазямельныя надзяляюцца зямлёй. 3) Воля. Замацаванне сапраўдных свабод, свабода сходаў, слова, друку і інш. 4) Вайна. Хутчэйшае заканчэнне вайны ў поўнай згодзе з саюзнікамі. 5) Асвета. Бясплатная ўсеагульная адукацыя. Адкрыццё ў вясковай мясцовасці, краі пачатковых, сярэдніх і спецыяльных навучальных устаноў, універсітэта і вышэйшых навучальных устаноў. 6) Права народаў. Усе народы, якія жывуць у Расіі, маюць роўныя правы”[136]. На першы погляд можа падацца, што паводле светапогляду гэта былі пераважна мэты прыхільнікаў ліберальных каштоўнасцей, што магло збліжаць членаў камітэта з агульна-расійскай партыяй канстытуцыйных дэмакратаў[137]. Тым больш што сярод членаў камітэта былі і кадэты. Адным з іх быў актыўны член арганізацыі А. Пігулеўскі.

Кадэцкія лідары не прызнавалі за беларускім народам яго права на нацыянальна-культурную аўтаномію. Яны, як і ідэолагі заходнерусізма, лічылі, што беларусы арганічна ўваходзяць у склад “адзінага рускага народа”[138]. У кадэцкіх арганізацый, якія пасля Лютаўскай рэвалюцыі пачалі дзейнічаць у Беларусі, не было адзінай зладжанай пазіцыі па беларускім пытанню, некаторыя з іх займалі больш лагодную да беларускага руху пазіцыю. Тым не менш нежаданне партыі кадэтаў ісці на ўступкі ў нацыянальным пытанні перашкаджала збліжэнню з імі кіраўнікоў Магілёўскага Беларускага Камітэта.

Тым часам на эвалюцыю поглядаў лідараў МБК паўплывала праграма Беларускай сацыялістычнай грамады[139], якая прапаганда-

[136] Рукапіс праграмных мэтаў МБАК // LMAVB RS. Фонд. 21. Спр. 2218. Арк. 19–20; Рудовіч С. У пошуках нацыянальнай ідэнтычнасці: Беларуская патрыятычная арганізацыя ў Магілёве ў 1917–1918 гг. С. 203–209.

[137] Праграма партыі кадэтаў пасля Лютаўскай рэвалюцыі: Расія – дэмакратычная парламенцкая рэспубліка, перадача ўлады Часоваму ўраду, працягванне вайны, усе народнасці павінны мець права свабоднага культурнага самавызначэння (свабодна карыстацца роднай мовай і атрымліваць на ёй адукацыю). Яе нацыянальная праграма: Расія – унітарная дзяржава з правам насяляючых яе народаў на культурна-нацыянальнае самавызначэнне (выкарыстанне нацыянальных моў у навучальных установах і судзе, развіццё літаратуры і культуры).

[138] Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. : у 2 кн. Кн. 1. С. 315.

[139] Беларуская сацыялістычная грамада прызнавала класавую барацьбу і сацыяльную рэвалюцыю. Аднак на першы план у параўнанні з класавымі задачамі працоўных яна ставіла нацыянальныя: абвяшчэнне аўтаноміі Беларусі ў межах Расійскай дэмакратычнай

валася прадстаўнікамі БСГ на з'ездзе беларускіх нацыянальных арганізацый (Мінск, 25–27.03.1917), на якім быў М. Кахановіч і дэлегаты ад МБК.

На пасяджэннях Камітэта абмяркоўвалася пытанне аб супрацоўніцтве з рознымі палітычнымі партыямі і арганізацыямі. У чэрвені 1917 г. Кахановіч, Кміта і Аляхновіч былі выбраны дэлегатамі ад МБК у выканаўчыя камітэты мясцовых арганізацый эсэраў і сацыял-дэмакратаў[140].

Погляды членаў МБК не былі аднолькавымі і сталымі. Лідары МБК на працягу дзейнасці спрачаліся, шукалі і паступова эвалюцыянавалі да ўсё большага асэнсавання самадастатковасці беларусаў і Беларусі і неабходнасці набыцця ўласнай дзяржаўнасці. Пры гэтым у першыя месяцы існавання пазіцыя МБК была выключна памяркоўнай і па некаторых пытаннях не зусім акрэсленай. Яго сябры маглі, напрыклад, сцвярджаць, што беларускі народ, як асобнае этнаграфічнае цэлае, існуе больш за тысячу гадоў, што насуперак усім гістарычным нягодам, пабочным уплывам і знешняму націску ён захаваў нацыянальнае аблічча і што гэты стойкі народ не павінен ды і не можа знікнуць бясследна, патануць у чужым яму нацыянальным патоку. Адсюль рабілася выснова: Беларусь мае свае асобныя, мясцовыя, нацыянальныя патрэбы, і таму беларусам неабходна згуртавацца ў цесную нацыянальную супольнасць. Адносна Беларусі гаворка ішла пра тое, што яе варта вылучыць у самастойную адміністрацыйную адзінку, што кіраваць ёю павінны асобы з асяроддзя самога насельніцтва Беларусі, для чаго неабходна ўтварыць мясцовы заканадаўчы орган і дакладна размежаваць кампетэнцыю паміж ім і агульнадзяржаўнымі органамі[141].

У выніку ўнутрыпалітычнага (неабходнасць нацыянальна-культурнага і эканамічнага адраджэння) і знешнепалітычнага (захопніцкія памкненні з боку Германіі, Савецкай Расіі і Польшчы) стану беларускай справы погляды членаў МБК (МБР) у 1917–1918 гг. істотна і хутка эвалюцыянуюць – ад аўтаноміі да незалежнасці.

---

рэспублікі. Гэту ідэю ва ўмовах рэвалюцыі падзялялі ўсе беларускія нацыянальныя партыі – ад ліберальных да рэвалюцыйна-дэмакратычных. Выступалі за развіццё беларускай культуры, мовы, школы.

[140] Пратакол пасяджэння 7.06.1917 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 136. Арк. 33.

[141] Праграмныя палажэнні палітычнай секцыі Магілёўскага Беларускага Камітэта наконт дзяржаўнага ладу Расіі // LMAVB RS. Фонд 21. Спр. 2218. Арк. 32–32 адв.; Пратакол сходу Магілёўскага Беларускага Арганізацыйнага Камітэта 18.04.1917 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 136. Арк. 21.

Прафесар М. Сташкевіч падкрэсліваў, што пасля Лютаўскай рэвалюцыі назіралася размежаванне па спосабах вырашэння нацыянальнага пытання. Ліберальныя партыі і арганізацыі (Заходнерускае таварыства, Беларускі саюз зямельных уласнікаў, Гомельскі саюз беларускай дэмакратыі, Віцебскі саюз беларускага народа, Аршанскі беларускі народны камітэт і інш.), да якіх спачатку адносіўся і МБК, падтрымлівалі ідэю адміністрацыйна-гаспадарчай самастойнасці краю ў межах Расійскай дзяржавы. Ліберальна-дэмакратычныя партыі беларускай арыентацыі (Беларуская хрысціянская дэмакратыя, Беларуская партыя народных сацыялістаў, партыя беларускіх аўтанамістаў) у сваіх праграмных патрабаваннях выступалі за прадастаўленне Беларусі нацыянальна-тэрытарыяльнай аўтаноміі ў складзе федэратыўна-дэмакратычнай расійскай рэспублікі (гл. праграму МБК) і падтрымлівалі, хоць і не заўсёды паслядоўна, самастойнае палітычнае жыццё беларусаў[142]. Зрэшты, сітуацыя мянялася ў залежнасці ад геаграфічнага і часовага фактараў.

Трэба адзначыць, што МБК па сваіх поглядах і дзеяннях даволі хутка апынуўся ў ліберальна-дэмакратычнай групе. На карысць гэтага сведчыць наступны факт. 26.06.1917 г. старшыня Заходне-Рускага таварыства, член Дзяржаўнай думы Расіі Чыхачоў ад імя савета Таварыства звярнуўся да МБК "с покорнейшей просьбой прислать своих представителей в числе по усмотрению Комитета для участия в совещании представителей Западно-Русских организаций, созываемом советом Западно-Русского общества 4 и 5 июля с.г. (у Петраградзе) для обсуждения вопросов о самоопределении белорусов и удовлетворении культурных и экономических нужд их"[143]. Магілёўскія беларусы добра разумелі палітычныя "манеўры" расійскіх шавіністаў. Таму накіравалі 3.07.1917 г. Чыхачову катэгарычны адказ "о невозможности делегировать членов в Зап. Русское совещание от Могилев. Комитета"[144].

Наступны крок непасрэдна тычыўся працэсу стварэння ў гэты час (з дапамогай краін Антанты і нацыянальна-патрыятычнай часткі інтэлігенцыі) Польскай дзяржавы.

---

[142] Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. : у 2 кн. Кн. 1. С. 328.
[143] Ліст старшыні Заходне-Рускага таварыства ў МБК ад 26.06.1917 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 137. Арк. 74.
[144] Журнал выхадных папер МБК. 1917 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 137. Арк. 6.

Ён быў выкліканы тым, што ў польскай і беларускай грамадскасці Магілёўскай губерніі погляды на будучыню Беларусі шмат у чым супадалі. Падчас Першай сусветнай вайны ў Магілёве дзейнічалі наступныя польскія арганізацыі (акрамя рэлігійных): Польскі вайсковы саюз, Польскі рабочы саюз, Польскае таварыства дапамогі ахвярам вайны, Цэнтральны абывацельскі камітэт, Польскае таварыства асветы і дабрачыннасці. 8–11.06.1917 г. у Магілёве прайшоў 2-гі Польскі з’езд, на якім прысутнічалі 170 дэлегатаў ад грамадскіх арганізацый і устаноў, польскіх павятовых рад. На з’ездзе быў сфармаваны пастаянны орган – Выканаўчы камітэт. У пастанове адзначалася, што “з’езд, высока ацэньваючы працу беларускіх нацыянальных арганізацый на карысць краю, пастанавіў далучыцца да іх патрабаванняў аўтаноміі для Беларусі”[145]. Прадстаўнікі Магілёўскай польскай рады, выбраныя ў гарадскую Думу, неадразова падтрымлівалі або сумесна дзейнічалі з МБК[146].

Моцна паўплывалі на прапольскія настроі МБК кароткачасовае ўсталяванне ў Магілёве савецкай улады і тое, што ў сакавіку 1918 г. горад Магілёў быў заняты польскімі войскамі. Камандзір І Польскага корпуса генерал Ю. Доўбар-Мусніцкі прыхільна ставіўся да самавызначэння беларусаў і да ідэі стварэння незалежнай БНР. 25.01.1918 г. нават выдаў адозву “Братья – Белорусы”: “… Не полякам, ценящим свободу дороже жизни и проливавшим за нее кровь в течение последних 150 лет, лишать свободы своих братьев, с которыми они жили на одной земле. Наоборот, мы готовы предоставить вам возможность собрать разогнанную притеснителями свободы Белорусскую Раду в Бобруйске, где под покровительством наших войск они свободно и беспрепятственно смогут обсудить свои дела. Мы в ваши внутренние дела вмешиваться не будем… Да здравствует свободная Белоруссия”[147].

З другога боку, настроі прапольскіх дзеячаў былі рознымі. Многія з іх марылі аб былой Рэчы Паспалітай. Пасля таго як 12.03.1918 г. войскі корпуса занялі Магілёў, на будынку ратушы была ўсталявана дошка аб аднаўленні Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. У Магілёве пад эгідаю польскіх улад быў распачаты

[145] Дадатак да пратакола пасяджэння МБК 17.06.1917 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 136. Арк. 40 адв.
[146] Местная жизнь. Городская дума. Белорусский вопрос // Труд. 1918. № 98. 26 (13) чэрв. С. 3.
[147] Адозва “Братья – Белорусы” // НАРБ. Фонд 325. Воп. 1. Спр. 19. Арк. 166–167.

манапольны гандаль гарэлкай, усе прыбыткі ішлі на карысць корпуса. Быў накіраваны пратэст польскаму выканаўчаму камітэту ў Кіеве[148].

Аб дзеяннях адміністрацыі корпуса Доўбар-Мусніцкага на Магілёўшчыне таксама вялася размова на пасяджэнні дэлегацыі НС БНР 20 мая 1918 года. Падкрэслівалася, што Доўбар-Мусніцкі на пасяджэнні Бабруйскай павятовай земскай управы гаварыў, "што калі палякам патрэбны будуць грошы, то яны іх возьмуць з жыхароў хоць сілаю". Таму невыпадкова члены Бабруйскай рады накіравалі 5 чэрвеня ў Цэнтральную Беларускую раду зварот с просьбай прыняць усе магчымыя захады перад Германскім камандаваннем аб найхутчэйшым раззбраенні 1-га Польскага корпуса, жаўнеры якога былі "недысцыплінаваныя" і "дэзарганізаваныя"[149].

Захаваўся ліст Бабруйскай павятовай беларускай рады за подпісам Успенскага да камандзіра 1-га Польскага корпуса ад 25.05.1918 г. У ім прадстаўнікоў "аднапляменнага з намі славянскага народа", якi "быў пастаўлены ў сілу абставін у цяжкае становішча" і якi "ўбогі беларускі народ" карміў на працягу 4-х месяцаў, просяць справядліва вярнуць хаця б малую частку выдаткаў, якія панесла мясцовае беларускае насельніцтва. Палякам прапаноўвалася праз Бабруйскую земскую ўправу вярнуць "бессістэмна рэквізаваных у сялян коней, кароў і інш. скаціну, а таксама… машыны, калёсы, рыдлёўкі, сякеры, бялізну, адзенне і многае іншае, што ўзята са складоў і майстэрань розных установ". Бабруйская Беларуская Рада выказвала спадзяванні, што такім чынам "польскі корпус можа змякчыць тую злобу і нянавісць у мясцовага беларускага насельніцтва, якую ён выклікаў за час свайго нядоўгага гаспадарання ў краі, каб насельніцтва не перанесла сваё незадавальненне корпусам на ўвесь польскі народ і ў асаблівасці тут на ягоных асобных прадстаўнікоў"[150].

У сувязі са шматлікімі зваротамі і патрабаваннямі ў тэлеграме дэлегацыі Народнага Сакратарыяту БНР (НС БНР) на імя германскага канцлера і польскай рады ў Варшаве выказвалася абурэнне знаходжаннем корпуса Доўбар-Мусніцкага ў трох паветах Магілёўскай губерні (Бабруйскім, Рагачоўскім і Магілёўскім). Дэлегацыя НС

[148] Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Т. 1. Кн. 1. С. 154–155.
[149] Обращение Бобруйской уездной белорусской рады в Центральную Белорусскую раду 05.06.1918 // НАРБ. Фонд 325. Воп. 1. Спр. 21. Арк. 211-211 адв.
[150] Ліст Бабруйскай павятовай беларускай рады ад 25 мая 1918 года // НАРБ. Фонд 325. Воп. 1. Спр. 10. Арк. 138.

БНР пратэставала супраць ганебных паводзінаў жаўнераў корпуса і таксама патрабавала, каб "польскі" корпус Доўбар-Мусніцкага быў неадкладна выведзены з межаў БНР[151].

Таму пазіцыя МБК у гэты перыяд не была стабільнай і ўпэўненай: "З Магілёва пішуць, што тамашнія беларусы раздзяліліся на дзве часьціны: адна прыхільная да палякаў, другая да расейцаў. Ад рэдакцыі: Дзіва: беларусамі празываюцца, а цягнуць да расейцаў або да палякаў. Дык навошта ж звацца беларусамі?"[152].

Менавіта ва ўмовах знаходжання ў Магілёве польскага корпуса ў Выканаўчага Камітэта МБР выспела ідэя правядзення прадстаўнічага форума, на якім планавалася абмеркаваць апошнія палітычныя падзеі ў Беларусі. 28.03.1918 г. на пасяджэнні Выканаўчага камітэта МБР абмяркоўваўся праект павесткі агульнага сходу членаў Рады з удзелам дэлегатаў ад губернскіх і павятовых земстваў, гарадскога самакіравання, прадстаўнікоў устаноў, грамадскіх нацыянальных і прафесійных арганізацый, палітычных партый. Цікавай выглядае прапанова ВК МБР, якую планавалі абмеркаваць на сходзе: "Арганізаваць у Магілёве Савет, які б складаўся з прадстаўнікоў нацыянальнасцей, што насяляюць Магілёўскую губерню, прапарцыянальна ліку жыхароў кожнай нацыянальнасці з вырашальным голасам і прадстаўнікоў Земстваў, Гарадоў, урадавых і грамадскіх устаноў, прафесійных арганізацый і палітычных партый з дарадчым голасам. Савет гэты не мае афіцыйнага характару, павінен садзейнічаць сваімі пастановамі аб'яднанню Беларускага Краю, стварэнню Цэнтральнай улады ў краі, а таксама ўплываць ў гэтым кірунку на дзейнасць пералічаных вышэй арганізацый і груп"[153]. Аднак на агульным сходзе асноўным стала зусім іншае пытанне. Стала вядома аб абвяшчэнні ў Мінску незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі.

Плённая дзейнасць Магілёўскага Беларускага Камітэта на працягу года спрыяла таму, што Магілёў аказаўся найбуйнейшым горадам на тэрыторыі Беларусі, які ў сакавіку 1918 г. падтрымаў абвяшчэнне БНР на вельмі прадстаўнічым узроўні. Прычым МБК не проста паспрыяў, а непасрэдна арганізаваў гэтую падтрымку. Тым не менш, доўгія дзесяцігоддзі гэтая падзея не проста

[151] Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Т. 1. Кн. 1. С. 104–105.
[152] Хроніка падзей да беларускіх газет // НАРБ. Фонд 325. Воп. 1. Спр. 19. Арк. 275.
[153] Пратакол пасяджэння ВК МБР 28.03.1918 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 136. Арк. 65адв.–67.

замоўчвалася, а падвяргалася сумненню і не прызнавалася як гістарычны факт.

Гістарыяграфічная праблема заключалася ў тым, што адпаведна ўспамінам 1921 г. кіраўніка Камітэта Міхаіла Кахановіча, падзеі лёсавызначальнай вясны 1918 г. Магілёве разгортваліся наступным чынам:

“...У канцы красавіка 1918 году атрымаліся звесткі з Менску, што Беларуская Рада абвесьціла незалежнасць Беларусі. Мы, магілёўцы, сталі абгаварываць паміж сабою пытанне, якім спосабам зрабіць, каб абвешчаньне незалежнасці Беларусі адсьвяткаваць у Магілёве найбольш урачыста.

І вось прышоў дзень, здаецца, 12 ліпеня (юля) 1918 г. У абшырную залю суда а шостай гадзіне вечару сталі прыбываць прадстаўнікі ўсіх магілёўскіх установ і арганізацый: ад земства губэрнскага, павятовага, ад мястовай думы, ад нацыянальных, профэсіянальных, культурна-прасьветных і палітычных арганізацый. Усяго сабралася да 400 прадстаўнікоў. На павестцы дня стаяў адзін толькі пункт – аб незалежнасці Беларусі. Пасьля досыць доўгіх дэбатаў пытаньне пастаўлена на балатыроўку і прайшло абсолютнаю большасьцю ўсіх проціў двох, пры дзевяцёх устрымаўшыхся. Такога рэзультату ніхто з нас, магілёўскіх радных-беларусаў, не чакаў. Гэта быў поўны трыумф нашае палітыкі. Магілёў моцна падтрымаў Менскую ўхвалу 25 сакавіка...”[154].

Але іншыя даступныя магілёўскім гісторыкам крыніцы непасрэдна не пацвярджалі месца і дату правядзення сходу, а таксама такой яго паважнасці (прадстаўнічасці). Так, адсутнічалі звесткі аб сходзе ў пачатку ліпеня ў працах вядомага савецкага краязнаўцы з Магілёва Іераніма Філіповіча, які асобную кнігу прысвяціў хроніцы падзей 1917–1918 гг. у Магілёве. У яго кнізе, праўда, ёсць за датай 2.05.1918 г. паведамленне аб сходзе, які арганізаваў МБК “у дні польскай акупацыі горада” (як мінімум на два месяцы раней даты Кахановіча. – аўт.) з удзелам грамадскасці, але сцвярджаецца, што гарадская дума і асноўныя палітычныя партыі адмовіліся пасылаць сваіх прадстаўнікоў у Цэнтральную Раду, якая цесна супрацоўнічала з нямецкімі ўладамі[155].

---

[154] Кахановіч Міхаіл. Магілёўцы і незалежнасць Беларусі (мае ўспаміны). С. 3–5.
[155] Филипович И.И. Могилев: Хроника событий 1917–1918 (по архивным и печатным материалам). С. 58.

Няяснымі таксама былі матывы прыходу на сход і галасавання за незалежнасць БНР разнастайных па сваіх поглядах і накіраванасці дзейнасці нацыянальных, прафесійных, культурна-асветніцкіх і грамадска-палітычных арганізацый і г. д. Выклікала здзіўленне вялікая разбежка паміж абвяшчэннем 25 сакавіка незалежнасці і скліканнем 12 ліпеня ў Магілёве сходу з абмеркаваннем гэтага пытання. Нарэшце, незразумела было, як тэхнічна можна было арганізаваць правядзенне такога шматлюднага сходу ў памяшканні акруговага суда. Усе гэтыя і некаторыя іншыя пытанні параджалі ў скептыкаў недавер да праўдзівасці і інфармацыйнай дакладнасці ўспамінаў Кахановіча.

Толькі праца ў літоўскіх архівах дазволіла нам адказаць на многія з пастаўленых пытанняў. Ужо першасны аналіз дакументаў даў магчымасць напачатку выказаць меркаванне, а потым і сцвярджаць, што сход адбыўся сапраўды ў будынку акружнога суда, які аднак з-за знаходжання ў Магілёве Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага ўзброенымі сіламі Расіі пераехаў з Губернатарскай плошчы ў будынак Марыінскай гімназіі на Дняпроўскім праспекце (сёння СШ № 1 г. Магілёва, вул. Першамайская 24). На шматлікіх дакументах МБК пазначаецца менавіта гэты адрас Камітэта.

Вясной 2014 г. у Вільні нам ўдалося выявіць справу з мандатамі ўдзельнікаў знакамітага магілёўскага сходу 31.03.1918 г. у Магілёве, якая незадоўга да гэтага была апрацавана архівістамі і паступіла ў адкрытыя фонды Літоўскага цэнтральнага дзяржаўнага архіва[156].

Справа з мандатамі ўдзельнікаў сходу вырашалараблему даты сходу. Праходзіў ён не 12 ліпеня, а 31 сакавіка 1918 г. У дзесяці мандатах дата сходу ўказваецца менавіта 31 сакавіка. У іншых маюцца выхадныя даты дакументаў: 29, 30, 31 сакавіка. Гэта дазваляе меркаваць, што запрашэнні на сход былі разасланы не пазней за 29 сакавіка або на дзень-два раней. Сход быў скліканы дастаткова аператыўна.

У справе месціцца толькі 26 мандатаў і пасведчанняў для 34 удзельнікаў сходу ад 31 сакавіка. Нягледзячы на тое што мандаты захаваліся часткова, яны пацвярджаюць шырокую рэпрэзентатыўнасць сходу. Важна адзначыць і тое, што з тэкстаў мандатаў відавочна бачна, што дэлегаты прадстаўлялі не сябе асабіста, а былі абраны або накіраваны на сход сваімі арганізацыямі ці ўстановамі.

---

[156] Мандаты і пасведчанні дэлегатаў, абраных для ўдзелу ў пасяджэнні Магілёўскай Беларускай Рады // LCVA. Фонд 582. Воп. 2. Спр. 65. Арк. 1–26.

А саюз служачых магілёўскіх аддзяленняў сялянскага і дваранскага банкаў накіраваў свайго дэлегата К. Анікіевіча адразу ў Беларускую раду, каб абараняць там "інтарэсы Беларусі". Магілёўскае цэнтральнае бюро прафесіянальных саюзаў таксама накіравала тав. Кадышэвіча ў Раду.

З тых мандатаў, што захаваліся, бачна, што на сходзе найбольш шырока было забяспечана прадстаўніцтва прафсаюзаў. Яны, як мінімум, былі прадстаўлены наступнымі саюзамі: агульнагубернскім служачых ва ўрадавых установах, рабочых іголкавага цэху, таварыства памочнікаў урачоў, служачых магілёўскіх аддзяленняў сялянскага і дваранскага банкаў, рабочых друкаванай справы, магілёўскага цэнтральнага бюро прафесіянальных саюзаў, служачых магілёўскага губернскага земства, землямерных тэхнікаў, служачых крэдытных, кааператыўных і гандлёва-прамысловых прадпрыемстваў горада Магілёва[157].

Палітычныя сілы на сходзе прадстаўлялі дэлегаты ад Бунда, Рады польскай, Магілёўскага Камітэта Аб'яднанай Яўрэйскай Сацыялістычнай Рабочай партыі, Партыі Сацыялістаў-Народнікаў Літвы. Мандаты іншых палітычных арганізацый, на жаль, адсутнічаюць.

З накіраваных на сход дастаткова было асоб высокага статусу ў сваіх арганізацыях. Так агульны сход служачых Упраўлення земляробства і дзяржаўных маёмасцяў накіраваў на сход начальніка ўпраўлення Івана Цэзаравіча Глебавіча і ягонага памочніка справавода Макарава. Служачыя праўлення Магілёўскага губернскага камісарыяту "абралі дэлегатам" дарадцу праўлення К.І. Абалонскага. Агульнагубернскі саюз служачых ва ўрадавых установах прадстаўляў яго старшыня К.О. Цэсман. Саюз служачых магілёўскага губернскага земства дэлегаваў Губернскага агранома Івана Якімавіча Няклепу[158]. На жаль, у многіх мандатах не ўказваецца статус дэлегатаў у сваіх арганізацыях.

Яўрэі на сход былі дэлегаваны ў асноўным ад прафсаюзаў, а таксама ад БУНДа і сіяністаў. Палякаў-паноў Заліноўскага і Шаняўскага (Zalinowski, Szaniawski) накіравала Польская Рада Магілёўшчыны. Прысутнічалі і літоўскія прадстаўнікі: ад ліквідацыйнай камісіі бежанцаў літоўцаў быў ксёндз Краўяліс, а ад

---

[157] Тамсама. Арк. 1–26.

[158] Мандаты і пасведчанні дэлегатаў, абраных для ўдзелу ў пасяджэнні Магілёўскай беларускай рады // LCVA. Фонд 582. Воп. 2. Спр. 65Арк. 1, 3, 6, 17.

Партыі Сацыялістаў-Народнікаў Літвы М. І. Кірліс. Украінскую граmаду прадстаўлялі Гузенка і Тэледнік [неразборліва. – аўт.][159].

Сэнсавы аналіз зместу мандатаў паказвае, што ініцыятарам і арганізатарам сходу выступіла Магілёўская Беларуская Рада. Назва сходу ў мандатах указвалася па рознаму. Што і нядзіўна, з улікам разнастайнасці партый, арганізацый і ўстаноў. У многіх мандатах указвалася назва сходу: “Пасяджэнне Магілёўскай беларускай рады”. У некаторых пасяджэнне называлася “сходам”. У трох мандатах падкрэслівалася надзвычайнасць сходу. Ён так і называўся “надзвычайным”. Магілёўскі Камітэт Аб’яднанай Яўрэйскай Сацыялістычнай Рабочай партыі накіраваў дэлегата на “нараду”.

У адным мандаце дакладна акрэслена мэта сходу – “рашэнне пытання аб усталяванні краёвай улады”. У мандаце Бунда – “пытанне аб арганізацыі Беларускай Рады”[160]. Сур’ёзная мэта вызначыла і высокую яўку і матывы ўдзельнікаў. Ва ўмовах, калі побач у савецкай Расіі палыхала грамадзянская вайна, МБК ставіў пытанне аб уладзе. Калі падсумаваць інфармацыю з успамінаў Кахановіча і мандатаў удзельнікаў сходу, то падтрымалі ўтварэнне беларускай дзяржаўнасці яўрэі, рускія, палякі, літоўцы, украінцы і беларусы; іўдзеі і праваслаўныя, каталікі і пратэстанты; бундаўцы і сацыял-дэмакраты… Незалежна ад палітычных поглядаў, нацыянальных і рэлігійных перакананняў многіх магілёўцаў, напэўна, задавальняў мір і ў іх мелася жаданне дыстанцыявацца ад нестабільнай камуністычнай суседкі. Яны шукалі выйсце з той складанай сітуацыі, што, відаць, і вызначыла падтрымку беларускага пытання на сходзе ў канцы сакавіка 1918 г.

Удакладненне даты і паважнасці сходу мае вельмі важнае значэнне, бо ў такім выпадку яно пацвярджаецца і працай І. Філіповіча, які, як было сказана вышэй, пакінуў у сваёй кніжцы “Могилев: Хроника событий 1917–1918 (по архивным и печатным материалам)” пад датай 2.05.1918 г. паведамленне аб сходзе, якое, на жаль, не пацвердзіў архіўнымі спасылкамі[161]. І. Філіповіч пагаджаецца і з высокай паважнасцю і прадстаўнічасцю сходу (нарады), і з ягонай мэтай. Супадаюць і часавыя рамкі правядзення сходу.

[159] Тамсама. Арк. 9, 12, 23, 25.
[160] Тамсама. Арк. 2, 10.
[161] Филипович И. И. Могилев: Хроника событий 1917–1918 (по архивным и печатным материалам). С. 58.

Падтрымка на сходзе ідэі стварэння БНР падштурхнула партыі і гарадскую Думу надалей абмяркоўваць гэтае пытанне больш сур’ёзна, вызначаць сваю пазіцыю і прымаць рашэнні. Паколькі ва ўмовах акупацыі паўнавартаснай рэальнай незалежнасці БНР дасягнуць не ўдалося, то пазіцыя суб’ектаў палітычнага працэсу пачала мяняцца. Дадзены вывад пацвярджаецца і аналізам тэкстаў публікацый у тагачасных магілёўскіх газетах[162].

Архіўныя дакументы дазваляюць правесці рэканструкцыю падзей, якія адбыліся напрыканцы сакавіка 1918 г. у Магілёве.

29.03.1918 г. да каменданта горада была накіравана просьба аб правядзенні сходу[163]. Камендант дазволіў яго правядзенне з умовай прадастаўлення яму пратакола сходу да 10 гадзін раніцы 2 красавіка.

Сход пачаўся а 18 гадзіне 31.03.1918 г. у будынку Марыінскай гімназіі на Дняпроўскім праспекце. На ім прысутнічала амаль 400 дэлегатаў (колькасць па ўспамінах Кахановіча была пацверджана адшуканым у архіве пратаколам сходу). Старшыня сходу – М. Кахановіч, сакратар – Д. Аляхновіч.

Асноўныя падзеі разгарнуліся пры абмеркаванні пытання арыентацыі Беларускай Народнай Рэспублікі: “одни ораторы полагали, что Белоруссия не должна отделяться от Великороссии, другие подчеркивали необходимость ориентации на Запад и, наконец, третьи **громадное большинство** – указывали на то, что ориентация должна быть только местная, **национально-Белорусская** [падкрэслена аўт.]”[164]. У выніку для галасавання было прапанавана адказаць на тры пытанні. Вось два першыя: “1. Признает ли собрание желательным и необходимым установление Белорусской Народной Республики? 2. Признает ли собрание необходимым организацию на демократических началах центральной Белорусской Рады в Минске как верховного органа управления краем?”[165]. Амаль аднагалосна было падтрымана стварэнне Беларускай Народнай Рэспублікі і прызнанне ўлады Цэнтральнай Беларускай

[162] Белорусская рада и народный секретариат // Труд. 1918. № 60. 19 мая. С. 1–2; Местная жизнь. В исполнительном комитете могилёвской белорусской рады // Труд. 1918. № 85. 13(01) чэрв. С. 4; Местная жизнь. Местная жизнь. Городская дума. Белорусский вопрос // Труд. 1918. № 98. 26 (13) чэрв. С. 3 і інш.
[163] Ліст МБК каменданту г. Магілёва ад 29.03.1918 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 137. Арк. 41.
[164] Пратакол агульнага сходу магілёўцаў 31.03.1918 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 136. Арк. 68адв.
[165] Тамсама. Арк. 69.

Рады (ЦБР) у Мінску як органа кіравання ўтворанай дзяржавы на тэрыторыі ў межах рассялення беларускага народа[166].

Старшыня Народнага Сакратарыяту і Народны сакратар Замежных спраў Беларускай Народнай Рэспублікі Язэп Варонка 5.04.1918 г. пісаў з Мінска ў Вільню Івану і Антону Луцкевічам: "... Незалежнасць – цяжкая і адветная праца, а сіл у нас мала... Учора ўжэ завязалі стасункі з Магілёвам, і там усё добра: земства, горад і магілёўская беларуская рада (галава Кахановіч) стояць за нас..."[167].

Канчатковае прызнанне незалежнасці БНР было замацавана 5.06.1918 г. на пасяджэнні Выканаўчага камітэта МБР[168].

Як эвалюцыянавалі б погляды магілёўцаў, і ў прыватнасці ўдзельнікаў сходу 31 сакавіка, калі б праект БНР быў больш паспяховым, мы можам толькі здагадвацца. На жаль, лёс беларускага пытання залежаў тады не столькі ад саміх жыхароў Беларусі, а ў значна большай ступені ад становішча на франтах вайны і знешнепалітычных адносін існаваўшых і больш магутных дзяржаў, перш наперш стасункаў Германскай імперыі і Савецкай Расіі.

Такім чынам, 31 сакавіка, а не 12 ліпеня, 1918 г. у Магілёве сапраўды адбыўся прадстаўнічы сход гараджан, які падтрымаў ідэю стварэння Беларускай Народнай Рэспублікі. Сход сабраўся ў будынку акруговага суда, які, аднак, з-за знаходжання ў Магілёве Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага ўзброенымі сіламі Расіі пераехаў з Губернатарскай плошчы ў будынак Марыінскай гімназіі на Дняпроўскім праспекце. У ім была вялікая гімназічная зала, што тэхнічна дазваляла правесці такі прадстаўнічы сход. Больш зразумелымі ўяўляюцца матывы прыходу на сход і галасавання за БНР прадстаўнікоў разнастайных нацыянальных, прафесійных, культурна-асветніцкіх і грамадска-палітычных арганізацый і г. д.

Гэты сход незвычайны і вельмі красамоўны. Ён раскрывае вытокі падтрымкі беларускай дзяржаўнасці ў тых вірлівых умовах грамадска-палітычнага жыцця. Сказаць адназначна, што ўсе магілёўцы падтрымалі ідэю беларускай дзяржаўнасці, а тым больш, што гэта зрабіла ўся Магілёўшчына, не дазваляюць наяўныя крыніцы. Але яны ж з усёй паўнатой паказваюць, што ў 1918 г. у

---

[166] Ліст каменданту горада Магілёва. Пратакол агульнага схода магілёўцаў 31.03.1918 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 136. Арк. 68–69.

[167] Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Т. 1. Кн. 1. С. 78.

[168] Пратакол № 5 пасяджэння Выканаўчага камітэта МБР 5.06.1918 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 136. Арк. 73–74 адв.; Местная жизнь. В исполнительном комитете могилёвской белорусской рады // Труд. 1918. № 85. 13(01) чэрв. С. 4.

Магілёве існавала масавая база для рэалізацыі ідэі станаўлення беларускай дзяржавы. І калі б знешнія абставіны былі больш спрыяльнымі, БНР мела б усе шанцы сцвердзіць сваю незалежнасць.

На працягу 1918 г. погляды сяброў Магілёўскага Беларускага Камітэта ў нацыянальным пытанні станавіліся ўсё больш радыкальнымі. Яны ў большасці пачалі падтрымліваць ідэю дзяржаўнай незалежнасці Беларусі. У 1918 г. камітэт не толькі вітаў утварэнне Беларускай Народнай Рэспублікі і абвяшчэнне 25 сакавіка 1918 г. незалежнасці Беларусі, але здолеў арганізаваць падтрымку БНР у горадзе Магілёве. Кіраўніцтва МБК актыўна падтрымлівала сувязі з Народным сакратарыятам (Радай міністраў) БНР, Віленскай беларускай радай і іншымі беларускімі палітычнымі арганізацыямі.

На пасяджэнні 13 мая разглядалася і пытанне аб выхадзе са складу членаў ВК МБР В. Кміта. Ён заявіў, што падчас агульнага сходу 31.03.1918 г., на якім амаль аднагалосна каля 400 дэлегатаў падтрымалі стварэнне Беларускай Народнай Рэспублікі, у яго склалася ўражанне, “что деятельность Рады сильно расходится с его взглядами на должное направление деятельности Рады, а потому он не считает возможным оставаться в рядах членов Рады и отказывается от звания члена МБРады”[169]. Гэты факт сведчыць, што некаторыя з членаў ВК МБР усё ж не падтрымлівалі стварэнне незалежнай БНР.

З сакавіка 1918 г. лёс Магілёўскага Беларускага Камітэта мае непасрэднае дачыненне да стварэння Беларускай Народнай Рэспублікі. Па шляху нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва пайшла вялікая колькасць беларускіх патрыётаў. Падчас існавання МБК яго дзейнасць каардынавалася, а ў чымсьці і накіроўвалася выбітнымі дзеячамі БНР.

У архівах захавалася шмат лістоў МБК, яго старшыні М. Кахановіча да вядомых грамадскіх дзеячаў Беларусі, у прыватнасці, да асоб, якія ўваходзілі ў кіраўніцтва беларускага руху і ўрада БНР. Гэтае ліставанне дае нам каштоўную інфармацыю, якая дазваляе з першых вуснаў прасачыць працэс фарміравання нацыянальнай ідэнтычнасці і беларускай дзяржавы. Нам падаецца важнай публікацыя звестак аб гэтым ліставанні, бо знаёмства з перапіскай Магілёўскага Беларускага Камітэта важна не толькі для даследавання гісторыі

[169] Пратакол пасяджэння ВК МБР 13.05.1918 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 136. Арк. 72.

самога Камітэта, але і для вывучэння гісторыі БНР і агульнай гісторыі Беларусі гэтага часу.

Як бачна з ліставання, мэтай дзеячаў Магілёўскага Беларускага Камітэта і Беларускай Народнай Рэспублікі была рэалізацыя памкненняў беларускага народа за ўласную дзяржаўнасць. Таму галоўным для іх было захаванне адзінства і незалежнасці Беларусі. У той жа час бальшавіцкі ўрад выношваў планы пра раскол Беларусі, у 1919 г. да РСФСР далучылі Віцебшчыну, Магілёўшчыну і Гомельшчыну, а ў 1921 г. Заходнюю Беларусь перадалі Польшчы. Толькі ў 1924, 1926 і 1939 гг., але не ў поўным аб’ёме, гэтыя тэрыторыі былі вернуты Беларусі.

Улічваючы тагачаснае ваеннае становішча, спачатку адносіны МБК да акупацыйнага Германскага кіраўніцтва былі даволі памяркоўныя. Вельмі моцна на пазіцыі МБК паўплывалі ўмовы Брэсцкай мірнай дамовы (3.03.1918) паміж Германіяй і РСФСР, змест дэкларацыі кайзера Германіі Вільгельма ІІ (23.03.1918) аб прызнанні незалежнасці Літоўскай дзяржавы, у склад якой былі ўключаны і беларускія землі (Віленшчына, Гродзеншчына, Беласточчына), і абвяшчэнне незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі (25.03.1918).

21.05.1918 г. германскае камандаванне аддало загад аб раззбраенні корпуса Доўбар-Мусніцкага, а 26 мая Магілёў быў заняты германскімі войскамі. Імкненне магілёўцаў да прызнання незалежнасці БНР як рэакцыі на дзеянні ўлад Савецкай Расіі і Германіі ў дачыненні да падзелу тэрыторыі Беларусі выклікала негатыўныя дзеянні з боку германскіх акупацыйных улад.

У чэрвені – ліпені 1918 г. германскае кіраўніцтва пачало працэс ліквідавання (“упразднения”) Магілёва як губернскага цэнтра[170], што значна памяншала статус горада. Выканаўчы камітэт Магілёўскай Беларускай Рады ў сувязі з дзеяннямі акупацыйных улад па ліквідацыі ў Магілёве акруговага суда і некаторых губернскіх установаў, а таксама далучэння акупаванай часткі Магілёўскай губерні ў судовым парадку да Мінскай губерні прыклаў шмат намаганняў і дзеянняў па захаванні статусу і ролі горада Магілёва ў жыцці Беларусі. Лідары МБК (МБР) настойліва і неаднаразова

[170] Пратакол пасяджэння ВК МБР 2.07.1918 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 136. Арк. 75.

хадайнічалі перад германскімі акупацыйнымі ўладамі пакінуць у Магілёве губернскія ўстановы[171].

Падчас ліквідацыі шэрагу ўстаноў закраналіся інтарэсы Магілёўскай Беларускай Рады, у прыватнасці, яна пазбавілася памяшкання ў будынку акружнога суда. Яшчэ 13.05.1918 г. на пасяджэнні Выканаўчага камітэта МБР разглядалася пытанне аб перавозе маёмасці Рады ў памяшканне таварыства цвярозасці. Было прынята рашэнне, што Выканаўчы камітэт будзе збірацца на свае пасяджэнні раз на 2 тыдні, па панядзелках а 17 гадзіне ў памяшканні аддзела народнай адукацыі Павятовай земскай управы (вуліца Малая Садовая, 21), дзе працаваў Д. Даўгяла[172]. 2.07.1918 г. маёмасць МБР з памяшкання таварыства цвярозасці была перавезена на кватэру М. Кахановіча.

Беларусы і ўвогуле насельніцтва Беларусі пільна сачылі за падзеямі ў Мінску. Усіх цікавіла, ці зможа кіраўніцтва БНР дамагчыся рэальнага ўвасаблення ідэі незалежнасці. А патрыятычна настроеная частка беларускага руху спадзявалася і прыкладала намаганні для рэалізацыі гэтай мары. Дакументы сведчаць, што дэкларацыя аб стварэнні і незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі мела шырокі станоўчы водгук у рэгіёнах, але затым на месцах узнікла паўза у пачатку рэальнай практыкі нацынальнага дзяржаўнага будаўніцтва. Да таго ж многія сумняваліся ў своечасовасці абвяшчэння незалежнасці БНР і яе легальнасці. Нядзіўна, што, пры мажлівасці, з месцаў у Народны Сакратарыят БНР накіроўваліся дэлегацыі для ўсведамлення сітуацыі і пачатку рэальнай дзейнасці.

Вялікую актыўнасць у стасунках з кіруючымі органамі БНР праяўлялі дэлегацыі з Магілёўшчыны. Некалькі дэлегатаў з Магілёўскай губерні ў маі 1918 г. наведалі Народны Сакратарыят і Прэзідыум Рады, правялі перамовы, аб чым паведамлялі інфармацыйныя органы маладой рэспублікі. Прычым гэта былі не толькі прадстаўнікі беларускіх рад, але і іншых устаноў і таварыстваў. Так, 16 мая ў Мінск прыбыў член Бабруйскай павятовай Рады і заснавальнік Беларускага культурна-асветніцкага таварыства ў

---

[171] Местная жизнь. Исполнительный комитет Могилевской Белорусской Рады. Об упразднении губернских учреждений // Труд. 1918. № 120. 18 (05) ліп. С. 3; Пратакол пасяджэння ВК МБР 5.07.1918 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 136. Арк. 76.

[172] Пратакол пасяджэння ВК МБР 13.05.1918 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 136. Арк. 70–72 адв.

Бабруйску свяшчэннік Давідовіч[173]. А 28 мая Старшыню Народнага Сакратарыята Я. Варонку наведалі дэлегаты Магілёўскай губерні ў асобе кс. А. Астрамовіча (паэт Зязюля) і Іосіфа Насовіча, якія былі ўпаўнаважаны весці перамовы аб заснаванні на Магілёўшчыне беларускіх школ, правінцыйных рад і інш. Адзначым, што ксёндз Астрамовіч вёў у краі культурна-асветніцкую работу, праводзіў размовы і казанні ў касцёле на беларускай мове, чым выклікаў варожыя адносіны з боку ксяндзоў палонафілаў. У выніку перамоў пытанне аб адкрыцці беларускіх школ на Магілёўшчыне было вырашана станоўча, на што былі выдатаваны асігнаванні[174]. Магілёўскія памешчыкі таксама цікавіліся дзейнасцю БНР. Прадстаўнікі зямельных уласнікаў грамадскія і палітычныя дзеячы Фермор і Хрушч-Мясаедаў 18 чэрвеня наведалі Народны Сакратарыят, а Фермор меў размову 19 чэрвеня са Старшынёй Народнага сакратарыяту і Народным Сакратаром замежных спраў Я. Варонкам[175]. Гэтыя і іншыя візіты сведчаць аб вялікай цікавасці розных слаёў грамадства да народнай рэспублікі.

Кіраўніцтва Беларускай Народнай Рэспублікі з моманту свайго стварэння надавала асаблівую ўвагу органам мясцовага кіравання. Народны Сакратарыят БНР яшчэ 29.04.1918 г. зацвердзіў часовы наказ мясцовым Беларускім Радам. У ім, між іншага сцвярджалася: “Пункт 1. Беларускія Рады маюць мэтаю – дзяржаўную незалежнасць Беларусі, развіццё і паўсюднае пашырэнне беларускай культуры. … п. 3 … рада павінна быць... у гарадах – гарадская..., губернскія і іншыя. Над усімі Радамі стаіць Рада Беларускай Народнай Рэспублікі… п. 5 …Запрашаць у Раду можна толькі нацыянальна-свядомых беларусаў... п. 16 Бяручы на **сябе абавязкі Улады на месцах**, Беларускія Рады павінны дапоўніць свой склад прадстаўнікамі **іншых** [выдзелена аўт.] народнасцей края, згодна з іх лікам у акрузе Рады” [176]. Варта асобна падкрэсліць, што беларусы, праводзячы палітыку па стварэнні ўласнай незалежнай дзяржавы, адразу гарантавалі правы нацыянальных меншасцей, выступалі

[173] Информационный листок № 23 Минск 17 мая 1918 года // НАРБ. Фонд 325. Воп. 1. Спр. 19, Арк. 205.
[174] Информационный листок № 26 Минск 28 мая 1918 года // НАРБ. Фонд 325. Воп. 1. Спр. 8. Арк.54.
[175] Бюллетень № 7 “Белорусская жизнь”. Менск, 21 июня 1918 г. // НАРБ. Фонд 325. Воп. 1. Спр. 8. Арк. 79; Спр. 21. Арк. 244.
[176] Часовы наказ мясцовым Беларускім Радам ад НС БНР // НАРБ. Фонд 325. Воп. 1. Спр. 19. Арк. 26–26адв.; Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Т. 1. Кн. 1. С. 134–135.

супраць нацыянальнай нецярпімасці. Ствараліся рады і на тэрыторыі Магілёўшчыны.

Тым часам Бабруйская Павятовая Рада прызначыла са свайго складу членам Рады БНР у Мінску свайго старшыню Е. Успенскага[177]. А ў Магілёве беларусы – гласныя гарадской Думы ўзнялі пытанне прызнання незалежнасці БНР перад галоўным прадстаўнічым органам улады горада – Гарадской Думай. 18 і 19 мая 1918 г. у магілёўскай газеце "Труд" былі апублікаваны матэрыялы да абмеркавання на пасяджэнні гарадской думы пытанняў адносін да аб'яўлення незалежнасці БНР і падпарадкавання радзе БНР. У першым артыкуле, які меў станоўчы характар, распавядалася пра І Усебеларускі з'езд, устаўныя граматы, прынцыпы работы Рады[178]. У другім артыкуле (аўтар той самы) – аб прыняцці і змесце 2 і 3 Устаўных грамат – аўтар сцвярджаў, што яны не адпавядаюць пастановам Усебеларускага з'езда, гучала крытыка ў адрас "незалежнікаў". Аўтар артыкула выступаў за Беларусь як частку непадзельнай Вялікарасіі[179].

Такія публікацыі і неабходнасць прапаганды ідэй беларускай справы прымусілі МБК (МБР) задумацца аб выданні сваёй газеты. Бракавала фінансаў. Таму вырашылі хадайнічаць перад НС БНР аб выдаткаванні сродкаў на дзейнасць МБК[180]. Пытанне было надзвычай актуальным ва ўсіх рэгіёнах. Народны секратарыят абмеркаваў яго і пастанавіў выдаваць 14 беларускіх газет "для прапаганды і абароны **беларускай дзяржаўнасці, незалежнасці і непадзельнасці**" [выдзелена аўт.] не толькі ў Магілёве, але і ў Мінску, Вільні, Віцебску, Смаленску, Гродна, Беластоку, Гомелі, Полацку, Пінску (на пінчуцкай гаворцы), Бабруйску, Маскве, Петраградзе і Кіеве. А вось пытанне выдання газеты ў Варшаве засталося нявырашаным[181]. Як бачна, прасоўваннем беларускіх ідэй з дапамогай газет Урад БНР збіраўся займацца на ўсёй этнаграфічнай тэрыторыі Беларусі, а таксама сярод беларускай дыяспары ў Кіеве, Маскве і Петраградзе. У выніку 30.05.1918 г. скарбнік В. Захарка атрымаў з канцылярыі НС паведамленне аб тым, што 24.05.1918 г. на пасяджэнні НС БНР

---

177 Бюллетень № 2 "Белорусская жизнь". Менск, 6 июня 1918 г. // НАРБ. Фонд 325. Воп. 1. Спр. 8. Арк. 73.
178 Белорусская рада и народный секретариат // Труд. 1918. № 59. 18 мая. С. 1–2.
179 Белорусская рада и народный секретариат // Труд. 1918. № 60. 19 мая. С. 1–2.
180 Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Т. 1. Кн. 1. С. 222.
181 Информационный листок № 26 Минск 28 мая 1918 года // НАРБ. Фонд 325. Воп. 1. Спр. 8. Арк. 55 адв.

было вырашана выдаткаваць 5000 рублёў на выданне штотыднёвай газеты ў Магілёве, на старонках якой будзе прапагандавацца беларуская справа[182].

У адказ на публікацыі і грамадскія дыскусіі, каб захаваць прынцыпова важнае і суцішыць моўную праблему, 5.06.1918 г. на пасяджэнні Выканаўчага камітэта МБР (прысутнічалі: М. Кахановіч, Д. Даўгяла, В. Какашынскі, Д. Аляхновіч, А. Ляхтановіч, Я. Аляхновіч, А. Плябанская, А. Семяненка, Л. Какашынскі) быў прыняты шэраг пастаноў: "... В настоящий момент стремление к созданию независимой Белоруссии является весьма полезным для белорусского национального движения, и поэтому [Выканаўчы камітэт МБР] считает объявление в настоящее время Центральной Белорусской Радой независимости Белоруссии правильным и полезным для Белоруссии. ... Признавая необходимыми и неотложными аграрные реформы в Белоруссии вплоть до наделения безземельных белорусов землеробов землей за счет казенных земель и земель крупных частных владельцев, Комитет считает, что объявленное Центральной Белорусской Радой уничтожение частной собственности на землю не соответствует исторически сложившемуся и существующему в настоящее время культурному и экономическому укладу жизни в Белоруссии. ... Приветствуя взрождение белорусского народного языка и расцвет белорусской литературы, поэзии и искусства, считает введение белорусского языка как обязательного в государственное делопроизводство преждевременным"[183], якія былі апублікаваны 13 чэрвеня ў магілёўскай газеце "Труд"[184].

Дэбаты аб адносінах да Цэнтральнай Беларускай Рады ў Мінску ў Магілёўскай гарадской думе адбыліся 26.06.1918 г. М. Кахановіч і прадстаўнік польскай рады выступілі з прамовамі за незалежнасць Беларусі, прадстаўнікі мясцовых кадэтаў, народнага саюза, БУНДа – супраць. Большасцю галасоў гарадская дума не прызнала паўнамоцтвы ЦБР у Мінску і вырашыла не пасылаць да яе дэлегатаў[185].

---

182 Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Т. 1. Кн. 1. С. 165.

183 Пратакол № 5 пасяджэння Выканаўчага камітэта МБР 5.06.1918 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 136. Арк. 73–74 адв.

184 Местная жизнь. В исполнительном комитете Могилевской белорусской рады // Труд. 1918. № 85. 13(01) чэрв. С. 4.

185 Местная жизнь. Городская дума. Белорусский вопрос // Труд. 1918. № 98. 26(13) чэрв. С. 3.

Верагодна, на пазіцыю Магілёўскай гарадской Думы паўплывала пазіцыя мінскіх земскіх органаў улады. Мінскі губернскі земскі сход і Мінская гарадская Дума напачатку спрыяльна ўспрынялі ўтварэнне БНР. Абвешчаная рэспубліка фінансавалася са сродкаў мясцовых бюджэтаў. Але ўжо ў канцы красавіка – маі адносіны мяняюцца. Курс на незалежнасць, на думку многіх гласных Мінскай гарадской думы, адхіляў "арыентацыю і палітычную лінію Рады ад той, якая была намечана ўсёй дэмакратыяй нашага краю, у тым ліку і першым Усебеларускім з'ездам… і з'яўляецца лініяй Думы". У выніку 29 красавіка Мінская Дума прыняла рашэнне адклікаць сваіх прадстаўнікоў з Рады БНР і прыпыніць далейшы водпуск асігнаваных радзе сродкаў[186]. З такой аргументацыяй 20 мая Мінскі губернскі земскі сход прыняў рашэнне разарваць адносіны з Радай БНР. Ён лічыў менавіта сябе "законным прадстаўніком 2-х млн насельніцтва губерні" і пастанавіў "усяляк падтрымліваць ідэю свабоднага самавызначэння Беларусі і свабоднага палітычнага і культурнага развіцця беларускага народа", якое можа вызначыць Устаноўчы сход Беларусі[187].

Такая пазіцыя мінскіх прадстаўнічых органаў улады, як і магілёўскіх, адлюстроўвала палітычны расклад сіл, які склаўся на пачатку рэвалюцыі і не адпавядаў зменам грамадскай думкі і новай палітычнай і геапалітычнай рэальнасці грознага 1918 г. Выканаўчы камітэт Магілёўскай Беларускай Рады 2 і 5.07.1918 г. на сваіх пасяджэннях разгледзеў пытанне аб сваіх адносінах да пастановы Магілёўскай гарадской Думы аб непрызнанні Рады БНР[188]. Вынікі былі апублікаваны: "Магілёўская беларуская рада абмеркавала пастановы Магілёўскай гарадской думы аб адносінах да рады БНР і лічыць, што Магілёўская гарадская дума не адлюстроўвае мясцовай грамадскай думкі"[189]. Больш таго, ВК МБР адзначаў, што тагачасны склад Магілёўскай гарадской думы стаў варожым беларускаму руху

[186] Журнал Минской городской Думы 29 апреля 1918 г. // НАРБ. Фонд 325. Воп. 1. Спр. 16. Арк. 51-52.

[187] Рэзалюцыя Мінскага губернскага земскага сходу па беларускаму пытанню, прынятая 20 мая 1918 года // НАРБ. Фонд 325. Воп. 1. Спр. 21. Арк. 159–159 адв.

[188] Пратакол № 6 пасяджэння Выканаўчага камітэта Магілёўскай беларускай рады 2.07.1918 г. Пункт 1: Адносіны да пастановы Магілёўскай гарадской Думы аб непрызнанні Рады БНР // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 136. Арк. 75–75 адв.; Пратакол № 7 пасяджэння Выканаўчага камітэта Магілёўскай беларускай рады 5.07.1918 г. // Тамсама. Арк. 76–76 адв.

[189] Местная жизнь. Исполнительный комитет могилёвской белорусской рады о могилёвской городской думе // Труд. 1918. № 114. 12 ліп. С. 2–3.

і прапаноўваў прыняць меры па “роспуску цяперашняга складу думы і замене яго больш адпаведным інтарэсам беларускага насельніцтва горада”[190].

Недзе паміж 5 і 11.07.1918 г. адбылася сустрэча прадстаўнікоў ВК МБР Яўгена Аляхновіча і Уладзіміра Лукіна з мясцовым прадстаўніком германскіх акупацыйных войск: “В беседе о финансировании местных учебных заведений коснулись Центральной Белорусской Рады. Е. Олехнович и В. Лукин заявили, что они являются членами Исп. Комитета Мог. Белорусской Рады. Представ. герм. войск выразил свое удовольствие относительно возможности познакомиться с деятельностью Мог. Белор. Рады и просил осведомить его о том, есть ли в Мог. Раде помещики и какой ориентации держится Мог. Рада. Е.С. Олехнович ответил, что помещики в Раде есть, что же касается ориентации Мог. Рады, то она стоит **за самостоятельность Белоруссии** [выдзелена аўт.], в экономическом же отношении Белоруссия, по мнению Мог. Рады, должна опираться на Украину. Представитель герм. оккуп. войск выразил желание поближе познакомиться с Мог. Белорусской Радой и просил установить возможность постоянного общения между ним и Радой. Кроме того, он просил дать ему переводчика для перевода его распоряжений на белорусский язык”[191]. 11.07.1918 г. на пасяджэнні ВК МБР быў створаны адмысловы орган для стасункаў з прадстаўнікамі германскіх акупацыйных войск у складзе: М. Кахановіч, Д. Даўгяла, В. Какашынскі, Я. Аляхновіч[192].

Напрыканцы ліпеня 1918 г. Магілёў наведаў Іван Луцкевіч. 27 ліпеня ён выступіў з дакладам на пасяджэнні Выканаўчага камітэта Магілёўскай Беларускай Рады: “падрабязна расказаў аб рабоце Віленскай Беларускай Рады, а таксама паведаміў кароткія звесткі аб найбліжэйшай дзейнасці Мінскай Беларускай Рады”[193]. Па ўспамінах М. Кахановіча: “Іван Іванавіч раіў нам моцна трымацца лёзунгу “Непадзельная і незалежная Беларусь” і ўсімі сіламі змагацца з ворагамі беларускага адраджэньня”[194].

---

[190] Ліст ВК МБР у Віленскую Беларускую Раду ад 29.07.1918 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 137. Арк. 44–45.

[191] Пратакол пасяджэння ВК МБР 11.07.1918 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 136. Арк. 78 адв.–79 адв.

[192] Тамсама. Арк. 79 адв.

[193] Пратакол пасяджэння Выканаўчага камітэта Магілёўскай Беларускай Рады 27.07.1918 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 136. Арк. 80.

[194] Васілеўскі Ю. Успаміны Міхаіла Кахановіча “Іван Луцкевіч у Магілёве” // Ратуша. 1993. 14–20 кастр. С. 6.

За некалькі дзён славуты беларускі дзеяч пазнаёміўся з горадам, яго архітэктурным аблíччам, станам беларускай справы, наведаў музеі і адшукаў у царкоўна-гістарычным музеі Магілёва некалькі асобнікаў унікальных старабеларускіх выданняў. Падрабязна яго візіт ў Магілёў апісаў даследчык Ю. Васілеўскі ў Магілёўскай газеце "Ратуша" (1993). Ад'язджаючы з горада, І. Луцкевіч выказаў сваё задавальненне тым, што "Магілёў мае беларускі твар і беларускую душу, нягледзячы на антыбеларускую палітыку апошніх сталецьцяў"[195]. Акрамя Магілёва, І. Луцкевіч наведаў Оршу і Бабруйск[196].

Згодна з інфармацыяй даследчыка А. Сідарэвіча, Народны Сакратарыят Беларускай Народнай Рэспублікі 1.08.1918 г. заслухаў даклад В. Какашынскага і прыняў пастанову накіраваць "Давярыцельную грамату", якую яму выдала, пэўна ж, Беларуская Рада ў Магілёве, у мандатную камісію Рады БНР на прадмет залічэння Какашынскага ў склад Рады БНР як прадстаўніка Магілёўскай Беларускай Рады.

Як указвалася вышэй, 28.05.1918 г. НС БНР даручыў ксяндзу А. Астрамовічу (пробашч парафіі ў Абольцах) і І. Насовічу арганізаваць мястэчковыя, павятовыя і губернскія рады ў раёнах Магілёўскай губерні[197]. НС БНР на сваім пасяджэнні 3.09.1918 г. заслухаў пісьмовы даклад кс. Астрамовіча і І. Насовіча аб тым, як арганізоўваліся беларускія рады на Магілёўшчыне. У ім паведамлялася між іншага, што "*сяляне* адносяцца пакуль што недаверчыва, а польскіе памешчыкі ўсімі сіламі ні давалі працаваць і нават пры помачы акупацыйнага начальства адабралі мандат на арганізацыю радаў"[198].

Аналіз архіўных матэрыялаў і тэкстаў публікацый у тагачасных магілёўскіх газетах паказвае, што беларускае пытанне хвалявала грамадства на працягу ўсяго 1918 г. Яно было ледзь не такім жа актуальным і папулярным, як і пытанне забеспячэння горада хлебам. Прычым летам і восенню 1918 г. беларускае пытанне знаходзіла ўсё больш прыхільнікаў незалежнасці, нягледзячы на этнічную самасвядомасць, палітычныя і рэлігійныя погляды, бо іншага выйсця з магчымага прыходу савецкай улады многім не

---

[195] Васілеўскі Ю. Успаміны Міхаіла Кахановіча "Іван Луцкевіч у Магілёве". С. 6.
[196] Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Т. 1. Кн. 1. С. 274.
[197] Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Т. 1. Кн. 1. С. 164.
[198] Тамсама. С. 247.

бачылася. Актуалізаваў, увесь час прапагандаваў і ставіў на абмеркаванне беларускае пытанне менавіта Магілёўскі беларускі камітэт. Яго члены пры кожным зручным моманце даводзілі, што ўтварэнне самостойнай беларускай дзяржавы можа стаць выйсцем з той няпростай драматычнай сітуацыі, ў якой апынулася тады наша краіна. Тым не менш, варта адзначыць, што, крыніцы, якія ёсць у наяўнасці, дазваляюць сцвярджаць, што МБК так і не здолеў стаць сапраўдным органам улады БНР на мясцовым узроўні.

Дадатковая дамова паміж Германіяй і Савецкай Расіяй была падпісана 27.08.1918 г. Згодна з ёй нямецкае войска мелася пакінуць беларускія землі на Усход ад Бярэзіны (Дняпроўскай), злучана з Магілёўшчынай[199].

Магчымы прыход Савецкай улады ў Магілёў прымусіў членаў Магілёўскага Беларускага Камітэта шукаць выйсце з сітуацыі. У Літоўскай дзяржаўнай акадэмічнай бібліятэцы Урублеўскага захоўваецца прашэнне ад другога верасня на імя камандзіра нямецкай акупацыйнай дывізіі ад выканкама МБК з просьбай аб эвакуацыі некаторых членаў камітэта і ягонай маёмасці вагай 25 пудоў (400 кг) і выдзялення для гэтага асобнага вагона цяплушкі[200]. Амаль ідэнтычны ліст быў накіраваны і ў адрас галавы Магілёўскай гарадской думы. Характэрна, што члены Камітэта клапаціліся і аб захаванні свайго архіва, які таксама планавалася вывезці.

Як бачна з лістоў, жаданне эвакуіравацца было выклікана перш-наперш страхам перад рэпрэсіямі з боку бальшавікоў. Асаблівую ролю тут сыгралі "віцебскія падзеі" – расстрэлы былых членаў Беларускага Народнага Саюза і Віцебскай Беларускай Рады. Адзначым адразу, што інфармацыя аб расстрэле пералічаных у прашэнні асоб была не зусім дакладная. Так, сцвярджалася, што сярод іншых бальшавікі расстралялі дэпутата былой Расійскай Дзяржаўнай Думы, вядомага беларускага краязнаўца Сапунова, але ён пражыў яшчэ шэсць гадоў – да 1924 г. У той жа час падставы для страху былі цалкам рэальнымі. Чуткі аб чырвоным тэроры ў Віцебску былі небеспадстаўнымі. Віцебск быў адзіным губернскім горадам Беларусі, у якім пасля наступлення войск германскай арміі захоўвалася савецкая ўлада на працягу ўсяго 1918 г. У горадзе і

[199] Тамсама. С. 259–260.
[200] Прошение Господину Начальнику дивизии Исполнительного Комитета Могилевской Белорусской Рады // LMAVB RS. Фонд 21. Спр. 2218. Арк. 47–47адв.

ваколіцах праводзіліся рэквізіцыі, дзейнічалі харчатрады, шырока прымянялася практыка чырвонага тэрору.

Падставы верыць пагалоскам аб віцебскіх расстрэлах былі ў членаў Магілёўскага Беларускага Камітэта даволі сур'ёзныя, і іх падмацоўвала перапіска з членамі Віцебскай Беларускай Рады. Захавалася "Большевицкое самоопределение народов" – ліст адчаю К. Хадкевіча аб "разгону і разгроме рэвалюцыйна-дэмакратычных арганізацый" у лютым 1918 г. бальшавікамі Віцебска. У ім падрабязна апісваюцца спробы чырвоных атрадаў рабаваць сабор і інтэнданцкія склады падчас наступлення немцаў, якому супрацьстаялі беларускія дружыны і "паўстанне народу". За гэта беларускія арганізацыі – выканкам воінаў беларусаў Паўночнага фронту, Віцебская Беларуская Рада, Беларуская сацыялістычная грамада былі абвінавачаны ў стварэнні белай гвардыі для паходу на савецкую ўладу, а іх маёмасць, перапіска, бібліятэка былі разрабаваныя, памяшканні занятыя[201]. Суб'ектыўныя, але шматлікія эмацыйныя паведамленні з Віцебска і іншых гарадоў, падкантрольных Чырвонай арміі, прымушалі членаў Магілёўскага камітэта асцерагацца не толькі за сваю маёмасць, але і за жыццё.

У архівах БНР маецца ліст старшыні Выканаўчага камітэта МБР М. Кахановіча з Магілёва Народнаму Сакратарыяту БНР ад 27 верасня 1918 года з просьбаю аб выдзяленні памяшкання для Камітэта ў Мінску і аб асігнаванні грошай. З рэзалюцыі загадчыка спраў НС Л. Зайца можна даведацца крыху пра лёс архіва МБК: "Грошы ні могуць быць выданы, бо ў пасяджэнні Рады за 13/X усе асыгноўкі старыя ануліраваны. Справы можна ўсе злажыць у адну з шафаў Нар. Сакрэт. 27/X ЛЗ"[202].

Нягледзячы на падрыхтоўку да эвакуацыі МБК працягвае палітычную дзейнасць. Завяршэннем пакрокавай стратэгіі Магілёўскага Беларускага Камітэта можна лічыць яго заявы ў абарону цэласнасці, самастойнасці і незалежнасці беларускай дзяржавы, якія ён дасылае ўрадам Украінскай дзяржавы і РСФСР.

Беларускі Генеральны Консул на Украіне Р. Базарэвіч (Кіеў) 30.09.1918 г. накіраваў ліст на імя Старшыні Беларускай дэлегацыі на міжнародных перамовах А.І. Луцкевіча: "Маем гонар перадаць

[201] Большевистское самоопределение народов // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 137. Арк. 115–116 адв.
[202] Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Т. 1. Кн. 1. С. 261.

два пратэсты Магілёўскага Беларускага Камітэта ад 29.09.1918 г. № 411 і № 412 на імя Урада РСФСР і Украінскай дзяржавы”[203].

Тэкст першага пад вых. № 411 ад 22.09.1918 г.: “Могилевский Белорусский Комитет. гор. Могилев губ. Правительству Российской федеративной советской республики в лице Председателя русской делегации для ведения мирных переговоров с Украинской державой. Могилевская Белорусская Рада, в заседании от 21 сентября 1918 года, рассмотрев вопрос о создавшемся, вследствие условий дополнительного к Брест-Литовскому договора, положении, устанавливающим принадлежность Белоруссии к составу Российской федеративной советской республики, после обмена мнениями постановила: Довести до сведения правительства Российской федеративной советской республики и правительства Украинской державы, что Могилевская Белорусская Рада считает последний “дополнительный” договор между Россией и Германией нарушением прав Белорусского народа на самоопределение, на независимость и неделимость Белоруссии, провозглашенные I-м всебелорусским конгрессом в г. Минске 17–31 декабря 1917 года. Поэтому Могилевская Белорусская Рада протестует против непризнания Брестским и дополнительным к нему договорами между Российской федеративной советской республикой и Германией прав Белорусского народа на самостоятельное государственное существование при условии объединения всех белорусских земель в одном самостоятельном государстве, о чем и доводит до сведения правительства Российской федеративной советской республики и Украинской державы. Председатель комитета М. Коханович. Секретарь. Подписи. Печать “Могилевский Белорусский Комитет”. Падобны змест пратэсту пад вых. № 412 “В Совет Министров Украинской державы Министру иностранных дел”[204].

Лісты пратэсту МБК 30.09.1918 г. праз Надзвычайную дэлегацыю Рады БНР трапілі да міністра замежных спраў Украіны і старшыні Расійскай мірнай дэлегацыі Х. Ракоўскага (Кіеў)[205].

Трэба адзначыць, што ліставанне на такім высокім узроўні не было выключнай з’явай у рэвалюцыйную эпоху. Крах манархіі і

[203] Ліст Беларускага Генеральнага Консула ва Украіне // LCVA. Фонд 582. Воп. 2. Спр. 9. Арк. 1.

[204] Лісты – пратэсты МБК // LCVA. Фонд 582. Воп. 2. Спр. 9. Арк. 4–4 адв., 5–6; Чарнавыя накіды заяў Магілёўскай беларускай рады Урадам Расіі і Украіны з пратэстам // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 137. Арк. 46–48.

[205] Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Т. 1. Кн. 1. С. 264.

дэмакратызацыя грамадства пасля Лютаўскай рэвалюцыі зрабілі падданых грамадзянамі і адкрылі апошнім дзверы ў вялікую палітыку. Многія былыя абывацелі адчувалі і бралі на сябе адказнасць за лёс краіны. Сам урад БНР даваў прыклад такіх паводзін. Знешнепалітычная дзейнасць кіраўніцтва маладой рэспублікі, якая шукала прызнання і дапамогі, была надзвычай актыўнай. Захаваліся звароты, ноты, мемарандумы, дэкларацыі і лісты ў Варшаву, Вашынгтон, Гаагу, Генуя, Жэневу, Кіеў, Лондан, Маскву, Парыж і іншыя сталіцы і цэнтры міжнародных адносін[206].

У кастрычніку 1918 г. завяршылася дзейнасць МБК у Магілёве. Як канкрэтна праходзіла эвакуацыя сяброў Камітэта з Магілёва, нам па даступных матэрыялах няясна. Але дакладна вядома, што выехаць кіраўніцтва Камітэта паспела. Ратуючыся ад бальшавіцкай навалы, частка сяброў МБК вырашыла перабрацца ў Мінск. 27.10.1918 г., за тры дні да прыходу Чырвонай арміі ў Магілёў, старшыня Магілёўскай Беларускай Рады Міхаіл Кахановіч знаходзіўся ўжо ў Мінску.

Да пачатку лістапада 1918 г. бальшавіцкія войскі часткова занялі Магілёўскі павет і г. Магілёў. Аб гэтым было адзначана 5 лістапада 1918 г. у Ноце Надзвычайнай дэлегацыі Рады БНР міністру замежных спраў Украіны аб хутчэйшым прызнанні незалежнасці БНР[207]. Заняцце Магілёва разглядалася як акупацыя Расіяй.

У Мінску Міхаіл Кахановіч пэўны час працягвае сваю дзейнасць як старшыня Магілёўскай Беларускай Рады. Так, 27.10.1918 г. ён піша ў Сакратарыят Беларускай Народнай Рэспублікі запіску, у якой выкладае свае ўяўленні аб міжнародным становішчы БНР і тактыцы на пасляваеннай мірнай канферэнцыі. У запісцы Кахановіч прапанаваў стварыць Лігу народаў былой Расійскай імперыі для супольных выступленняў на міжнародных форумах. Яго думкі ішлі поруч з сусветнымі развагаммі аб магчымых супольнасцях. Так, у 1919 г. была ўтворана Ліга Нацый. Пасля Другой сусветнай вайны – Ліга паняволеных народаў. М. Кахановіч у Мінску нейкі час пражываў на вуліцы Праабражэнскай у доме № 9 на кватэры святара І. Зенюка[208].

[206] Дакументы па пытаннях зносін Урада БНР з урадамі замежных дзяржаў (звароты, ноты, мемарандумы, дэкларацыі). Кароткая даведка аб галоўных момантах працы Урада БНР за мяжой (1925) // НАРБ. Фонд 325. Воп. 1. Спр. 14.
[207] Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Т. 1. Кн. 1. С. 290–291.
[208] Лісты старшымі МБР М. Кахановіча // LCVA. Фонд 582. Воп. 2. Спр. 9. Арк. 39–40; Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Т. 1. Кн. 1. С. 287.

Пра дзейнасць МБК больш нічога невядома. У сувязі з набліжэннем чырвонаармейцаў да Мінска далейшы шлях Кахановіча і архіва МБК ляжаў у Вільню, дзе ён спачатку будзе кіраўніком школьнага аддзела Цэнтральнай беларускай рады Віленшчыны і Гродзеншчыны, затым першым дырэктарам Віленскай беларускай гімназіі і дэпутатам сейма Польшчы.

Яшчэ за савецкім часам у вусных размовах магілёўцаў выказвалася версія, па якой менавіта за прызнанне Незалежнасці Беларусі пасля ўсталявання савецкай улады ў 1919 годзе Магілёў пазбавілі губернскага статусу, ператварыўшы яго ў павятовы цэнтр Гомельскай губерні РСФСР. Шматгранная дзейнасць Магілёўскага Беларускага Камітэта ў 1918 г. дазваляе казаць аб небеспадстаўнасці такога сцвярджэння.

Збег знешнепалітычных абставін прымусіў кіраўніцтва МБК пакінуць Магілёў і перабрацца напачатку ў Мінск, а затым у Вільню. Уражвае, што, нягледзячы на падрыхтоўку да эвакуацыі, Рада ад імя МБК напярэдадні выгнання знаходзіла магчымасць складаць і пасылаць пратэсты ўрадам Украінскай дзяржавы і РСФСР у абарону беларускай дзяржавы.

Першая сусветная вайна паскорыла дзяржаваўтваральныя працэсы ў Еўропе. На абшарах былой Расійскай імперыі ўзніклі такія дзяржавы, як Польшча, Фінляндыя, Літва, Эстонія, Латвія і інш. Актывізаваўся палітычны рух па стварэнні ўкраінскай і беларускай дзяржаў.

Гістарычныя даследаванні абвяргаюць стэрэатыпы, што пануюць у адносінах да ролі ўсходнебеларускіх гарадоў у нацыятворчых працэсах XX ст. У прыватнасці, наступны: “Беларускі ўсход даўно гіпнатызаваў нас сваёй часам гратэскавай сур’ёзнасцю й касьмічнай місійнасьцю. Так ужо сталася, што формы палітычнай і нацыянальна-культурнай актыўнасці там ніколі не былі надта разьвітыя, затое не бракавала неўструктураванай стыхійнай энэргіі. Ёсьць у ёй пэўная прывабнасьць, – не ў эфектыўнасьці, але эфектнасьці”[209].

У 1917–1918 гг. у Магілёве дзейнічала адна з самых паспяховых беларускіх арганізацый рэвалюцыйнага перыяду – Магілёўскі Беларускі Камітэт, які стаў першай нацыянальнай дэмакратычнай палітычнай арганізацыяй беларусаў на ўсходзе нашай краіны. Яны ж раскрываюць вытокі падтрымкі беларускай дзяржаўнасці ў вірлі-

[209] Васілеўскі Ю., Сёмуха А. Літаратурны акалот: Антон Беларусаў-Скалка // Запісы БІНІМ. NEW YORK. 1999. № 23. С. 159.

вых умовах грамадска-палітычнага жыцця напрыканцы Першай сусветнай вайны.

Аналіз статута арганізацыі, праграмных мэт і арганізацыйнай працы ў 1917–1918 гг. схіляе да высновы, што дзейнасць камітэта грунтавалася на Беларускай нацыянальнай ідэі. Аб гэтым сведчыць наяўнасць у дзейнасці Магілёўскага Беларускага Камітэта такіх яе элементаў (кірункаў), як гісторыя, этнічныя традыцыі (этнічныя сувязі, фальклор, зямля продкаў, мова, рэлігія, звычаі, паходжанне), імкненне да незалежнасці. Практычная дзейнасць сяброў МБК, безумоўна, сведчыла пра шчырую зацікаўленасць у эканамічным і культурным прагрэсе краю, у здабыцці беларусамі годнага месца ў супольніцтве народаў. Яна паказвае, што члены арганізацыі не абмяжоўваліся культуна-асветніцкай працай, а імкнуліся да палітычнай дзейнасці, каб уплываць на лёс краіны.

Сябры арганізацыі зрабілі камітэт уплывовай і адметнай гарадской з’явай. Яны здолелі не толькі актыўна ўдзельнічаць, але і шмат у чым вызначыць парадак дня гарадскога жыцця. Дзякуючы дзейнасці Магілёўскага Беларускага Камітэта на першых дэмакратычных мясцовых выбарах у Магілёўскую гарадскую думу ў жніўні 1917 г. нацыянальная беларуская палітычная плынь упершыню ў Магілёве была гучна прадстаўлена і мела поспех, што дазволіла беларусам адстойваць свае інтарэсы ў Магілёўскай гарадской думе на працягу 1917–1918 гг. Фарміраванне асобнага спісу ад беларусаў на выбарах ва Устаноўчы сход дазволіла беларускім арганізацыям Усходняй Беларусі гучна заявіць аб сабе. Магілёўскі Беларускі Камітэт актыўна далучыўся да падрыхтоўкі першага агульнанацыянальнага форуму беларусаў – Усебеларускага з’езда, які быў скліканы ў снежні 1917 г.

За час свайго існавання палітычныя погляды дзеячаў Магілёўскага Беларускага Камітэта эвалюцыянавалі ад ідэі дзяржаўнай аўтаноміі Беларусі ў складзе Расійскай дзяржавы да ўхвалення стварэння незалежнай Беларускай Народнай Рэспублікі. Драматычныя палітычныя падзеі таго часу: разгон бальшавікамі Першага Усебеларускага з’езда, Брэсцкі мір і акупацыя значнай часткі Беларусі германскімі войскамі канчаткова схілілі сяброў камітэта, як і ншыя беларускія арганізацыі краіны да падтрымкі ідэі стварэння незалежнай беларускай дзяржавы.

Узнікненне і станаўленне Беларускай Народнай Рэспублікі непарыўна звязана з гісторыяй і культурай Магілёва і Магілёўшчыны.

У 1918 г. камітэт вітаў утварэнне Беларускай Народнай Рэспублікі і абвяшчэнне 25.03.1918 г. незалежнасці Беларусі і арганізаваў падтрымку гэтай ідэі ў горадзе Магілёве. Вынікам самавызначэння беларусаў Магілёва можна лічыць правядзенне схода 31.03.1918 г. – адзінага выпадку маштабнай падтрымкі стварэння Беларускай Народнай Рэспублікі ў значным цэнтры Беларусі.

Аналіз архіўных матэрыялаў і тэкстаў публікацый у тагачасных магілёўскіх газетах паказвае, што летам і восенню 1918 г. беларускае пытанне знаходзіла ўсё больш прыхільнікаў незалежнасці, нягледзячы на этнічную самасвядомасць, палітычныя і рэлігійныя погляды, бо іншага выйсця з магчымага прыходу савецкай улады многім не бачылася. Актуалізаваў, увесь час прапагандаваў і ставіў на абмеркаванне беларускае пытанне менавіта Магілёўскі Беларускі Камітэт. Яго члены пры кожным зручным моманце даводзілі, што ўтварэнне самастойнай беларускай дзяржавы можа стаць выйсцем з той няпростай драматычнай сітуацыі, у якой апынулася наша краіна. І толькі збег знешнепалітычных абставін прымусіў кіраўніцтва МБК пакінуць Магілёў і перабрацца напачатку ў Мінск, а затым у Вільню.

У самых неспрыяльных умовах акупацыі і рэвалюцыйных катаклізмаў кіраўніцтва камітэта адстойвала інтарэсы беларусаў і краю ў гарадскіх, губернскіх, агульнарасійскіх установах, дасылала адозвы суб’ектам міжнароднага права. На жаль, лёс беларускага пытання залежаў тады не толькі ад саміх жыхароў Беларусі, але, у значна большай ступені, ад становішча на франтах вайны і знешнепалітычных адносін існаваўшых і значна больш магутных дзяржаў, перш-наперш ад стасункаў Савецкай Расіі і Германскай імперыі.

Можна сцвярджаць, што стварэнне і дзейнасць Магілёўскага Беларускага Камітэта – гэта першы ў ХХ ст. на тэрыторыі Усходняй Беларусі выхад на палітычную і міжнародную арэну грамадскай арганізацыі, якая з’яўлялася носьбітам ідэалагічнага руху па дасягненні і замацаванні аўтаноміі, адзінства і індывідуальнасці беларускай нацыі. Дзейнасць Магілёўскага Беларускага Камітэта, Беларускага Камітэта гласных Гарадской Думы г. Магілёва ў 1917–1918 гг. абвяргае стэрэатыпы, што пануюць у адносінах да ролі ўсходнебеларускіх гарадоў у нацыятворчых працэсах ХХ ст. Камітэт стаў адным з цэнтраў кансалідацыі беларускага нацыянальнага руху калі і не нароўні, то ўслед за Мінскам[210].

[210] Агееў А. Р., Пушкін І. А. Фарміраванне і дзейнасць Магілёўскага Беларускага Камітэта (1917–1918) : манаграфія. Магілёў, 2017. С. 113–117.

# 3. АСАБЛІВАСЦІ ФУНКЦЫЯНАВАННЯ ЭЛЕМЕНТАЎ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ Ў САВЕЦКАЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

## 3.1 Грамадскі рух ва ўмовах нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва і станаўлення сацыялістычнага ўкладу жыцця (1919–1940-я)

У 1919 г. савецкая ўлада трывала ўсталёўвалася на беларускіх землях. Яшчэ 21–23.12.1918 г. на канферэнцыі Беларускіх секцый РКП(б) у Маскве было выбрана Цэнтральнае бюро беларускіх камуністычных арганізацый (Дз. Жылуновіч) і было прынята рашэнне аб неабходнасці сварэння БССР, бо беларуская тэрыторыя цалкам ужо кантралявалася Чырвонай арміяй.

1.01.1919 г. было абвешчана стварэнне ССРБ (БССР). Савецкая Беларусь была адным з стваральнікаў СССР (1922). У СССР да 1936 г. дэкларавалася форма дзяржаўнага кіравання – дыктатура пралетарыята. Уся ўлада павінна была належыць камуністычнай партыі бальшавікоў[211].

На грамадскае жыццё Беларусі паўплываў падзел яе тэрыторыі. Ужо праз месяц пасля ўтварэння БССР у лютым 1919 г. усходнія раёны па рашэнні цэнтральных органаў партыі бальшавікоў адыйшлі Савецкай Расіі. У выніку Магілёўшчына разам з Віцебшчынай да 1924 гг., а Гомельшчына да 1926 г. знаходзіліся ў складзе РСФСР. У 1921 г. Заходняя Беларусь была перададзена Польшчы. Такім чынам частка насельніцтва Беларусі жыла ў Савецкай Беларусі, другая – у РСФСР, а трэцяя – ў буржуазнай Польшчы, што прадвызначыла розныя ўмовы і шляхі фарміравання элементаў грамадзянскай супольнасці.

Толькі з 1926 г. БССР пачала ўяўляць больш-менш адзіны культурны і гаспадарчы рэгіён, на тэрыторыі якога пражывала пераважная большасць прадстаўнікоў адной нацыі – беларусаў. На

[211] Касцюк М.П. Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі. Мінск, 2000; Шымуковіч С.Ф. Гісторыя Беларусі. Ч. II. С. 119–167; Несцяровіч М.Б. Узаемаадносіны дзяржаўнай улады і грамадскіх арганізацый у Беларусі (1917–2000 гг.) // Весці НАНБ. Серыя гуманітарных навук, 2005. № 2. С. 52–58; Пушкін І.А. Нацыянальныя меншасці БССР у грамадска-палітычным і культурным жыцці (20-я гады XX ст.): Манаграфія. Магілёў, 2004; Удзел нацыянальных меншасцей у грамадска-палітычным жыцці Савецкай Беларусі (1919–1990 гг.): манаграфія. Мінск, 2010 і інш.

чарговым VIII з’ездзе Саветаў БССР 5–12 04.1927 г. была прынята новая Канстытуцыя БССР. Вышэйшым органам улады з’яўляўся Усебеларускі з’езд Саветаў. Дзяржаўнымі мовамі былі зацверджаны беларуская, руская, польская і яўрэйская. Мовай міжнацыянальных зносін вызначалася беларуская.

Станоўчая роля масавых арганізацый такіх, як камуністычная партыя Беларусі, камсамол, афіцыйныя прафсаюзы ў справе далучэння шырокага кола грамадзян да грамадска-палітычнага жыцця рэспублікі новага тыпу дастаткова асветлена, даволі аднабакова і тэндэнцыйна, у публікацыях часоў існавання СССР [212].

Аднак у Беларусі ня ўся грамадскасць падтрымала савецкі шлях развіцця. Пэўная частка насельніцтва Беларусі стала на шлях узброенай барацьбы з новай уладаю. У 1918–1919 гг. адбыліся паўстанні ў Вяліжы, Гомелі, Чавусах, Горках, Воршы, Прапойску (Слаўгарадзе) і іншых гарадах. Варта адзначыць, што ў перыяд 1919–1923, 1925–1926, 1930–1931 гг. дзеянні ўзброеных сялян і інтэлігенцыі насілі ярка вызначаны палітычны кантэкст, чыста крымінальных злачынстваў практычна не было.

Узброеныя выступленні насельніцтва на абшарах Беларусі можна падзяліць на некалькі груп. Паўстанні і выступы з акрэсленай палітычнай праграмай: з мэтай рэстаўрацыі дарэвалюцыйнага ладу; аднаўлення буржуазна–дэмакратычных свабод, якія былі атрыманы ў ходзе Лютаўскай рэвалюцыі, з заклікам да перадачы ўлады Ўстаноўчаму сходу; нацыянальна-вызваленчыя паўстанні з заклікамі да Незалежнасці Беларусі. Былі пратэсты і без акрэсленай палітычнай праграмы, выкліканыя эканамічнай палітыкай бальшавікоў. Усе яны былі аб’яднаны антыбальшавіцкімі настроямі[213]. Беларускія нацыянальныя арганізацыі “Брацтва беларускае”, “За Радзіму”, “Зялёны дуб” імкнуліся да стварэння беларускай незалежнай дзяржавы.

---

[212] Напрыклад: Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии. Ч. I–II. Минск, 1967–1968; Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Минск, 1983; Коммунистическая партия Белоруссии в цифрах 1918–1988. Минск, 1988; Из истории социалистического и коммунистического строительства / Сб. статей. Минск, 1973; Очерки истории Ленинского комсомола Белоруссии. Минск, 1975; Очерки истории профсоюзов Белоруссии (1905–1969). Минск, 1970 і інш.

[213] Пушкін І.А. Узброены супраціў ва Усходняй Беларусі (20–30–я гады XX ст.): дакументы і матэрыялы. Мінск, 2009; Ліст Цэнтральнай Рады Віленшчыны і Гродзеншчыны // LCVA. Фонд 306. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 1; Даклад Літоўскаму Ураду аб палітычным стане Беларусі. 29.03.1921 г. // Тамсама. Фонд 582. Воп. 1. Спр. 18. Арк. 1–9.

Савецкі ўрад, бачачы незадаволенасць і масавыя ўзброеныя выступы народных масс адмовіўся ад палітыкі “ваеннага камунізму”, што дазволіла не дапусціць сацыяльнага выбуху і спрыяла ажыўленню ў эканоміцы. Былі праведзеныя шэраг эканамічных мерапрыемстваў, якія атрымалі назву “новая эканамічная палітыка” (НЭП).

У міжваеннай гісторыі БССР вылучаюцца два перыяды: да 1929 г. нацыянальна-дэмакратычны і пасля 1929 г. – перыяд фарміравання і ўмацавання адміністратыўна-каманднай сістэмы кіравання.

Для грамадска-палітычнага жыцця Савецкай Беларусі ў 1920-я гады характэрны дзве тэндэнцыі: па-першае, гэта быў апошні перыяд дзейнасці розных партый, арганізацый і аб’яднанняў, якія паступова выцясняюцца з жыцця, па-другое, адбываецца далучэнне насельніцтва ў новыя працэсы праз уцягненне іх у прасавецкія грамадска-палітычныя аб’яднанні.

Тагачасныя грамадска-палітычныя аб’яднанні (далей – аб’яднанні) можна ўмоўна падзяліць на дзве групы. Да першай адносіліся тыя, якія падтрымлівалі савецкую ўладу і існуючы дзяржаўны лад, ці былі лаяльнымі да іх, альбо былі заснаваны і працавалі пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі. Да другой адносіліся тыя, чыя дзейнасць знаходзілася як бы ў “апазіцыі” да існуючай улады. Абедзве групы падзяляліся на падгрупы аб’яднанняў у залежнасці ад накірунку работы.

Першая група складалася з: а) палітычных аб’яднанняў КП(б)Б, КСМБ, Яўрэйская камуністычная партыя (ЯКП), партыя “Паалей Цыён”[214], БУНД, яўрэйскі камуністычны саюз моладзі (яўкамол); б) грамадскіх: прафесійныя саюзы, піянерскія арганізацыі; в) гаспадарчых: таварыства па землеупарадкаванню працоўных яўрэяў (АЗЕТ) [215], таварыства саматужнікаў, сельскагаспадарчыя, кааперацыя і г.д.; г) культурна-асветніцкіх: літаратурныя, краязнаўчыя таварыствы, таварыства “Ваяўнічых бязбожнікаў” і г.д.; д) featuring рознага роду дабраахвотных таварыстваў кшталту МОПР, Авіяхім, Чырвоны Крыж і г.д. Другая група складалася з: а) палітычных: “Алгемейне-Сіяністы”, “Яўрэйская працоўная партыя Цыарэй

[214] Лісты, пратаколы, даклады арганізацый ЯСДРП (Паалей–Цыон) на тэрыторыі Беларусі. 1917–1928 гг. // Расійскі дзяржаўны архіў сацыяльна-палітычнай гісторыі. Фонд 272. Воп. 1. Спр. 14, 116, 129, 188, 303, 304, 305, 306, 307, 318, 530.

[215] Пратаколы, планы, справаздачы, перапіска аб працы рэспубліканскіх і абласных аддзелаў АЗЕТа // Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. Фонд Р-9498. Воп. 1. Спр. 1–15.

Цыён”, ЦСП (Цыянісцка-Сацыялістычная партыя) з яе маладзёжнымі філіяламі: ЦС ЮФ (Цыянісцкі сацыялістычны Югенд Фербанд) і ЯССМ (Яўрэйская Сіянісцка-сацыялістычная моладзь), арганізацый моладзі – АСМ ( арганізацыя сіянісцкай моладзі), “Гехалуц” і інш.; б) грамадскіх: “Камітэт абароны палякаў” у Бабруйскай акрузе; в) культурных і спартыўных: польскія “скауты”, латышскія спартыўныя гурткі, музычныя гурткі ў нямецкай калоніі Мазырскай акругі і інш.; г) дабрачынных эканамічнага напрамку: “Бікур Хейлым”, “Гімплас-Хасед”; д) рэлігійных таварыстваў, брацтваў: таварыства “тэрцыяраў” (амаль пры кожным касцёле), “таварыства ружанца”, “таварыства Св. Вікенція з Пауля”, “таварыства Св. Сэрца Ісуса і Марыі”, “таварыства Непарочнага зачацця Св.Дзевы Марыі”, сярод немцаў – гурткі “Божых дзяцей” і г.д. [216]

Камуністычная партыя бальшавікоў з самага пачатку імкнулася ліквідаваць дзейнасць сваіх палітычных апанентаў. У 1921 г. самаліквідаваліся ці распаліся Бунд, Яўрэйская камуністычная партыя, была разгромлена Беларуская партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў (беларускія эсэры).

З пачаткам НЭПа ў 1921 г. адбылася адносная дэмакратызацыя грамадска-палітычнага жыцця, наколькі гэта дазваляла аднапартыйная сістэма. Актыўна пашыралі дзейнасць прафсаюзы, галоўнай мэтай якіх стала абарона пралетарыяту ў барацьбе супраць нэпманаўскай буржуазіі. Хутка пашыраў свой уплыў сярод моладзі камсамол. Папулярнымі былі такія таварыствы, як Асаавіяхім, фізкультурныя аб’яднанні. У Беларусі дзейначалі філіялы Міжнароднай арганізацыі дапамогі змагарам рэвалюцыі, Чырвоны крыж (Беларускае таварыства). У рэчышчы барацьбы з рэлігійнымі ўстановамі пашыралі дзейнасць атэістычныя арганізацыі.

Шырокі размах у 1920-я гг. атрымаў краязнаўчы рух. Аматары-краязнаўцы апісвалі грамадскае і эканамічнае жыццё ў рэспубліцы, яе прыродныя ўмовы: глебы, карысныя выкапні, жывёльны і раслінны свет; вывучалі гісторыю народа, яго мову, святы і абрады, фальклор, звычаі, народныя веды і вераванні. Гэта пазітыўна ўплывала на нацыянальныя пачуцці, развіццё нацыянальнай самасвядомасці беларусаў.

[216] Дакладныя запіскі, справаздачы, лісты // НАРБ. Фонд 4 п. Воп. 1. Спр. 1869, 1914, 1964, 2993; Справаздачы і даклады ЦК КСМБ // Тамсама. Фонд 63. Воп. 2. Спр. 12, 144, 275; Матэрыялы латсекцыі // Дзяржаўны архіў грамадскіх аб’яднанняў Магілёўскай вобласці (ДАГАМаг). Фонд 6601. Воп. 1. Спр. 222 ; Пушкін І.А. Удзел нацыянальных меншасцей у грамадска-палітычным жыцці Савецкай Беларусі (1919–1990 гг.). С. 28–39.

У 1930-я гг. дзейнасць афіцыйных грамадскіх аб'яднанняў была скаваная рознымі рэгламентацыямі. Іх працу цвёрда кантралявалі партыйныя, савецкія і іншыя органы. Ініцыятыва працаўнікоў і арганізацый накіроўвалася ў рэчышча дзеянняў афіцыйных падыходаў. Ім адводзілася роля перадаткавага механізму па выка-нанні партыйна-савецкіх рашэнняў. Кампартыя, прафсаюзы, камса-мол былі адзяржаўлены, дзейнасць іх была строга рэгламентавана[217]. У іх шэрагах ліквідоўвалася іншадумства і стрымліваліся праявы ініцыятывы, у тым ліку сярод кіраўнікоў мясцовага ўзроўню. Усе дзеянні былі прадвызначаны цэнтральнымі органамі кіравання.

Важным напрамкам грамадска-палітычнай работы з'яўляліся выбарчыя кампаніі. Сярод іх варта вылучыць удзел у выбарах і працы Усебеларускіх з'ездаў і мясцовых органах кіравання – саветах. З'езды выкарыстоўваліся для паказу падтрымкі палітыкі савецкай улады і КП(б)Б, як у справе пабудовы сацыялізму, змагання з сусветным і ўнутраным капіталізмам. Аднак прадстаўнікі розных сацыяльных груп (сяляне, рабочыя, саматужнікі) мелі магчымасць выкарыстоўваць гэтыя з'езды для вырашэння сваіх патрэб.

Аналізуючы матэрыялы з'ездаў (найбольш часта яны праводзіліся ў 1926–1928 гг.), можна зрабіць высновы, што акрамя пытанняў развіцця і ўдасканалення сельскай гаспадаркі, найбольш часта гучалі пытанні культурна-асветнай работы (стварэнне, дзейнасць, матэрыяльныя ўмовы школ, хат-чытален, бібліятэк, дзейнасці гурткоў і г.д.), выдання падручнікаў, газет, літаратуры на нацыянальных мовах, падрыхтоўкі настаўнікаў, стварэння нацыянальных саветаў, развіцця кааперацыі. Іншыя прапановы і не маглі з'явіцца, бо на падобныя форумы траплялі толькі загадзя правераныя і падрыхтаваныя органамі КП(б)Б асобы.

У межах кампактнага пражывання нацыянальных меншасцей ствараліся нацыянальныя Саветы (яўрэйскія, польскія, рускія, латышскія, нямецкія, украінскія), што спрыяла захаванню нацыянальнай самасвядомасці і актыўнаму ўдзелу ў грамадска-палітычным жыцці рэспублікі.

У 1920–1930-я гг. на тэрыторыі БССР ствараліся і дзейнічалі калектыўныя гаспадаркі – камуны і калгасы. Першымі, па ўласнай

[217] Пушкин И. А. Профессиональные союзы БССР в предвоенный период на примере Могилёвщины (1930–1941 гг.). С. 78–82; Агеев А.Г., Пушкин И.А. История профсоюзного движения Могилёвщины. С. 85.

ініцыятыве, іх стваралі яўрэі. У стварэнні калектыўных гаспадарак вельмі актыўны ўдзел прымала бяднейшая частка сялянства.

Гвалтоўныя дзеянні ўладаў па правядзенні калектывізацыі прывялі да розных форм супраціву з боку часткі насельніцтва (падпал маёмасці, забойства жывёлы, узброеныя выступы і г.д.). Адной з форм грамадскага супраціву ў памежных раёнах БССР з'яўлялася нелегальная эміграцыя. Сярод польскага насельніцтва Бабруйскай, Мінскай акруг у пачатку 1930 г. з'явіліся намеры зыйсці з усёй маёмасцю ў Польшчу. Органы ДПУ атрымалі загад арыштамі папярэджваць магчымыя падобныя дзеянні насельніцтва. Нягледзячы на гэта некалькім сотням сялянаў удалося гэта зрабіць [218], што сведчыць аб іх свядомасці і высокай ступені арганізацыі.

У сувязі з правядзеннем калектывізацыі ў БССР адбывалася разбурэнне абшчыннага самакіравання ў сельскім побыце, аднак яго асобныя элементы працягвалі жыць і ў новых умовах (звычай узаемадапамогі – талака і інш.). У выніку гвалтоўнай калектывізацыі канчаткова завяршыўся працэс разбурэння інстытута прыватнай уласнасці на зямлю. З таго часу ў савецкай дзяржаве сярод насельніцтва запанаваў пагардлівы і здзеклівы выраз: “Усё вакол калгаснае, усё вакол маё”. Прымусовае ўвядзенне грамадскай уласнасці на зямлю прывяло да страты сялянінам пачуцця эканамічнай свабоды і незалежнасці, што прывяло ў наступныя дзесяцігоддзі да аслаблення пачуцця салідарнасці, няўпэўненасці ва ўласныя сілы і дзейнасць грамадскіх інстытутаў. Гэта яскрава бачна на прыкладзе Заходняй Беларусі, якая знаходзілася ў складзе Польшчы і дзе прыватная ўласнасць на зямлю існавала да 1939 г. Менавіта там, уключна з Мінскам, назіралася найбольшая актывізацыя грамадскіх працэсаў у канцы 1980-х – пачатку 1990-х гг.

Пад уздзеяннем партыйна-савецкага кіраўніцтва грамадская актыўнасць насельніцтва змяняла свае накірункі, узнікалі яе новыя формы, напрыклад, сацыялістычнае спаборніцтва. Яно па–рознаму ўспрымалася насельніцтвам. З аднаго боку, назіраўся энтузіязм працоўных, накіраваны на павышэнне вытворчасці працы, паляпшэнне якасці прадукцыі, добраахвотнае зніжэнне расцэнак і павышэнне норм, а з другога – прысутнічаў скептыцызм і недавер, неразуменне сутнасці спаборніцтва: “Не жадаем уступаць у спаборніцтва, не навязвайце нам”, “Няма масла, няма сала, а вы нам тлумачыце аб спаборніцтве”. Узніклі і замацаваліся ў якасці працоўных

---

[218] Паведамленні АДПУ па БВА // НАРБ. Фонд 4 п. Воп. 21. Спр. 279. Арк. 92.

традыцый рацыяналізатарства і вынаходніцтва, ударніцтва, зотаўскі і стаханаўскі рухі [219].

Аб узроўні развіцця грамадзянскай супольнасці ў Савецкай Беларусі сведчаць грамадскія настроі ў асяродку гарадскога насельніцтва ў міжваенны час. Іх можна падзяліць на тры групы. Першая – абсентысцкія (абыякавыя), характэрныя для насельніцтва, якое ставіла перад сабой мэту выжывання ў любых умовах. Другая – канфармісцкія, уласцівыя асобам, якія прыстасоўваюць сваё жыццё да рэальнасці і спадзяюцца атрымаць сваю частку ўлады, дабрабыту ў існуючых сістэмах. Трэццяя – настроі агітацыйнага супрацiву, характэрныя асобам актывісцкага тыпу паводзін, якія былі незадаволены працэсам фарміравання "новай, бальшавіцкай" рэчаіснасці.

Найбольш пашыранымі савецкія формы грамадскай актыўнасці былі ў асяроддзі гарадскога насельніцтва. Калі разглядаць усё насельніцтва па сацыяльнаму статусу – самая высокая грамадская актыўнасць была сярод настаўнікаў. Яны пасля працоўнага дня ў школе вялі гурткі па ліквідацыі непісьменнасці, былі агітатарамі на выбарах, чыталі лекцыі і даклады ў клубах і на прадпрыемствах, распаўсюджвалі дзяржаўныя пазыкі сярод насельніцтва і г.д.

Ва ўмовах фарсіравання аднапартыйнай, адміністрацыйна-каманднай сістэмы ў краіне, нельга сказаць, што ўсе – кіраўнікі і члены камуністычнай партыі, прафсаюзаў і іншых афіцыйных аб'яднанняў раўнадушна глядзелі як парушаюцца прынцыпы дэмакратызацыі, галоснасці, забеспячэння рэалізацыі свабод і інтэрасаў працаўнікоў. Можна прывесці вялікую колькасць фактаў праяў грамадскай ініцыятывы і крытыкі дзеянняў партыйнага кіраўніцтва з боку насельніцтва [220]. Нярэдкасцю былі наступныя выказванні на сходах: "Кампартыя не дае рабочым магчымасці выбіраць у свае прафсаюзныя органы таго, каго жадаюць рабочыя, а насаджаюць партыйцаў; савецкая дзяржава бедная таму, што партыя паўсюль насаджае загадчыкамі партыйцаў, не разумеючых нічога ў справе і толькі атрымоўваючых вялікія заробкі, адсюль нашы прадпрыемствы толькі дэфіцытныя; улада давіць рабочых і што яна не адрозніваецца ад старых царскіх міністраў; у Польшчы лепшыя парадкі, чым у Расіі, Пілсудскі большы сацыяліст, чым бальшавікі;

[219] Беларусы. Т. 4. С. 350.

[220] Падрабязна глядзі: Грамадскія настроі і міжнацыянальныя адносіны ў асяродку гарадскога насельніцтва ў міжваенны час на прыкладзе Магілёўшчыны // Пушкін І.А. Удзел нацыянальных меншасцей у грамадска-палітычным жыцці Савецкай Беларусі (1919–1990 гг.). С. 82–94.

партыя вылучае на адказныя пасады камуністаў, а тыя абкрадаюць дзяржаву; партыя – гэта тое ж самае дваранства” [221].

Рабочыя друкарні, гаворачы наконт “дабраахвотных” складак, падкрэслівалі: “Нашы кіраўнікі душаць рабочы клас… толькі і ведаюць, што браць усемагчымыя адлічэнні, ахвяраванні… рабочыя іншых краін жывуць значна лепей, чым мы, нягледзячы на тое, што ў іншых краінах існуе імперыялізм, а мы жывем у савецкай краіне”. Далей – болей: “Калі пачнецца вайна, дык я ўпэўнены, што больш дурняў не будзе і ніхто не пойдзе абараняць савецкую ўладу, бо рабочыя зразумелі, што савецкая ўлада – адзін падман”, “…як можна мірыцца з існаваннем такой улады. Я чакаю і не магу дачакацца калі, урэшце, нас пазбавяць ад яе”, “…кажуць, што мы ідзем да сацыялізму, а мне здаецца, што на дзесятым годзе рэвалюцыі, мы ідзем не да сацыялізму, а да прыгоннага права…” [222].

Падобныя погляды і публічныя выказванні не рэдкія былі ў 1920-я гады і цалкам зніклі ў наступныя дзесяцігоддзі. Яны сталі расцэньвацца як выступы супраць савецкай улады, а тыя, хто прытрымліваўся іх, падвергліся рэпрэсіям з боку партыйна-савецкага кіраўніцтва.

У канцы 1920-х гг. у БССР пачаўся курс на згортванне беларусізацыі і сталі ўсталёўвацца загадныя метады кіравання ва ўсіх сферах грамадскага жыцця. Бюракратычны апарат зліўся з партыйным і пераўтварыўся па сутнасці ў асобны сацыяльны клас. У выніку зрошчвання дзяржаўнага і партыйнага апарату рэзка знізілася роля выбарных Саветаў. Выканаўчая ўлада стала кантраляваць органы заканадаўчай улады. Тэрытарыяльныя рэспубліканскія прафсаюзы ліквідаваліся, у БССР быў прызначаны ўпаўнаважаны ВЦСПС. У кіраванні спалучаліся метады татальнай цэнтралізацыі, адміністрацыйна-загадныя метады кіравання і дзяржаўны тэрор у дачыненні да незадаволеных і патэнцыяльна незадаволеных асоб. Адбылася змена сацыяльных слаёў насельніцтва і яго інстытутаў, на якія зараз абапіраліся ўлады – гэта люмпенізаванае насельніцтва, бюракратыя, армія, праваахоўчыя і карныя структуры.

1930-е гады ўвайшлі ў гісторыю нашай краіны як адны з самых цяжкіх і змрочных. З аднаго боку яны характарызаваліся тым, што жыццё грамадства праходзіла ў асноўным у мірных умовах і былі

[221] Інфармацыйныя зводкі аддзела ДПУ // ДАГАМаг. Фонд 6577. Воп. 1. Спр. 12. Арк. 57, 272.
[222] Інфармацыйныя зводкі аддзела ДПУ // Тамсама. Спр. 350. Арк. 70, 124, 194.

адзначаныя самаадданай працай народа, вонкава мажорным пафасам сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага развіцця ў накірунку пабудовы сацыялізму. З іншага боку ў гэтыя гады вялося жорсткае, бязлітаснае, няўмольнае і ў той жа час паслядоўнае, сплanаванае змаганне сталінскага кіраўніцтва з лепшымі прадстаўнікамі інтэлігенцыі, працоўнага класа, сялянства, нават з часткай партыйнага і савецкага апарата, грамадскімі арганізацыямі і г.д.[223] Менавіта ў гэтыя гады ў краіне ўсталявалася сталінская дыктатура. Апорай яе была адміністрацыйна-камандная сістэма кіравання сацыяльна-эканамічным, грамадска-палітычным і культурным жыццём, што негатыўна паўплывала на фарміраванне элементаў грамадзянскай супольнасці.

Тым не менш, нават у неспрыяльных абставінах 1930-х гг. назіралася пэўная актывізацыя грамадскага жыцця у значнай ступені не падкантрольнага афіцыйнай уладзе ў выглядзе па-за культавай дзейнасці рэлігійных абшчын нацыянальных супольнасцей БССР. Выкарыстоўваліся наступныя формы и метады: дзейнасць па тлумачэнню і сістэматызацыі рэлігійных ідэй, місіянерская, дабрачынная, выхаванне ў сям'і, па захаванню прынцыпаў і правілаў жыцця, кіраўніцтва і дзейнасць рэлігійных арганізацый, асветная, адукацыйная. Новая хваля актывізацыі па-за культавай дзейнаці рэлігійных абшчын была выклікана падрыхтоўкай і прыняццем Канстытуцый СССР і БССР, а таксама правядзеннем Усесаюзнага перапісу насельніцтва (1936–1937). Ва ўмовах пабудовы савецкай дзяржавы, якая імкнулася да суцэльнага падпарадкавання камуністычнай ідэалогіі і ўсталявання атэістычнага (матэрыялістычнага) светапогляду рэлігійнае жыццё абшчын у 1930-я гг. стала той сферай, дзе захоўваліся прыкметы, рысы і асаблівасці традыцыйнай культуры нацыянальных супольнасцей[224].

У Заходняй Беларусі сітуацыя крыху была іншай. У Польшчы дзейнічалі легальныя і нелегальныя палітычныя партыі і арганізацыі. Значны ўплыў на беларускае насельніцтва мелі: партыя

---

[223] Записка наркома ГБ СССР В.Н.Меркулова в ЦК ВКП(б), И.В.Сталину об итогах "операции по аресту и выселению антисоветского и социально-чуждого элемента из западных областей БССР" // Расійскі дзяржаўны архіў навейшай гісторыі. Фонд 89. Воп. 18. Спр. 7. Арк. 1–3; Адамушка У.І. Палітычныя рэпрэсіі 20–50-х гадоў на Беларусі. Мінск, 1994.

[224] Пушкін І.А. Пазакультавая дзейнасць рэлігійных абшчын нацыянальных меншасцей БССР у 1930-я гг. // Веснік Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.А.Куляшова. Серыя А. Гуманітарныя навукі. 2016. № 2. С. 16–19.

беларускіх эсэраў, Беларуская рэвалюцыйная арганізацыя, БСДП, Беларуская хрысціянская дэмакратыя, КПЗБ, КСМЗБ, Беларуская сялянска-рабочая грамада, Таварыства беларускай школы[225].

Акрамя беларускіх нацыянальных арганізацый існавалі і грамадскія аб'яднанні прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей. Актыўна у Заходняй Беларусі дзейнічалі Бундаўскія культурна-асветніцкія арганізацыі, аб'яднанні рускіх, украінцаў. Літоўскі рух быў прадстаўлены дзейнасцю таварыства "Рытас" і найбольш уплывовай арганізацыяй сярод вяскоўцаў–літоўцаў "Літоўскае таварыства выхавання і апекі моладзі імя Св. Казіміра", якое знаходзілася пад уплывам літоўскіх хрысціянскіх дэмакратаў. У асобных населеных пунктах праводзілі працу аддзелы Саюза літоўскіх настаўнікаў.

У Заходняй Беларусі дзейнічалі праўрадавыя грамадскія арганізацыі: Таварыства стражы крэсовай, Саюз вясковай моладзі, Стралецкі саюз, Ліга супрацьпаветранай і хімічнай абароны, Марская і каланіяльная ліга, Саюз пажарнай аховы, Таварыства падтрымкі будаўніцтва грамадскіх пачатковых школ, Польска мацеж школьна, Таварыства развіцця ўсходніх зямель, Саюз грамадзянскай працы жанчын, Саюз асаднікаў, Таварыства польскай моладзі і інш.[226]

Вопыт удзелу ў грамадскіх арганізацыях з мэтай рэалізацыі сваіх інтарэсаў прадвызначыў значнае згуртаванне незадаволеных савецкай уладай пасля уз'яднання Заходняй Беларусі з БССР.

---

[225] Дэлегаты з'ездаў БХД. 1927–1930 гг. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 3. Спр. 141. Арк. 1–3; Спр. 142. Арк. 1; Статут Беларускага навуковага таварыства // Тамсама. Воп. 1. Спр. 3. Арк. 1–5; Статут Беларускага Пасольскага Клуба. 1922 г. // Тамсама. Спр. 207. Арк. 1–4 адв.; Статут Таварыства Беларускай Культуры // LCVA. Фонд 582. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 26–26 адв.; Пратакол агульнага сходу Таварыства Беларускай Школы // Тамсама. Фонд 905. Воп. 2. Спр. 3. Арк. 9–12; Зварот ЦК КПЗБ і ЦК БХД. 1935 г. // БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 201. Арк. 1–5.

[226] Загідулін А. Грамадска-палітычны рух у Заходняй Беларусі ў 30-я гады XX ст. (на прыкладзе Парэцкай гміны) // Шлях да ўзаемнасці = Droga ku wzajemności. Мат. X Міжнар. навук. канф. Гродна, 2004. С. 135–141; Машчук А. Дзейнасць Бундаўскіх культурна-асветніцкіх арганізацый на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд // Polsko-Białoruskie związki językowe, literackie, historyczne i kulturowe: Materiały XI Międzynarodowej Konferencji Naukowej "Droga ku wzajemności". Białystok, 2004. S. 569–580; Вабишевич А.Н. Из культурно-просветительской жизни украинцев в Западной Беларуси (1920–30-е годы) // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы навук. канф. С. 257–262; Яго ж. Дзейнасць літоўскіх культурна-асветніцкіх арганізацый на беларуска–літоўска–польскім памежжы ў 20–30-я гг. XX ст. // Веснік ГрДУ. Серыя 1. 2007. № 1. С. 37–41; Польскія грамадскія арганізацыі на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1920–1930-я гг. // Весці НАНБ. Серыя гуманітарных навук. 2008. № 3. С. 72–78; Пушкін І.А. Удзел нацыянальных меншасцей у грамадска-палітычным жыцці Савецкай Беларусі (1919–1990 гг.). С. 25–28.

Толькі з кастрычніка 1939 г. па ліпень 1940 г. было створана 109 розных падпольных арганізацый, якія аб'ядноўвалі 3231 удзельніка[227]. Адзначым, што ў шэрагах антысавецкага супраціву, нараўне з палякамі, знаходзіліся яўрэі, беларусы, украінцы.

Удзел насельніцтва ў партыях і арганізацыях дазволіў захаваць элементы грамадзянскай свядомасці, якія ўласцівы актывісцкаму тыпу палітычнай культуры. У пасляваенны час, у БССР гэта і прадвызначыла асаблівасці заходняга рэгіёну Беларусі, недавер савецкага кіраўніцтва да мясцовых кіруючых кадраў. Менавіта насельніцтва Заходняй Беларусі найбольш актыўна праявіла сябе ў час перабудовачных працэсаў (1987–1990) і першыя гады стварэння незалежнай Рэспублікі Беларусь.

1.09.1939 г. пачалася Другая сусветная вайна. З канца жніўня 1941 г. і да ліпеня 1944 г. працягвалася гітлераўская акупацыя беларускіх зямель.

Мы адзначалі, што сістэмаўтваральнай перадумовай фарміравання грамадзянскай супольнасці з'яўляецца наяўнасць індывіда з развітым пачуццём грамадзянскай і асабістай годнасці, яго адказнасці перад грамадствам. Гэта яскрава праявілася пад час вайны беларускага народа супраць гітлераўскіх захопнікаў[228]. У 1941–1944 гг. шырокае развіццё атрымала ў Беларусі народнае супраціўленне – партызанскі рух і дзейнасць падпольных арганізацый у гарадах[229].

---

[227] Коваленя А.А., Мацко А.Н. Национально-демографические процессы в Беларуси (1939–1945 гг.) // Нацыянальна-дэмаграфічныя працэсы на Беларусі: зб. нав. арт. Мінск, 1998. С. 39.

[228] Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 5. Беларусь у 1917–1945 гг. Мінск, 2006. С. 449–570; Нарысы гісторыі Беларусі. Ч. 2. С. 265–323; Каваленя А.А. Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны 1941–1944гг. (некаторыя аспекты тэрытарыяльных, ваенна-палітычных і нацыянальна-дзяжаўных працэсаў) // Беларуская дзяржаўнасць: вопыт ХХ стагоддзя: матэрыялы Міжнар.навук.-тэарэт.канф. Мінск, 2004. С. 94–102; Каваленя А., Касовіч А. Сацыяльна-дэмаграфічныя і нацыянальныя працэсы на Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны // Нацыянальныя меншасці Беларуі: Тэматычны зб.навук.прац. Кн. 2. Брэст–Мінск–Віцебск, 1996. С.70–73; Крывашэй Дз.А. Нацыянальныя супольнасці Беларусі ў перыяд германскай акупацыі (чэрвень 1941 – ліпень 1944). Мінск, 2009.

[229] Барабаш В. Белорусско-польское антифашистское сотрудничество на территории Беларуси в период гитлеровской оккупации (1941–1944гг.) // Шлях да ўзаемнасці = Droga ku wzajemności. С. 208–213; Барановский Е.И. Участие украинцев в партизанском и подпольном движении в Беларуси в годы Великой Отечественной войны // Беларусь–Украіна: гістарычны вопыт узаемаадносін: Матэрыялы міжнар. навук. канф. Мінск, 2004. С. 281– 284; Каваленя А.А., Мацко А.Н. Камсамольска-маладзёжнае падполле Беларусі – фактар уключэння нацыянальных меншасцей у барацьбу з ворагам (1941–1944гг.) // Нацыянальная палітыка і міжнацыянальныя адносіны на Беларусі ў ХХ стагоддзі. Мінск, 1997. С. 125–152 ; Хацкевич А.Ф., Крючок Р.Р. Становление партизанского движения в Белоруссии и дружба народов СССР. Минск, 1980 і інш.

Першыя акты ўзброенага супраціву гітлераўцам з боку савецкіх партызан адносяцца да ліпеня 1941 г. Агульны лік партызан у гады вайны ў Беларусі – больш за 374 тыс чалавек. Каля 440 тыс. налічвалася ў партызанскім рэзерву. Дзейнічала каля 4 тыс тэрытарыяльных падпольных арганізацый, якія налічвалі звыш 70 тыс патрыётаў.

Больш за палову партызан Беларусі ўступілі ў атрады пасля Сталінградскай бітвы. Значны ўплыў на пашырэнне партызанскага руху ў Беларусі ўнеслі атрады НКУС СССР і РСЧА, накіраваныя сюды вясной–летам 1942 г. Але, нягледзячы на гэта, асноўную масу партызан Беларусі складалі беларусы і нацыянальныя супольнасці, якія пражывалі тут у даваенны перыяд. Так, згодна статыстычных дадзеных Беларускага штаба партызанскага руху (БШПР), 88,84% беларускіх партызан складалі жыхары Беларусі (рускія, беларусы, палякі, яўрэі, татары, украінцы і іншыя нацыянальнасці, якія да вайны 1941–1945 гг. пражывалі на тэрыторыі рэспублікі).

Адначасова ў гады Другой сусветнай вайны на тэрыторыі Беларусі існаваў антыгітлераўскі несавецкі супраціў – дзейнасць Арміі Краёвай (АК) і ўкраінскіх нацыянальных ўзброеных фарміраванняў[230].

Прадметам аналізу грамадскага жыцця ва ўмовах гітлераўскай акупацыі Беларусі можа стаць дзейнасць арганізацый беларускіх калабарантаў: Беларускай нацыянал-сацыялістычнай партыі, Беларускай народнай самапомачы (БНС), “Вольнага корпуса самааховы”, Рады БНР, “Саюза беларускай моладзі – СБМ”, “Рады даверу”, БЦР[231].

Беларуская калабарацыя мела некалькі складаючых частак. Па першае, гэта ідэйная калабарацыя з ліку паслядоўнай антыбальшавіцкай эміграцкай апазіцыі. Па-другое – гэта жыхары БССР, якія паверылі гітлераўцам і свядома пайшлі да іх на службу, і па-

[230] Барабаш В.В. Поляки в антифашистской борьбе на территории Беларуси (1941–1944 гг.). Гродно, 1998; Валаханович И.А. Деятельность спецгрупп НКГБ БССР по выявлению и ликвидации подпольных структур ОУН–УПА на оккупированной территории Беларуси (1943–1944 гг.) // Беларусь–Украіна: гістарычны вопыт узаемаадносін: Матэрыялы міжнар.навук. канф. С. 297–300; Калаткоў У.Я. Украінізацыя грамадска-палітычнага і культурнага жыцця на Беларускім Палессі ў перыяд нямецкай акупацыі (1941–1944гг.) // Беларусь–Украіна: гістарычны вопыт узаемаадносін. С. 290–292; Літвін А.М. Армія Краёва // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 1. Мінск, 1993. С. 152–153 і інш.

[231] Літвін А.М. Акупацыя Беларусі (1941–1944) : Пытанні супраціву і калабарацыі. Мінск, 2000; Туронак Ю. Беларусь пад нямецкай акупацыяй. Мінск, 1993; Шымуковіч С.Ф. Гісторыя Беларусі. Ч. ІІ. С. 175–178.

трэцяе – гэта людзі, пазбаўленыя выбару (ваеннапалонныя). Таму аднолькава трактаваць калабарацыю як асэнсаваную здраду радзіме немагчыма. Але касцяк калабарацыі складалі прадстаўнікі першай групы і яны мелі намер аднавіць самастойную Беларусь.

Іх намаганнямі, з дазволу акупантаў, у кастрычніку 1941 г. была створана Беларуская народная самапомач (БНС). Галоўнай мэтай яе існавання была вызначана дапамога пацярпеўшым беларусам ад вайны і бальшавікоў. 29.06.1942 г. быў створаны “Вольны корпус самаахова” (беларуская самаахова – БСА) і Рада БНР, затым Беларускае навуковае таварыства, некаторыя праф-саюзы, беларускі судовы апарат. 22.06.1943 г. пачала дзейнасць маладзёжная арганізацыя “Саюз беларускай моладзі – СБМ”. У арганізацыю ўступіла некалькі тысяч чалавек, галоўным чынам з Заходняй Беларусі. Аднак беларускія калабаранты так і не атрымалі ад гітлераўцаў таго, чаго жадалі – інстытутаў дзяржаўнасці.

Такім чынам, ва ўмовах нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцт-ва, фарміравання таталітарнай палітычнай сістэмы і ваеннага ліхалецця, традыцыі і элементы грамадзянскай супольнасці част-кова захоўваліся праз дзейнасць насельніцтва ў аб’яднаннях, якія складалі палітычную сістэму грамадства ў БССР: у камуністычнай партыі, прафсаюзах, дзяржаўных інстытутах (наркаматах, саветах), камсамоле, кааператыўных аб’яднаннях, творчых саюзах і іншых. Дзякуючы ім атрымалася арганізаваць працоўны ўздым насель-ніцтва на здзяйсненне спраў, накіраваных на паляпшэнне жыцця краіны і народа. Адначасова, разбураючы традыцыйныя грамадскія працэсы ў беларускім супольніцтве, сталі фарміравацца рысы этатысцкай палітычнай культуры, якая вырашала палітычныя праблемы і здзяйсняла кантроль над палітычнымі працэсамі з дапа-могаю толькі механізмаў дзяржаўнага рэгулявання. Гэта пераш-каджала свабодным праявам грамадскіх сіл. Празмернае апякунства дзяржавы над грамадзянамі нанесла вялікую шкоду энэргіі, дзейнасці, маралі людзей. У выніку празмернага мэтанакіраванага кіраўніцтва – асобы адмаўляліся ад значнай часткі самастойнасці і адказнасці, з’яўлялася сацыяльная апатыя і іншыя негатыўныя з’явы.

## 3.2 Асаблівасці грамадска-палітычнага жыцця БССР у час “перамогі сацыялізму” (1945–1990)

Пасля перамогі ў Вялікай Айчынай вайне у кіраўніцтве краінай зноў перамагла жорсткая таталітарная лінія[232]. Тым не менш, нягледзячы на ўсе намаганні ўладаў, у часткі насельніцтва Беларусі не была цалкам вынішчана нацыянальная самасвядомасць, існавала не падкантрольная ўладам грамадская дзейнасць. Назіралася імкненне захавання нацыянальных адметнасцей праз стварэнне рознага роду нацыянальна-грамадскіх аб’яднанняў [233] і ў рэлігійнай сферы.

У маладзёвым асяроддзі ў пасляваенныя дзесяцігоддзі перыядычна ўзнікалі тайныя таварыствы: Саюз беларускіх патрыётаў, Свободная Беларусь, Клуб вольнай моладзі, Саюз вольнай моладзі, Вольная думка і інш. Гэтыя нешматлікія вучнёўскія гурткі не ставілі мэтай здзяйсненне тэрарыстычных актаў ці захоп улады, проста ва ўмовах таталітарызму вучні абменьваліся сваімі думкамі, марылі аб лепшых дэмакратычных часах. Усе гэтыя спробы стварэння непадкантрольных кампартыі грамадскіх арганізацый і рэлігійных абшчын пільна адсочваліся НКУС–КДБ і выкараняліся. Удзельнікі панеслі пакаранні. Аб гэтым неаднаразова казалася ў выступах старшыні КДБ БССР на XXV, XXVI, XXVII з’ездах кампартыі Беларусі[234].

---

[232] Нарыс гісторыі беларускай дзяржаўнасці: XX стагоддзе. С. 337–523; Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 6. Беларусь у 1946–2009 гг. Мінск, 2011. С. 23–586; Шымуковіч С.Ф. Гісторыя Беларусі. Ч. II. С. 199–227; Нарысы гісторыі Беларусі. Ч. 2. С. 424–476; Агеев А.Г., Пушкин И.А. История профсоюзного движения Могилёвщины. С. 113–190; Несцяровіч М.Б. Узаемаадносіны дзяржаўнай улады і грамадскіх арганізацый у Беларусі (1917–2000 гг.) // Весці НАНБ. Серыя гуманітарных навук, 2005. № 2. С. 52–58; Пушкін І.А. Нацыянальныя супольнасці ў дзейнасці партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва Беларусі (1945–1990 гг.) // Веснік Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.А.Куляшова. 2008. № 4. С. 20–25.

[233] Пушкін І.А. Дзейнасць нелегальных грамадскіх аб’яднанняў моладзі ў БССР (па матэрыялах стэнаграм з’ездаў КПБ у 1960–1970-я гг.) // Актуальные проблемы в изучении и преподавании общественно-гуманитарных наук (дисциплин). Материалы I (Первой) Международной научной конференции. Витебск, 2010. С. 73–74; Яго ж. Нацыянальна-патрыятычныя аб’яднанні Беларусі 1980–1990-х гг. // Романовские чтения-3 : сб. трудов Международной науч. конференции. Могилёв, 2007. С. 26–27.

[234] Стэнаграма XXV з’езда КПБ // НАРБ. Фонд 4 п. Воп. 2. Спр. 248. Арк. 352, 353 ; Стэнаграма XXVI з’езда КПБ // Тамсама. Спр. 251. Арк. 174, 175, 179 ; Стэнаграма XXVII з’езда КПБ // –. Спр. 257. Арк. 92, 94, 95; Матэрыялы да стэнаграмы XXVII з’езда КПБ // Тамсама. Спр. 259. Арк. 151 ; Пушкін І.А. Удзел нацыянальных меншасцей у грамадска-палітычным жыцці Савецкай Беларусі. С. 169–171.

У 1950-я – першая палова 1980-х гг. сфарміраваўшыйся таталітарны савецкі рэжым прадугледжваў існаванне грамадскай дзейнасці беларускага насельніцтва толькі ва ўмацаванні існаваўшай сістэмы: рух за камуністычныя адносіны да працы, масавае распаўсюджанне працоўных пачынаў па стварэнню ўдарных брыгад, сацыялістычнае спаборніцтва. Усё суправаджалася павелічэннем пераважна колькасных паказчыкаў грамадскай актыўнасці, ростам колькасці актывістаў. Гэта не заўсёды прыводзіла да якаснага паляпшэння грамадскай работы і часта насіла фармальны характар.

Актыўнасць жыхароў рэспублікі ў грамадскім жыцці вызначалася шэрагам прычын, найбольш важныя з іх: узрост, адукацыя, сацыяльна-прафесійны статус, сямейнае становішча, асабістыя схільнасці. Як паказалі матэрыялы этнасацыялагічнага даследавання 1986 г., сельскія жыхары па грамадскай актыўнасці прыкметна ўступалі гараджанам. Сярод сельскіх жыхароў удзельная вага рэспандэнтаў, якія выконвалі грамадскія даручэнні і знаходзіліся на выбарнай пасадзе, склала 16,8 %, сярод гараджан іх было больш – 26,9 %. Пастаянныя даручэнні ад грамадскіх арганізацый мелі 12,8 % апытаных сельскіх жыхароў і 32,9% гараджан. У гэту групу ўваходзілі прапагандысты, агітатары, лектары, палітінфарматары, члены рэдкалегій газет і інш. Шмат было тых, хто выконваў розныя па сваім характары часовыя даручэнні, сярод сельскіх жыхароў іх удзельная вага складала 14,5 %, сярод гараджан – 22,8 %. Характэрна, што па меры павышэння адукацыі, сацыяльна-прафесійнага статуса чалавека, сярод камуністаў і камсамольцаў грамадская актыўнасць насельніцтва ўзрастала. Цікава адзначыць, што кожнаму другому апытанаму беларусу–гараджаніну і кожнаму трэцяму сельскаму жыхару грамадская праца прыносіла маральнае задавальненне, якое было заснавана на ўсведамленні яе карысці для людзей. Разам з тым, кожны восьмы апытаны беларус і ў вёсцы, і ў горадзе палічыў, што грамадская праца замінае асноўнай працы і сямейнаму жыццю. Некаторыя тлумачылі сваю пасіўнасць у грамадскай дзейнасці занятасцю вучобай, даглядам дзяцей ці фармальным характарам гэтай працы, іншы раз не звязанай з канкрэтным жыццём чалавека[235].

У рэспубліцы існаваў цэлы шэраг арганізацый, дзейнасць якіх мела добраахвотна-прымусовы характар: Таварыства аховы

---

[235] Беларусы. Т. 4. С. 353.

помнікаў гісторыі і культуры, Таварыства аховы прыроды, Добраахвотнае таварыства садзеяння арміі, авіяцыі і флоту (ДТ СААФ), Таварыства Чырвонага Крыжа, Таварыства выратавання на водах (ТВВОД), Таварыства аматараў кнігі, Таварыства ведаў, Таварыства паляўнічых і рыбаловаў, Геаграфічнае таварыства і шмат іншых. Усе яны мелі свой актыў і, як правіла, пярвічныя ячэйкі ў працоўных калектывах. Аднак іх дзейнасць не набывала масавага характару і не аказвала істотнага ўплыву на побыт беларускага насельніцтва[236].

Супярэчлівы характар насіла жыццё рэспублікі ў перыяд 1950–1960 гг. З аднаго боку, былі спробы дэмакратызацыі, звязаныя з рэабілітацыяй так званых "ворагаў народу", сярод якіх было багата дзеячаў навукі і культуры, аслабленнем партыйнага ўціску, а з другога, – русіфікацыя ўсіх сфер жыцця, абгрунтаваная тэзісам аб пабудове камуністычнага грамадства, дзе будуць зліты мовы і культуры ўсіх савецкіх народаў, ваяўнічы атэізм, шаблоннасць. У сярэдзіне 1950-х гг. узмацнілася палітыка канфрантацыі дзяржавы ў адносінах да рэлігіі і вернікаў, што звязана з ідэяй пабудовы на працягу аднаго пакалення ў краіне камунізму, дзе рэлігіі няма месца. Пасля пастановы СМ СССР (1961 г.) пачалася кампанія па масавым закрыцці і нават знішчэнні храмаў, рэпрэсіі ў адносінах да служыцеляў культаў і вернікаў[237].

Асабліва жорсткія адносіны ўладаў былі да вернікаў, якія не жадалі, каб пазбегнуць татальнага кантролю, афіцыйна рэгістраваць свае абшчыны ў органах улады. У гэтым партыйна-савецкае кіраўніцтва бачыла праявы іншадумства, непадпарадкавання савецкай уладзе, незадаволенасць гэтай групы вернікаў існуючымі парадкамі ў СССР і БССР. Улады лічылі, што ў краіне існуе сектанцкае падполле. За правядзенне рэлігійных сходаў, рэлігійнае выхаванне дзяцей вернікаў і іх лідараў жорстка каралі. Судовыя выракі: "Пяць гадоў зняволення за незаконную рэлігійную дзейнасць" не рэдкасць у БССР у 1970-я гг.[238] У той час адбыліся выпадкі калі пры

[236] Тамсама. С. 360.
[237] Мазец В. Нацыянальна дзяржаўная палітыка і змены этнічнай структуры насельніцтва Беларусі ў 1945–1986 гг. // Беларусь у ХХ стагоддзі. Вып. 2. Мінск, 2003. С. 234–241; Канфесіі на Беларусі. С. 264–314; Пушкін І.А. Удзел нацыянальных меншасцей у грамадска-палітычным жыцці Савецкай Беларусі. С. 239.
[238] Дакладныя запіскі, даведкі Упаўнаважанага па справах рэлігіі пры СМ СССР па БССР аб стане рэлігійнасці ў рэспубліцы, выпіскі з пастаноў суда // НАРБ. Фонд 136. Воп. 1. Спр. 19, 20, 35, 36.

прыпыненні сходаў рэлігійнай моладзі ўжывалася нават зброя. Напрыклад, у Магілёве 2.05.1974 г.[239] Улады бачылі ў пашырэнні рэлігійнасці сярод насельніцтва – велізарную крамолу ў савецкай, сацыялістычнай краіне, з атэістычным і матэрыялістычным светапоглядам.

У савецкай Беларусі было шмат страчана нацыянальна-рэлігійных традыцый. Аднак істотная частка насельніцтва Беларусі з’яўлялася носьбітамі пэўных рэлігійных традыцый і каштоўнасцей. Іх узровень грамадскай актыўнасці быў даволі высокі.

Перыяд “застою” 1966 – пачатак 1980-х гг. у СССР характарызаваўся правядзеннем палітыкі “неасталінізму” і ўзмацненнем пераследу іншадумцаў (дысідэнтаў). Яшчэ больш узрасла роля камуністычнай партыі ў кіраванні ўсімі сферамі жыцця ў краіне. Гэты статус і кіруючая роля кампартыі былі замацаваны ў шостым пункце Канстытуцыі СССР 1977 г. Для рэалізацыі грамадскіх памкненняў насельніцтва дзяржава садзейнічала масаваму развіццю самадзейнай мастацкай творчасці: многія аматарскія калектывы сталі вядомы далёка за межамі рэспублікі. У 1983–1985 гг. у БССР было створана 652 калектывы мастацкай самадзейнасці, якія аб’ядноўвалі 18 тысяч удзельнікаў.

За гады савецкай улады ў Беларусі дзяржаўны манапалізм запанаваў паўсюль. Поспехі і перспектывы грамадска-палітычнага жыцця 1920-х гадоў, найбольш адчувальны ў параўнанні з тым, што атрымалася ў 1930-я і пасля ваенныя гады, калі склалася дамінуючая на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў палітычная культура з таталітарнай свядомасцю. Дзяржава падпарадкавала сабе чалавека. Гэта перашкаджала свабодным праявам грамадскіх сіл. Празмернае апякунства дзяржавы над грамадзянамі нанесла вялікую шкоду энэргіі, дзейнасці, маралі людзей. У выніку празмернага мэтанакіраванага кіраўніцтва асобы адмаўляліся ад значнай часткі самастойнасці і адказнасці, сярод значнай часткі беларускага насельніцтва замацавалася сацыяльная апатыя і іншыя негатыўныя з’явы.

У красавіку 1985 г. на пост Генеральнага сакратара ЦК КПСС быў абраны М.С. Гарбачоў. Ён хутка абвясціў курс рэформаў, якія атрымалі назву “перабудова”. Перабудова ў СССР была накіравана

[239] Пушкин, И.А. Расстрел баптистов – «раскольников» под Могилевом в 1974 году: к истории государственно-конфессиональных отношений в советской Белоруссии / И. А. Пушкин // Свобода совести в российском и международном измерении: Материалы Международной научно-практической конференции (Пенза, 23–24 октября 2012г.) / Отв. ред. д-р ист. наук И.И. Маслова, канд. ист. наук Б.В. Николаев. Пенза, 2012. С. 113–118.

на маштабныя змены адразу ва ўсіх сферах, уключаючы дэмакратызацыю грамадства. Ініцыятарам перабудовы была КПСС. На партыйных канферэнцыях, з'ездах, пленумах ЦК распрацоўваліся мерапрыемствы па яе рэалізацыі ў жыцці. Асобнымі мерапрыемствамі перабудовы стала палітыка галоснасці, гаспадарчага разліку, адраджэння прыватнай ініцыятывы ў рамках кааператыўнага руху. Палітыка галоснасці прадугледжвала паступовае адмаўленне ад кантролю КПСС за ідэалагічнымі працэсамі ў грамадстве. Цэнзура над публікацыямі была зменшана, дазволены сходы для абмеркавання палітычных працэсаў. Акрамя кантралюемых камуністычнай партыяй і ўрадам грамадскіх арганізацый сталі ўзнікаць самастойныя дыскусійныя клубы і нефармальныя аб'яднанні, у якіх можна было праявіць асабістую грамадскую ініцыятыву.

У БССР працэс дэмакратызацыі грамадства ішоў значна больш марудна, чым у іншых рэспубліках. Тым не менш, тут таксама ўзнікалі грамадскія арганізацыі – "Талака", "Тутэйшыя" (Мінск), "Паходня" (Гродна), "Машэка" (Магілёў), "Узгор'е" (Віцебск), "Повязь" (Орша), нацыянальных меншасцей (палякаў, яўрэяў, татар) і інш. Пры стварэнні гэтых нефармальных аб'яднанняў напачатку ставіліся культурна-асветныя мэты. Але з часам яны пераўтвараліся ў арганізацыі з акрэсленымі грамадска-палітычнымі кірункамі дзейнасці. У 1990 г. у Беларусі ўтвараецца масавае грамадска-палітычнае аб'яднанне Беларускі Народны Фронт "Адраджэньне", узнікаюць новыя палітычныя партыі (дэмакратычная, нацыянал-дэмакратычная, сацыял-дэмакратычная, сялянская і г.д.).

З другой паловы 1980–х гг. грамадскае жыццё насельніцтва Беларусі пад уздзеяннем палітычных і сацыяльных фактараў інтэнсіўна трансфармуецца. Зніжаецца ўзровень грамадскай актыўнасці насельніцтва, звязанай са старымі формамі: удзел у сацыялістычным спаборніцтве, у грамадскай рабоце працоўнага калектыву, святочных дэманстрацыях і шэсцях, масавых урачыстых мерапрыемствах. Частка моладзі прапаноўвае магчымасці альтэрнатыў. Напрыклад, у г. Орша, 7.11.1990 г. пад час правядзення святочнай дэманстрацыі, у цэнтры горада насустрач міаніфестантам з чырвонымі сцягамі накіравалася грамада моладзі з Оршы (суполка "Повязь") і Магілёва ("Машэка") пад бел-чырвона-белым сцягам, якая ішла прывесці ў парадак капліцу на могілках па Пралетарскай вуліцы. Падобнае адбывалася і ў іншых гарадах Беларусі. Нацыянальныя пачуцці, грамадская актыўнасць этнасаў скіроўваюцца на

адраджэнне і захаванне традыцыйнай культуры. У гэты час ідзе ажыўленне рэлігійнага жыцця: пачалі будавацца храмы, выпускаецца царкоўная літаратура, расце рэлігійнасць беларускага насельніцтва. Шырока адзначаецца праваслаўнай царквой і грамадскасцю ў Беларусі Свята славянскай пісьменнасці і культуры. У лік агульнанацыянальных свят і памятных дзён уваходзяць Ражство Хрыстова, Вялікдзень, Радаўніца, Дзень Памяці “Дзяды”.

У 1990 г. новы ВС БССР прыняў закон аб арганізацыях, які дазволіў стварэнне грамадскіх і палітычных арганізацый, партый. У сакавіку – красавіку 1990 г. у БССР адбыліся выбары ў Вярхоўны Савет рэспублікі, а таксама ў мясцовыя саветы. Упершыню за многія дзесяцігоддзі яны праходзілі на альтэрнатыўнай аснове. 10.02.1990 г. на Усебеларускім дэмакратычным форуме быў створаны Беларускі дэмакратычны блок, які аб’ядноўваў прадстаўнікоў дэмакратычна арыентаваных арганізацый. У выніку ў зноў выбраным Вярхоўным Савеце з’явіліся апазіцыйныя фракцыі БНФ і “Дэмакратычны клуб”. 27.07.1990 г. Вярхоўны Савет прыняў дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце БССР. У тых умовах гэта было хутчэй толькі пажаданнем. Аднак мела надзвычай важныя наступствы.

## 3.3 Імітацыя самакіравання на прадпрыемствах і ва ўстановах БССР у другой палове 1950–1960-х гг.

Адпаведна тэарэтычным абгрунтаванням класікаў марксізма-ленінізма будаўніцтва новага грамадства напрасткі залежала ад ступені актыўнасці і ініцыятывы працоўных а таксама іх уключанасці ў кіраванне вытворчасцю. Праўда, ужо ў міжваенны перыяд тэрмін “самакіраванне” паступова ў СССР быў выцеснены слоганам “далучэнне працоўных да кіравання вытворчасцю”, паколькі ён пачаў супярэчыць склаўшайся сістэме каманднa-адміністрацыйных метадаў кіравання эканомікай. Па меры росту складанасці вытворчасці, ўзроўню адукацыі і кваліфікацыі ўсіх удзельнікаў прамысловай вытворчасці ўзрастала важнасць зацікаўленасці і ініцыятывы работніка. Гэтую праблему рознымі сродкамі спрабавалі вырашыць усе індустрыяльныя краіны ў другой палове ХХ стагоддзя. Асабліва актуальная яна была ў краінах, якія ўзялі курс на пабудову сацыялізму. Яе рашэнне арганічна ўпісвалася ў тэарэтычныя мадэлі

сацыялізму, у якіх абвяшчалася, што кіраванне народнай гаспадаркай здзяйсняецца ў інтарэсах народа і пры яго непасрэдным удзеле.

Пытанні далучэння працоўных да кіравання вытворчасцю знаходзілі адлюстраванне ў рашэннях КПСС, але слаба рэалізоўваліся на практыцы. Новы этап намеціўся пасля правядзення XX з’езда КПСС. У межах уяўленняў таго часу быў здзейснены шэраг мер накіраваных на “удасканаленне дэмакратычных прынцыпаў кіравання эканомікай”, у тым ліку і на далучэнне працоўных да яе кіравання. Апошняе сярод іншага павінна было павысіць і кадравы патэнцыял прамысловасці шляхам рэкрутавання маладых кіраўнікоў з таленавітых работнікаў з нізавых прыступак прамысловай іерархічнай лесвіцы. Як падкрэсліваў У. І. Ленін, – неабходна “орабочить нашы аппараты, – привлечь ещё больше рабочих и трудящихся крестьян к управлению промышленностью и народным хозяйством вообще…”[240]. Далучэнне нізавых работнікаў, у першую чаргу рабочых, да кіравання прадпрыемствамі, розныя формы іх навучання, перш наперш завочныя, разглядаліся, кажучы сучаснаю мовай, як сродак дэмакратызацыі і павышэння кадравага патэнцыялу прамысловасці.

Вытворчыя нарады, якія ўзніклі яшчэ ў 1920 гг., у канцы 1950 гг. перажывалі рэнесанс. Яны ствараліся на ўсіх узроўнях арганізацыі вытворчасці: у брыгадах, на ўчастках, у цэхах і на прадпрыемствах. На іх павінны былі абмяркоўвацца ўсе асноўныя вытворчыя пытанні. Партыйныя і прафсаюзныя органы зноў пачалі пільна сачыць за іх функцыянаваннем, расла іх колькасць. У свеце рашэнняў XX з’езда партыі ЦК КПБ патрабаваў павысіць ролю вытворчых нарад і выносіць на іх самыя важныя пытані вытворчасці.

Нягледзячы на спробы рэанімацыі, дзейнасць вытворчых нарад не задавальняла ні нізавых работнікаў ні вышэйшыя эшалоны ўлады. Многія камуністы адзначалі, што толькі на асобных прадпрыемствах нарады работалі неблага. Агульнае незадавальненне лідараў прафсаюзаў у 1956 г. выклікала тое, што ва многіх выпадках вытворчыя нарады функцыянавалі фармальна, скліканіся нерэгулярна і мала адрозніваліся ад планёрак, на іх прымалася вельмі мала прапаноў. На месцах былі праведзены пленумы, сходы і нарады накіраваныя на паляпшэнне іх дзейнасці. Спрабуючы рэанімаваць дзейнасць вытворчых нарад снежанскі (1957) пленум ЦК КПСС, а

[240] Ленин В. И. Письмо к организациям РКП о подготовке к партийному съезду // Ленин В. И. Полн. собр. соч. Т. 40. С. 143.

затым студзеньскі (1958) пленум ВЦСПС прынялі рашэнне аб пераўтварэнні іх на буйных і сярэдніх прадпрыемствах у “пастаянна дзеючыя вытворчыя нарады” пад кантролем прафсаюзаў. Цэнтр цяжару працы нарадаў быў перанесены на цэхі і прадпрыемствы. Яны абіраліся на прадпрыемствах з колькасцю работнікаў звыш 100 чалавек. Адначасова адбылося некаторае пашырэнне правоў прафсаюзаў на прамысловых прадпрыемствах. Прафсаюзы сталі ўдзельнічаць у размеркаванні жылля, пуцёвак і г.д.

Са студзеня 1958 г. пачаўся хуткі колькасны рост пастаянна дзеючых вытворчых нарадаў. Ужо праз паўгода ў БССР іх было створана 1757, а да 1965 г. іх колькасць вырасла да 3971. У іх было абрана 165 тыс чалавек, у тым ліку 67,5 % рабочых. Напачатку на некаторых прадпрыемствах дзейнасць пастаянна дзеючых вытворчых нарадаў мела станоўчыя вынікі, абуджала ініцыятыву рабочых і служачых. Але адначасова з самага пачатку іх утварэнне і дзейнасць набылі ўсе характарыстычныя рысы масавай кампаніі з паспешнымі выбарамі, неразуменнем удзельнікамі задач і функцый нарадаў, разрывам паміж выбарамі і пачаткам дзейнасці, ліпавымі справаздачамі і нават прамымі фальсіфікацыямі. У дзейнасці многіх нарадаў назіралася фармальная прысутнасць рабочых, а рэальны ўдзел толькі кіруючых работнікаў.

Прычым дзейнасць вытворчых нарадаў з гадамі не толькі не паляпшалася, а мела тэндэнцыю да пагаршэння. Як толькі ўвага партыйных органаў да дзейнасці вытворчых нарадаў знізілася, іх дзейнасць пачала ўсё больш фармалізавацца. Калі ў 1960 г. статыстыка зафіксавала 30 тыс прапаноў на такіх нарадах, то ў 1963 г. – толькі 25 тыс. Увогуле вытворчыя нарады паказалі сваю нізкую эфектыўнасць у выкананні галоўнай задачы – далучэнні работнікаў да кіравання прадпрыемствамі[241]. Падобнай была сітуацыя і ў рэгіёнах Беларусі, напрыклад на Магілёўшчыне[242]. Уплыў гэтай формы рэкрутавання работнікаў у сферу кіравання прамысловасцю быў нізкім, але і адмаўляць яго цалкам нельга. Актыўныя работнікі мелі шанс паказаць сябе ў працэсе іх дзейнасці і стаць прэтэндэнтам на больш высокія пасады, і частка з іх карысталася такой магчымасцю.

[241] Агеев А. Г. Общественно-политическая деятельность рабочего класса Беларуси в 1956 – 1965 гг. Автореферат дис… к. и. н. Мн., 1992. С. 12–13.
[242] Агеев А. Г. Производственные совещания на предприятиях Могилевской области в 1956 – 1965 гг. // Могилевщина. 1991. С. 60–63.

У разглядаемы перыяд існавалі і іншыя формы прыцягнення рабочых і служачых да кіравання вытворчасцю: заключэнне калектыўных дамоў, правядзенне рабочых сходаў, дзейнасць на прадпрыемствах разнастайных творчых аб'яднанняў. Вынаходніцтва і стварэнне апошніх стала характэрнай рысай часу кіравання краінай М. Хрушчовым. Яны лічыліся адным са сродкаў пошуку, прыцягнення і падрыхтоўкі новых кадраў У гэтыя гады ўзніклі і хутка распаўсюдзіліся на прамысловых прадпрыемствах Беларусі грамадскія канструктарскія бюро, грамадскія бюро эканамічнага аналізу, саветы наватараў, грамадскія аддзелы і інстытуты, творчыя комплексныя брыгады, групы грамадскіх інспектароў і г.д. Час узнікнення большасці з грамадскіх арганізацый на вытворчасці – канец 1950 – першая палова 1960 гг.

Па ранейшаму працягвалі дзейнасць Усесаюзнае таварыства вынаходнікаў і рацыяналізатараў, навукова-тэхнічныя таварыствы, пастаянна дзеючыя вытворчыя нарады. У іх былі шырока прадстаўлены рабочыя і служачыя прамысловых прадпрыемстваў. Тым не менш, найбольш актыўна ўдзельнічалі ў іх дзейнасці не шырокія масы работнікаў, а грамадскі актыў. Актывістаў і перадавікоў нярэдка літаральна цягалі па разнастайных сходах і нарадах.

На 1965 г. на заводах і фабрыках БССР дзейнічала каля 6 тыс "творчых арганізацый" у якіх удзельнічала больш за 52 тыс рабочых і служачых[243]. Для параўнання варта прывезці колькасць грамадскіх самадзейных арганізацый у сельскіх раёнах Магілёўскай вобласці, якіх на пачатак гэтага года было створана больш за 12 тыс. з колькасцю ўдзельнікаў 83 тыс. чалавек, у тым ліку на прамысловых прадпрыемствах гэтых раёнаў[244].

Дзейнасць "творчых арганізацый" праходзіла дастаткова падобныя стадыі развіцця. Яны ўзнікалі як адлюстраванне патрэбы ў паляпшэнні працы на какрэтным участку работы, "вузкім месцы" вытворчасці ці з прычыны жадання выслужыцца, паказаць сябе з найлепшага боку ў вачах вышэйстаячага начальства. Узнікненне ішло або па ініцыятыве знізу, або па ўдалай прапанове зверху. Новая ініцыятыва прыцягвала да сябе ўвагу і часцей за ўсё падтрымлівалася, пасля чаго пачыналася кампанія па яе пашырэнню.

[243] Агеев А. Г. Общественно-политическая деятельность рабочего класса Беларуси в 1956 – 1965 гг. Автореферат. С. 13.

[244] Справка об опыте привлечения трудящихся к участию в работе местных Советов Могилевской области. 15. 11. 1964 г. // Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці (ДАМаг). Фонд 7. Воп. 5. Спр. 1007. Арк. 5.

Пад ціскам зверху вопыт абагульняўся і прапагандаваўся, а новыя аб’яднанні пачынала ствараццa на іншых заводах і фабрыках, установах без уліку іх неабходнасці, наяўнасці лідараў і без неабходнай падрыхтоўкі. Такая звышаператыўнасць і кампанейшчына нярэдка дыскрэдытавала пачынанне. Мноства аб’яднанняў існавала фармальна, ніякай канкрэтных пытанняў не рашала, працы не праводзіла.

Нягледзячы на вялікія праблемы з функцыянаваннем творчых аб’яднанняў, наяўнасць вялікай колькасці грамадскіх фарміраванняў падавалася сведчаннем пашырэння дэмакратызацыі кіравання вытворчасцю, сродкам пошуку і падрыхтоўкі новых кадраў. Было пашырана перакананне, што чым болей работнікаў будзе ўдзельнічаць у разнастайных формах кіравання вытворчасцю, тым больш яно паспяховае. Лічылася, у тым ліку, што тым больш новых кіраўнікоў сацыялістычнай вытворчасцю будзе падрыхтавана.

Па сутнасці гэта было вульгарнае ўяўленне аб “пераходзе колькасці ў якасць”, якім падмянялі гегелеўскі закон аб пераходзе колькасных зменаў у якасныя. На некаторых прадпрыемствах БССР колькасць грамадскіх аб’яднанняў пераходзіла мяжу мэтазгоднасці. Так, на Мінскай тытунёвай фабрыцы ў 1965 г. пры колькасці 260 работнікаў дзейнічала 21 грамадская арганізацыя, у якіх было задзейнічана 611 чалавек[245]. Лічбавыя паказчыкі і выдумванне ўсё новых арганізацый нярэдка станавіліся самамэтай. Удзел большасці работнікаў у кіраванні вытворчасцю быў фармальным, меў дарадчы характар. У большасці арганізацый адсутнічала самадзейнасць і самарэгуляцыя. Дэкларатыўнасць далучэння работнікаў да кіраванні вытворчасцю падрывала давер і кампраментавала саму ідэю.

Адным з важных непрадбачных фактараў, які быў нечаканым але меў істотнае значэнне для павышэння ўвагі партыйных і гаспадарчых органаў кіравання да кадравай палітыцы ў прамысловасці ў канцы 1950 – першай палове 1960 гг., стала барацьба работнікаў за свае правы, у тым ліку забастоўкі рабочых на прадпрыемствах БССР. Іх прычыны былі самыя разнастайнымі: сацыяльная несправядлівасць пры размеркаванні прэміяльных фондаў, змены нормаў нармавання на прадпрыемствах, цяжкія, у тым ліку санітарна-гігіенічныя, ўмовы працы і г.д. У пастановах партыйных, дзяржаўных, прафсаюзных і іных органаў кіравання па выніках

[245] Агеев А. Г. Общественно-политическая деятельность рабочего класса Беларуси в 1956 – 1965 гг. Автореферат. С. 14.

разгляду фактаў прыпынення рабочымі работы ўсяляк падкрэслівалася, што прычына забастовак – канкрэтныя памылкі непасрэдных кіраўнікоў прадпрыемстваў, слабая кадравая і грамадска-палітычная работа, а не сістэмныя і сацыяльна-эканамічныя фактары.

Такім чынам, другая палова 1950–1960 гг. характаразуюцца росквітам утварэння разнастайных грамадскіх аб’яднанняў на прадпрыемствах рэспублікі. Паколькі адпаведна марксісцкім уяўленням найбольш прагрэсіўнай сілай грамадства з’яўляўся рабочы клас, то яму і адводзілася рашаючая роля ў органах самакіравання на вытворчасці. Адной з самых масавых форм далучэння работнікаў да кіравання вытворчасцю ў 1950–1960 гг. лічыліся вытворчыя нарады. На заводах і фабрыках БССР дзейнічалі тысячы “творчых арганізацый” у якіх удзельнічалі дзясяткі тысяч рабочых і служачых. З цягам часу фармальная, а не рэальная актыўнасць работнікаў стала характэрнай для большасці грамадскіх арганізацый на прамысловых прадпрыемствах.

Для фактычнага, а не фармальнага далучэння работнікаў да кіравання вытворчасцю неабходна было як мінімум адладзіць механізм атбору і ўкаранення пастурпаўшых прапаноў, павысіць інфармаванасць і асабістую зацікаўленасць работнікаў у справах вытворчасці. А для гэтага патрэбны быў бы пераход ад камандных спосабаў кіравання эканомікай да больш дэмакратычных метадаў, ломка ўжо звычнай псіхалогіі кіравання, адпрацоўка механізмаў зваротнай сувязі на прадпрыемствах. Нарэшце для гэтага неабходна была і агульная дэмакратызацыя грамадства. У 1950–1960-я гг. такіх зменаў не адбылося.

Пастурпова парасткі дэмакратычных форм кіравання прамысловымі прадпрыемствамі і будоўлямі, якія існавалі, пастурпова былі згорнуты, або фармалізаваліся. Імітацыйнае самакіраванне працоўных стала нормай, а не выключэннем з правіл. Канфліктныя сітуацыі на прадпрыемствах не разрашаліся праз дыялог і ўзгадненне пазіцый, што спрыяла фактам забастовак на прадпрыемствах БССР[246].

[246] Агееў Аляксандр. Імітацыйнае самакіраванне на прамысловых прадпрыемствах БССР у другой палове 1950–1960-х гадах // Ад Магдэбургскага права да сучаснага самакіравання : зборнік матэрыялаў. Магілёў, 2017. С. 103–109.

## 3.4 Формы пратэсту савецкіх работнікаў і кадравая палітыка КПБ (1950–1960-я)

Адваротным бокам спробы партыйных органаў распрыгоніць ініцыятыву народа, стала больш рэзкая рэакцыя рабочых на сацыяльную несправядлівасць, парушэнні працоўнага заканадаўства. Пасля прыпынення масавых рэпрэсій рабочыя і служачыя прамысловасці ўсё часцей сталі рашацца на розныя формы пратэсту і адстойванне сваіх правоў. З сярэдзіны 1950-х гадоў павялічваецца паток скаргаў і заяў у вышэйстаячыя інстанцыі. Пасля адмены сталінскага рэпрэсіўнага заканадаўства, якое фактычна запрыгоніла работнікаў за сваімі заводамі і фабрыкамі, пачынаецца хуткі рост рухомасці кадраў, які нярэдка з'яўляўся выяўленнем пасіўнага пратэсту рабочых і служачых. Паступова работнікі прамысловасці пераходзілі да больш актыўных формаў пратэсту[247].

Толькі за перыяд 1956–1965 гг. у архівах Беларусі намі знойдзена больш за 60 прыкладаў адмовы рабочых ад працы на прамысловых, транспартных прадпрыемствах і будоўлях БССР, большасць з якіх трапляюць пад вызначэнне "забастоўка"[248]. Прычым ёсць усе падставы меркаваць, што ў сапраўднасці колькасць такіх выпадкаў была значна вышэйшай, бо прыпыненене працы падрывала аўтарытэт кіруючых кадраў прамысловасці, партыйных органаў, якія адказвалі за грамадска-палітычную і агітацыйна-масавую работу, і пры магчымасці факты стачак на прадпрыемствах ўсяляк прыхоўваліся, а пры немажлівасці схавання прымяншаліся іх памеры, яны апісваліся эзопавай мовай.

Большасць забастовак адбывалася на буйных і сярэдніх прамысловых прадпрыемствах БССР. Большая палова стачак здарылася ў буйнейшым прамысловым цэнтры рэспублікі г. Мінску. Амаль усе забастоўкі мелі лакальны характар, цягнуліся менш трох сутак. На металістаў і "машынабудаўнікоў прыйшлася адна траціна ўсіх стачак. Меліся факты і такіх форм пратэсту, як "забастоўкі наадварот", "работа па правілах", "запаволеная праца". Звяртае на

---

[247] Агееў А. Р. Пасляталінскія забастоўкі савецкіх рабочых у Магілеве і кадравая палітыка КПБ // Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць : зборнік навуковых прац удзельнікаў X Міжнар. навук. канф., 25-26 мая 2017 г., г. Магілёў / уклад. А. М. Бацюкоў, І. А. Пушкін. Магілёў, 2017. С. 172–177

[248] Агеев А. Г. Бастовали ли рабочие до перестройки? // Человек и экономика. 1991. № 5. С. 25–27.

сябе ўвагу перыядычнасць забастовак. Калі ў 1956–1960 гг. выяўлена 20 такіх фактаў, то ў 1961–1965 гг. – 42[249].

Першыя выўленыя намі на тэрыторыі Магілёўскай вобласці, як і ў іншых абласцях БССР, забастоўкі адбыліся ў 1957 г. У абласным цэнтры пачынальнікамі забастовачнага руху сталі будаўнікі. Першымі такімі забастоўкамі па савецку сталі падзеі шостага мая і трэцяга-чацвёртага снежня 1957 г. у структурах Будтрэста № 12 г. Магілёва[250]. Варта разгледзіць падзеі 1957 г. у Будтрэсце № 12 г. Магілёва па праву першых і ў якасці прыклада характэрнай рэакцыі партыйных органаў на падобныя “здарэнні”.

Шостага мая, у дзень закрыцця нарадаў за мінулы месяц, цэлы дзень не працавалі дзве брыгады муляроў, брыгада цесляроў, і два звяна тынкоўшчыкаў Будтрэста № 12. Рабочыя былі незадаволены нізкай аплатай іх працы. У ходзе разбіральніцтва высветлілася, што ў будтрэсце назіраюцца частыя прастоі, “няма ўмоваў для высокапрадуцыйнай працы”. Пытанне разглядалася на пасяджэння бюро Магілёўскага ГК КПБ ад 23. 05. 1957 г. Начальнік УНР-906 атрымаў вымову з занясеннем у асабістую справу[251].

Трэцяга снежня 1957 г. начальнік пагрузачна-разгрузачных работ Будтрэста №12 Жарыкаў закрыў нарад за лістапад і абвясціў грузчыкам, што іх заробак склаў 25 руб. 60 кап. у дзень. Пад час абеду 65 грузчыкаў сабраліся ў канторы чыгуначнай веткі, каб высветліць прычыну, па якой ім закрылі нарады на меншую суму, чым у кастрычніку. Не дачакаўшыся Жарыкава ў пачатку другой гадзіны рабочыя пайшлі ў кантору забеспячэння трэста. Там грузчыкаў выслухаў намеснік начальніка канторы і паабяцаў усё праверыць. Спецыяльная камісія правярала нарады і да 18-00, калі скончыўся рабочы дзень, і высветліла, што яны закрыты правільна. Рабочыя не дачакаўшыся праверкі, недзе 15–30, пайшлі да сябе ў інтэрнат і больш на работу ў гэты дзень не выходзілі. Увечары на разгрузку былі пададзены 34 вагоны жвіру. Грузчыкам было прапанавана выйсці на разгрузку, але яны заявілі, што на работу не

[249] Агеев А. Г. Общественно-политическая деятельность рабочего класса Беларуси в 1956 – 1965 гг. Автореферат. С. 16-17.

[250] Выписка из протокола № 13 заседания Бюро первичной партийной организации областного Стройтреста № 12 от 9 декабря 1957 г. // ДАГАМаг. Фонд 9. Воп. 131. Спр. 81. Арк. 93-95; Постановление бюро Могилевского горкома КПБ от 23. 05. 1957 г. “О состоянии организации труда в УНР-906” // ДАГАМаг. Фонд 42. Воп. 17. Спр. 6. Арк. 157.

[251] Постановление бюро Могилевского горкома КПБ от 23. 05. 1957 г. “О состоянии организации труда в УНР-906” // ДАГАМаг. Фонд 42. Воп. 17. Спр. 6. Арк. 157.

выйдуць, бо ім мала закрылі ў лістападзе. Раніцой чацвёртага лістапада грузчыкі сабраліся каля канторы і Жарыкаў паведаміў ім, што зарплата за лістапад будзе не 25 руб. 60 кап., а 31 руб. 37 кап у дзень, бо ім не была ўлічана праца ў святочныя дні і начныя змены. Фактычна ён павялічыў разлікі на выгрузку цэглы і камня, што разам з святочнымі і начнымі павялічыла зарплату грузчыкам. Канфлікт быў вычарпаны, і рабочыя прыступілі да працы. Але разборкі толькі пачыналіся. Яны ішлі і па партыйнай лініі і ўнутры прадпрыемства. Прычынамі выпадку былі названыя:

– сістэматычная нявыдача нарадаў рабочым перад пачаткам работ, а вывядзенне зарплаты ў канцы месяца;
– практыка сістэматычнай прыпіскі ў нарадах аб'ёма прац, што паспрабаваў выправіць новы нчальнік, які пры гэтым не правёў з рабочымі тлумачальнай працы, што "выклікала нярвознасць сярод рабочых";
– безадказныя адносіны кіраўніцтва трэста да навядзення парадку ў арганізацыі працы;
– адсутнасць патрэбнага кантролю пярвічнай партыйнай арганізацыі над дзейнасцю адміністрацыі прадпрыемства і слабая масава-палітычная работа сярод грузчыкаў [252].

Бюро пярвічнай партарганізацыі трэста разбірала надзвычайнае здарэнне на сваім пасяджэнні 9 снежня. Жарыкаў паспрабаваў не распальваючы страсці і зменшыўшы памеры забастоўкі распавесці аб адмове рабочых выйсці на працу. Інакш павялі сябе члены бюро. Начальнік канторы забеспячэння Мурашаў акцэнт зрабіў на "недастаковай масава-палітычнай рабоце" сярод грузчыкаў. Член бюро Шумейка лічыў, што віна тут Жарыкава, які няправільна абвясціў зарплату, няправільна закрыў нарады, што адмова рабочых ад выгрузкі вагонаў – "вялікае злачынства". Пашкевіч пагаджаўся са слабай працай партбюро, але нагадаў, што незадаволенасць пачалася адразу пасля прызначэння Жарыкава на пасаду ў сувязі масавымі прыпіскамі яго папярэдніка. Цімашэнка прапаноўваў пакараць Жарыкава і падкрэсліваў, што галоўная прычына ў арганізацыі працы: табеля выхаду на працу не падпісваліся, на дошке вытворчых паказчыкаў вынікі працы не адлюстроўваліся. Сакратар партбюро трэста таварыш Лазавік падкрэсліў, што камуністы "не зрабілі вывадаў з факта, які меў месца ў клубе

[252] Справка о случае отказа грузчиков выйти на работу в строительном тресте № 12 // ДАГАМаг. Фонд 9. Воп. 131. Спр. 81. Арк. 85–86.

завода 511…”, што зарплату налічваюць у канцы месяца, што выхаваўчая работа слабая… Але галоўным было тое, што факты невыходу рабочых на выгрузку вагонаў меліся і іх нельга было замаўчаць. У пастанове па пытанню адмовы рабочых ад выхаду на працу ў начны час з 3 на 4 снежня падкрэсліваліся арганізацыйна-вытвор-чыя прычыны надзвычайнага здарэння. У выніку Жарыкаву паставілі на від, а начальніка канторы забеспечэння Мурашава папярэдзілі. Загадалі ўвесці практыку правядзення сходаў і вытворчых нарадаў рабочых і служачых. За канторай замацавалі камуністаў для правядзення размоў, дакладаў на палі-тычныя і вытворчыя тэмы[253]. Пасля забастоўкі ў 1957–1958 гадах партыйна арганізацыя была на асаблівым кантролі і вымушаная была пастаянна дакладываць аб правядзенні масава-палітычнай работы[254].

Наступныя забастоўкі ў Магілёве выяўлены намі ў 1961 г. Рабочыя механічных майстэрань і электрамайстэрні серавугляроднай вытворчасці завода № 511 трэцяга студзеня не працавалі да абеду, а рабочыя рамонтна-механічнага участка № 3 чацвёртага студзеня ўвесь дзень. Прычынай прыпынення працы стала пазбаўленне прэміі за снежань без тлумачэнняў з боку адміністрацыі. Пытанне разглядалася на пасяджэння бюро Магілёўскага ГК КПБ ад 09. 02. 1961 г. Сакратару партарганізацыі і дырэктару завода было строга ўказана на недахопы ў працы [255].

У наступным годдзе бюро Магілёўскага гаркома КПБ ад 20 верасня разглядала адразу два факта адмовы ад працы магілёўскіх рабочых: 27 жніўня шэсць рабочых электраматорнага цэха завода “Электрарухавік” прыпынілі працу з-за невыдадзенага своечасова без тлумачэнняў авансу, а трэцяга верасня 23 рабочых цэха цесляроў завода Будаўнічых дэталяў – з-за змяншэння расцэнак. У пратаколе ўказваецца, што падобныя з’явы адмовы ад працы на іншых прадпрыемствах назіраліся і раней[256]. Нягледзячы на

---

[253] Выписка из протокола № 13 заседания Бюро первичной партийной организации областного Стройтреста № 12 от 9 декабря 1957 г. // ДАГАМаг. Фонд 9. Воп. 131. Спр. 81. Арк. 93–95.

[254] Докладная о проведении массово-политической работы среди рабочих, ИТР и служащих УНР-76 Стройтреста № 12 в 1957-1958 году // ДАГАМаг. Фонд 9. Воп. 131. Спр. 82. Арк. 77–80.

[255] Постановление бюро Могилевского горкома КПБ от 09. 02. 1961 г. “О случае отказа то работы рабочих…” // ДАГАМаг. Фонд 42. Воп. 24. Спр. 48. Арк. 90, 106.

[256] Постановление бюро Могилевского горкома КПБ от 20.09.1962 г. “О нарушении установленного порядка пересмотра норм…” // ДАГАМаг. Фонд 42. Воп. 24. Спр. 90. Арк. 273, 285.

прынятыя меры ў лістападдзе 1962 г. падставай для чарговай размовы на бюро стала адмова ад працы 14 работнікаў Стужкаткацкай фабрыкі[257].

У 1966 г. работнікі такарна-рэвальвернага ўчастка механа-зборнага цэха № 1 завода Пад’ёмна-транспартнага абсталявання імя Кірава 27 студзеня не прыступілі да працы з-за нязгоды з новымі нормамі выпрацоўкі. Пасля прыходу адміністрацыі і абяцання дырэктара завода разабрацца, частка рабочых пачала працаваць, але 23 чалавека баставалі ўвесь дзень. На бюро абкама КПБ было строга ўказана дырэктару на недахопы ў рабоце[258]. А 25 красавіка 10 работнікаў друкарні імя Свердлава адмовіліся працаваць з-за санітарных умоваў працы. Группа з 9 наборшчыкаў адмовілася працаваць у другую змену і пайшла дамой з-за рамонту будынка і забруджванні яе асобных участкаў. У першую змену у будынку праводзіліся малярныя працы і не было прыбрана. Пайшла дамой член партыі Ханіна – работніца гэтай змены. Сыйшоў з працы і член партбюро, адначасова старшыня прафсаюзнага мясцкома Ф. Карасёў. Ён, а таксама выконваючы абавязкі дырэктара атрымалі вымовы з занясеннем. Па Карасёву было рэкамендавана “рашыць пытанне аб знаходжанні Карасёва членам прэзідыўма абкама прафсаюзаў і старшынёй мясцовага камітэта”[259].

В 1969 г. 67 работнікаў смены № 5 прядзільнага цэха № 2 завода штучнага валакна імя Куйбышава не працавалі больш за дзве гадзіны з-за нязгоды з эксперыментам па ўкараненню брыгадна-паточнага метаду абслугоўвання машын. Толькі пасля адмены эксперымента, якое паабяцаў асабіста дырэктар, рабочыя прыступілі да працы[260].

Па нашых падліках рабочыя Магілёва за 1956–1970 гг. як мінімум 10 разоў адмаўляліся ад працы. Для прыкладу: рабочыя

---

[257] Постановление бюро Могилевского горкома КПБ от 17.05.1969 г. “О факте отказа от работы рабочих смены № 5 прядильного цеха № 2 завода искусственного волокна им. Куйбышева” // ДАГАМаг. Фонд 42. Воп. 31. Спр. 191. Арк. 52–54.

[258] Протокол №1 бюро Могилевского обкома КПБ от 12 февраля 1966 г. “О факте отказа от работы группы рабочих механосборочного цеха № 1 завода Подъемно-транспортного оборудования им Кирова” // ДАГАМаг. Фонд 9. Воп. 137. Спр. 27. Арк. 7–9.

[259] Постановление бюро Ленинского райкома КПБ г. Магілёва ад 29. 04. 1966 г. “О самовольном уходе с работы группы рабочих типографии им. Свердлова” // ДАГАМаг. Фонд 6009. Воп. 4. Спр. 24. Арк. 107–108.

[260] Постановление бюро Могилевского горкома КПБ от 17.05.1969 г. “О факте отказа от работы рабочих смены № 5 прядильного цеха № 2 завода искусственного волокна им. Куйбышева” // ДАГАМаг. Фонд 42. Воп. 31. Спр. 191. Арк. 52–54.

Бабруйска – 8, Крычава – 3, што адпавядае прамысловаму патэнцыялу гэтых гарадоў. Па гадах магілёўскія забастоўкі размяркоўваюцца наступным чынам: 1957 г. – 2, 1961 г. – 2, 1962 г. – 3, 1966 г. – 2, 1969 г. – 1. А на абшарах Магілёўскай вобласці па гадах факты адмовы ад працы рабочых размеркаваліся яшчэ больш выразна: 1957 – 2, 1961 – 3, 1962 – 6, 1966 – 2, 1967 – 2, 1968 – 2, 1969 – 2, 1970 – 1. Звяртае ўвагу на сябе вельмі вялікая колькасць адмоў ад працы ў 1962 г.[261].

Гэтая асаблівасць – значны ўсплеск стачачнай барацьбы ў 1962–1963 гг. характэрны і ўвогуле для БССР. Колькасць выяўленых фактаў адмовы ад працы ў гэтыя гады перавышаў сярэднегадавы за ўвесь перыяд у 2 разы. У гэтай сувязі трагічныя падзеі 1962 г. – растрэл рабочых у Новачаркаску ўжо не выглядаюць выпадковымі. Менавіта ў гэты час на невысокі ўзровень матэрыяльнага становішча работнікаў накладаліся інфляцыйныя наступствы грашовай рэформы 1961 г., павышэнне коштаў на мяса-малочную прадукцыю 1962 г. А праведзенае ў 1958–1960 гг. упарадкаванне зарплаты рэзка зменшыла магчымасці экстэнсіўнага росту вытворчасці працы за кошт арганізацыйных мерапрыемстваў.

Рабочы рух БССР у гэты час не выйшаў за межы эканамічных рамак, адкрыта палітычных патрабаванняў на прадпрыемствах Беларусі намі не выяўлена. Аднак, "антысавецкія выказванні" і "факты "паклёпу на нашу савецкую рэчаіснасць" мелі месца ў 1963 г. на Магілёўскіх заводах імя Кірава і імя Куйбышава. Але адзначаныя выключэнні толькі пацвярджаюць агульную тэндэнцыю эканамічнай накіраванасці патрабаванняў рабочых [262].

Барацьба работнікаў за свае правы, у тым ліку забастоўкі рабочых на прадпрыемствах БССР, не ўяўлялі непасрэднай пагрозы існаваўшаму рэжыму. Тым не менш, яна сталі адным з важных непрадбачных фактараў, які быў нечаканым для савецкага кіраўніцтва, і меў істотнае значэнне для павышэння ўвагі партыйных і гаспадарчых органаў кіравання да кадравай палітыцы ў прамысловасці ў сярэдзіне 1950 – першай палове 1960-х гг. Прычыны стачак былі самыя разнастайнымі: сацыяльная несправядлівасць пры размеркаванні прэміяльных фондаў, змены нормаў нармавання

[261] Агееў А. Р. Забастоўкі на прадпрыемствах Магілёўскай вобласці ў 50-60-х гг. XX ст. // Гістарычныя лёсы верхняга Падняпроўя. Ч II. Магілёў, 1995. С. 113.
[262] Агееў А. Р. Забастоўкі на прадпрыемствах Магілёўскай вобласці ў 50-60-х гг. XX ст. // Гістарычныя лёсы верхняга Падняпроўя. Ч II. Магілёў, 1995. С. 114.

на прадпрыемствах, цяжкія, у тым ліку санітарна-гігіенічныя, ўмовы працы і г.д. У пастановах партыйных, дзяржаўных, праф-саюзных і іншых органаў кіравання па выніках разгляду фактаў прыпынення рабочымі работы ўсяляк падкрэслівалася, што прычына забастовак – канкрэтныя памылкі непасрэдных кіраўнікоў прадпрыемстваў, слабая кадравая і грамадска-палітычная работа, а не сістэмныя і сацыяльна-эканамічныя фактары. Кіраўнікі прадп-рыемстваў, як правіла, мелі адносна лёгкія пакаранні па партыйнай лініі, але іх праца ставілася пад пільны кантроль партыйных органаў на гарадскім і абласным узроўнях.

### 3.5 Аўтарытарызм і самакіраванне ў пошуках шляхоў павышэння якасці і эфектыўнасці кадравага патэнцыялу прамысловасці ў БССР (1970–1980-я)

Развіццё незалежнай Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе патрабуе глыбокага асэнсавання, пошуку і вызначэння найбольш эфектыўных форм і метадаў яе функцыянавання. Сёння на першы план выступаюць праблемы, якія закранаюць неабходнасць удаска-налення сістэмы кіравання і самакіравання, кадравага патэнцыялу краіны, дзейнасці ўсіх звёнаў дзяржаўнага апарату, што дазволіць паспяхова пераадоліць крызісныя з’явы ў грамадстве і эканоміцы. Іх паспяховае вырашэнне тармозяць аб’ектыўныя і суб’ектыўныя прычыны, адну з якіх, кадравую, мы паспрабуем прааналізаваць з пункту гледжання гістарычнага вопыту.

У БССР у апошняе дзесяцігоддзе яе існавання выкарыс-тоўваліся наступныя шляхі і метады, накіраваныя на павышэнне якасці і эфектыўнасці кадравага патэнцыялу: абмеркаванне на сесіях саветаў і пасяджэннях іх выканкамаў, сходах працоўных калектываў справаздач савецкіх і гаспадарчых кіраўнікоў аб выка-нанні імі службовых і грамадскіх абавязкаў; фарміраванне рэзерва кадраў; арганізацыя і правядзенне атэстацыі кіраўнікоў і спецыя-лістаў у міністэрствах, ведамствах БССР і іх падраздзяленняў; стажыроўкі ў першы год кіраўнікоў і галоўных спецыялістаў прадпрыемстваў прамысловасці; перападрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі.

Да форм самакіравання і ўплыву грамадскасці на працэс фарміравання кіраўніцтва можна аднесці абмеркаванне на сесіях саветаў, пасяджэннях іх выканкамаў і на сходах працоўных

калектываў справаздач савецкіх і гаспадарчых кіраўнікоў аб выкананні імі службовых і грамадскіх абавязкаў, а таксама арганізацыю і правядзенне атэстацыі кіраўнікоў і спецыялістаў у міністэрствах, ведамствах БССР і іх падраздзяленняў. Толькі за 1985 г. на сесіях выканкамаў мясцовых саветаў БССР было заслухана 3526 справаздач дэпутатаў аб выкананні імі дэпутацкіх абавязкаў, праведзена 31157 сходаў са справаздачамі 1863 выканкамаў і 8754 схода са справаздачамі 2238 аддзелаў і ўпраўленняў, на якіх папрысутнічалі 4600 тыс. чалавек[263]. З аднаго боку вялікая колькасць асоб даведалася аб дзейнасці кіруючых структур і гэта добра. З іншага, гэтыя лічбы маюць колькасныя, а не якасныя паказчыкі, бо сходы насілі фармальны характар, адбывалася простае інфармаванне прыйшоўшых на сход аб поспехах і дасягненнях. Ніякага рэальнага ўплыву на становішча спраў яны не мелі.

У адпаведнасці з пастановаю СМ СССР ад 26.07.1973 г. і СМ БССР ад 10.10.1980 г. праводзілася атэстацыя кіруючых работнікаў і спецыялістаў. У міністэрствах, ведамствах і на прадпрыемствах ствараліся і дзейнічалі атэстацыйныя камісіі. Напрыклад, у 1983 г. адбылася атэстацыя кіруючых работнікаў і спецыялістаў Міністэрства жылёва камунальнай гаспадаркі БССР. Падлягала атэстацыі 97,3 % работнікаў сістэмы, з іх 96,3 % былі прызнаны цалкам адпавядаючымі займаемай пасадзе, 3,1 % пры ўмове паляпшэння працы, 0,6 % не здолелі прайсці атэстацыю, 1,3 % па выніках атэстацыі былі пераведзены на больш адказныя працы або ім павысілі аклады, 0,4 % былі вызвалены ад займаемай пасады ці пераведзены на іншую працу з паніжэннем[264].

У БССР з 01.01.1983 па 31.12.1985 г. было атэставана 248,6 тыс кіруючых работнікаў і спецыялістаў або 84,3% ад агульнай колькасці работнікаў, якія павінны былі прайсці атэстацыю (не праходзілі работнікі, якія адпрацавалі на сваёй пасадзе менш года, маладыя спецыялісты, цяжарныя жанчыны і жанчыны, якія мелі дзяцей ва ўзросце да 1 года). 96,3 % або 239,5 тыс. асоб прызналі адпавядаючымі займаемай пасадзе. 3,1 % (7,7 тыс.) адпавядаючымі пры ўмове паляпшэння працы, 0,6 % (1,4 тыс. чал.) палічылі не адпавядаючымі займаемай пасадзе, з іх 323 або 0,5 % кіраўнікоў і

[263] Ліст Упраўлення Справамі СМ БССР № 04/31 ад 14.03.1986 г. у ЦК КПБ // НАРБ. Фонд 7. Воп. 10. Спр. 256. Арк. 47.

[264] Запіска Упраўлення Справамі СМ БССР № 13/147 ад 24.04.1985 г. “О совершенствовании работы с кадрами”. Студзень 1986 г. // НАРБ. Фонд 7. Воп. 10. Спр. 256. Арк. 14, 15.

1050 (0,6 %) спецыялістаў. Па выніках атэстацыі 11,8 тыс. чалавек атрымалі больш адказныя пасады або былі заахвочаны, у тым ліку 2,8 тыс. кіраўнікоў і 9 тыс. спецыялістаў. Былі вызвалены ад займаемай пасады ці пераведзены на іншую працу – 1,4 тыс., з іх 0,3 тыс. кіраўнікоў і 1,1 тыс. спецыялістаў [265].

Фарміраваннем рэзерва кадраў займаліся выканаўчыя і кіруючыя органы ўлады. Аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам БССР была зацверджана наменклатура кадраў у якую ўваходзілі: старшыні, намеснікі старшынь, сакратары выканаўчых камітэтаў гарадскіх і раённых саветаў, старшыні і сакратары выканкамаў пасялковых і сельскіх саветаў, кіраўнікі аддзелаў і ўпраўленняў аблвыканкамаў і іх намеснікі. У арганізацыйна-інструктарскіх аддзелах аблвыканкамаў ствараліся спісы рэзерва кадраў па вылучэнні на адпаведныя пасады. З трапіўшымі ў спіс штогод праводзіліся, згодна зацверджаных планаў, заняткі ў школах савецкага будаўніцтва[266], але праходзілі яны фармальна і не цікава, пераўтвараючыся ў справаздачы і інфармаванне аб поспехах сацыялістычнага будаўніцтва.

Прамысловы рэзерв кадраў на кіруючыя пасады (старшыні, намеснікі, начальнікі упраўленняў і аддзелаў, дырэктары і галоўныя інжынеры і г.д.) фарміраваўся ў Міністэрствах і на прадпрыемствах і абавязкова ўзгадняўся с партарганізацыяй і прафкамамі[267]. Напрыклад, у 1985 г. у структурах Мінлегпрама і Мінмясцпрама БССР была праведзена праверка партыйных арганізацый па ўдасканаленню працы з кадрамі. Было выяўлена, што 96,8 % інжынерна-тэхнічных пасад займалі спецыялісты (1980 г. – 94,3 %), 8564 спецыялісты мелі вышэйшую адукацыю (1980 г. – 6549 чал.). Была створана і дзейнічала са студзеня 1984 г. школа дырэктароў. Заняткі ў школе праводзіліся адзін раз у 2–3 месяцы на перадавых прадпрыемствах галіны. У 1984 г. у Мінлегпраме і Мінмясцпраме БССР былі вылучаны на больш высокія пасады 854 чал., у 1985 г. –

---

[265] Ліст Цэнтральнага статыстычнага ўпраўлення БССР у СМ БССР № 01-11/44 ад 15.05.1986 г. “О результатах аттестации работников, занятых в отраслях народного хозяйства БССР” // НАРБ. Фонд 7. Воп. 10. Спр. 294. Арк. 13, 15, 16.

[266] Даведка арганізацыяна-інструктарскага аддзела Упраўлення Справамі СМ БССР, 1985 г. // НАРБ. Фонд 7. Воп. 10. Спр. 256. Арк. 42.

[267] Запіска Упраўлення Справамі СМ БССР № 13/147 ад 24.04.1985 г. “О совершенствовании работы с кадрами”. Студзень 1986 г. // НАРБ. Фонд 7. Воп. 10. Спр. 256. Арк. 12.

743 чал., пры гэтым з рэзэрва кадраў больш 50%[268]. У Мінлеспраме БССР за 1984–1985 гг. былі вылучаны з рэзерва кадраў на больш высокія пасады: міністр, першы намеснік міністра, два намеснікі міністра, начальнік тэхнічнага ўпраўлення, намеснік начальніка вытворча-тэхнічнага ўпраўлення дрэваапрацоўваючай і меблявай прамысловасці, генеральны дырэктар аб'яднання "Рэчыцадрэў", генеральны дырэктар аб'яднання "Бабруйскдрэў", галоўны інжынер аб'яднання "Івацэвічыдрэў", намеснік генеральнага дырэктара аб'яднання "Мінскдрэў". Прызначаны на пасаду намеснік начальніка вытворча-тэхнічнага ўпраўлення дрэваапрацоўваючай і меблявай прамысловасці адначасова быў выбраны намеснікам сакратара партыйнай арганізацыі міністэрства, а намеснік генеральнага дырэктара аб'яднання "Мінскдрэў" – сакратаром партыйнай арганізацыі аб'яднання. Як бачым, завяршаўся працэс зрошчвання партыйнага і гаспадарчага апарату[269].

З мэтай набыцця вопыту арганізацыі і кіраўніцтва вытворчасцю Міністэрствы і ведамствы БССР для стажыроўкі кіраўнікоў і галоўных спецыялістаў са стажам працы да аднаго году вызначалі лепшыя прадпрыемствы і арганізацыі прамысловасці, будаўніцтва, транспарта, гандлю, бытавога абслугоўвання насельніцтва, калгасаў, саўгасаў і іх вытворчых падраздзяленняў. Да такіх прадпрыемстваў Міндарбуда БССР, напрыклад, адносіліся: дарожна-будаўнічы трэст № 1 г. Віцебска, дарожна-будаўнічы трэст № 6 г. Гродна і Гродзенскі аблдарбуд; Мінаўтатранса БССР: аўтапарк № 1 Мінскага гарадскога ўпраўлення аўтамабільнага транспарта, аўтакамбінаты № 3 і 6 Мінскага гарадскога ўпраўлення грузавога аўтатранспарта[270]. Варта адзначыць, што стажыроўка таксама часта пераўтваралася ў фармальнасць – спецыялісты (асабліва кіраўнікі) з'яўляліся толькі ў пачатку стажыроўкі, каб скласці і зацвердзіць план яе праходжання і напрыканцы, каб забраць станоўчы водгук і пасведчанне.

---

[268] Даведка № 05/199 ад 23.12.1985 г. "О работе Минлегпрома БССР и Минместпрома БССР по реализации решений XII Пленума ЦК КПБ «О задачах партийных организаций республики по дальнейшему совершенствованию работы с кадрами в свете требований ЦК КПСС»" // НАРБ. Фонд 7. Воп. 10. Спр. 256. Арк. 27, 28.

[269] Даведка № 02/247 ад 13.12.1985 г. "О работе с резервом кадров в Минлеспроме ББСР"// НАРБ. Фонд 7. Воп. 10. Спр. 256. Арк. 32.

[270] Ліст Упраўлення Справамі СМ БССР № 04/31 ад 14.03.1986 г. у ЦК КПБ // НАРБ. Фонд 7. Воп. 10. Спр. 256. Арк. 48.

У БССР сетка павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў народнай гаспадаркі ўключала ў 1985 г. 136 вучэбных цэнтраў, створаных пры 34 міністэрствах і ведамствах БССР, у тым ліку 12 інстытутаў, 13 факультэтаў, 19 вучэбна-курсавых камбінатаў, 59 курсаў і 33 іншых вучэбных цэнтра, у якіх штогод праходзілі абучэнне каля 70 тыс. чалавек. Акрамя таго ў БССР былі вучэбныя цэнтры павышэння кваліфікацыі саюзнага падпарадкавання. Галаўной навучальнай установай павышэння кваліфікацыі работнікаў сістэмы рэспубліканскіх міністэрстваў і ведамстваў з 1988 г. стаў Рэспубліканскі міжгаліновы інстытут павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў галін народнай гаспадаркі, які быў створаны яшчэ ў 1968 г. Перад ім была пастаўлена задача: мэтавая падрыхтоўка кадраў розных галін гаспадаркі (транспарт, будаўніцтва, жылкамгас, бытавое абслугоўванне, гандль, энэргетыка і інш.). Да 1990 г. інстытут стаў буйным навучальным цэнтрам, у якім штогод вучыліся звыш 10 тыс. прадстаўнікоў розных міністэрстваў і ведамстваў на 4 факультэтах, 13 кафедрах, больш чым па 100 спецыяльнасцям. Усяго за час дзейнасці у РМ ІПК павысілі кваліфікацыю больш за 101,2 тыс. кіраўнікоў і спецыялістаў.

Перадрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў народнай гаспадаркі гэта адзін са шляхоў паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэса. У адпаведнасці з Пастановаю СМ БССР № 335 ад 12.11.1985 г. Міністэрствам вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР і падведамаснымі ВНУ ў 1987 г. была праведзена праца па рэалізацыі Комплекснай праграмы па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы кадраў у вобласці стварэння і эксплуатацыі робататэхнічных комплексаў (РТ), гнуткіх вытворчых сістэм (ГВС) і сістэм аўтаматызаванага праектавання (САПР). У 8 ВНУ (БПІ, БДУ, МРТІ, ММІ, ВТІЛП, БТІ, НПІ і МТІ) падрыхтавалі спецыялістаў, атрымаўшых падрыхтоўку ў галіне РТ, ГВС, САПР у колькасці 1274 (план – 1257 чал.) асоб, па спецыяльнасцям: машынабудаванне і прыборабудаванне – 628 чал. (план – 675), электронная тэхніка, электрапрыборабудаванне і аўтаматыка – 439 (426), радыётэхніка і сувязь – 90 (90), эканоміка – 47 (50) спецыялістаў. Акрамя таго: у Мінскім палітэхнічным тэхнікуме ў 1987 г. адбыўся першы выпуск тэхнікаў па спецыяльнасці 0663 “Эксплуатацыя прамысловых робатаў” у колькасці 27

чал. (план – 26), у 1988 г. – 820, у 1989 г. – 846, у 1990 г. – 1108 спецыялістаў[271].

У 1987 г. Дзяржаўны камітэт СССР па навуцы і тэхнікі сумесна з шэрагам міністэрств і ведамстваў СССР распрацаваў прапановы па ўдасканаленню сістэмы падрыхтоўкі кадраў вышэйшага звяна кіравання народнай гаспадаркі. Да кіруючых кадраў вышэйшага звяна кіравання адносіліся: кіраўнікі міністэрстваў і ведамстваў і іх намеснікі, начальнікі самастойных упраўленняў і аддзелаў цэнтральнага апарата міністэрстваў і ведамстваў і іх намеснікі, генеральныя дырэктары прамысловых аб’яднанняў і іх намеснікі[272]. У БССР да іх таксама адносіліся: генеральныя дырэктары навукова-вытворчых аб’яднанняў, кіраўнікі самастойных прадпрыемстваў, трэстаў, камбінатаў і іх намеснікі.

СМ БССР паведамляў, што ў рэспубліцы асноўнай формай падрыхтоўкі (павышэння кваліфікацыі) кадраў вышэйшага звяна кіравання, з’яўляецца іх абучэнне ў Інстытуце павышэння кваліфікацыі кіраўнікоў вышэйшага звяна дзяржаўнага кіравання Акадэміі народнай гаспадаркі пры СМ СССР, Рэспубліканскім міжгаліновым інстытуце павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў галін народнай гаспадаркі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР і факультэце павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў пры Беларускім дзяржаўным інстытуце народнай гаспадаркі імя В. Куйбышава Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР. За 1986 г. прайшлі падрыхтоўку 313 (35,45 %) асоб вышэйшага звяна кіравання[273]. Кіраўнікі і спецыялісты профільных міністэрстваў праходзілі павышэнне кваліфікацыі ў Беларускім інстытуце народнай гаспадаркі і інжынерных курсах Дзяржбуда СССР, Маскоўскім архітэктурным інстытуце, Маскоўскім інстытуце ўпраўлення, Ленінградскім фінансава-эканамічным інстытуце, Высшых дзяржаўных курсах павышэння кваліфікацыі абучэння па пытаннях патэнтазнаўства і вынаходства і інш.[274]

---

271 Ліст Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР у СМ БССР № 21-05-708 ад 30.12.1987 г. // НАРБ. Фонд 7. Воп. 10. Спр. 1039. Арк. 132, 133.

272 Ліст намесніка старшыні Дзяржаўнага камітэта СССР па навуцы і тэхнікі № 7-25/297 ад 01.07.1987 г. // НАРБ. Фонд 7. Воп. 10. Спр. 1039. Арк. 20.

273 Ліст СМ БССР № 13/135-87 ад 08.05.1987 г. “О сведениях по подготовке кадров высшего звена управления” // НАРБ. Фонд 7. Воп. 10. Спр. 1039. Арк. 22.

274 Запіска Упраўлення Справамі СМ БССР № 13/147 ад 24.04.1985 г. “О совершенствовании работы с кадрами”. Студзень 1986 г. // НАРБ. Фонд 7. Воп. 10. Спр. 256. Арк. 12, 13.

Пасля заканчэння і завяршэння павышэння кваліфікацыі кіруючыя работнікі і спецыялісты выконвалі выпускныя работы, рэфераты, здавалі экзамены і залікі. Выпускныя работы павінны былі мець прыкладны характар і іх неабходна было ўкараняць па месцу асноўнай працы[275]. Так, на працягу 1978 г. у Інстытуце кіравання народнай гаспадаркай Акадэміі народнай гаспадаркі СССР (Масква) прайшлі абучэнне наступныя кіруючыя работнікі БССР: намеснік начальніка ўпраўлення гідраметслужбы, намеснік міністра сельскай гаспадаркі, намеснік старшыні Беларускага аб’яднання “Белсельгастэхніка”, намеснік міністра лёгкай прамысловасці, намеснік старшыні праўлення спажыўсаюза, намеснік міністра харчовай прамысловасці, намеснік міністра прамысловасці будаўнічых матэрыялаў, намеснік міністра прамысловага будаўніцтва, намеснік старшыні Дзяржбуда, а ў 1980 г. інстытут збіраў звесткі аб практычнай рэалізацыі іх прапаноў у вытворчасці.

Шэраг міністэрстваў, ведамстваў, арганізацый і прадпрыемстваў СССР (БССР) з 1.01.1987 г. пераходзілі на новыя ўмовы гаспадарання. У адпаведнасці з пастановаю ЦК КПСС і СМ СССР ад 12.07.1985 г. “О широком распространении новых методов хозяйствования и усиления их воздействия на ускорение научно-технического прогресса” Дзяржплан СССР арганізаваў вучобу кіруючых кадраў міністэрстваў (ведамстваў), аб’яднанняў і прадпрыемстваў, якія пераходзілі на новыя ўмовы гаспадарання, восенню 1986 г. на базе Акадэміі народнай гаспадаркі пры СМ СССР для намеснікаў старшынь СМ саюзных рэспублік, міністраў і кіраўнікоў ведамстваў; на базе Вышэйшых эканамічных курсаў пры Дзяржплане СССР для начальнікаў планава-эканамічных упраўленняў міністэрстваў; на базе рэспубліканскіх галіновых і міжгаліновых інстытутаў павышэння кваліфікацыі для кіраўнікоў кадраў прадпрыемстваў жыллёвай і камунальнай гаспадаркі, рачнога флоту[276].

Праводзілася абучэнне ў 1986–1989 гг. па наступных кірунках: удасканаленне гаспадарчага механізма ва ўмовах пераходу да рынкавай эканомікі, арганізацыя гаспадарчага разліку на прынцыпах

---

[275] Ліст Акадэміі народнай гаспадаркі СССР № 82/10-15 ад 11.03.1980 г. на імя Старшыні СМ БССР // НАРБ. Фонд 7. Воп. 5. Спр. 7229. Арк. 75.

[276] Ліст Дзяржаўнага планавага камітэта СССР у СМ БССР № АП-351/65-386 ад 30.07.1986 г. “Об организации учёбы руководящих кадров министерств (ведомств), объединений и предприятий, переводимых с 1987 г. на новые условия хозяйствования” // НАРБ. Фонд 7. Воп. 10. Спр. 575. Арк. 116–117.

арэнды і падрада, прымяненне вылічальнай тэхнікі і новай інфармацыйнай тэхналогіі ў гаспадарчай дзейнасці. У 1990–1991 гг. арганізавалі навучанне па новых накірунках: дзяржаўна-прававая падрыхтоўка народных дэпутатаў усіх узроўняў і кіруючых кадраў для працы ў новых умовах; радыяцыйная і прамысловая экалогія; знешнеэканамічная дзейнасць міністэрстваў і ведамстваў; праблемы менеджмента і маркетынга; стварэнне сумесных прадпрыемстваў[277].

Дзяржаўная сістэма павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў, пачынаючы з 1988 г. адчувала вялікія цяжкасці з камплектаваннем. У 1988–1990 гг. адзначалася тэндэнцыя памяншэння колькасці абучаючыхся ў сістэме павышэння кваліфікацыі ў параўнанні з 1986 г. – у 1989 г. на 14 %, 1990 г. на 30–40 %. У 1987 г. прайшлі абучэнне 182,6 тыс. чал., у 1989 г. – 140,4 тыс.[278]

У апошні год існавання БССР перападрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў народнай гаспадаркі праводзілася па галіноваму прынцыпу ў 110 навучальных установах, у тым ліку ў 16 інстытутах павышэння кваліфікацыі, 15 факультэтах і спецфакультэтах пры ВНУ, 79 курсах пры міністэрствах (ведамствах), прадпрыемствах і арганізацыях.

Побач з гэтым, варта падкрэсліць, што ў 1980-я гг. шэраг міністэрстваў і ведамстваў стабільна не забяспечвалі поўнае і якаснае выкананне пастановы СМ БССР ад 15.06.1981 г. “О мерах по дальнейшему совершенствованию системы повышения квалификации руководящих работников и специалистов народного хозяйства в свете требований XXVI съезда КПСС”. У прыватнасці не былі прыняты меры па паляпшэнню планавання павышэння кваліфікацыі і арганізацыі вучэбнага працэса (Міністэрства мясцовай прамысловасці БССР, Мінхарчпрам БССР, Міністэрства нарыхтовак БССР, Мінжылкамгас БССР); не забяспечвалася перыядычнасць павышэння кваліфікацыі (Міністэрства дарожнага будаўніцтва БССР, Мінхарчпрам БССР, Міністэрства нарыхтовак БССР, Мінжылкамгас БССР); не выконваліся планавыя заданні па павышэнню кваліфікацыі (Мінхарчпрам БССР, Міністэрства нарыхтовак БССР) і іншае. Сур’ёзныя недахопы ў арганізацыі павышэння

---

[277] Ліст Рэспубліканскага міжгаліновага інстытута павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў галін народнай гаспадаркі № 01-1715 ад 18.09.1990 г. на імя старшыні СМ БССР// НАРБ. Фонд 7. Воп. 10. Спр. 2274. Арк. 36–37.

[278] Ліст Міністэрства народнай адукацыі БССР № 13-6/5 ад 23.01.1991 г. на імя сташыні СМ БССР // НАРБ. Фонд 7. Воп. 10. Спр. 2274. Арк. 75.

кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў былі ў Міністэрстве лясной і дрэваапрацоўваючай прамысловасці БССР[279]. Найбольш арганізавана павышэнне кваліфікацыі кадраў вялося ў Міністэрстве адукацыі, Міністэрстве аховы здароўя, Міністэрстве культуры, Міністэрстве сацыяльнага забеспячэння. Аднак і там былі недахопы, уласцівыя іншым міністэрствам. Так, павышэнне кваліфікацыі вельмі часта падмянялася нарадамі, семінарамі, тэхнічнай вучобай. Не забяспечвалася ўстаноўленная (адзін раз у пяць гадоў) перыядычнасць абучэння кадраў, якая насамрэч складала 10 год, а сярод кіраўнікоў прадпрыемстваў (арганізацый), работнікаў органаў кіравання больш 15–20 год[280].

У выніку, неабходна адзначыць, што фарміраванне кадравага патэнцыялу БССР цалкам залежыла ад палітыкі кіруючых органаў СССР. Склад кіруючых работнікаў і спецыялістаў фарміраваўся адміністратыўным шляхам (адміністрацыяй і кіруючымі органамі КПБ) пры мінімальным (фармальным) удзеле грамадскасці ў выглядзе прафсаюзаў. З 1981 г. зноўку пры прызначэнні на адказныя пасады рабіцца асаблівы акцэнт на сацыяльным паходжанні кіруючых работнікаў. Гэта было выклікана тым, што сфарміравалася партыйна-савецкая і партыйна-гаспадарчая наменклатура, якая стала складаць асобную частку савецкага грамадства, адарваную ад астатняга народа. Каб падкрэсліць сваю сувязь з рабочымі і сялянамі (што хаця б вонкава адпавядала сутнасці камуністычнай ідэалогіі) сталі падкрэсліваць такія звесткі ў афіцыйных справаздачах. Гэта ўласціва тагачаснаму “застою” (асабліва ў развіцці самакіравання) і “сацыяльнай іржы”, якія сталі раз’ядаць грамадства, падзяляючы яго на дзве часткі: наменклатуру (лепш забяспечвалася ўсім неабходным) і астатніх (жылі ў адпаведнасці з магчымасцямі ва ўмовах недахопу якасных тавараў і паслуг), што негатыўна паўплывала на развіццё прамысловасці, сацыяльнай і грамадска-палітычнай сферы. Выразна прасочваецца

---

[279] Дакладная запіска загадчыка аддзела навукі і тэхнікі Упраўлення справамі СМ БССР № 13/147 ад 24.04.1985 г. “О дальнейшем совершенствовании системы повышения квалификации руководящих работников и специалистов народного хозяйства республики” // НАРБ. Фонд 7. Воп. 10. Спр. 575. Арк. 2–3.

[280] Ліст Міністэрства народнай адукацыі БССР № 13/21 ад 28.02.1990 г. у СМ БССР “О ходе выполнения постановления ЦК КПБ и СМ БССР от 11.05.1988 г. № 131 “О перестройке системы повышения квалификации и переподготовки руководящих работников и специалистов народного хозяйства республики” // НАРБ. Фонд 7. Воп. 10. Спр. 2274. Арк. 3, 4.

нізкая змяняльнасць кіруючых кадраў, што істотна перашкаджала абнаўленню кадравага патэнцыялу і развіццю эканомікі БССР.

Спробы аўтарытарным спосабам у 1970–1980-я гг. выправіць становішча ў эканоміцы шляхам змяняльнасці кадраў, укаранення розных метадаў павышэння якасці і эфектыўнасці кадравага патэнцыялу ва ўмовах існавання савецкай эканамічнай сістэмы і адсутнасці рэальнага самакіравання, не прынеслі чакаемага выніку.

# 4. ФАРМІРАВАННЕ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ (1991–2017)

## 4.1 Пачатак фарміравання мясцовага самакіравання і грамадзянскай супольнасці ў наш час

На гэту тэму ў апошнія дзесяцігоддзі з’явілася вялікая колькасць публікацый[281]. Прыпынімся толькі на некаторых гістарычных фактарах, якія аказалі істотны ўплыў на працэс фарміравання грамадзянскай супольнасці ў нашай краіне.

25.08.1991 г. пасля няўдалага путчу ў Маскве нечарговая сесія Вярхоўнага Савета БССР прыняла закон “Аб наданні статусу канстытуцыйнага закона Дэкларацыі Вярхоўнага Савета БССР аб дзяржаўным суверэнітэце БССР” і пастанову “Аб забеспячэнні палітычнай і эканамічнай самастойнасці БССР”. Такім чынам, фактычна была абвешчана незалежнасць Беларусі. 19.09.1991 г. БССР была перайменавана ў Рэспубліку Беларусь (у скарочаным варыянце – Беларусь), былі вызначаны нацыянальныя сімвалы –

---

[281] Котляров И.В. Политические партии Беларуси: теория, история, современность. Минск, 2006; Бобков В., Кузнецов Н., Осмоловский В. Политические партии Беларуси. Минск, 1997; Бубнаў Ю.М., Пушкін І.А. Паліталогія: Курс лекцый. Магілёў, 2006; Агееў А. Р. Барацьба за адраджэнне Магілеўскай ратушы: гісторыя і ўрокі // Проблемы и перспективы становления гражданского общества : материалы Междунар. науч.-практич. конф. С. 7–1; Грамадзянская супольнасць і праблемы нацыянальна-культурнай ідэнтыфікацыі ў Беларусі. Матэрыялы навукова-практычнага семінара. Брэст: Рэдакцыя газеты “Шлях”, 1996; Зенченко В.А. Формирование гражданского общества в Беларуси и России: сравнительный анализ // Новейшая история (1991–2006 гг.): государство, общество, личность: материалы науч.–теорет. конф. Минск, 2006. С. 418–424; Смехович Н.В. Формирование гражданского общества в Беларуси: теория, социальный опыт и перспективы // Тамсама. С. 491–497; Пушкін І.А. Грамадска–палітычная і культурна–асветніцкая дзейнасць грамадскіх аб’яднанняў нацыянальных супольнасцяў Беларусі (1991–2005 гг.) // Веснік Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта. 2008. № 4. С. 15–21; Яго ж. Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.): манаграфія. Магілёў, 2007; Смоляк С.Г. Общественные объединения и власть // Новейшая история (1991–2006 гг.): государство, общество, личность: материалы науч.–теорет. конф. С. 497–501; Смолина А.П. Социальное партнёрство и формирование гражданского общества // Белорусская политология: многообразие в единстве – III : материалы междунар. науч.-практ. конф. Гродно, 2008. С.177–179; Чемоданова А.В. Теоретические аспекты развития правового государства и гражданского общества в Республике Беларусь // Белорусская политология: многообразие в единстве – III. Ч. 2. С. 275–277; Соловей Т.Г. Эволюция института политических партий в современном обществе // Тамсама. С. 185–188; Ясев В.В. Специфика деятельности общественных объединений в Республике Беларусь (1990–1994 гг.) // Романовские чтения – 5. С. 8–9 і інш.

бела-чырвона-белы сцяг і герб "Пагоня". Быў выбраны новы старшыня Вярхоўнага Савета – С.С. Шушкевіч.

Абвяшчэнне незалежнасці Беларусі спрыяла далейшаму развіццю дэмакратычных адносін. Хутка развівалася незалежная прыватная прэса.

15.03.1994 г. была прынята Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, згодна якой краіна стала прэзідэнцкай рэспублікай. Выбары Прэзідэнта ў 1994 г., рэферэндумы 1995, 1996 і 2004 гг. істотна паўплывалі на развіццё Беларусі. Пасля 1995 г. урад краіны дэклараваў правядзенне палітыкі будаўніцтва сацыяльна-арыентаванай дзяржавы, якая будзе будавацца на прынцыпах канстытуцыйных гарантый асабістых правоў і свабод грамадзян, свабоды прадпрымальніцтва, выбару прафесіі і месца працы, роўнасці ўсіх формаў уласнасці, гарантыі яе недатыкальнасці і выкарыстання ў інтарэсах асобы і грамадства, забеспячэння ўзаемасувязі дабрабыту работніка і вынікаў яго працы, сацыяльнай абароны непрацаздольных і іншых сацыяльна ўразлівых пластоў насельніцтва, сацыяльнага партнёрства (паміж дзяржавай, прафсаюзамі і саюзамі прадпрымальнікаў). "Беларуская мадэль" дзяржавы павінна была дазволіць, з аднаго боку, захаваць сацыяльныя заваёвы народа, а з другога – выкарыстоўваць рынкавыя механізмы для павышэння эфектыўнасці эканамічнай сістэмы, яе ўспрымальнасці да навукова-тэхнічнага прагрэсу. Ствараючы ўмовы для рынкавай эканомікі, дзяржава імкнулася да дасягнення такіх прынцыповых мэтаў, як рост дабрабыту народа, высокая ступень занятасці, спрыяльнае для жыцця навакольне асяроддзе.

У першыя гады незалежнасці было зарэгістравана 29 палітычных партый і 7 грамадска-палітычных рухаў, якія з'явіліся пасля прыняцця закона "Аб грамадскіх арганізацыях". У 1994 г. парламент прыняў закон аб палітычных партыях, які гарантаваў грамадзянам нашай краіны права свабоды палітычных поглядаў і актыўнага ўдзелу ў грамадска-палітычным жыцці.

На пачатак 2017 г. у Рэспубліцы Беларусь зарэгістраваны 15 палітычных партый, якія прадстаўляюць практычна ўвесь спектр палітычных сіл у краіне: Аб'яднаная грамадзянская партыя (АГП), Беларуская аграрная партыя (БАП), Беларуская партыя "Зялёныя" (БПЗ), Беларуская партыя левых «Справядлівы свет», Беларуская патрыятычная партыя (БПП), Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада), Беларуская сацыяльна-спартыўная партыя

(БССП), Камуністычная партыя Беларусі (КПБ), Кансерватыўна-Хрысціянская Партыя БНФ, Ліберальна-дэмакратычная партыя (ЛДП), Партыя БНФ, партыя «Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада», Рэспубліканская партыя, Рэспубліканская партыя працы і справядлівасці (РППС), Сацыял-дэмакратычная партыя Народнай Згоды, а таксама зарэгістраваны 31 прафсаюз, 2 731 грамадскае аб'яднанне, з іх 228 – міжнародныя. Дзейнічае 155 фондаў, у тым ліку 14 міжнародных[282].

У Магілёўскай вобласці было зарэгістравана (2011): палітычных партый – 102 рэгіянальных структуры, з іх 8 абласных, 9 гарадскіх, 37 раённых, 48 першасных. Мясцовых грамадскіх арганізацый – 107, з іх абласных – 18, раённых і гарадскіх – 89. Прафсаюзных арганізацый – 3110, з іх 16 абласных, 116 раённых і гарадскіх, 24 аб'яднаных, 2954 іншых. Іншых аб'яднанняў – 6449, з іх абласных – 81, раённых і гарадскіх – 613, іншых – 5755. У Магілёве і Бабруйску дзейнічалі 16 грамадскіх аб'яднанняў 7 нацыянальных супольнасцей: 2 азербайджанскіх, 2 армянскіх, 1 грузінскае, 5 яўрэйскіх, 2 польскіх, 2 рускіх (ГА "Рускае таварыства", ГА "Рускі дом"), 2 украінскіх ("Дніпро" Магілёў, "Славуціч" Бабруйск). Былі зарэгістраваны 258 рэлігійных абшчын, дзве праваслаўныя епархіі, 4 манастыры, рэспубліканскае рэлігійнае аб'яднанне "Самастойная евангелісцка-лютэранская царква ў Рэспубліке Беларусь", абласныя аб'яднанні цэркваў ЕХБ, ХВЕ, 23 прыходы рыма-каталіцкай царквы, ЕХБ – 39 абшчын, ХВЕ – 40 абшчын, іўдаізма – 9 абшчын [283].

Грамадска-палітычныя і культурныя працэсы, якія адбываліся ў Беларусі ў першай палове 1990-х гг., далі адчувальны штуршок развіццю беларускай нацыянальнай культуры і культуры нацыянальных супольнасцей, гэта садзейнічала росту іх палітычнай і нацыянальнай свядомасці. Ва ўмовах грамадскага развіцця паступова фарміраваліся элементы палітычнай культуры, арыентаванай на рынак і канкурэнтную барацьбу. Яны з'яўляліся рэгулюючым прынцыпам жыццядзейнасці грамадства, што прадугледжвала

[282] Баюра А., Стрелец М. Некоторые размышления на предмет формирования и развития гражданского общества в Республике Беларусь // Ад Магдэбургскага права да сучаснага самакіравання: зборнік матэрыялаў / уклад., аўт. прадмовы І.А. Пушкін, А.Р. Агееў. Магілёў, 2017. С. 154-160.

[283] Взаимодействие с общественными объединениями и партиями // Пути повышения эффективности идеологической работы в современных условиях : стиль, формы и методы / Сборник материалов. Ч. 2. Могилёв, 2010. С. 50–63.

фарміраванне грамадзянскай супольнасці і актывісцкага (грамадзянскага) тыпу палітычнай культуры насельніцтва. З пачатку 2000-х гг. гэтыя працэсы ў Рэспубліцы Беларусь замарудзіліся.

Стабільна назіраецца працэс памяншэння ўплыву палітычных партый на грамадскае жыццё і ўзрастае роля грамадска-палітычных арганізацый і рухаў. Самадзейныя грамадскія асацыяцыі (грамадскія арганізацыі), якімі б нязначнымі не здаваліся іх інтарэсы, з'яўляюцца адным з цэнтральных, галоўных інстытутаў грамадзянскай супольнасці. Сацыяльная актыўнасць усіх катэгорый насельніцтва, рэалізуемая праз удзел у грамадскіх арганізацыях з'яўляецца найважнейшым фактарам паспяховага развіцця і функцыяніравання грамадзянскай супольнасці. Аднак у Рэспубліцы Беларусь адзначаецца нязначны ўплыў нават грамадскіх арганізацый. Таму для паспяховага станаўлення і развіцця грамадзянскай супольнасці неабходна садзейнічаць паглыбленню працэсаў самаарганізацыі, якія адбываюцца ў грамадстве. Належыць заахвочваць грамадскую ініцыятыву, якая непазбежна выклікае павышэнне грамадзянскай самасвядомасці.

Такім чынам, стварэнне незалежнай Рэспублікі Беларусь выклікала імкненне да грамадскай самарэалізацыі і ўзрастанне нацыянальнай самасвядомасці. Узніклі палітычныя партыі і грамадскія арганізацыі, ініцыятывы як неад'емныя элементы грамадзянскай супольнасці.

## 4.2 Барацьба грамадскасці за рэгенерацыю гістарычнага ландшафту Магілёва і Магілёўскай ратушы, як сімвала Магдэбургскага права і градзянскай супольнасці

Гарадскі культурны ландшафт з'яўляецца адным са сродкаў, з дапамогай якіх ўмацоўваецца нацыянальная ідэнтычнасць. У савецкія часы гістарычныя цэнтры многіх беларускіх гарадоў былі разбураны і перабудаваны. Пры гэтым цэльныя новыя ансамблі, можа быць за выключэннем Мінска, не былі створаны. Нягледзячы на разбуральныя працэсы, ўжо ў апошнія дзесяцігоддзі існавання савецкай краіны пачалася праца па стварэнню праектаў аднаўлення асобных страчаных помнікаў і горадабудаўнічых планаў па рэгенерацыі гістарычных цэнтраў беларускіх гарадоў. Многім архітэктарам тады здавалася, што яны марнуюць свой час і дзяржаўныя сродкі. Яшчэ нядаўна – у даваенныя і пасляваенныя гады помнікі

бязлітасна руйнаваліся, а цяпер прыходзілася рабіць нешта супрацьлеглае. Праекты па загадзе зверху былі выкананы, і сёння менавіта па тых лякалах адбываецца адраджэнне страчанай архітэктурнай спадчыны.

Паказальна ў гэтым сэнсе гісторыя адраджэння Магілёўскай ратушы. Яе, нягледзячы на пастановы аб рамонце, улады зруйнавалі ў 1957 г. На сёняшні час няма рацыянальнаых версій тлумачэння прычын гэтага акту вандалізму. Чым больш праходзіла часу з моманту разбурэння ратушы, тым больш станавілася зразумелым, якую каштоўнасць страціў горад. Ні адзін з савецкіх будынкаў не змог стаць новым архітэктурным сімвалам горада. З разбурэннем ратушы, большасці храмаў, многіх старадаўніх жылых дамоў Магілёў страціў сваё некалі непаўторнае прыгожае аблічча. Новыя, як правіла, панельныя будынкі, на жаль, не былі такімі адметнымі і не змаглі замяніць плён працы нашых продкаў.

Натуральна, што з цягам часу нарадзілася ідэя адрадзіць страчаны помнік. У 1975 г., менш чым праз 20 гадоў з дня разбурэння ратушы, пачалася падрыхтоўка распрацоўкі праекта аднаўлення ратушы. У 1978 г. Міністэрства культуры БССР выдзеліла грошы на распрацоўку праекта адбудовы Магілёўскай ратушы і размяшчэнне ў ёй палаца шлюбаў.

Пасля адпаведных гістарычных даследаванняў у верасні 1979 годзе пачаліся археалагічныя раскопкі ратушы пад кіраўніцтвам Алега Трусава. На занядбанай і бруднай Савецкай плошчы яшчэ былі бачны рэшткі ўзарваных падмуркаў ратушы. У 10 – 15 метрах ад іх высілася металёвае механічнае кола, абазванае магілёўцамі “чортавым”. У выніку праведзеных раскопак было вывучана 620 кв. м. плошчы пры таўшчыні культурнага слоя ад 0,4 да 1,5 – 1,7 м. Прачытанне стратыграфіі раскопу дазволіла даследчыкам прасачыць асноўныя перыяды будаўніцтва ратушы і дакладна датаваць іх. У 1984 годзе вывучэнне магілёўскай ратушы было прадоўжана І. Чарняўскім, якім было даследавана 100 кв. м. помніка. у выніку правядзення археалагічных раскопак былі атрыманы вельмі цікавыя археалагічныя матэрыялы, што пацвердзілі заможнасць жыхароў сярэднявечнага Магілёва, якія здолелі пабудаваць адну з самых манументальных ратушаў на Беларусі[284].

---

[284] Агееў А.Р., Трусаў А.А. Магілёўская ратуша. Гістарычны лёс і адраджэнне. 2-е выд. папр. і дап. Магілёў, 2010. С. 110–118.

На падставе навуковых даследаванняў архітэктар Я. Ханіна распрацавала праект гістарычнай рэканструкцыі, па старых рысунках, фотаздымках і чарцяжах аднавіла ўсе дэталі будынка. Праект быў высока ацэнены спецыялістамі. У 1983–985 гадах нават выпускалася рабочая дакументацыя, але потым праектаванне было прыпынена.

Палітыка перабудовы і галоснасці, якую праводзіла кіраўніцтва СССР у другой палове 1980-х гадоў, спрыяла росту цікавасці грамадства да сваёй, у тым ліку страчанай, гістарычнай спадчыны. Сімвалічна, што напрыканцы існавання СССР каля падмуркаў ратушы і ганку Дома культуры будтрэста № 12 (Палац шлюбу) адбываліся першыя несанкцыянаваныя камуністычнымі ўладамі мітынгі. Менавіта тут нараджаўся дэмакратычны рух на Магілёўшчыне, выступалі маладыя магілёўскія палітыкі новай хвалі. На мітынгах гучалі новыя нязвыклыя для савецкіх часоў словы аб сапраўднай дэмакратыі, аб неабходнасці рэабілітацыі ворагаў народу, адраджэння гістарычнай памяці, перадачы вернікам адабраных раней храмаў. Менавіта тут нараджаўся дэмакратычны рух на Магілёўшчыне, выступалі магілёўскія палітыкі новай хвалі: Міхась Булавацкі, Сяргей Габрусеў, Уладзімір Голуб, Леанід Міроненка, Тамара Раманькова, Наталля Рослава, Анатоль Фёдараў ды іншыя. Тут заяўлялі аб сабе і многія вядомыя затым палітычныя дзеячы агульнабеларускага маштабу, як напрыклад будучы Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, лідэр Беларускага народнага фронту Зянон Пазняк[285].

Важнай падзеяй, якая паўплывала на грамадскую думку ў Магілёве, стала выданне з 1989 г. грамадска-палітычнай штотыднёвай газеты “Ратуша”. Сама назва выдання была сімвалічнай і спрыяла замацаванню ў свядомасці маладзейшых гараджан Магілёўскай ратушы як сіноніма страчанай у савецкія часы спадчыны, сімвала і нават брэнда горада. Да таго ж газета паслядоўна прапагандавала ідэю аднаўлення ратушы як сімвала адраджэння магілёўскага самакіравання.

Пазіцыя дзеячаў грамадскага руху таго часу спрыяла падтрымцы ідэі адбудовы будынка ратушы тагачасным старшынёй выканаўчага камітэта горада Магілёва Сяргеем Габрусевым. Ва

[285] Агееў Аляксандр. Рэгенерацыя гістарычнага ландшафту Магілёва і праблема аўтэнтычнасці Магілёўскай ратушы, як сімвала магдэбургскага права // Ад Магдэбургскага права да сучаснага самакіравання : зборнік навуковых матэрыялаў. Магілёў, 2017. С. 71-88.

ўмовах эйфарыі першых гадоў незалежнасці гарадскія ўлады прынялі рашэнне аб аднаўленні сімвала гарадскога самакіравання на гістарычным месцы, дзе ратуша прастаяла амаль тры стагоддзі, быў выкапаны катлаван, і 23.05.1992 г. адбылася сімвалічная закладка першага каменя будынка. Асвяціў на ўрачыстым малебне і благаславіў адраджэнне сімвала гарадскога самакіравання архіепіскап Магілёўскі і Мсціслаўскі Максім (Кроха). У 1992 годзе было засвоена каля 1 млн. руб. і выведзены нулявы цыкл. Але, як часцяком бывае, добрая справа не адразу пайшла лёгка. Распад СССР, цяжкасці пераходнага перыяду не дазволілі так хутка, як ма́рылася грамадскасці, аднавіць ратушу. З-за недахопу сродкаў і палітычнай волі ва ўмовах сістэмнага крызісу эканомікі работы былі надоўга прыпынены[286].

Працягу адбудовы ратушы ў канцы 1990 гадоў пры новых кіраўніках гарадскога выканаўчага камітэту замінала дачыненне да першай спробы адраджэння ратушы Сяргея Габрусева. Ён ўспрымаўся магілёўскай наменклатурай, як апазіцыянер і чалавек з іншай "каманды", што часткова было праўдай. Тое, што ідэю адраджэння працягвалі падтрымліваць практычна ўсе магілёўскія апазіцыйныя палітычныя партыі і рухі, толькі ўзмацняла недавер да пректу.

Нягледзячы на няўдачу першай спробы аднаўлення, практычна ўся культурная эліта горада падтрымлівала праект. Некалькі разоў магілёўская грамадскасць праводзіла збор подпісаў з прапановай адрадзіць дыямент магілёўскага грамадзянскага дойлідства. Магілёўскія гісторыкі і краязнаўцы ўсе 90-я гады XX і першыя гады XXI стагоддзяў у сваіх публікацыях і выступленнях неаднаразова ставілі пытанне пра неабходнасці аднаўлення гарадской ратушы. Вялікую актыўнасць і настойлівасць тут праявіў першы дырэктар Музея гісторыі горада Магілёва Ігар Пушкін. Не дазвалялі забыцца на неабходнасць адбудовы мясцовыя журналісты, гісторыкі і краязнаўцы. Сярод іх найбольш настойлівымі і паслядоўнымі былі Алены Барысава, Мікола Ножнікаў і Віктар Юшкевіч. Макеты, малюнкі ратушы сталі неад’емнай часткай экспазіцый магілёўскіх музеяў. Паступова ратуша зноў стала сапраўдным архітэктурным сімвалам Магілёва, а яе сілуэт стаў пазнавальным для ўсіх, у тым

[286] Агееў А.Р. Магілёўская ратуша: гісторыя адраджэння і яе ўрокі // ARCHE Пачатак. 2010 г. № 3. С. 342–362

ліку і маладзейшых, пакаленняў гараджан. Ён пачынае шырока распаўсюджвацца ў якасці гарадскога брэнда[287].

Пад уплывам грамадскай думкі магілёўскія ўлады ў пачатку XXI стагоддзя вярнуліся да ідэі яе адраджэння. Праект абмяркоўваўся на самым высокім у вобласці ўзроўні. Прапановы старшыні Магілёўскага гарвыканкама Віктара Шорыкава па адбудове помніка падтрымаў старшыня абласнога выканаўчага камітэта Барыс Батура. У маі 2004 г. гарадскі выканаўчы камітэт даў дазвол на праектаванне, а ў студзені 2005 г. было выдадзена архітэктурна-планіровачнае заданне на аднаўленне помніка архітэктуры.

У аснову праекту былі пакладзены гістарычныя дакументы і матэрыялы. З дапамогай камп'ютарнай апрацоўкі старых фотаздымкаў былі ўдакладнены памеры і прапорцыі фасадаў і архітэктурнага дэкору. Прадугледжвалася будаўніцтва ратушы на яе спрадвечным месцы, выкарыстанне толькі высакаякасных матэрыялаў і канструкцый, дэкаратыўная і вячэрняя падсветка. Праект прадугледжваў адкрыццё будынка для наведвання і адначасова захоўваў першапачатковую функцыю ратушы – месца размяшчэння органаў гарадскога самакіравання[288].

Напачатку меркавалася, што адроджана ратуша будзе да 740-й гадавіны меркаванай даты заснавання Магілёва. Але фінансавая напружанасць гарадскога бюджэту ўвесь час адсоўвала рэальны пачатак будаўніцтва ратушы. На наш погляд, вельмі важным момантам, які паўплываў на тэрмін пачатку адбудовы помніка, стаў чарговы збор подпісаў за адраджэнне ратушы падчас свята горада ў чэрвені 2007 г. Яго правяла група неабыякавых да магілёўскай гісторыі хлопцаў і дзяўчат, сярод якіх большасць была актывістамі апазіцыйных партый. Сем чалавек сабралі за тры святочныя дні каля дзвюх тысяч подпісаў і пазней перадалі іх дэпутатам на сесіі гарадскога савета. Ідэю вырашылі перахапіць палітычныя апаненты.

[287] Агееў А.Р. Барацьба за адраджэнне магілёўскай ратушы: гісторыя і ўрокі // Проблемы и перспективы становления гражданского общества: материалы Междунар. науч.-практич. конф., 20-21 мая 2010 г., Могилев. В 2-х ч. Ч. 2. Могилев, 2010. С. 7–11.

[288] Архітэктурны праект. Узнаўленне гісторыка-культурнай каштоўнасці XVII стагоддзя ратушы ў г. Магілёве. Агульная тлумачальная запіска // Бягучы архіў Магілёўскага гарадскога камунальнага ўнітарнага прадпрыемства "Упраўленне капітальнага будаўніцтва". 730-2004-АТЗ

Мясцовая арганізацыя БРСМ абвясціла акцыю па адбудове ратушы разам. Барацьба за ініцыятыву пайшла толькі на карысць справе[289].

Пасля збору подпісаў на старонках гарадской газеты "Веснік Магілёва" была распачата дыскусія па пытанні неабходнасці аднаўлення ратушы. Рэакцыя культурных аб'яднанняў, жыхароў горада на ідэю адраджэння ратушы аказалася надзвычай станоўчай. Разгледзеўшы звароты грамадзян, грамадскіх аб'яднанняў, прапановы круглага стала, якія падтрымаў гарвыканкам, нягледзячы на складанасць выканання бюджэту гарадскі савет дэпутатаў на сваёй сесіі 8 жніўня 2007 г. прыняў рашэнне пачаць аднаўленне ратушы ўжо ў 2007 г., выдзеліць з гарадскога бюджэту неабходныя сродкі для завяршэння вырабу праектна-каштарыснай дакументацыі і пачатку будаўніцтва. Дэпутаты звярнуліся ў абласны выканаўчы камітэт з просьбай уключыць аб'ект у абласную інвестыцыйную праграму 2008-га года[290].

Такім чынам, рашэнне аб аднаўленні ратушы ў Магілёве не было спантанным. Яе рэканструкцыя, амаль як і прапісана ў міжнародных хартыях, была прызнана "неабходнай у выніку грунтоўных і адкрытых кансультацый паміж прадстаўнікамі дзяржаўнай і мясцовай адміністрацыі і зацікаўленай грамадскасці".

У жніўні 2007 г. на аб'екце распачаліся будаўнічыя работы. Аднаўленне найвышэйшага дасягнення магілёўскага гарадскога дойлідства пачалося праз паўстагоддзя пасля яго варварскага знішчэння. Гарвыканкам даверыў будаўніцтва прэстыжнага аб'екта ААТ "Прамжылбуд". Дырэктар Леанід Балдзенка накіраваў на будоўлю сваіх лепшых спецыялістаў. Яе кіраўніком стаў начальнік участка Міхаіл Міхалап. Непасрэдна курыравалі будаўніцтва старшыня гарвыканкама Віктар Шорыкаў і яго намеснік Уладзімір Ціток.

Фундаменты ратушы і вежы былі заглыблены на 7 метраў і пачалася ўкладка бетонных падушак у падмурак будынка. Уся падземная частка была выканана з маналітнага і зборнага бетону і жалезабетону. У кастрычніку пачаліся працы па кладцы сцен ратушы. Яны ўзводзіліся з чырвонай цэглы высокай трываласці,

[289] Агееў А.Р. Барацьба за адраджэнне магілёўскай ратушы: гісторыя і ўрокі // Проблемы и перспективы становления гражданского общества: материалы Междунар. науч.-практич. конф., 20-21 мая 2010 г., Могилев. С. 7–11.

[290] Агееў А.Р., Трусаў А.А. Магілёўская ратуша. Гістарычны лёс і адраджэнне. 2-е выд. папр. і дап. Магілёў, 2010. С. 119–136.

якая паступіла на будоўлю з Мінскага керамічнага і Обальскага цаглянага ў Віцебскай вобласці заводаў.

Вялікай праблемай у гэты час было спазненне з распрацоўкай чарцяжоў і дакументацыі. Будаўніцтва распачалося тады, калі аб’ект яшчэ не быў забяспечаны ўсёй неабходнай праектна-каштарыснай дакументацыяй. Праекціроўшчыкі былі пастаўлены ў вельмі складаныя ўмовы раптоўным і шпаркім пачаткам будаўніцтва. Аплата работ ўвесь час спазнялася.

Нягледзячы на ўзнікаўшыя праблемы будынак ратушы набываў свае спрадвечныя рысы. Ва ўрачыстай цырымоніі, звязанай з пачаткам адраджэння гарадской ратушы, якая адбылася 23 лістапада 2007 г., прыняў удзел Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Пасля гэтай акцыі можна было быць упэўненым, што нягледзячы на катаклізмы ў сусветнай эканоміцы, будаўніцтва аб’екта будзе завершана. Быў у гэтым і негатыўны момант. Сведкі падзеі сцвярджаюць, што менавіта тады прагучалі амбіцыйныя абяцанкі мясцовай улады адбудаваць ратушу за адзін год, пры праектных двух.

Як часта бывае і на іншых беларускіх аб’ектах, будоўля з апярэджаннем графіка да пэўнай даты выклікала шматлікія тэхналагічныя праблемы. Будаўнікі скардзіліся на тое, што праектная дакументацыя перманентна не паспявае да новага графіку работ. Галоўны архітэктар наракаў на нізкую кваліфікацыю і якасць работ будаўнікоў Магілёва, з-за чаго ўвесь час неабходна карэктаваць чарцяжы, абураўся тым, што тынкавыя профілі і профілі карнізаў не адпавядаюць прынятым у XVIII ст., што аўтарскі нагляд замовец не аплачвае, што перамяшчэнне гадзінніка на 15 метраў уверх зрабіла дэкор верхніх паверхаў немагчымым і г.д. У кіраўніцтва горада і будаўнікоў былі свае контраргументы. Тым не менш, працы былі рэзка паскораны.

У сакавіку было завершана кладка цэглы вежы. Усю вясну інтэнсіўна ішла дэкаратыўная тынкоўка сцен вежы і будынка, укладка чарапіцы на страсе ратушы. Усе вонкавыя сцены будынка былі атынкаваны, а ляпныя дэталі выкананы метадам адліўкі з бетону. Ратушу ўпрыгожыла сапраўдная чырвоная гліняная дахоўка, якую набылі ў Германіі з прычыны адсутнасці айчыннай вытворчасці такой якасці. У суботу 19 красавіка на сваю спрадвечную 47-метровую вышыню быў усталяваны купал ратушы. У маі

былі скончаны асноўныя будаўнічыя работы і дэманціраваны вежавы кран. Пачаліся складаныя ўнутраныя апрацоўчыя работы.

Нягледзячы на шматлікія вытворчыя праблемы ўсе працы былі скончаны да пачатку ліпеня 2008 года. Першы раз адроджаны шэдэўр грамадзянскай архітэктуры XVII стагоддзя прэзентавалі грамадскасці на Дня горада 3 ліпеня, а другі раз афіцыйна 18-га па прыездзе Прэзідэнта Беларусі адбылося ўрачыстае адкрыццё страчанага ў 1957 г., а цяпер адроджанага шэдэўра грамадзянскай архітэктуры XVII стагоддзя[291].

У адрозненні ад многіх іншых ініцыятыў беларускай грамадскасці, задума адрадзіць сімвал гарадскога самакіравання здзейснілася таму, што практычна ўся культурная эліта горада падтрымлівала ідэю адраджэння страчанага помніка. Грамадскасць Магілёва ўдала выбрала аб’ект для змагання. Ён не супярэчыў пануючым настроям кіруючай наменклатуры. У Магілёве пэўны час ішлі спрэчкі на тэму, хто выйграў ад будаўніцтва ратушы: апазіцыя і грамадскія актывісты, ці ўлада? Цяпер яны сціхлі. Стала відавочна, што выйгралі ўсе.

Адбудова ратушы была прызнана галоўнай гарадской падзеяй 2008 г. Да яе адкрыцця была выдадзена кніга “Магілёўская ратуша. Гістарычны лёс і адраджэнне”. Больш падрабязна гісторыя барацьбы грамадскасці за адраджэнне магілёўскай ратушы былі намі раскрыты на магілёўскіх канферэнцыях.

Пяць гадоў новага жыцця ратушы пацвердзілі вялікае значэнне барацьбы грамадскасці за яе аднаўленне і паказалі вялізныя станоўчы ўплыў адраджэння страчаных гістарычных помнікаў (асабліва дамінантных для гістарычных ландшафтаў) для развіцця патэнцыялу рэгіёнаў. Сёння можна смела казаць, што адраджэнне магілёўскай ратушы – адзін з фактараў устойлівага развіцця рэгіёна. Напрыклад, як паказвае рэакцыя прадстаўнікоў турыстычных кампаній, адбудова ратушы павысіла турыстычны патэнцыял горада. “У горада з’явіўся шарм” – рэакцыя і магілёўцаў, і гасцей гораду.

Ратуша сёння не проста прыцягвае турыстаў і нагадвае магілёўцам аб слаўных часах магдэбургскага права, але адным сваім з’яўленнем выклікала ўзрастанне грамадскай актыўнасці гараджан. Адразу ў горадзе сталі абмяркоўвацца іншыя магчымыя аб’екты гістарычнай рэканструкцыі. Рэзка ўзрасла колькасць зваротаў ў

---

[291] Агееў А.Р., Трусаў А.А. Магілёўская ратуша. Гістарычны лёс і адраджэнне. 2-е выд. папр. і дап. Магілёў, 2010. С. 119–136.

органы ўлады з прапановамі аб вяртанні магілёўскім вуліцам старажытных назваў, узвядзенні помнікаў славутым землякам і г.д.

Справа ў тым, што для ўрбанізаванага сучаснага грамадства прастора гарадоў набывае сакральнае значэнне. Невыпадкова адраджэнне ратушы ярка праявіла і нявырашаныя праблемы рэгенерацыі цэнтра Магілева, паказала, якім ён мог бы стаць, калі б былі адбудаваны і іншыя знакавыя будынкі. У публікацыях не раз выказвалася думка, што цэнтральнай частцы Магілёва не хапае "разынкі". Месца зруйнаваных будынкаў новабуды XX стагоддзя занялі, але замяніць іх яны не змаглі. Дарэчы, многія пляцоўкі так і засталіся незабудаванымі. Відавочна, што яе трэба праводзіць. але праекты не прымаюцца. Вельмі цяжка аказалася замест зруйнаваных будынкаў уціснуць у традыцыйны ландшафт сучасныя пабудовы. Ён вымагае старых форм.

Адной ратушы аказалася мала для рэгенерацыі гістарычнага цэнтра Магілёва. А новыя будаўнічыя праекты могуць канчаткова знішчыць перспектывы рэгенерацыі гістарычнага ландшафта. Будаўніцтва маставога пераходу праз Дубравенку выклікала радасць аўтааматараў і сум, роспач і маркоту ў асяродку мастакоў і краязнаўцаў. Адна з самых маляўнічых вуліц гораду фактычна знікла. Вуліцу, якая гістарычна склалася і натхняла мастакоў і паэтаў, замяніў функцыянальны пуцеправод. Вялікія спрэчкі і супраціўленне грамадскасці ў горадзе выклікалі планы будаўніцтва гандлёва-офіснага цэнтра на месцы касцёла Ксаверыя (езуіцкага), расшырэння гандлёвага цэнтра "Магніт". На наш погляд, апасрэдна такой грамадскай актыўнасці спрыяла паспяховы ўдзел грамадскасці ў адраджэнні перліны магілёўскага дойлідства – гарадской ратушы.

У Беларусі ў апошнія гады распачаўся працэс адбудовы зруйнаваных у віхуры драматычных падзей XX ст. помнікаў архітэктуры. Адноўлены Мінская ратуша, тры праваслаўныя храмы ў гістарычнай часты Віцебска. Абмяркоўваюцца праекты адбудовы Брэсцкай і Гарадзенскай ратуш, іншых страчаных жамчужын беларускага дойлідства. Прыклад Віцебска, дзе каля пустой ратушнай плошчы правялі рэканструкцыю старых будынкаў, адбудавалі разбураныя цэрквы, і горад адразу стаў прыцягальным турыстычным цэнтрам, паказвае накірунак дзеяння. У Магілёве таксама варта сканцэнтравацца не на новым будаўніцтве ў цэнтры горада, а на адраджэнні знакавых старажытных будынкаў на іх сапраўдных

месцах. Гаворка ідзе перш наперш аб адбудове будынкаў Багаяўленскага сабора і касцёла Ксаверыя (езуіцкага), вежы Спаскай царквы. Гэта стане ўкладам у аднаўленне гістарычнага ландшафту, што паспрыяе станоўчым зменам грамадскіх настрояў, росту ініцыятывы грамадзян і эканамічнага патэнцыялу, мацаванню гарадской і нацыянальнай ідэнтычнасці.

Прайшло восем гадоў з моманту адраджэння ў ліпені 2008 г. Магілёўскай ратушы. Яна, так упрыгожыла горад, што ад жыхароў Магілёва і яго гасцей чуюцца аб ёй самыя станоўчыя водгукі. Стромкая постаць ратушы захапляе гараджан і турыстаў, зноў зрабіла гістарычны цэнтр месца маляўнічым і рамантычным. Тым не менш, дыскусіі вакол ратушы ў асяроддзі спецыялістаў працягваюцца. Яе лёс не перастаў хваляваць і грамадскасць. Адна з праблем, якая абмяркоўваецца – гэта спрэчка аб ступені аўтэнтычнасці адроджанага будынка ратушы. Сапраўды, пазітыўнае ўспрыманне факта адраджэння страчанага помніка архітэктуры не засланяе пытанняў: ці падыходзіць да яе тэрмін “помнік”, наколькі новая ратуша каштоўная?

Перш чым прыступіць да аналізу праблемы, дазволім сабе нагадаць, што тэрмін “аўтэнтычнасць” у гуманітарных навуках звычайна прымяняецца для абазначэння першасных, традыцыйных, рэгіянальна-спецыфічных відаў культуры. У слоўніках “аўтэнтычны” тлумачыцца, як “сапраўдны, адпаведны сапраўднаму, пэўны, дакладны.” Як трапна заўважыў дэкан архітэктурнага факультэта БНТУ Армен Сардаров, у добрым беларускім слове “сапраўдны” так і чуецца “быць з праўдай”.

Распачнем з таго, што ў дыскусіях аб аўтэнтычнасці сучаснага будынка Магілёўскай ратушы назіраецца відавочны канфлікт разнастайных інтэрпрэтацый. Іх крайнасці:

– будаўніцтва ратушы – ёсць адраджэнне гістарычнага помніка з дапамогай сучасных тэхналогій;

– у 2008 г. была пабудавана нават не копія, а муляж былой ратушы, які толькі вонкава нагадвае былую жамчужыну магілёўскай грамадзянскай архітэктуры і не мае асаблівай каштоўнасці.

Па сутнасці, супрацьлеглыя ацэнкі каштоўнасці аднаўлення ратушы сталі адлюстраваннем аб’ектывісцкага і канструктывісцкага падыходаў да праблемы. У сучаснай антрапалогіі, як правіла, вылучаюць два вызначэнні аўтэнтычнасці: як атрыбут, асаблівасць, унутрана ўласцівая дадзенай рэчы або тэхналогіі якасць, і як

становішча яе ў прасторы і часе. Другі канструктывісцкі падыход для нас асабліва важны, бо менавіта паводле яго вызначаюць прыналежнасць пабудовы да архітэктурнага комплексу ці гістарычнага ландшафту. У ім, у адрозніванні ад першага, лічаць, што аўтэнтычнасць ляжыць не ў саміх аб'ектах, а ў дыскурсах, якія ўзнікаюць з іх нагоды. У гэтым сэнсе, аўтэнтычнасць заўсёды сацыяльна сканструяваная і зменлівая з'ява[292].

У тэорыі аб'ектывісцкія ўяўленні аб аўтэнтычнасці лёгка пераадольваюцца, а на практыцы дамінуюць. Справа ў тым, што ў прыкладных сферах культуры – у музейнай дзейнасці, на рынку мастацтва, нават у законатворчасці спецыялісты маюць справу з канкрэтнымі рэчамі і ім важна іх атрыбутаваць, вызначыць эпоху, кошт і г.д. Тым не менш, разуменне складанасці праблемы аўтэнтычнасці пашыраецца. Пры такім больш шырокім яе разглядзе падставы для спрэчак становяцца зразумелымі. Музейныя работнікі і антыквары ў ацэнцы ратушы акцэнт робяць на змяненнях формы і матэрыялаў, а грамадскія актывісты – на сімвалічнасці яе адраджэння.

З чыста фармальнага боку, як падаецца, правы крытыкі, бо ратуша будавалася з сучасных матэрыялаў, па сучасных тэхналогіях, да яшчэ і з пэўнымі адступленнямі ад праекта. Яна, сапраўды, па пэўных прычынах не можа лічыцца абсалютна дакладнай копіяй старажытнага будынка. З гэтага пункту гледжання яе цяжка назваць адроджаным помнікам архітэктуры XVII стагоддзя. Безумоўна, гэта будынак XXI стагоддзя. Аднак жа, ёсць і іншыя, больш кампліментарныя для ратушы меркаванні, бо калі атрыбутуецца і ацэньваецца архітэктурны будынак, то вызначаюцца рысы, якія некалькі адрозніваюцца ад антыкварных рэчаў і музейных прадметаў.

Разглядаючы праблему мы будзем абапірацца на вядомы ў антрапалогіі пастулат, згодна якому казаць можна аб трох асноўных відах аўтэнтычнасці: па форме, функцыі і зместу. Не будзем забываць і пра тое, што каштоўнасць ратушы мы можам разглядаць у сучасным горадабудаўнічым, агульнакультурным, гістарычным і іншых кантэкстах.

---

[292] Агееў Аляксандр. Рэгенерацыя гістарычнага ландшафту Магілёва і праблема аўтэнтычнасці Магілёўскай ратушы, як сімвала магдэбургскага права // Ад Магдэбургскага права да сучаснага самакіравання : зборнік навуковых матэрыялаў. Магілёў, 2017. С. 71–88.

Найперш трэба адзначыць, што адроджаны будынак ратушы стаіць на сваім родным спрадвечным месцы. Дзякуй Богу яго не забудавалі ў савецкі час. Месца было вольнае. Руйнаваць пабудовы XX ст не прыйшлося, а адбудова ратушы натуральна спрыяла рэгенерацыі, хай сабе і частковай, гістарычнага краявіду цэнтра горада, аб значэнні чаго мы пагаворым ніжэй.

Калі казаць аб форме, то тут важна падкрэсліць, што паводле сваёй знешняй форме і сілуэту праект будынка даволі дакладна капіруе старажытную ратушу. Архітэктары і будаўнікі ўвялі толькі некалькі вонкавых змяненняў, якія іх адрозніваюць. А вось унутраная планіроўка сучаснай ратушы прыстасавана да сучасных патрэб і істотна адрозніваецца ад ранейшых узораў.

Не засяроджваючы шмат увагі на праектных дэталях, адзначым толькі што генеральным праекціроўшчыкам выступіла ТАА “Цэнтр па рэгенерацыі гісторыка-культурных ландшафтаў і тэрыторый”. Праект “Узнаўленне гісторыка-культурнай каштоўнасці XVII стагоддзя ратушы ў г. Магілёве” здзейснілі навуковы кіраўнік А. Кропатаў, галоўны архітэктар А. Кандратаў, галоўны інжынер А. Кандраль, архітэктары В. Пракопчык і Т. Панамарова, канструктар В. Сазонава. У яго аснову былі пакладзены гістарычныя дакументы і матэрыялы, гістарычная даведка і археалагічная справаздача А. Трусава, праект 1985 года архітэктара Я. Ханінай. Важна адзначыць, што першапачаткова меліся чарцяжы планаў папярэдняга праекта, фатаграфіі праекта 1834 года, фатаграфіі абмераў планаў 1919 года, абмер плану 1945 года, і дакладныя "свае" фрагментарныя абмеры мура цокаля 1979 года Матэрыялы абмераў параўноўваліся, каб знайсці супадзенні ў памерах, але адрозніванні былі досыць вялікімі. Новы праект прайшоў узгадненне ва ўпраўленні па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

З праектнай дакументацыі бачна, што з дапамогай камп’ютарнай апрацоўкі старых фотаздымкаў былі ўдакладнены памеры і прапорцыі фасадаў і архітэктурнага дэкору. На падставе вертыкальных замераў па дадзеных фатаграфій была сканструявана мадэль будынка ратушы. Сумяшчэнне мадэлі і фатаграфіі з дапамогай кампутара, выверка суадносін вышыні ярусаў і паверхаў на аснове вытворных “залатой” прапорцыі пацвердзіў высокую ступень яе дакладнасці і паслужыў доказам таго, што фасад у свой час будаваўся з улікам прапорцый стылю.

У аснову праекта была пакладзена ідэя аднаўлення фасадаў ратушы такімі, якімі яны былі ў сярэдзіне XVIII стагоддзя. Новы праект рэканструкцыі прадугледжваў будаўніцтва будынка ратушы вышынёй 14 метраў і васьміграннай пяціярусная вежы, якая на 47 метраў 30 сантыметраў павінна была зноў ўзняцца над горадам. Вонкавыя габарыты будынка ў ім адпавядалі арыгінальным памерам. Толькі пры рашэнні дваровага фасаду выкарыстоўваліся аналагі і ўскосныя ўказанні ў гістарычнай запісцы на існаванне франтона.

У адпаведнасці з праектам, плануемая плошча забудовы складала 373 м$^2$, аб'ём будынка – 5500 м$^3$, агульная плошча памяшканняў – 844,2 м$^2$, у тым ліку падвала – 18,7 м$^2$, першага паверха 284,1 м$^2$, другога – 270,7 м$^2$, мансарды – 270,7 м$^2$. Плошчы верхніх ярусаў вежы, якія не былі прадугледжаны для эксплуатацыі, пры гэтым не ўлічваліся. У сувязі са зменай функцыянальнага прызначэння будынка, унутраная планіроўка паверхаў была выканана згодна з новым планам. У апраўданне архітэктарам трэба зазначыць, што ўнутраная планіроўка будынка з часоў будаўніцтва некалькі разоў мянялася[293].

Нясучыя сценавыя канструкцыі ратушы планавалася ствараць з блокаў ячэістага бетону таўшчынёй 500 мм. і цэглы – 260 – 300 мм. Таўшчыня цагляных сцен вежы адрозніваецца ў залежнасці ад ярусаў і змяншаецца ад 1130 мм. унізе да 380 мм. наверсе. Дзеля надання большай устойлівасці вежу паставілі на маналітную жалезабетонную пліту. Праект прадугледжваў індывідуальныя вокны, як і многія дзверы будынку; у экспазіцыйных залах першага паверха – наладжванне падвяснай столі і пакрыццё падлогі керамічнай пліткай. Падлога другога паверха планавалася паркетнай, і толькі мансарда мела, паводле праекта, сучасную аздобу. Каштарыс праекта ў коштах 2007 года склаў 5,5 млрд. рублёў (2 млн. 560 тыс. $)[294].

Яшчэ на стадыі праектавання ішло абмеркаванне прызначэння памяшканняў ратушы. Пасля разгляду шэрагу прапаноў было вырашана на першым паверсе будынка размясціць залы Музея гісторыі Магілёва, на другім – залу пасяджэнняў гарадскога Савета, урачыстых прыёмаў і цырымоній, прыёмную кіраўніка гарадской

---

[293] Архітэктурны праект. Узнаўленне гісторыка-культурнай каштоўнасці XVII стагоддзя ратушы ў г. Магілёве. Агульная тлумачальная запіска // Бягучы архіў Магілёўскага гарадскога камунальнага ўнітарнага прадпрыемства "Упраўленне капітальнага будаўніцтва". 730-2004-АТЗ.
[294] Тамсама.

адміністрацыі, а на мансардзе – фондавыя і службовыя памяшканні, кабінеты гарадскога музея. Такім чынам, праект прадугледжваў адкрыццё будынка для наведвання і адначасова захоўваў першапачатковую функцыю ратушы – месца размяшчэння органаў гарадскога самакіравання. Пад час будаўніцтва ратушы тагачасны старшыня Магілёўскага гарвыканкама Віктар Шорыкаў памяшканне прыёмнай кіраўніка гарадской адміністрацыі на другім паверсе палічыў залішнім. Было вырашана перадаць яго музею горада, што значна павялічыла экспазіцыйныя магчымасці апошняга, але і дадало праблем будаўнікам і праекціроўшчыкам.

Будынак сёння выкарыстоўваецца пад музей гісторыі Магілёва і яму належыць. Але, і гэта вельмі істотна, ў яго ёсць і іншая надта важная функцыя – у ратушы праходзяць сесіі дэпутатаў Магілёўскага гарадскога савета дэпутатаў. Так, у маі 2010 года ўпершыню ў навейшай гісторыі ратушы прайшлі выбары новага старшыні гарадскога Савета дэпутатаў.

Вельмі важна, што ратуша, як і ў часы самакіравання, зноў стала адным з цэнтрам грамадскага жыцця горада. У ёй праводзяцца шматлікія афіцыйныя і грамадскія гарадскія мерапрыемствы, у тым ліку ўзнагароджанні, уручэнне прэміі “Дасягненне”, урачыстыя прыёмы замежных дэлегацый, канферэнцыі, прэзентацыі і г.д. Фактычна будынак функцыянуе як гарадскі грамадскі цэнтр[295].

Можна канстатаваць, што назіраецца адраджэнне і элементаў функцыянальнай аўтэнтычнасці Магілёўскай ратушы.

Пытанне зместу ў дачыненні да ратушы дастаткова складаная тэма. Справа ў тым, што ў праблеме аўтэнтычнасці важныя маркеры, якія мы прызнаём. На мой погляд, перш за ўсё тут трэба казаць аб сімвалічнасці адраджэння будынка ратушы. Магілёўская ратуша – гэта форма, якая даўно пераўтварылася ў сімвал. Пры аналізе культурных сімвалаў, перш наперш, выяўляюць гісторыю налажэння сэнсаў і пераўтварэння рэчы ці аб’кта ў сімвал. Таму і пачну разглядаць гэты аспект праблемы гістарычна паслядоўна.

Па першае, ратуша для магілёўцаў гістарычна была і застаецца сёння сімвалам гарадскога самакіравання. Яна нагадвае аб тых слаўных часах, калі гарадскі магістрат кіраваў усім жыццём у горадзе і размяшчаўся звычайна ў спецыяльным будынку – ратушы. Магдэбургскія гарады стаялі на адной роўніцы са славутымі

---

[295] Агееў А.Р., Трусаў А.А. Магілёўская ратуша. Гістарычны лёс і адраджэнне. 2-е выд. папр. і дап. Магілёў, 2010. С. 137–148.

гарадамі Старога Свету ў сэнсе самакіравання. Магілёўская ратуша з канца XVII стагоддзя дэманстравала свету, што магілёўцы здольныя ўмела распараджацца ўласнай свабодай і дабрабытам.

Па другое, ратуша для гараджан даўно стала адным з сімвалаў шматвяковай гісторыі горада. Сёння адбудаваная ратуша нібыта масток наладзіла сувязь паміж сучаснасцю і гісторыяй Магілёва. Напрыклад, яна адразу аблягчыла экскурсаводам, гасцям гораду ўспрыманне магілёўскай даўніны, ды і самім жыхарам прывязку старых фотаздымкаў да сучаснага ўрбаністычнага пейзажу Магілёва.

Па трэцяе. Магілёўская ратуша заўсёды была і цяпер зноў стала адным з архітэктурных сімвалаў Магілёва. Вельмі важна адзначыць тое, што пасля адраджэння ратушы была адноўлена адна з галоўных архітэктурных дамінантаў горада. Сёння гарадскі ландшафт не толькі стаў больш маляўнічым, але і наблізіўся да вядомага нам па фотаздымкам пачатку XX стагоддзя ўзору. Цяпер ратуша зноў фарміруе панараму гістарычнай частцы Магілёва. Усім стала бачна, як яе не хапала ў цэнтры Магілёва[296].

Калі пагаджацца з думкамі многіх сучасных архітэктараў, што архітэктура прызвана дапамагаць людзям кантактаваць паміж сабой і месцам, ў якім яны пражываюць, то ратуша выконвае гэтую задачу бліскуча. Яна не заблытвае і не азадачвае людзей, а, перш наперш, вырашае задачы камунікацыі паміж імі і прасторай. Як архітэктурная дамінанта Магілёўская ратуша зноў візуальна паказала, дзе знаходзіцца цэнтр горада. Нібыта свечка, яна высветліла і пазначыла месцазнаходжанне старога гораду і стала як магніт прыцягваць увагу да яго.

Магілёўская ратуша заўсёды займала сваё пачэснае месца і сярод дыяментаў беларускага дойлідства. Па яе сілуэту магілёўцы адрознівалі свой горад ад іншых. У Вялікабрытаніі ў сярэдзіне XX стагоддзя, пад час забастоўкі паштовых работнікаў беларускімі эмігрантамі была надрукавана серыя з пяці аналагаў паштовых марак. Яны былі ў абароце кароткі час, калі розныя грамадскія арганізацыі займелі права мець уласную пошту. Згуртаванне беларусаў Вялікабрытаніі размясціла на іх выявы самых выбітных

[296] Агееў Аляксандр. Рэгенерацыя гістарычнага ландшафту Магілёва і праблема аўтэнтычнасці Магілёўскай ратушы, як сімвала магдэбургскага права // Ад Магдэбургскага права да сучаснага самакіравання : зборнік навуковых матэрыялаў. Магілёў, 2017. С. 71–88.

помнікаў беларускай архітэктуры. Сярод беларускіх ратуш была абрана менавіта магілёўская.

Нездарма сёння, пасля свайго адраджэння Магілёўская ратуша стала сапраўднай тэлевізійнай зоркай як рэгіянальнага, так і нацыянальнага тэлебачання. Як правіла, яна архітэктурна прадстаўляе Магілёў ў выпусках прагнозаў надвор'я і застаўках большасці рэспубліканскіх каналаў.

Па чацвёртае. І першае, і другое, і трэцяе выразна сведчыла аб еўрапейскасці Магілёва. Магдэбургскае самакіраванне, прыналежнасць да еўрапейскай гістарычнай прасторы, стылёвае архітэктурнае падабенства з іншымі гарадамі Еўропы сцвярджае духоўную і матэрыяльную прыналежнасць горада да гэтай частцы свету. Дарэчы, менавіта таму і сёння для мноства магілёўцаў адраджэнне ратушы – ёсць сведчанне еўрапейскага выбару нашай краіны.

Па пятае. Істотную ролю ў фарміраванні адносін гараджан да ратушы, на мой погляд, сыграла і трагічная гісторыя знішчэння выдатнага архітэктурнага помніка ў 1957 годзе. Ратуша застаецца адным з сімвалаў варварскіх, часцяком на мяжы з злачыннасцю адносін да архітэктурнай спадчыны ў савецкі час. Пакутніцкі лёс будынка, які тэхналагічна адносна проста рамантаваўся, але замест рэканструкцыі быў разбураны, выклікаў натуральнае спачуванне і рамантызацыю.

І апошняе. Нельга абмінуць і тое, што ратуша сёння не проста нагадвае магілёўцам аб слаўных часах магдэбургскага права і прыцягвае турыстаў сваёй выбітной гарманічнай формай, але адным сваім з'яўленнем выклікала ўзрастанне грамадскай актыўнасці гараджан. Адраджэнне ратушы стала такой важнай падзеяй у жыцці Магілёва, яшчэ і таму, што гісторыя змагання за яе аднаўленне сама ператварылася ў сімвал плённасці грамадскай ініцыятывы[297].

Тое, што шматгадовая барацьба магілёўскай грамадскасці за адраджэнне знішчанага помніка закончылася поспехам, выклікала энтузіязм і паспрыяла шматлікім станоўчым каментарам у прэсе. Адразу пасля адкрыцця ратушы ў горадзе сталі абмяркоўвацца іншыя магчымыя аб'екты гістарычнай рэканструкцыі. Рэзка ўзрасла колькасць зваротаў ў органы ўлады з прапановамі аб вяртанні магілёўскім вуліцам старажытных назваў, узвядзенні помнікаў

[297] Агееў А.Р. Барацьба за адраджэнне магілёўскай ратушы: гісторыя і ўрокі // Проблемы и перспективы становления гражданского общества: материалы Междунар. науч.-практич. конф. В 2-х ч. Ч. 2. Могилев, 2010. С. 7–11.

славутым землякам і г.д. Ратуша для магілёўцаў была сімвалам самакіравання, а сёння стала і добрым знакам духоўнага абуджэння і адраджэння.

Менавіта ў сімвалічнасці адраджэння магілёўскай ратушы нам бачыцца найбольшая каштоўнасць яе адраджэння. Нездарма ў прадмове старшыні Магілёўскага гарадскога выканкама С.П. Барадаўкі да другога выдання кнігі “Магілёўская ратуша. Гістарычны лёс і адраджэнне” сказана: “Гарадская ратуша на працягу трох стагоддзяў з’яўлялася галоўным сімвалам (вылуч. аўт.) горада на Дняпры, яго дзяржаўнай значнасці, палітычнай і эканамічнай магутнасці.”

Павага да аўтэнтычнасці і яе шырокае разуменне зафіксавана ва ўсіх асноўных міжнародных архітэктурных хартыях і дакументах. У Рыжскай хартыі 2000 г. не двухсэнсоўна запісана, што “…аўтэнтычнасць ёсць мерай таго, наколькі праўдападобна і дакладна вызначальныя рысы культурнай спадчыны (уключаючы знешні выгляд і кампазіцыю, матэрыялы і субстанцыю, выкарыстанне і функцыю, традыцыі і тэхналогіі, размяшчэнне і наваколле, дух і пачуцці, і іншыя фактары) сведчаць пра сваю значнасць…”[298] За стагоддзі рэстаўрацыйных работ архітэктурная супольнасць прыйшла да разумення вартасці помнікаў старасветчыны ва ўсіх яго праявах: знешняе аблічча, характар пабудовы інтэр’ера, элементы аздобы, гістарычныя напластаванні, канструкцыі, будаўнічыя матэрыялы розных перыядаў. Натуральна, што ўяўленні антрапалагаў, этнолагаў, гісторыкаў аб аўтэнтычнасці ўплывалі на ўяўленні архітэктараў і наадварот.

Падводзячы вынік разважанням, варта адразу адзначыць, што адроджаны, а дакладней сказаць нанава пабудаваны будынак Магілёўскай ратушы, безумоўна, не можа лічыцца ды і не мог, нават тэарэтычна, стаць цалкам аўтэнтычным архітэктурным помнікам XVII стагоддзя. Калі адноўлены будынак Магілёўскай ратушы разглядаць выключна, як антыкварную рэч ці як музейны прадмет, то, сапраўды, не можа ісці гаворкі аб адроджанай аўтэнтычнасці. Гэта нанабуд, муляж і не болей. Але, калі глядзець на яе, як на архітэктурны аб’ект, які ўпісаны ў магілёўскую гісторыю і культурную прастору, то, як паказана вышэй, сітуацыя выглядае зусім не так катастрафічна.

[298] Хартыя аб аўтэнтычнасці і гістарычнай рэканструкцыі ў адносінах да культурнай спадчыны. “Рыжская хартыя” (Рыга, 2000) // http://spadczyna.org/content/view/54/48/

Сёння і з фармальна-архітэктурнага, і з функцыянальнага пунктаў гледжання, і асабліва па зместу можна казаць аб элементах адроджанай аўтэнтычнасці магілёўскай ратушы. І з гэтага пункту гледжання зусім не выглядаюць вар'яцкімі ці антынавуковымі разважанні аб адраджэнні "помніка гісторыі" (вылучана аўт.) – Магілёўскай ратушы. Такая адзнака, дарэчы, рэзка павялічвае каштоўнасць грамадскай актыўнасці накіраванай на аднаўленне па-варварску зруйнаванага ў 1957 г. помніка магілёўскай грамадзянскай архітэктуры. Яна паказвае і напрамак ў якім можна рухацца ў справе аднаўлення страчаных з-за катаклізмаў XX стагоддзя, а больш з-за нашай неахайнасці і інтэлектуальнай злыбеды помнікаў.

### 4.3 Пашырэнне імкнення да адраджэння самакіравання праз ушанаванне магдэбургскіх традыцый на Магілёўшчыне

Сёння мы ставім мэтай нашай дзейнасці – пашырэнне звестак пра гэты малавядомы аспект гісторыі Магілёўшчыны і ўкараненне іх у свядомасць сучасных жыхароў Беларусі. Трэба каб грамадства як натуральную з'яву ўспрымала тое, што Магдэбургскае права з'яўляецца неад'емнай часткай нашага жыцця, падкрэслівае нашу еўрапейскасць. Калісьці яно садзейнічала эканамічнаму росквіту краю, развіццю рамяства і гандлю, узнікненню самабытных мастацкіх школ, развіццю мураванага дойлідства. Сёння традыцыі Магдэбургскага самакіравання, прыналежнасць да еўрапейскай гістарычнай прасторы, стылёвае архітэктурнае падабенства з іншымі гарадамі Еўропы сцвярджае духоўную і матэрыяльную прыналежнасць горада да гэтай часткі свету. Дарэчы, менавіта таму сёння для значнай часткі грамадства адраджэнне ратуш – ёсць сведчанне еўрапейскага выбару нашай краіны.

Менавіта ў дзень надання гораду Магдэбургскага права ў Магілёве (28 студзеня) падводзяцца вынікі апытання "Чалавек года" і "Падзея года" па версіі грамадскасці. У 2012 г. ганаровым званнем ушанавалі за актыўную праваабарончую дзейнасць Б. Бухеля і працу Музея гісторыі Магілёва па збору сродкаў на набыццё ў фонды музея Статута ВКЛ 1588 г., у 2013 г. – за дзейнасць па захаванні гісторыка-культурнай спадчыны І. Пушкіна і стварэнне ў Магілёве арт-праекта "Палатно гісторыі ў стылі графіці", у 2014 г. – кіраўніка Цэнтра гарадскіх ініцыятыў Ю. Стукалава і правядзенне агульнагарадскога свята "Дранік-Fest", у 2015 г. за актыўны ўдзел у

праектах і арганізацыях, якія спрыяюць грамадзянскай самаарганізацыі А. Агеева і ўсталяванне памятнай дошкі рупліўцу беларускай культуры, рэжысёру-тэатралу Валянціну Ермаловічу, у 2016 г. за актыўную культурна-асветніцкую дзейнасць А. Дзячкова і збор подпісаў за адмену Дэкрэта № 3.

Развіццё самакіравання ў Магілёве і вобласці на гістарычных традыцыях актыўна прапагандуецца. У пачатку 2000-х гг. сумеснымі намаганнямі грамадскасці і органаў кіравання Магілёва каля ўваходу ў Магілёўскі гарвыканкам была ўсталявана інфармацыйная дошка аб наданні гораду Магдэбургскага права ў 1577 г. каралём Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў Стэфанам Баторыем, а ў 2008 г. быў адноўлены будынак гарадской ратушы. Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт харчавання ў 2010 г. правёў прадстаўнічую міжнародную канферэнцыю пад назвай "Праблемы і перспектывы станаўлення грамадзянскай супольнасці"[299].

Грамадскімі арганізацыямі Магілёва штогод адзначаюцца ўгодкі надання гораду Магдэбургскага права. У 2011 г. святкаванне адбылося ў адноўленай Ратушы. Праведзены некалькі канферэнцый і сустрэч, прысвечаных Магдэбургскаму праву на тэрыторыі Магілёўшчыны: рэгіянальныя навукова-практычныя канферэнцыі "Магдэбургскае права ў Крычаве: гісторыя і сучаснасць" (Крычаў, 2012), "Магдэбургскае права на Магілёўшчыне: учора, сёння, заўтра" (Магілёў, 2012), рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя "Магдэбургскія традыцыі на Магілёўшчыне" (Магілёў, 2015), міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Ад Магдэбургскага права да сучаснага самакіравання" (Магілёў, 28.01.2017 г.), прысвечаная 440-годдзю надання Магілёву Магдэбургскага права, ў якой прынялі ўдзел навукоўцы, краязнаўцы, прадстаўнікі СМІ і грамадскасці з розных абласных гарадоў і раённых цэнтраў Беларусі, Расіі і Украіны [300].

У выніку абмеркавання дакладаў і дыскусіі ўдзельнікі канферэнцый выпрацавалі практычныя мерапрыемствы па далейшым удасканаленні працы, накіраванай на вывучэнне мінулага магдэбургскіх гарадоў і мястэчак, вызначылі кірункі культурна-

[299] Проблемы и перспективы становления гражданского общества: материалы Междунар. науч.-практич. конф., 20–21 мая 2010 г., Могилев / УО «Могилевский государственный университет продовольствия»; редкол.: Ю.М. Бубнов, (отв. ред.), Т.Г. Бобкова, И.А. Пушкин, В.Л. Рожковский, В.В. Юдин. В 2-х ч. Могилев, 2010.

[300] Ад Магдэбургскага права да сучаснага самакіравання: зборнік навуковых матэрыялаў / уклад., аўт. прадмовы І. А. Пушкін, А. Р. Агееў. Магілёў, 2017. С. 6–8.

асветніцкай дзейнасці па папулярызацыі і актуалізацыі ведаў аб Магдэбургскім праве і гісторыі самакіравання беларускіх гарадоў. Матэрыялы канферэнцый былі выдадзены асобнымі выданнямі [301].

У 2015 г. з дапамогаю партнёраў і сяброў Магілёўская абласная арганізацыя ГА "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны" пры спрыянні Галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай працы, культуры і па справах моладзі Магілёўскага аблвыканкама рэлізавала праект "Магдэбургскія традыцыі на Магілёўшчыне" (адказны У. Лапцэвіч). Былі арганізаваны і праведзены з удзелам грамадскасці, а ў пэўных месцах і рэгіянальных уладаў, круглыя сталы аб магдэбургскіх традыцыях у Шклове, Чавусах, Чэрыкаве, Горках, Бялынічах, Бабруйску, Крычаве. Сем праведзеных грамадскіх круглых сталоў па тэме Магдэбургскага права дасягнулі сваёй мэты – тэма не толькі прагучала, але і знайшла водгук у жыхароў гарадоў, дзе традыцыі мясцовага самакіравання маюць глыбокія карані. Інфармацыя аб гэтых мерапрыемствах падавалася мясцовымі і рэспубліканскімі СМІ[302].

У 2016 г. па ініцыятыве і на сродкі грамадскасці, пры ўдзеле мясцовых уладаў, былі выраблены і ўсталяваны тры гранітныя інфармацыйныя дошкі аб наданні Магдэбургскага права ў Чэрыкаве, Чавусах і Бялынічах, у двух апошніх местах менавіта ў дзень надання ім права на самакіраванне.

Якім чынам гэта адбывалася. Спачатку была дасягнутая дамоўленасць з кіраўнікамі аддзелаў ідэалогіі райвыканкамаў на прадмет сустрэч па тэме рэалізацыі прапаноў, выпрацаваных на леташніх круглых сталах па тэме Магдэбургскага права ў Чавусах, Чэрыкаве і Бялынічах.

19 мая такая сустрэча адбылася ў Чавускім райвыканкаме. На ёй прысутнічалі прадстаўнікі мясцовай улады, грамадскасці,

---

[301] Ад Магдэбургскага права да сучаснага самакіравання: зборнік навуковых матэрыялаў / уклад., аўт. прадмовы І. А. Пушкін, А. Р. Агееў. Магілёў, 2017; Магдэбургскае права на Магілёўшчыне: зборнік навуковых матэрыялаў / уклад. І. А. Пушкін, А. Р. Агееў. Магілёў, 2015; Магдэбургскае права на Магілёўшчыне: учора, сёння, заўтра: зборнік матэрыялаў / Сацыяльна-культурная ўстанова "Рэгіянальнае бюро стратэгія развіцця і міра"; уклад., аўт. прадмовы І.А. Пушкін, А.Р. Агееў. Магілёў, 2012; Проблемы и перспективы становления гражданского общества: материалы Междунар. науч.-практич. конф., 20–21 мая 2010 г., Могилев / УО «Могилевский государственный университет продовольствия»; редкол.: Ю.М. Бубнов, (отв. ред.), Т.Г. Бобкова, И.А. Пушкин, В.Л. Рожковский, В.В. Юдин. В 2-х ч. Могилев, 2010.

[302] Магдэбургскае права на Магілёўшчыне: зборнік навуковых матэрыялаў / уклад. І. А. Пушкін, А. Р. Агееў. Магілёў, 2015. С. 9–13.

дырэктар Чавускага гісторыка-краязнаўчага музея. Была выказана прапанова ўсталяваць у горадзе гранітную інфармацыйную дошку з надпісам аб даце надання гораду Магдэбургскага права, вызначаны яе памеры і змест. Было вырашана адлюстраваць на дошцы старажытны герб Чавусаў «Святы Марцін» і выбіць надпіс «12 жніўня 1634 года прывілеем караля Уладзіслава IV Вазы гораду Чавусы было нададзена Магдэбургскае права». 25 мая аналагічная сустрэча адбылася ў Чэрыкаўскім цэнтры культуры з аналагічным, па сутнасці вынікам. Было вырашана адлюстраваць на гранітнай дошцы герб Чэрыкава, дадзены гораду ў момант здабыцця Магдэбургскага права і выбіць надпіс «15 лютага 1641 года прывілеем караля Уладзіслава IV Чэрыкаву нададзена Магдэбургскае права». Удзельнікі сустрэчы выказалі меркаванне, што найбольш правільным будзе ўсталяваць інфармацыйную дошку на будынку былога магістрата, пабудаванага ў 1787 годзе, у якім пасля размяшчаліся розныя органы мясцовай улады. 26 мая актывісты сустракаліся с чыноўнікамі Бялыніцкага райвыканкама і прадстаўнікамі мясцовай грамадскасці. На сустрэчы вырашылі зрабіць інфармацыйную дошку ў выглядзе разгорнутай кнігі, на адным баку якой павінна быць выбіты надпіс «4 кастрычніка 1634 года Бялынічы атрымалі Магдэбургскае права», а на другой – «У друкарні кляштара кармелітаў у снежні 1652 года выдадзена першая кніга».

Першай была выраблена дошка для Чэрыкава. Яе ўрачыстае адкрыццё ў выглядзе тэатралізаванага дзейства адбылося 17.07.2016 г. і было прымеркавана да святкавання Дня горада. На адкрыцці прысутнічала кіраўніцтва Чэрыкаўскага райвыканкама на чале з старшынёй М. Касмачовым. Перад прысутнымі выступілі таксама магілёўскія і чэрыкаўскія гісторыкі і філолагі.

13.08.2016 г. роўна праз 382 гады пасля надання Чавусам Магдэбургскага права гранітная інфармацыйная дошка ў гонар той падзеі была адкрыта на будынку Чавускага гісторыка-краязнаўчага музея. Урачыстаму адкрыццю дошкі, у якім удзельнічаў старшыня Чавускага раённага савета дэпутатаў А. Мацюлін, папярэднічала пасяджэнне мясцовай каардынацыйнай рады па ўстойлівым развіцці, дзе гісторыкі распавядалі пра традыцыі самакіравання на Магілёўшчыне.

4.10.2016 г. адбылося адкрыццё гранітнай інфармацыйнай дошкі ў Бялынічах. Яно таксама было прымеркавана да 382-х угодкаў надання гораду Магдэбургскага права. Дошка размешчана

на будынку Бялыніцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі. У адкрыцці прынялі ўдзел бялынічане, гісторыкі, грамадскія дзеячы і намеснік старшыні Бялыніцкага райвыканкама і ён жа намеснік Бялыніцкага раённага савета дэпутатаў А. Ганчук[303].

5.11.2016 г. у Магілёве былі падведзены вынікі работы па папулярызацыі традыцый мясцовага самакіравання. Пад час круглага стала "Музей Алеся Адамовіча: супрацоўніцтва грамадскасці і ўлады" адбылася прэзентацыя выдання "Ушанаванне дат надання Магдэбургскага права гарадам Магілёўшчыны (Чэрыкаў, Чавусы, Бялынічы)". У брашуры адлюстраваны ўсе моманты адкрыцця інфармацыйных дошак пра Магдэбургскае права ў Чэрыкаве, Чавусах і Бялынічах. На прэзентацыі было адзначана, што нягледзячы на розныя складанасці, рэалізацыя гэтага праекта з'явілася станоўчым прыкладам узаемадзеяння грамадскасці і ўлады ў мэтах папулярызацыі гісторыі роднага краю, і што найбольш важна – замацаванні ў свядомасці сучасных беларусаў слаўнай гісторыі прававых узаемадачыненняў іх продкаў.

28.01.2017 г. пад час святкавання 440-годдзя надання Магілёву Магдэбургскага права ўдзельнікі міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Ад Магдэбургскага права да сучаснага самакіравання" у рэзалюцыі падкрэслілі, што "традыцыйнай агульнаеўрапейскай формай арганізацыі грамадскага жыцця і вырашэння надзённых справаў на тэрыторыі Беларусі было Магдэбургскае права".

Еўрапейскі ўзровень развіцця самакіравання на тэрыторыі Магілёўшчыны ў XVI–XVIII стст. дазваляе ганарыцца здабыткамі дэмакратычных працэсаў гарадскога жыцця нашага краю. Сёння грамадскасці неабходна абагульніць назапашаны вопыт і вярнуць магдэбургскі дух, упэўненасць у сваіх сілах, адказнасць за сваю будучыню у гарады і мястэчкі Беларусі.

---

[303] Лапцэвіч У. Колішняе Магдэбургскае права як важкая цагліна ў ідэялагічным падмурку сучаснай беларускай дзяржавы // Ад Магдэбургскага права да сучаснага самакіравання: зборнік навуковых матэрыялаў / уклад., аўт. прадмовы І. А. Пушкін, А. Р. Агееў. Магілёў, 2017. С. 135–138.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

У выніку аналізу гістарычных фактараў і передумоў фарміравання элементаў грамадзянскай супольнасці ў Беларусі можна канстатаваць наступнае.

На працягу гісторыі Беларусі існавалі розныя формы сялянскага самакіравання (абшчына, гаспадарчая кааперацыя, сельскі савет), гарадскога (веча, цэх, магістрат, брацтвы, гарадская дума, гарадскі савет), шляхецкага (зборы, сеймікі, канфедэрацыі, дваранскія сходы), адбывалася фарміраванне парламентарызму (дзейнасць палітычных партый і грамадскіх арганізацый), што з'яўляецца передумовамі фарміравання і станаўлення грамадзянскай супольнасці ў Рэспубліцы Беларусь.

Наяўнасць першапачатковай неарганізаванасці і адсутнасць навыкаў каардынаваць якія-небудзь групавыя дзеянні ўласцівы беларускаму грамадству, але не толькі яму. Высокай ступенню групавой арганізаванасці не могуць пахваліцца і шматлікія нашы блізкія і далёкія суседзі: расіяне, украінцы, палякі, чэхі і г.д. У Беларусі на гэта паўплывалі: тэрміны фарміравання беларускага этнаса, нацыі і знаходжання ў складзе краіны (Расійская імперыя, СССР) з моцнай цэнтралізаванай уладаю, маналітным бюракратычным апаратам ці "наменклатурай", добра наладжанай сістэмай дзяржаўнай прапаганды. Усё гэта яшчэ пагаршалася выкараненнем прыватнаўласніцкіх памкненняў у большасці беларускага насельніцтва. Да таго ж, за доўгія гады свайго знаходжання ў межах Расійскай імперыі і СССР большасць карэннага беларускага насельніцтва фактычна была адлучана ад кіравання сваёй тэрыторыяй, або фармальна ўдзельнічала ў гэтым працэсе. Як вынік, у асяроддзі ўлады працяглы час адсутнічала нацыянальная палітычная эліта, здольная арганізаваць пераемнасць пакаленняў і стварыць палітычную традыцыю, а таксама абараняць нацыянальныя інтарэсы. Таму ў шырокіх пластоў насельніцтва сфарміравалася нежаданне выяўляць палітычную актыўнасць.

У сучаснай Беларусі фарміраванне грамадзянскай супольнасці, найперш заходняга тыпу, стрымліваюць: невялікі працэнт прыватнага сектара ў эканоміцы і адпаведна – адсутнасць вялікай незалежнай ад дзяржавы сацыяльнай групы з важкім капіталам і ўласнасцю, здольнай на сур'ёзную абарону сваіх інтарэсаў на палітычным і заканадаўчым узроўнях; існуючы міф дзяржавы-

бацькі з адпаведным “дэструктыўным сабатажам” – працуем менш, атрымліваем больш; адсутнасць палітычнай эліты, якая б здзяйсняла нацыянальна арыентаваную знешнюю і ўнутранаю палітыку; наяўнасць рэпрэсіўнага апарата і страх перад расправай за сацыяльную і палітычную актыўнасць.

Тым не менш, агляд і аналіз перадумоў і працэсу фарміравання элементаў грамадзянскай супольнасці ў Беларусі на розных этапах гістарычнага развіцця, дазваляе нам казаць аб здольнасці беларусаў да самарганізацыі, а пры стварэнні адпаведных умоваў і да самакіравання, аб магчымасці фарміравання грамадзянскай супольнасці ў сучаснай Рэспубліцы Беларусь.

Прыведзены ў кнізе матэрыял абвяргае погляды тых навукоўцаў і палітологаў, якія сцверджаюць, што ў беларускім грамадстве не існуе традыцый грамадзянскай супольнасці. Гэтыя традыцыі фарміраваліся на беларускіх землях у перыд іх агульнаеўрапейскага развіцця, затым замарудзіліся, далей складваліся ва ўмовах панавання Расійскай імперыі, існавання таталітарнай савецкай дзяржаўнасці. Фарміраванне сучаснай мадэлі грамадзянскай супольнасці магчыма ў выпадку вяртання беларускага грамадства на шлях інтэграцыі ў еўрапейскую прастору.

Агляд узаемаадносін грамадскасці і ўлады на працягу стагоддзяў сведчыць і аб тым, што ўсходнебеларускае насельніцтва (грамадзяне і эліта) актыўна ўдзельнічалі ў палітычным і культурным жыцці краіны, нацыятворчых працэсах. Ніводная значная культурная ці грамадска-палітычная падзея, істотны працэс не абыходзіўся без удзелу прадстаўнікоў усходу Беларусі. Пры гэтым нярэдка менавіта беларускі ўсход выступаў у якасці акумулятара і ініцыятара тых ці іншых грамадска-палітычных і культурных ініцыятыў, ствараў свае беларускія арганізацыі, распачынаў агульнабеларускія справы.

*Навуковае выданне*

**Пушкін** Ігар Аляксандравіч
**Агееў** Аляксандр Рыгоравіч

# ГРАМАДЗЯНСКАЯ СУПОЛЬНАСЦЬ І ДЗЯРЖАВА. СТАНАЎЛЕННЕ БЕЛАРУСКАГА САМАКІРАВАННЯ

У аўтарскай рэдакцыі

Дызайн вокладкі *Н. Г. Тверской*

Падпісана да друку 19.07.2017.
Фармат 60×84 1/16. Гарнітура Times New Roman.
Ум. друк. арк. 10,40. Ул.-выд. арк. 10,60.
Тыраж 65 экз. Заказ 85.

Установа адукацыі
«Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт харчавання».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/272 ад 04.04.2014.
Пр-т Шміта, 3, 212027, Магілёў.

Надрукавана ва ўстанове адукацыі
«Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт харчавання».
Пр-т Шміта, 3, 212027, Магілёў.